Берасцейскія кнігазборы

БРЭСЦКІ АБЛВЫКАНКАМ
АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА імя М. ГОРКАГА

Берасцейскія кнігазборы

Матэрыялы міжнароднай
навукова-практычнай канферэнцыі
«Берасцейскія кнігазборы:
праблемы і перспектывы даследавання»
Брэст, 30—31 кастрычніка, 2008 г.

Брэст 2009

УДК 002.2(476.7)(061.3)
ББК 76.116.3(4Бел-4Брэ)я431
Б 48

Пад агульнай рэдакцыяй доктара філалагічных навук М.В. Нікалаева

Складальнікі:
А.М. Мяснянкіна — намеснік дырэктара па навуковай рабоце Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага,
Т.С. Кавенька — загадчыца аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага

Рэдакцыйная калегія:
Р.Р. Бысюк — начальнік ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама,
Т.П. Данілюк — дырэктар УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага»,
Л.М. Несцярчук — кандыдат гістарычных навук, галоўны спецыяліст па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама,
М.В. Нікалаеў — доктар філалагічных навук, загадчык аддзела рэдкай кнігі РНБ,
М.І. Новік — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры мовазнаўства УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»,
А.Г. Ківака — кандыдат філалагічных навук, дацэнт, заг. кафедры класічнай і сучаснай замежнай філалогіі УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»,
Сенькевіч Т.В. — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі рускай літаратуры УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна»,
І.У. Чабатарова — віцэ-консул Консульства Украіны ў г. Брэсце.

Б48 **Берасцейскія кнігазборы:** Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30—31 кастрычніка 2008 г.) / УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага» ; складальнікі: А.М. Мяснянкіна, Т.С. Кавенька. — Брэст, 2009. — 464 с., 16 л. іл.

ISBN

Зборнік складзены з дакладаў, прачытаных на міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Берасцейскія кнігазборы: праблемы і перспектывы даследавання» (Брэст, 30—31 кастрычніка 2008 г.). Аўтары з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны прапануюць вынікі даследаванняў гісторыі кніжнай культуры, значная ўвага надаецца кніжным старажытнасцям Брэстчыны, лёсу мясцовых архіваў і бібліятэк. Асаблівае месца займаюць матэрыялы, прысвечаныя сучаснасці: кнігавыданню, камплектаванню бібліятэк, пытанням рэстытуцыі, перспектывам аднаўлення гісторыка-архітэктурных аб'ектаў старасветчыны.
Зборнік адрасаваны гісторыкам, культуролагам, кнігазнаўцам, бібліёграфам, краязнаўцам, можа быць карысным для ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і духоўнай культурай беларускага народа.

ISBN

Ад рэдакцыі

Берасцейшчына займае асаблівае месца ў гісторыі краіны. Гэта ўнікальная тэрыторыя, дзе культуры славянскіх Захаду, Поўдня і Ўсходу, роўна як заходнееўрапейскія, прыходзілі ў непасрэднае, самае цеснае ўзаемадзеянне на працягу многіх стагоддзяў. Кніжнасць і літаратура сталі найбольш універсальнымі сродкамі ўзаемапранікнення, узаемаўзбагачэння, пазнання адзін аднаго. Ці варта здзіўляцца, што мінулае рэгіёна звязана не толькі з выдатнымі асобамі, але і з славутымі бібліятэкамі, друкарнямі і манастырскімі скрыпторыямі. На жаль, войны, непаразуменні, паўстанні і рэлігійная нецярпімасць, неаднаразовыя дзяржаўныя падзелы тэрыторыі знішчалі лепшыя ўзоры праяўлення духоўнай культуры народа — кнігі і рукапісы. Рэшткі кнігазбораў разносіліся па прасторах Расіі, Украіны, Швецыі, Польшчы і

іншых краін. Практычна ўсё ацалелае знаходзіцца за межамі Брэсцкай вобласці. Тым не менш, усе гэтыя дзяржавы захавалі беларускія каштоўнасці і садзейнічалі выратаванню многіх з іх.

Выканаць задачу захавання кніжнай культуры нацыі, адначасова забяспечваючы шырокі доступ да яе шляхам пераводу ў электронную форму і захавання на сучасных носьбітах рукапісных старадрукаваных і дакументальных помнікаў, што дазволіць аб'яднаць у адзіную электронную калекцыю копіі помнікаў, арыгіналы якіх захоўваюцца ў фондах Беларусі і замежных краін, павінны праграмы «Памяць свету» (ЮНЭСКА) і «Памяць Беларусі». Часткай іх можа стаць рэгіянальная праграма «Берасцейскія кнігазборы».

Пачаткам працы ў гэтым накірунку стала правядзенне міжнароднай прадстаўнічай навуковай канферэнцыі па ініцыятыве Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага, якая аб'яднала зацікаўленых і дасведчаных. Ініцыятыву бібліятэкі падхапілі шматлікія мясцовыя краязнаўцы, кнігазнаўцы і гісторыкі культуры з Мінска і Гродна, спецыялісты з Пецярбурга, Кракава, Масквы, Вільні, Кіева і Астрога. Гэты факт, як ні які іншы, гаворыць пра актуальнасць задумы. А Зборнік, які Вы, паважаны чытач, трымаеце зараз у руках, сведчыць пра плённасць выніку.

Галоўныя накірункі навуковых даследаванняў і практычнай бібліяграфічнай дзейнасці праграмы «Берасцейскія кнігазборы»:

- пошук і апісанне прадукцыі кнігапісцаў і манастырскіх скрыпторыяў;

• улік усіх захаваных (незалежна ад месцазнаходжання) асобнікаў брэсцкіх друкарняў XIV і пінскай XVIII стст.;

• рэканструкцыя рэпертуару друкарняў (друка-літаграфіяў) Брэстчыны XIX—XX стст.;

• гістарычная рэканструкцыя старасвецкіх бібліятэк Брэстчыны як прыватных, так і розных устаноў (царкоўных, манастырскіх, дзяржаўных, грамадскіх);

• даследаванне асобных кніжных помнікаў з іх, незалежна ад паходжання і сённяшняга месцазнаходжання;

• вывучэнне звязанай з кніжнай культурай «біяграфікі» — лёсаў кнігапісцаў, друкароў, аўтараў і гаспадароў (карыстальнікаў) кніг як у старажытнасці, так і ў Новы час.

У нейкай ступені пастаўленыя задачы вырашаюцца ў матэрыялах прапанаванага Зборніка, аднак для стварэння паўнавартаснай карціны кніжнай культуры рэгіёна патрэбна яшчэ неаднойчы звярнуцца як да гэтых, так і да іншых, не закранутых сёння сюжэтаў.

Матэрыялы размешчаны ў Зборніку паводле храналогіі рэтраспектыўна. У першым раздзеле — «Кніжная спадчына і яе сённяшні лёс» — змешчаны артыкулы аб праблемах рэстытуцыі, перспектывах аднаўлення гісторыка-архітэктурных аб'ектаў старасветчыны Берасцейшчыны і сучасным стане кнігавыдання і бібліятэчнай справы ў рэгіёне. Другі храналагічны раздзел — «Кніга і бібліятэчная справа на Берасцейшчыне ў XIX—XX стст.» — аб'яднаў артыкулы як тэарэтычныя, прысвечаныя культуралагічным, гістарыяграфічным і крыніцазнаўчым

аспектам праблемы існавання беларускай культуры ў прасторы Расійскай імперыі ў XIX—пачатку XX стст., так і распрацоўкі канкрэтных кніжных, бібліятэчна-архіўных і біяграфічных матэрыялаў гэтага часу. Трэці раздзел — «Кнігі і кніжная культура Берасцейшчыны XVI—XVIII стст.» — пачынаецца паведамленнямі пра помнікі рукапіснай кніжнасці, працягваецца блокам дакладаў, прысвечаных брэсцкім друкарням XIV ст. (сюды ж арганічна ўваходзіць матэрыял аб злотніках сярэдневяковага Брэста), а заканчваецца серыяй паведамленняў, прысвечаных царкоўным і манастырскім бібліятэкам у часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Рабочымі мовамі канферэнцыі былі беларуская, польская, руская і ўкраінская, адпаведна матэрыялы друкуюцца на гэтых мовах. Да польскамоўных артыкулаў зроблены кароткія анатацыі па-беларуску, пры рэдагаванні былі па магчымасці ўніфікаваныя напісанні імёнаў гістарычных дзеячаў.

Надрукаваны багаты матэрыял паказвае, колькі яшчэ важных для гісторыі культуры Берасцейшчыны тэмаў не закранута, не вывучана, не асэнсавана. Таму члены рэдкалегіі лічаць лагічным і патрэбным зрабіць гэта выданне, як і саму канферэнцыю «Берасцейскія кнігазборы», перыядычнымі.

Кніжная спадчына і яе сённяшні лёс

Несцярчук Л.М.

Перспектывы аднаўлення гісторыка-архітэктурных аб'ектаў старасветчыны на Берасцейшчыне

Берасцейская зямля — калыска шматлікіх гістарычных асобаў, якія вядомыя ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага, Рэчы Паспалітай, Расійскай імперыі як выбітныя мысліцелі, дзяржаўныя, ваенныя, культурныя і рэлігійныя дзеячы.

Сярод іх — Андрэй Рымша, Фёдар Еўлашэўскі, Афанасій Філіповіч, Андрэй Баболя, Казімір Лышчынскі, Мацей Радзівіл, Мікалай Радзівіл Чорны, Іахім Храптовіч, Станіслаў Панятоўскі, Тадэвуш Касцюшка, Адам Нарушэвіч, Юльян Нямцэвіч, Адам Міцкевіч, Напалеон Орда, Гелена Скірмунт, Рафаіл Слізень, Тамаш Зан, Юзаф Крашэўскі, Рамуальд Траўгут, Лявон Бароўскі, Франц. Савіч, Юльян Крачкоўскі, Паўлюк Багрым, Усевалад Ігнатоўскі, Рыгор Шырма і шмат іншых слынных асобаў, якія пакінулі ў матэрыяльнай і духоўнай спадчыне Беларусі глыбокі след.

Праблема паглыбленага вывучэння лёсу бібліятэк, музейных, архіўных і іншых каштоўнасцяў вышэйназваных выбітных асобаў паўстала надзвычай востра. У гэтым рэчышчы навуковая дыскусія, што адбываецца на сённяшняй канферэнцыі, з'яўляецца надзвычай актуальнай і запатрабаванай.

На Берасцейшчыне актыўна шырыцца аднаўленне і захаванне радавых гнёздаў гістарычных асобаў XVIII—XIX стст., а пасля іх рэабілітацыі востра паўстае пытанне ўнутранага напаўнення створаных тут музеяў і музейных комплексаў.

Мая задача — давесці да ведама ўдзельнікаў канферэнцыі інфармацыю пра тое, што робіцца сёння ў гарадах і раёнах вобласці для таго, каб вярнуць да жыцця 53 мемарыяльныя сядзібы, рэшткі якіх яшчэ захаваліся на тэрыторыі Берасцейшчыны.

Напрыклад, у Брэсцкім раёне налічваецца дзве мемарыяльныя сядзібы: Лышчыцы — радзіма асветніка і філосафа Казіміра Лышчынскага, і Скокі — радзіннае гняздо выдатнага пісьменніка, драматурга, палітычнага дзеяча ВКЛ Юльяна Нямцэвіча, стваральніка і актыўнага збіральніка бібліятэчных калекцый.

З гэтых дзвюх сядзіб захаваўся толькі Скокаўскі палацава-паркавы ансамбль. Ужо на працягу апошніх пяці гадоў тут вядуцца навуковыя праектныя і рэстаўрацыйныя работы. Падрыхтаваны праект аднаўлення сядзібнага дома пад раённы музей гісторыі асветніцтва на Прыбужскай зямлі. Толькі ў гэтым юбілейным годзе на рэстаўрацыю палаца ў Скоках з абласнога бюджэту выдзелена 300 млн. рублёў. Акрамя таго, у Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь накіравана хадайніцтва Брэсцкага аблвыканкама аб уключэнні Скокаўскага палаца Нямцэвічаў у Рэспубліканскую інвестыцыйную праграму на 2009 г.

Найбольшая колькасць мемарыяльных аб'ектаў налічваецца ў Баранавіцкім раёне. Тут іх выяўлена 9. Сярод іх — сядзіба Вольна, знітаваная з жыццём і дзейнасцю Рафаіла Слізеня, выдатнага архітэктара і скульптара, аўтара медальёнаў і помнікаў-бюстаў Тамашу Зану, Адаму Міцкевічу, Ігнату Дамейку і іншым вядомым асобам. Сядзіба Слізеняў у Вольна, на жаль, страчана, і аднавіць яе няма магчымасці.

Адной з самых знакамітых сядзіб, безумоўна, з'яўляецца Завоссе, у якой нарадзіўся Адам Міцкевіч. У 1998 г. колішні фальварак поўнасцю адноўлены, цяпер у ім працуе музей-сядзіба Адама Міцкевіча, які ўключаны ў турыстычныя маршруты Берасцейшчыны.

З вёскай Крашын звязана жыццё і дзейнасць народнага паэта і майстра Паўлюка Багрыма, мастака Пятра Святаполка-Завадскага, фалькларыста і этнографа М. Федароўскага і беларускага асветніка ксяндза Магнушэўскага.

У Баранавіцкім раёне, акрамя названых мемарыяльных сядзібаў, часткова захаваліся гістарычныя палацы роду Радзівілаў у в. Паланечка, роду Бохвіцаў у в. Паўлінава, роду Катлубаяў у в. Ястрамбель. Праведзена толькі частковая рэстаўрацыя названых палацаў.

Астатнія былыя сядзібныя дамы роду Дамейкаў у в. Сачыўкі, роду Верашчакаў у в. Туганавічы, роду Храптовічаў у в. Ясянец поўнасцю знішчаны. Захаваліся толькі рэшткі гістарычных паркаў.

У Драгічынскім раёне маецца тры мемарыяльныя сядзібы: Закозель, Людвінава і Пярковічы. Дзве першыя звязаны з жыццём і дзейнасцю прадстаўнікоў знакамітага роду Ажэшкаў, а Пярковічы былі спадчынным гняздом роду Віславухаў.

На сённяшні дзень разгорнуты рэстаўрацыйныя работы на Пярковіцкім палацы, падрыхтавана таксама навукова-праектная дакументацыя на рэстаўрацыю Заказельскай мемарыяльнай капліцы.

У Жабінкаўскім раёне распачаты праектныя работы па аднаўленні зачыненай базавай школы ў в. Малыя Сяхновічы (радавое гняздо Касцюшкаў-Сяхновіцкіх) пад раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

На радзіме вядомага беларускага асветніка, этнографа, педагога і гісторыка Юзафа Крачкоўскага ў в. Азяты ўсталявана мемарыяльная дошка. Дом Крачкоўскіх ужо, на жаль, даўно не існуе.

У Іванаўскім раёне разгорнуты праектна-рэстаўрацыйныя работы па стварэнні музейнага комплексу Н. Орды ў в. Варацэвічы. Да 200-годдзя з дня нараджэння Н. Орды (2007 г.) пабудавана і ўрачыста адкрыта карцінная галерэя. На 2009 год плануецца распачаць аднаўленне сядзібнага дома Ордаў. Гэта адзін з этапаў стварэння музейнага комплексу Н. Орды.

Івацэвіцкі раён звязаны з нараджэннем нацыянальнага героя ЗША, Літвы, Польшчы, Украіны, ганаровага грамадзяніна Францыі, кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. у Польшчы, Літве, Украіне і Беларусі. У 2004 г. пры фінансавай падтрымцы ЗША адноўлены сядзібны дом (фальварак Мерачоўшчына), у якім у 1746 годзе нарадзіўся Т. Касцюшка. У 2005 г. у гэтым доме адкрыты мемарыяльны музей.

У 2007 г. Дом-музей Т. Касцюшкі і палац Пуслоўскіх камісіяй ЮНЭСКА былі ўключаны ў спіс прыярытэтных аб'ектаў для развіцця айчыннага і замежнага турызму з выдзяленнем гранта ў памеры 50 тыс. долараў ЗША на працяг праектавання Косаўскага палаца. Акрамя таго, Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14. 01. 2008 г. № 20

Косаўскі палац уключаны ў інвестыцыйную праграму рэстаўрацыі на 2008—2009 гг. пад турыстычны комплекс. Цяпер там разгорнуты рэстаўрацыйныя работы.

Багатыя на мемарыяльныя сядзібы Камянеччына, Кобрыншчына, Ляхавіччына.

На Камянеччыне (в. Волчын) нарадзіўся апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Захаваліся рэшткі Троіцкага касцёла, у якім ахрысцілі будучага манарха. У 2007 г. касцёл перададзены каталіцкай супольнасці, за бюджэтныя сродкі падрыхтавана навукова-праектная дакументацыя супрацьаварыйных і кансервацыйных работ. У колішняй плябаніі цяпер фарміруецца музей гісторыі в. Волчын.

На былых сядзібах аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863 г. Рамуальда Траўгута (в. Астроўе Маларыцкага раёна, в. Божы Дар Кобрынскага раёна і в. Шастакова Камянецкага раёна) усталяваны ў 2002—2003 гг. мемарыяльныя знакі.

У стадыі аднаўлення пад музейныя комплексы знаходзяцца Дубайская гістарычная капліца і парк, палац Бутрымовіча на Піншчыне, Ружанскі палац Сапегаў на Пружаншчыне, Грушаўская мемарыяльная капліца ў Ляхавіцкім раёне, Картузіянскі кляштар у г. Бяроза, Нова-Беражноўскі палац у Столінскім раёне.

Чакаюць падтрымкі іншыя ўнікальныя аб'екты старасветчыны: Лыскаўскі касцёл, палацы ў в. Каштанаўка і пас. Інтэрнацыянальны на Пружаншчыне, палац у в. Флер'янава Ляхавіцкага раёна, былы палац роду Юндзілаў у г. Івацэвічы, які, дарэчы, у гэтым годзе ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

Усё сказанае — гэта першыя крокі на доўгім шляху аднаўлення матэрыяльнай і духоўнай спадчыны. Страчана вельмі шмат, таму справу аднаўлення і вяртання страчанага прыйдзецца весці не аднаму пакаленню.

Долгодрова Т. А.

О публикациях перемещенных культурных ценностей, хранящихся в Российской Государственной библиотеке

1993 год стал годом начала публикаций т.н. «трофейных» фондов РГБ[1], которые поступили в библиотеку после окончания Второй мировой войны в 1946 г. в возмещение ущерба, нанесенного отечественным культурным ценностям. Их существование замалчивалось почти полвека. Принятие Закона о перемещенных культурных ценностях дало возможность прежде всего начать работу по созданию каталогов с публикациями всех экспонатов Немецкого музея книги и шрифта (Лейпциг), хранящихся ныне в РГБ. О том, что работа по созданию трех каталогов была в основном завершена, сказано в нашем докладе на Третьих международных книговедческих научных чтениях в Минске в 2003 году[2].

На сегодняшний день вышел из печати только один «Каталог художественных переплетов собрания Карла Бехера» (М., «Пашков Дом», 2007).

---

1 Долгодрова Т.А. Коллекция Немецкого музея книги и шрифта в собрании Российской государственной библиотеки / Т.А. Долгодрова, О.Р. Бородин // Наше наследие. 1994. № 32. С. 98—105.
Dolgodrova T. Les livres de Leipzig / T. Dolgodrova., O. Borodin // Connaissance des Arts. 1995. № 515.P. 63—69.

2 Долгодрова Т.А. О создании каталогов собраний Немецкого музея книги и шрифта (г. Лейпциг), хранящихся в фондах РГБ // Материалы третьих международных научных чтений. Мн., 2003. С. 91—98.

Я — его составитель и автор вступительной статьи. Каталог переплетов собрания немецкого коллекционера конца XIX—начала XX вв. карлсбадского врача Карла Бехера представляет несомненный интерес для историков книги и книжного дела, в особенности изучающих вопросы переплетного мастерства, а также всех интересующихся проблемами книговедения. Коллекция Бехера отражает 500-летнюю историю западноевропейского переплета — она содержит 400 художественных, издательских, библиофильских и владельческих переплетов XV—XIX вв., в которых отражены все стили и школы западноевропейского (и отчасти восточного) переплета. В коллекции представлены все прославленные западноевропейские мастера переплета.

Описания переплетов в каталоге расположены в порядке номеров собрания К. Бехера с сохранением его нумерации, наклеенной на форзацных листах. Приведены также и номера Немецкого музея книги и шрифта (Лейпциг) — DBSM 11/.., находящиеся в книгах. В Каталоге подробно описаны все 400 переплетов коллекции, указаны размеры переплетов, материалы, из которых они сделаны, характер тиснения или другого декора — вышивки, живописи и т.д. Также обозначен стиль, воспроизведены надписи на переплетах и владельческие записи на титульных листах. Особенно важно то, что записи эти сопровождаются переводом на русский язык. Указаны суперэкслибрисы и экслибрисы, дана расшифровка символических значений всех изображений и иконография сюжетов. Каталог снабжен указателями по материалам переплетов, стилям, по странам изготовления, по именам переплетчиков, хронологическим указателем и др.

Библиографическая часть Каталога представляет полное описание 550 западноевропейских рукописных и печатных книг XV—XIX вв., которые находятся в этих переплетах. Дано поэкземплярное описание всех книг с указанием особенностей каждого издания. Этот факт стоит отметить особо, так как обычно при описании переплетов книги, описание книг, заключенных в них, делается либо в краткой форме, либо просто дается упоминание издания. Состав книг собрания Бехера сам по себе столь интересен, что потребовал такого подробного описания. Особенно подробно автором описаны рукописные книги — определены школы иллюминирования этих рукописей и иконография миниатюр, раскрыта символика изображенных предметов. Описания снабжены аннотацией с переводом на русский язык имен авторов и заглавий, имен

издателей, что помогает читателям лучше представить состав книг, входящих в коллекцию Бехера.

Во вступительной статье приведена краткая история переплета — даны обозначения всех стилей, возникших в истории переплета, и отмечены их характерные особенности, объяснено, почему стиль получил свое название. Это очень важно, так как в России отсутствуют издания на русском языке, охватывающие всю историю западноевропейского переплета. Поэтому статья и сам свод каталога способны отчасти возместить этот пробел. Так как во всех книжных и музейных собраниях России существует в той или иной мере значительное количество западноевропейских переплетов, данный Каталог может помочь в работе по их описанию. Автор рассказывает об особенностях переплетов XV в., о появлении затем стилей «à la dentelle», отмечая лучшие образцы переплетов в этом стиле, принадлежащие французским переплетчикам Жану-Антуану и Николя-Дени Derôme с характерным для них «dentelle avec les oiseaux». Описаны французские переплеты стиля «à Du Seuil», который появился в конце XVII в. в работах Августена Du Seuil. Отмечен стиль «à l'eventeille». В Каталоге описано 17 очень редких вышитых переплетов XVI—XVII вв., среди них особо стоит отметить переплеты английской работы, изготовленные монахинями монастыря Little Gidding, на которых вышиты настоящие портретные изображения английских королей. Очень интересны переплеты с тисненными надписями и девизами. Особо стоит сказать о переплете с тисненной надписью переплетчика: «Nicolaus ab Ebeleben vivit post funera virtus» — «Николай из Эбелебена будет жить после смерти».

Каталог сделан с учетом западноевропейских публикаций последних лет, что очень важно, так как позволяет внести коррективы и дополнения в существующие представления об истории переплета. Как, например, очень важна впервые на русском языке появившаяся информация о переплетах стиля Гролье. До сих пор переплетчик, их сделавший, считался в России анонимом, а теперь в Каталоге указывается его имя — это Жан Пикар. То же можно сказать и о переплетах, сделанных в венецианской мастерской, где переплетались книги, издаваемые Альдом Мануцием. До этого в России бытовало мнение, что книги переплетались в типографии Альда.

Очень важно видеть эти переплеты — даже небольшая выставка, подготовленная и устроенная нами в РГБ в апреле 2007 г., где были представ-

лены только 49 переплетов, показала, что собранные вместе переплеты могут сказать о многом. Так небольшое (9 экз.) собрание восточных переплетов, при экспонировании их рядом с переплетами венецианской школы XVI в., делают очевидным то влияние, какое оказали восточные переплеты на Венецию, а затем и на другие школы европейского переплета. Экспонированные рядом переплеты Саксонской школы XVI в. — школы Якоба Краузе, придворного переплетчика курфюрста Августа Саксонского — отражают влияние венецианской школы переплета. Находящиеся на выставке два русских переплета демонстрировали их близость и к венецианской, и к саксонской школам. Таким образом, концепция выставки переплетов Карла Бехера продемонстрировала очень важный аспект коллекции — взаимодействие школ переплета разных стран, их взаимовлияние и особенности.

В конце 2008 — начале 2009 гг. выйдет из печати в издательстве «Пашков дом» наш «Каталог набивных тканей XIII—XIX вв. собрания Роберта Форрера», который является продолжением серии «Коллекции Российской Государственной библиотеки». Западноевропейские старопечатные книги, начиная с 1460 г., украшались иллюстрациями, сделанными в технике гравюры на дереве, — ксилографии. С тех же самых ксилографических досок делалась и печать на набивных тканях, но гравюра на ткани отличалась укрупненными формами и появилась она на несколько веков раньше, чем гравюра в книгах. Опыт, наработанный в ксилографии на тканях, оказал свое влияние на изобретение книгопечатания.

Собрание набивных тканей XIII—XIX вв. немецкого коллекционера и ученого Роберта Форрера до поступения в ГБЛ являлось с 1920-х годов частью действующей экспозиции Немецкого музея книги и шрифта. При этом коллекция не имела своего печатного каталога. Эта уникальная коллекция содержит 238 (174 паспарту) образцов набивных тканей и отражает все стили и школы в истории западноевропейских тканей с набойкой. Эти редчайшие экспонаты послужили Р. Форреру основой для создания нового направления в искусствознании — истории печати на ткани. Кроме описания образцов тканей с набойкой, в каталоге впервые дается описание иконографии сюжетов. Каталог содержит указатели: материалов, техники, терминов, хронологический и др. Описания снабжены аннотацией с переводом на русский язык имен граверов и художников. Каталог предваряет вступительная статья, состоящая из трех разделов: о составе собрания, о тканях прославлен-

ного французского производителя набивных тканей XVIII—начала XIX вв. — Кристофа Филиппа Оберкампфа и о мужских набивных носовых платках начала XIX в., выпускаемых антинаполеоновской коалицией и находящихся в собрании Форрера.

Коллекция Форрера представляет огромную источниковедческую ценность для искусствоведов, художников, книговедов. Каталог собрания будет иметь цветные иллюстрации.

Третий каталог — «Собрание инкунабулов и палеотипов Генриха Клемма» (авторы-составители: Н.П. Черкашина, Т.А. Долгодрова), также будет издан в издательстве «Пашков дом» в 2009 г. Каталог содержит описания части собрания немецкого библиофила Г. Клемма (1818—1886 гг.), входившего с 1886 г. в состав Немецкого музея книги и шрифта (Лейпциг). В нем даны библиографические описания 136 инкунабулов и 10 изданий XVI в., дополненные основными библиографическими источниками по инкунабулам, а также аннотациями с краткой характеристикой издания, экземпляра и переплета. Научный аппарат содержит алфавитный указатель авторов и заглавий, указатель заглавий, указатель имен комментаторов, переводчиков, редакторов, корректоров, авторов дополнительного материала, комментируемых авторов, хронологический указатель, конкорданции. Каталог иллюстрирован репродукциями гравюр из старопечатных книг.

Кроме собрания Лейпцигского музея, в Отделе редких книг РГБ есть и другие, не менее ценные «трофейные» коллекции. Прежде всего, это собрание переплетов XVI в. работы прославленного придворного мастера Саксонского курфюрста Августа — Якоба Краузе[3]. Он явился создателем уникального стиля, в котором сочетались традиции немецкого Ренессанса и венецианские влияния. В Париже в журнале «Bulletin de bibliophile» нами опубликована статья, где были указаны все издания и рукописи, заключенные в переплеты Краузе, а сами переплеты были сгруппированы по материалам и мастерам[4]. В настоящее время нами ведется работа над «Каталогом переплетов Якоба Краузе и мастеров его круга». Собрание Краузе в РГВ насчитавает 365 переплетов, которые хранятся как единая коллекция. К сожалению, реальное количество

3 Долгодрова, Т.А. О создании Каталога собрания переплетов Якоба Краузе и его круга // Международная научная конференция Румянцевские чтения 2005. М., 2005. С. 73—78.

4 Dolgodrova T., Aurich F. Les reliures de Jakob Krause / T. Dolgodrova, F. Aurich // Bulletin de bibliophile. Paris. 2006. № 1. P. 41—66.

поступивших в ГБЛ переплетов Краузе остается неизвестным, так как часть коллекции в 1946—1947 гг. оказалась распыленной в собрании книг XVI—XVII вв. Но сейчас с помощью хранителя Т.А. Чернобровой нам удалось обнаружить еще 290 переплетов круга Краузе. Это не конец работы, некоторое количество переплетов еще будет выявлено. Их описания будут добавлены в создаваемый Каталог. Новые находки — это своего рода сенсация, так как до сих пор из 900 исчезнувших из Дрезденской государственной библиотеки переплетов Краузе были известны только 365, хранящихся в РГБ. Теперь можно говорить, что из 900 переплетов более 600 сохранились.

Особое место в фондах РГБ занимают работы знаменитого семейства граверов XVII в. — Мериан. Самой знаменитой из них стала Мария Сибилла Мериан — художница, жившая на рубеже XVII—XVIII вв. Её имя хорошо известно как в истории искусств (она с большим успехом занималась воспроизведением насекомых и цветов в акварельных рисунках и гравюрах на меди), так в истории естествознания (как исследовательницы насекомых). Одна из первых женщин, дерзнувшая посвятить себя научной деятельности, первооткрывательница мира насекомых Южной Америки, Мериан часто упоминается как одна из первых феминисток. Её отец Маттеус Мериан был знаменитым швейцарским гравером, художником и книгоиздателем, унаследовавшим типографию издателей и граверов семьи де Бри. Кроме Марии Сибиллы, известность получили его сыновья Маттеус Мериан-младший и Каспар Мериан. Все издания Марии Сибиллы Мериан в РГБ, кроме одного («Чудесные превращения гусениц», 1717 г.), происходят из перемещенных культурных ценностей — из Саксонской государственной библиотеки (Дрезден). Издания ее отца и братьев также большей частью из трофейных собраний Берлина, Дрездена, Дассау и др.

Самым прославленным творением Марии Сибиллы стали «Метаморфозы суринамских насекомых». Это были огромные альбомы гравюр in-folio, раскрашенные акварелью, первый том которых был издан в Амстердаме в 1705 г. печатником И. Валком. В РГБ хранится экземпляр этого альбома с текстом на латинском языке, где гравюры, сделанные в технике офорта, бесценны — раскрашены акварелью самой М.С. Мериан. Художница изобразила прекрасные цветы, поедаемые червячками, очень натуралистично передавая все стадии жизни насекомых: от коконов и гусениц до роскошных бабочек. Сравнение насекомого, вылупля-

ющегося из куколки, с душой человека, которая воскресает для вечной жизни, было любимым символом в эпоху Мериан, поэтому нельзя забывать и о религиозно-мистическом подтексте ее работ. Мериан называют «дитя барокко», но ее работы отличаются от других художников-флористов, также творящих в эпоху барокко, как Марель, например, необыкновенным экспрессионизмом, который недостаточно объяснять только торжествующим тогда стилем барокко, в бурном движении передающим накал страстей. Напряженная экспрессия линий и форм в гравюрах Мериан — это какая-то ее личностная особенность.

В Отделе редких книг РГБ есть это второе издание «Метаморфоз суринамских насекомых», представляющее собой полную перепечатку издания 1705 г., к которому было добавлено 12 новых гравюр и новый титульный лист в начале книги. Сравнивая издания 1705 и 1719 гг., нужно отметить, что гравюры в экземпляре 1719 г. (в отличие от альбома 1705 г.) сделаны способом перевернутой печати, поэтому там отсутствуют подписи граверов (иначе они вышли бы в зеркальном виде). Из-за этого оттиски в нем более бледные, чем объясняется и разный колорит раскраски экземпляров.

Кроме Отдела редких книг, альбомы Мериан есть также в Отделе изоизданий РГБ. Это второй в РГБ экземпляр издания «Метаморфоз суринамских насекомых» 1705 г., на этот раз на голландском, а не на латинском языке. Главной его особенностью является то, что часть гравюр в этом издании заменена акварельными рисунками (всего их 39) — копиями гравюр Мериан. В Отделе ИЗО есть второе издание 1719 г., но этот экземпляр включает только 12 гравюр, которые были созданы Мериан для предполагавшегося второго тома суринамских несекомых. Гравюры эти сделаны способом «перевернутой печати». Раскраска же их великолепна и содержит в отличие от экземпляра 1719 г. из НИО редких книг, довольно обильное использование золота как в буквах титульного листа и начале текста, так и в гравюре фронтисписа. Также в отделе ИЗО есть конволют, содержащий более поздние издания Мериан в переводе на французский язык. Это «Насекомые Европы», не изданные при жизни Мериан, переведенные с голландского языка на французский Жаном Марре и изданные в Амстердаме печатником Бернаром в 1730 г. Книга эта содержит 184 гравюры Мериан. Это повтор всех 150 гравюр трех частей «Чудесных превращений гусениц». Остальные гравюры взяты, видимо, из «Книги цветов» или из разрозненных листов гравюр Мериан.

Все они остались без раскраски. Книга имеет переплет альбома «Превращений суринамских насекомых» 1726 г., изданного в Гааге Пьром Госсе с параллельным текстом на латинском и французском языках. Все 72 оставшихся нераскрашенными гравюр этого издания — повтор издания 1719 г.

Судьба большей и ценнейшей части наследия Марии Сибиллы Мериан — ее изданий, коллекций и акварелей, благодаря интересу Петра I «к художествам» и к естествознанию, оказалась связана с Россией, вернее с Санкт-Петербургом. Хочется пожелать, чтобы к 300-летию со дня смерти Марии Сибиллы Мериан, которое будет в январе 2017 г., был создан хотя бы виртуальный музей. Пора собрать в нем вместе и описать все хранящиеся в России оригинальные акварельные рисунки и альбомы гравюр Мериан, чтобы иметь полное представление о том, какими шедеврами мы обладаем. Достойное место в этой виртуальной галерее могли бы занять и все «трофейные» издания альбомов Мериан, хранящихся в РГБ. Они дают полное представление об ее творчестве и содержат все главные издания художницы. Также они демонстрируют разнообразие технических приемов Мериан при изготовлении гравюр и совершенство их раскраски в изданиях о суринамских насекомых, сделанное самой художницей. Там бы уместны были и издания остальных представителей семейства Мериан.

Валецкі Вацлаў

Польская нацыянальная бібліяграфія як інструмент сучасных даследаванняў у галіне літаратуры па вывучаемай праблематыцы

Цэнтр даследаванняў польскай бібліяграфіі Эстрайхераў Ягелонскага універсітэта, якім я кірую як навуковай адзінкай у структуры навучальнай установы, ставіць перад сабою некалькі даследчыцкіх задач, сярод якіх найбольш істотнае месца займае працяг публікацыі ўсіх серый Бібліяграфіі Эстрайхера, збіранне і папулярызацыя ў электроннай версіі атрыманай інфармацыі аб дапаўненнях і карэкціроўцы ўсёй *Польскай бібліяграфіі Эстрайхераў*, а таксама навуковае апрацаванне паводле эстрайхераўскіх стандартаў і публікацыя каталогаў бібліятэк, якія захоўваюць старыя польскія друкі (у тым ліку часта невядомыя Эстрайхеру), галоўным чынам на сённяшніх землях Украіны, Расіі і Беларусі, а таксама ў кніжных зборах недаступных публічна[1]. Але ж цяпер хацеў бы звярнуць увагу на нашу Электронную Базу Польскай Бібліяграфіі

1 Polskie książki i rękopisy w zbiorach Biblioteki Naukowej Państwowego Uniwersytetu im. M.W. Łomonosowa w Moskwie. Katalog = Польские редкие книги и рукописи в фондах Научной библиотеки МГУ им. М. В. Ломоносова. Каталог, opr. S. Siess-Krzyszkowski і И.Л. Великодная, Kraków-Москва, 2005 ; у Інтэрнэце даступны, напрыклад, каталог неіснуючай «старой» бібліятэкі ў Нясвіжы (сёння галоўным чынам у калекцыях у Пецярбургу, Маскве і Хельсінках, рыхтуем каталог бібліятэкі ў Красічыне, каталог бібліятэкі Музея кнігі ў Львове, каталог бібліятэкі езуіцкага калегіюма ў Львове і інш.) Параўнай: www.estreicher.pl

Эстрайхераў (Elektroniczna Baza Bibliografii Polskiej Estreicherów — EBBE), задачай якой з'яўляецца:

- бібліяграфічная і інфармацыйная апрацоўка, а далей — папулярызацыя ў Інтэрнэце электроннай версіі *Польскай бібліяграфіі* як электроннай кнігі (е-кнігі);
- навуковае пераўтварэнне ў базу дадзеных матэрыялу ўсіх тамоў бібліяграфіі Эстрайхера разам з дапаўненнямі.

Гэтыя два пункты навуковай дзейнасці Цэнтра даследаванняў польскай бібліяграфіі як пазнавальны выклік на парозе XXI стагоддзя будуць тэмаю дадзенага артыкула. У дадзены момант з'явіліся тэхнічныя магчымасці папулярызацыі эпахальнай працы Эстрайхераў у іншай версіі, якая адрозніваецца ад збору ў некалькі дзесяткаў тамоў (калі лічыць усе серыі і выданні — каля шасцідзесяці тамоў). Паасобныя часткі, якія з'явіліся ў выніку больш чым стогадовай працы, часам цяжка выкарыстоўваць у поўным аб'ёме, таму што трэба перагортваць (улічваючы магчымасць людской памылкі) шмат тамоў, якія па зразумелых прычынах не маглі ў час іх складання ахопліваць усяго камплекту матэрыялаў. Таксама даступнасць у Польшчы і за мяжою на кніжным рынку, а дакладней на букіністычным, *Польскай бібліяграфіі* з'яўляецца рэшткавай, а ў дачыненні да некаторых частак нават ніякай.

Магчымасць падачы ўсёй бібліяграфіі ў выглядзе электроннай кнігі ў Інтэрнэце адкрывае надзвычайнае поле для «прапаганды» польскай культуры, а таксама мае выключную навуковую карысць. Мы апрацавалі такую сістэму доступу да адсканаваных старонак друкаванай версіі ўсіх тамоў *Бібліяграфіі*, якая дае магчымасць спраўнага пошуку слова-запытання адначасова ва ўсіх тамах, дзе яно сустракаецца. З гэтага моманту практычна ўвесь свет мае доступ да скарбніцы польскай гуманітарнай навукі ў кожную хвіліну. Усё выглядае так, як бы мы выдалі *Польскую бібліяграфію* яшчэ раз у мільёнах экземпляраў, каб яна служыла навукоўцам з усіх галін гуманітарных навук ва ўсім свеце. Тут варта заўважыць, што гэтая асноўная для польскай культуры праца адсутнічае ў камплекце ў шматлікіх прэстыжных бібліятэках Еўропы і па-за яе межамі. Наш нядаўні досвед пераконвае, што яе няма ў звязаных з польскай культурай XIX стагоддзя венскіх бібліятэках, дзе, здавалася б, яна павінна быць. У сваю чаргу бібліятэкары ў Луцку на Украіне маюць толькі тамы, выдадзеныя перад 1908 годам, і на іх падставе апісваюць свае калекцыі палонікаў. Падобная сітуацыя ў бібліятэках Злучаных

Штатаў, для якіх культура Старога кантынэнта з'яўляецца падставай усялякай экзістэнцыі.

Апісаную тут электронную кнігу, створаную намі на падставе бібліяграфіі Эстрайхера, трактуем як даследчыцкі інструмент, патрэбны ўжо цяпер усім зацікаўленым. Галоўнаю нашаю мэтаю з'яўляецца размеркаванае на даўжэйшы час, апісанае ў пункце 2, стварэнне з матэрыялу эстрайхераўскай *Бібліяграфіі* не электроннай кнігі, але базы дадзеных. Базы, якая дазваляла б карыстацца багаццем назапашаных там крыніц, інфармацыі, недаступных з-за неэфектыўнага прагортвання тамоў або недасягальных, напрыклад, з прычыны звычайнай чалавечай памылкі праз няўвагу або з прычыны немагчымасці спалучэння дадзеных, камбінацыю якіх можа даць толькі каманда пошуку, зададзеная базе дадзеных.

База дае магчымасць адначасовай, хуткай і няцяжкай, а з пункту гледжання сумленнасці — надзейнай праверкі і пошуку як ва ўсёй бібліяграфіі, так і ў асобных яе частках з улікам самых вытанчаных даследчыцкіх патрэб. А гэта значыць не толькі просты пошук адначасова ва ўсіх серыях, што нас цікавяць, і дадатках прозвішча аўтара ці назвы працы, колькі б разоў ні былі яны пералічаны таксама па-за месцам, прадугледжаным для бібліяграфічнага слова-запытання, але таксама тэматычныя пошукі, якія тычацца якога-небудзь дадзенага працягу знакаў, дзе вышукоўваюцца, напрыклад, поўныя эстрайхераўскія бібліяграфічныя апісанні і каментары, а таксама, што вельмі істотна, падаецца інфармацыя пра бібліятэкі, якія маюць цяпер ці мелі калісьці асобныя, часам унікальныя на сённяшні дзень друкі. Гэта дазваляе таксама ў сваю чаргу выхопліваць самыя розныя залежнасці, утвараць тэматычныя і храналагічныя спісы, якія паслужаць далейшым інтэрпрэтацыйным даследаванням. Дарэчы, немагчыма і няма патрэбы пералічваць усе прымяненні і ўсе перавагі зразумелай такім чынам Электроннай Базы Бібліяграфіі Эстрайхераў, таму што гэта справа відавочная.

Яшчэ я хацеў бы звярнуць увагу на згаданую раней зусім не абы-якую справу, звязаную з нашай ініцыятывай.

Праект «Польская нацыянальная бібліяграфія ў версіі электроннай базы», гэта значыць абедзьве яго версіі: 1 і 2, з'яўляюцца падмуркам польскай гуманітарнай навукі, таму цяжка (побач з *Польскім біяграфічным слоўнікам*) знайсці ў гэтай сферы дзейнасці і ў гэтым навуковым абшары

пачынанне, больш вартае падтрымкі яго рэалізацыі як крыніцы ўсялякіх далейшых даследаванняў.

У нашыя перспектыўныя планы ўваходзіць спалучэнне электроннай версіі *Польскай бібліяграфіі* з электроннай версіяй *Польскага біяграфічнага слоўніка*, што створыць базу для далейшага пашырэння ўсёй біяграфічна-бібліяграфічнай сістэмы для польскай гуманітарнай навукі. Пры нагодзе прадбачыцца таксама змяшчэнне ў гэтай жа сістэме іншых баз бібліяграфічнага характару, якія будуць выкарыстоўваць структуру базы, створанай для гэтага праекта (напрыклад, згаданыя вышэй каталогі існуючых і не існуючых польскіх калекцый на Усходзе, галоўным чынам у Расіі — даўнія памесныя бібліятэкі, кнігі прывезеныя з польскіх зямель у якасці ваенных трафеяў пасля II сусветнай вайны, а таксама захопленыя раней, як хаця б нявернутая частка Бібліятэкі Залускіх ці бібліятэкі Жыгімонта Аўгуста).

*

У Цэнтры даследаванняў польскай бібліяграфіі мы падрыхтавалі і рупліва рэалізуем падрабязную праграму перапрацоўкі *Польскай бібліяграфіі* на электронную базу дадзеных. Трэба моцна падкрэсліць: на базу дадзеных, не на прадастаўленне ў Інтэрнэце «карцінак» адсканаваных старонак *Бібліяграфіі*, гэта мы ўжо выканалі і адносімся, як згадвалася, як да часовага сродку. Толькі магчымасць «абарочвання» дадзенымі, а гаворачы прафесійна — іх перапрацоўка мае сэнс, калі мы ўспрымаем гэтае заданне з пункту гледжання згаданай навуковай карысці, якую мае прынесці.

Нам удалося выпрацаваць своеасаблівую мадэль падзелу паасобных слоў-запытанняў *Бібліяграфіі* на такія, гаворачы моваю інфарматыкаў, палі, што ўсе тыпы эстрайхераўскіх слоў-запытанняў ёю прымаюцца, і такі далейшы падзел запытання на рэкорды ў рамках паасобных палёў, што ўведзеная рэкамендацыя пошуку без праблемаў знаходзіць патрэбную інфармацыю і сартуе яе паводле чаканага крытэрыя. Дадаткова поўнае слова-запытанне з *Бібліяграфіі* размяшчаем у чарговым рэкордзе, не разбітае на паасобныя элементы, але цалкам, каб, напрыклад, дазволіць карыстальніку яго капіраванне і «ўклейванне» ва ўласныя электронныя матэрыялы і нататкі.

У гэтым месцы трэба падкрэсліць, што мы прынялі рашэнне аб перанясенні ў нашу базу друкаванай постаці *Польскай бібліяграфіі* ў

такой форме, у якой яна існуе ў дадзены момант. Гэта значыць, што мы не выконваем у гэтай частцы базы ніякай карэкціроўкі, ані паправак працы нашых папярэднікаў, прызнаючы гэта немэтазгодным па розных прычынах: па-першае, не хочам ствараць «папраўленай» версіі, хаця б таму, што ў такім выпадку ўтварылася б гідра, якая не прынясе ніякай карысці (напрыклад таму, што да шматлікіх апісаных друкаў у дадзены момант няма доступу, бо яны не існуюць, таму складанне бібліяграфіі з правераных і неправераных артыкулаў не мае сэнсу); акрамя таго, гэта была б праца невыканальная ў бліжэй акрэсленым часе. Мы лічым таксама, што нас абавязвае асноўны наказ лаяльнасці адносна працы Эстрайхераў, гэта значыць захаванне яе манументальнага выдання ў навуковым выглядзе такой, якая яна ёсць — тым больш, што яе навуковыя якасці, як было згадана вышэй, доўга яшчэ не будуць выкарыстаныя да канца. А нават больш: захаванне яе выгляду з'яўляецца адначасова захаваннем (часам нават не ўяўляемым) яе якасцяў, якія некампетэнтныя асобы нават не заўважаюць. Так, інфармацыя пра лакалізацыю паасобных экзэмпляраў, якая некаторымі ўспрымаецца як неактуальная, з'яўляецца адной з найбольш каштоўных крыніц інфармацыі пра страты польскай культуры ў галіне старажытнага пісьменства. А такіх прыкладаў можна прыводзіць мноства і бясконца.

*

Даступная ў Інтэрнэце пад адрасам www.estreicher.pl е-кніга *Польская бібліяграфія* і база ў рабочай версіі, якая ствараецца на яе падставе, мае чатыры (заўсёды хачу тут дадаваць: пакуль чатыры — у сувязі з тым, што гаворым аб тым, што з'яўляецца ўвесь час *in statu nascendi*) асноўныя апоры: Базу старапольскай бібліяграфіі (Baza bibliografii staropolskiej), Базу бібліяграфіі XIX стагоддзя (Baza bibliografii XIX wieku), Базу храналагічнай бібліяграфіі (Baza bibliografii chronologicznej) і Базу дадатковых матэрыялаў да *Польскай бібліяграфіі* Эстрайхераў (Baza materiałów do uzupełnień *Bibliografii Polskiej* Estreichera).

Старапольская база ў канчатковай форме будзе змяшчаць увесь матэрыял трэцяй часткі, разам з друкаванымі ў паасобных тамах дадаткамі і з выдадзеным асобна і чарговым томам, які рыхтуецца цяпер аб'яднаных дадаткаў, гэта значыць будзе ахопліваць старапольскі матэрыял.

База храналагічнай бібліяграфіі, альбо другой часткі ўсёй эстрайхераўскай працы, ахоплівае матэрыял тамоў пад нумарамі (у паслядоўным укладзе) VIII, IX і XI/2.

База бібліяграфіі XIX стагоддзя будзе ў канчатковай форме змяшчаць увесь матэрыял першай часткі, як першага выдання, так і другога; з апошняга — папаўняемай сістэматычна па меры выхаду ў свет чарговых тамоў перавыдання «XIX стагоддзя»; апрача таго знойдуцца тут таксама асобна нумараваныя тамы I—IV, што ўваходзяць у склад першай часткі і якія змяшчаюць друкі з 1881—1900 гадоў разам з дадаткамі, а таксама — зразумела — тамы, нумараваныя як X і XI/1, што ўваходзяць у склад другой часткі, храналагічнай, якая стасуецца XIX стагоддзя.

База дадатковых матэрыялаў да *Польскай бібліяграфіі* Эстрайхера з'яўляецца месцам збірання ўсіх бібліяграфічных апісанняў даступных з прац накшталт «друкі, невядомыя Эстрайхеру», і іншых падобных. Мы лічым, што нашым абавязкам з'яўляецца папулярызацыя гэтых матэрыялаў, без кваліфікавання ў дадзены момант іх прыдатнасці да планаваных на будучыню дадатковых тамоў *Польскай бібліяграфіі*, выдадзеных ужо як самастойная праца Цэнтра даследаванняў поль-

скай бібліяграфіі, толькі ў пэўным сэнсе яны вырастаюць з *Польскай бібліяграфіі* Эстрайхераў.

База электроннай версіі *Польскай бібліяграфіі* Эстрайхераў ужо пашыраецца і далей будзе пашырацца за кошт розных самастойных бібліяграфічных спісаў, як, напрыклад, згаданыя дадаткі да працы Эстрайхераў, падрыхтаваныя намі каталогі недаступных (бо неіснуючых, або недаступных публічна) бібліятэк, тэматычныя бібліяграфіі (падыходзіць да завяршэння праца над бібліяграфіяй польскіх — ад найдаўнейшых часоў да сучасных — перакладаў усёй італьянскай літаратуры), альбо іншыя спісы, напрыклад, парэміялагічныя, якія абапіраюцца на старадрук працы Кнапскага, або база польскай пісьменнасці на даўніх паўднёва-ўсходніх крэсах Рэчы Паспалітай. Бо ўсе яны будуць выкарыстоўваць і спасылацца на тое самае ядро эстрайхераўскай базы, унікальна намі запланаванай і рэалізаванай пад нашым наглядам.

*

А цяпер паспрабуем паказаць на прыкладзе нашых інструментаў (якія ўвесь час з'яўляюцца *in statu nascendi*), якім чынам электронная версія бібліяграфіі Эстрайхера ў выглядзе е-кнігі і электроннай базы бібліяграфіі Эстрайхера, што ствараюцца ў нашым Цэнтры, могуць стаць пунктам выйсця да апрацавання запатрабаванай тут падчас пасяджэнняў шырока зразумелай бібліяграфіі Брэсцкіх друкаў і тых, якія стасуюцца Брэста. Невычарпальны матэрыял па гэтай тэме, што вельмі моцна трэба падкрэсліць, з'яўляецца адным з істотных элементаў польскай нацыянальнай бібліяграфіі.

Брэсцкія друкі ў частцы II (храналагічнай) Польскай бібліяграфіі

Akta zboru krześciańskiego. Brześć, Murmeliusz (bez podania roku i nie wykryte) (w cz. III pod hasłem Zacius Szymon).

Barlecyusz. Historya o dobyw. m. Szkondry, tłóm. Bazylika. Brześć, Bazyl., 1569.

Barlecyusz. Żywot J. Kastryoty, tłóm. Bazylik Cyp. Brześć, Bazylik, 1569.

Bazylik Cypr. Historya o przesl. K. bożego Hist. o postanow. kościołów nad któremi byl Jan Łaski (p. Utenchoviusa). Brześć, Bazylik, 1567.

Biblia Radziwiłłowska. Brześć lit. Wojewód. Obacz Testament, 1563.

Budny. O przedn. artyk. Wiary. Brześć litewski, 1570.
Bullinger Hen. O prawdz. Przyjmowaniu ciała. Brześć, S. Murmelius, 1559.
Droga krzyżowa. Brześć litewski, 1860.
Falconius Tomasz. Sprawy i słowa J. Chrystusa. Brześć, 1566 (w cz. III pod hasłem Biblia).
Falconius Tomasz. Wtóre księgi Łukasza św. Dzieje albo sprawy apostoła. Brześć, 1566 (w cz. III pod hasłem Biblia).
Hozeasz. Komentarz na proroctwo. Brześć, Radziw., 1559 (w cz. III pod hasłem Theodor Wit).
Hozeasz Prorok z wykładem Wita Teodora. Brześć (1559) (Tytuł tylko i dedyk. dodał do dawnej edycyi Wierzb[ięta]), 1567 (w cz. III pod hasłem Theodor Wit).
Lippoman Alojzy. Dwa listy na polski j. Brześć, Murmel., 1559 (w cz. III pod hasłem Vergerius Piotr Paweł).
P.F.S. Krótki zbiór z pisma św. Brześć litew., 1858.
Pauli G. O wyznaniu wiary ks. Sarnickiego. Brześć, 1564 (w cz. III pod Pauli Grzegorz).
Postępek prawa czartowskiego. Brześć, Cypr. Baz., 1570.
Proszowic (z) Szymon. Akta, t. j. Sprawy Zoboru wil. Od 1557. Brześć, Murmelius, 1559 (w cz. III pod Zacius Szymon z Proszowic).
Zacyusz Simon. O pościech. Brześć, Murmeliusz, 1559.
Zacyusz Simon. Confessio fidei eccl. vilnensis pro paedobaptismo. Brześć, 1559.
Zacynusz Simon. Wyznanie wiary Zboru wileńsk. Brześć. Ob. Proszowic, 1559.

Друкі, датаваныя ў Брэсце

Burzyński Stan. Dekret Aug. III. ex actoratu St. Burzyńskiego instygatora z XX. Soc. Jes. Coll. Wileńs. o XX. Schol. Piar. zawarcie Szkół. W Brześciu 23. Marc. 1738. i w Dreznie 23 Kwietnia 1737, wyd. 1738.
Burzyński Stan. Dekret Aug. III. Otwarcia w Wilnie contra institutiones in praejudicium Akad. Wilens. w Brześciu 28. Marca. (dwojakie), 1738.
Dekret J. Kr. M. W. X. Litews. Brześć litews., 1738 (w cz. III pod Burzyński Stanisław).
Niemcewicz Julian Ursyn. Bruchstück der Targowitz. Bibel. Brześć, 1793.
Potocki St. Uniwersał do województw, ziem i powiat. Brześć lit. 6 Września 1792 (w cz. III pod hasłem Potocki Szczęsny Stanisław).

Брэсцкія друкі ў частцы III (старапольскай) і ў частцы I (XIX ст. выданне 1 і выданне 2) Польскай бібліяграфіі

Barlecyusz. Historya o dobyw. m. Szkondry, tłóm. Bazylika. Brześć, Bazylik, 1569.
Barlecyusz. Żywot J. Kastryoty, tłóm. Bazylik Cyp. Brześć, Bazylik, 1569.

Мамонтов М. А.

Брест в периодической печати Санкт-Петербурга, 1992—1995 гг.

Более 10 лет назад Российская национальная библиотека начала издавать «Белорусский сборник», на страницах которого стали регулярно помещаться текущие аннотированные указатели публикаций в периодических и продолжающихся петербургских изданиях, посвященные Беларуси. Появление этих списков не было случайным. Нижний хронологический период учета в них совпал с распадом СССР и образованием самостоятельных государств России и Беларуси. Нам представлялось, что учет таких материалов важен и интересен для обеих стран. Для Беларуси — это часть ее национального репертуара, то, что написано о стране за рубежом, и то, что, несомненно, должно собираться в ее книгохранилищах. Для России — это материал для изучения жизни своего нового соседа и партнера.

К настоящему моменту опубликованы списки за 1992—1994 гг., подготовлены для печати и выйдут уже в этом году материалы за 1995 г. В дальнейшем учет, естественно, будет продолжен. Работа велась очень широко, расписывались все доступные нам газеты и журналы, выходящие в эти годы, плюс продолжающиеся сборники, альманахи и бюллетени, имеющие постоянную нумерацию. Большинство из них не зарегистрировано в государственных библиографических изданиях Российской книжной

палаты, что также повышает информационное значение наших указателей. Период для петербургской журналистики был более чем продуктивным, поэтому общее число расписанных изданий приближалось к 600: около 400 газет и 200 журналов и сборников на русском, английском и немецком языках.

В количественном отношении цифры следующие: всего за 1992—1995 гг. учтено около 2500 публикаций о Беларуси.

Собранный материал весьма разнообразен и в значительной степени непривычен для традиционного белорусоведения. В принципе, его можно разделить на четыре группы:

— произведения белорусистики как таковой, т.е. комплекса гуманитарных дисциплин, изучающих язык, фольклор, литературу, историю, духовную и материальную культуру белорусского народа (таких работ в нашей печати очень немного);

— исследования Беларуси безотносительно к ее национальной особенности и принадлежности, т.е. в сфере естественных наук, археологии, демографии и т.п. Сюда примыкают и предметы, представляющие собой нечто «протобелорусское» — истории земель современной Беларуси в средние века, литературы Западной Руси;

Што да крыніцазнаўчай базы па тэме даследавання, то выглядае яна даволі аб'ёмнай і патрабуе далейшага і больш глыбокага вывучэння, асабліва, што стасуецца архіўных матэрыялаў, у першую чаргу ў архівасховішчах Гродна, Вільнюса; мясцовых перыядычных выданняў і г. д. Пэўную інфармацыю, у тым ліку бібліяграфічную, пра брэсцкія кляштарныя кнігазборы аўгустынаў, базыльянаў, бернардынаў, езуітаў, трынітарыяў і інш., перамяшчэнне якіх прыпадае ў тым ліку на першую палову XIX ст., можна знайсці ў працах, напрыклад, М. Нікалаева[7], У. Пашкевіч[8], А. Пацявічуса[9]. Так, у прыватнасці, у Бібліятэцы Віленскага універсітэта захоўваюцца інвентары і каталогі бібліятэк брэсцкіх трынітарыяў 1816 г. (416 тамоў), акты візітацый брэсцкіх бернардынаў 1819 г. і інш.[10]

З даследчыцкага поля зроку не павінны выпадаць і апублікаваныя гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы, якія пачалі з'яўляцца ў друку ў XIX ст. на польскай і рускай мовах. Так, да прыкладу, «Акты, издаваемые Виленскою комиссией для разбора древних актов» (1872. Т. 6.)[11] паведамляюць, што ў першай палове XVII ст. прыватнымі кнігазборамі ў Брэсце валодалі ўжо нават мяшчане, як Гурын Федаровіч. Паводле яго духоўнага тэстаменту ў яго ўласным кнігазборы былі Евангелле напрастольнае, Актоіх, Псалтыр, Трэбнік Астрожскі, Евангелле вучыцельнае, Біблія, два Апосталы, Псалтыр — «друку Скорынина», Маргарыт, Пчала,

5 Библиотечное дело Белоруссии (XVI в. — 1917 г.) : библиогр. указ. / сост. Л.Н. Новицкая. — Мн., 1982.—194с.

6 Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия. Ч. 1 / сост. М. Василевская. — Мн., 1982. — 409 с.; Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия. Ч. 2 / сост. М. Василевская. — Мн., 1983. — 419 с.

7 Нікалаеў М. Палата кнігапісная. Рукапісная кніга на Беларусі ў X — XVIII ст.ст. — Мн., 1993. — 239 с.

8 Paszkiewicz U. Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej (spis za lata 1510 — 1939). — Warszawa, 1998. — S. 38—39; Paszkiewicz U. Inwentarze i katalogi bibliotek z ziem wschodnich Rzeczypospolitej do 1939 roku. Supl. 2. Poznań, 2006. S. 41—42.

9 Pacevičus A. Vienuolynų bibliotekos Lituvoje 1795—1864 m.: dingęs knygos pasaulis. — Vilnius, 2005.— 312 p. : il.

10 Pacevičus A. Vienuolynų bibliotekos Lituvoje 1795—1864 m. ... P. 134—153, 167.

11 Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссией для разбора древних актов. Т. 6. Вильна, 1872. С. 242—243. (Далей — АВАК, Т. 6.)

тры Малітоўнікі, Часоўнік, Трэбнік — усяго ў дакуменце адзначана 16 кірылічных кніг. Былі ў зборы кнігі і на польскай мове, хаця Гурын Федаровіч і яго жонка Саламея Гурынава былі, як відаць, праваслаўнага веравызнання, бо некаторыя з кніжных дароў завяшчаліся Рускаму шпіталю, цэрквам Перамянення Св. Спаса і Св. Пакрова ў Славацічах[12].

Некаторыя матэрыялы пра бібліятэку Брэсцкага езуіцкага калегіума, створанага яшчэ ў 1620-я гг., захоўваюцца і ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Мінску — гэта «Люстрацыя Брэсцкага езуіцкага калегіума за 1773—1774 гг.», у рэестры якой запісана 1725 кніг[13]. Каля 70% кніжнага фонду бібліятэкі езуіцкага калегіума складалі богаслужбовыя і рэлігійна-палемічныя творы, у тым ліку 11 Біблій. У бібліятэцы былі таксама кнігі па граматыцы, лінгвістыцы, гісторыі, матэматыцы, філасофіі, палітыцы, мастацкай літаратуры, медыцыне (у фондзе Аптэкі). Спіс быў складзены ў сістэматычным парадку з асобным вылучэннем колькасці кніг паводле фармату — «большага» (in folio) і «меншага». Аднак дадзены рэестр, на жаль, не ўтрымлівае апісанні саміх асобнікаў з кнігазбору. Вядома, што кнігі былі на лацінскай, нямецкай, французскай і, напэўна, на польскай мовах[14]. Нагляд за бібліятэкай ажыццяўляў ксёндз-езуіт Бухавецкі[15].

З 1795 г., пасля ўключэння Брэста-Літоўскага ў склад Расійскай імперыі, горад стаў павятовым месцам Слонімскай, затым Літоўскай, а з 1801 г. Гродзенскай губерняў[16]. Апошняя дата амаль супала з пачаткам рэформы сістэмы народнай адукацыі ў Расіі і ўвядзеннем у дзеянне царскіх загадаў 1801 і 1802 гг., якія дазвалялі «распечатывать» і адкрываць прыватныя друкарні[17].

Што да брэсцкіх выданняў XIX — пач. XX стст., то іх асноўная частка захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў С.-Пецярбургу (55 асобнікаў), Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы ў Маскве (35), Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (12), Бібліятэцы Віленскага універсітэта (6), Цэн-

12 АВАК, Т. 6. С. 242—243.
13 НГАБ. Ф. 1928. Воп. 1. Спр. 265.
14 НГАБ. Ф. 1761. Воп. 1. Спр. 16. Арк. 324.
15 НГАБ. Ф. 1928. Воп. 1. Спр. 265. Арк.17адв.
16 Науменко В.Я. Брест : историко-экономический очерк. 2-е изд., перераб. и доп. Мн., : Наука и техника, 1977. — С. 48.
17 *Умецкая Е.С.* Из истории распространения книги... С. 52.

тральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2), Бібліятэцы Варшаўскага універсітэта (1).

Першае вядомае на сёння брэсцкае выданне XIX ст. выйшла ў 1811 г. у друкарні Лейбы Шарашэўскага — гэта «Kronika zboru ewangelickiego» (аўтар — W. Węgiełski)[18]. У першай палове XIX ст. у друкарні Л. Шарашэўскага, якая найбольш вызначылася сваёй дзейнасцю ў горадзе ў параўнанні з іншымі, было надрукавана пяць выданняў: чатыры — на польскай мове, адно — на рускай. Выданні прысвячаліся ў асноўным навучанню, як «Elementarz polski, czyli nauka czytania polskiego…» (1860)[19] ці «Весна жизни. Новый русский букварь» (1862)[20]. Цікава, што абодва выданні былі складзены і выдадзены, як было зафіксавана ў назве, «сябрам дзяцей». Нават «Ołtarzyk mały…» (1860) таксама прызначаўся для навучання, але адпаведна богаслужэнню. Дарэчы, дадзенае выданне мела памер 8,5х12 см і змяшчала ілюстрацыі.

Імя Лейбы Шарашэўскага, кнігавыдаўца і кнігагандляра з Брэста, адзначана і сярод падпісчыкаў выдавецтва «Biblioteka Polska» Казіміра Юзафа Туркоўскага (1855—1863)[21]. Такім чынам Л. Шарашэўскі набываў польскія выданні для сваёй кніжнай лаўкі, якая існавала на Кобрынскім фарштаце ў Брэсце[22]. Паводле складзенага ў адпаведнасці з загадам «Об усилении надзора за продажей иностранной литературы» (25.01.1846—17.02.1847 гг.) «Каталога», у кнігарні Л. Шарашэўскага налічвалася 224 назвы кніг у асноўным на польскай і французскай мовах. Былі таксама слоўнікі і размоўнікі па рускай, нямецкай, лацінскай мовах. Большасць кніжных выданняў складала мастацкая (55 назваў) і гістарычная (53) літаратура , а таксама вучэбныя выданні па граматыцы, матэматыцы, геаграфіі, філалагічная літаратура (53). Усяго ў «Каталогу» вылучаны шэсць тэматычных раздзелаў, сярод якіх ёсць кнігі па гаспадарцы, лясніцтве, тэхналогіі (28 назваў), падарожжах, прыродазнаўстве, філасофіі, астраноміі (19), а таксама кнігі для дзяцей (16). Адзіным рэлігійным выданнем і апошнім у «Каталогу» запісаны «Złoty Ołtarzyk do Nabożeństwa»[23] [13, арк. 106 адв.]. На жаль, месца і год выдання ў пры-

18 Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия. Ч. 2. С. 359, № 1961.
19 Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия. Ч. 2. С. 32, № 141.
20 КБ. — С. 329, № 322.
21 *Kowkel L.* Prywatne książgozbiory na Grodzieńszczyznie... S. 25, 60.
22 НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 21. Спр. 120.
23 НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 21. Спр. 120. Арк. 106адв.

ведзеных апісаннях не падаецца. Выключэнне складае «Geografia powszechna. Anzarta» — Вільня, 1844[24]. Дзе-нідзе адзначаюцца яшчэ выданні з Парыжа, Вроцлава, Варшавы, Берліна (у асноўным французска-польскія слоўнікі)[25]. Як відаць з зафіксаванага асартыменту кніжнай прадукцыі, брэсцкія чытачы маглі набываць мастацкія творы В. Скота, В. Дзюканжа, Ю. Крашэўскага, Ф. Булгарына і інш.; гістарычныя — С. Бандке, Т. Нарбута, А. Ціера, М. Балінскага, Ю. Крашэўскага і інш. У сваю чаргу Лейба Шарашэўскі даў падпіску ў тым, што «в книжной лавке моей, находящейся здесь в г. Бресте на Кобринском форштате, ни под каким видом не буду продавать книги, кои не были ещё рассмотрены цензурою, а ещё более таких сочинений, кои подверглись запрещению»[26].

На Гродзеншчыне і Брэстчыне прозвішча яўрэйскіх купцоў Шарашэўскіх было шырока і добра вядомым: у 1862—1924 гг. у Гродна існавала знакамітая тытунёвая фабрыка І. Л. Шарашэўскага[27], які з'яўляўся таксама членам праўлення Таварыства дапамогі бедным яўрэям г. Гродна[28]; многія хто з Шарашэўскіх былі брэсцкімі ўрачамі і грамадскімі дзеячамі, як Лявон Самуйловіч — штатны ўрач Брэсцкага яўрэйскага пачатковага вучылішча і сябра Гарадскога санітарнага камітэта[29] ці А. С. Шарашэўскі — кандыдат у сябры Брэсцкага пажарнага таварыства[30].

Друкарня Лейбы Шарашэўскага працавала прыкладна ў 1811—1862 гг. (паводле кніжных выданняў друкарні), потым, у 1880—1888 гг., друкалітаграфіяй валодалі ўжо нашчадкі, якія выпусцілі яшчэ тры кніжныя выданні: адно на французскай і два на рускай мовах таксама вучэбнага характару. Апошнія вядомыя з адзначаных выданняў друкарні — гэта парады Я.У. Шышко па навучанні салдат [Дадат. № 7]. Дарэчы, Я.У. Шышко быў не толькі аўтарам, але таксама з'яўляўся і выдаўцом сваіх твораў, а яшчэ меў кніжны склад у Брэсце-Літоўскім[31].

24 НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 21. Спр. 120. Арк. 99.
25 НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 21. Спр. 120. Арк. 98—100.
26 НГАБ у Гродна. Ф. 1. Воп. 21. Спр. 120. Арк. 45.
27 Памятная книжка Гродненской губернии на 1907 год. Гродно : Губ. Тип., 1907. С. 78—232.
28 Памятная книжка Гродненской губернии на 1907 год. С. 78—79.
29 Памятная книжка Гродненской губернии на 1907 год. С. 196.
30 Памятная книжка Гродненской губернии на 1907 год. С. 232.
31 Каталог книгам и пособиям для войск, имеющихся в складе изданий Я. У. Шишко. г. Брест-Литовск. — Пинск, 1887. — 53 с.

У галіне кнігазбіральніцтва вызначыўся яшчэ адзін брэсцкі яўрэй — гэта Самуэль Хэфт (1806—1895?)[32], пра якога ў «Przewodniku Antykwarskim» (1911. № 2—3) напісаў Міхал Федароўскі. Самуэль Хэфт паходзіў з сям'і «od wieków w Brześciu Litewskim osiadłej i nie bylejakiej»[33]. Яго дзед Даніэль быў адным з дарадцаў і настаўнікаў князя Марціна Радзівіла, а бацька на гандлі лесам зарабіў вялікі капітал, пакінуўшы яго Самуэлю — 100 тыс. руб., тры мураваныя дамы. С. Хэфт з вялікай любоўю адносіўся да кніг, самавукам авалодаў пяццю мовамі. Усю сваю энергію ён накіраваў пасля смерці бацькі, калі можна было ўжо не хаваць свайго захаплення, на збор кніг. Па дварах, кляштарах і плябанях «nieraz całe biblioteki nabywał» і ў нястомнай кніжнай пагоні штогод наведваў Вільню, Варшаву, Жытомір або Кіеў, адкуль прывозіў свае кніжныя набыткі. Адным з шляхоў папаўнення кнігазбору быў абмен, як адзначае М. Федароўскі, напрыклад, з бібліяфілам з Украіны Канстанцінам Свідзінскім. Бібліятэка займала тры вялікія і светлыя пакоі, запоўненыя да столі кнігамі. У чацвёртым пакоі размяшчаліся замкнёныя на ключ шафы з асабліва каштоўнымі рарытэтамі. Пераважалі ў прыватнай калекцыі кнігі на польскай і лацінскай мовах, былі на французскай (прыродазнаўчай тэматыкі), рускай (палоніка), не было габраікі. Багата рэпрэзентаваны былі розныя навукі — філасофія, гісторыя, літаратура, краязнаўства, а таксама белетрыстыка. «Książki Heft kochał nie dla bibuly, ale dla ich trześci»[34]. Бібліятэка была каталагізавана яе ўладаром. У кнігах нікому не адмаўлялася, але асабліва каштоўныя С. Хэфт даваў толькі добра знаёмым. Як паведаміў М. Федароўскі, бібліятэка згарэла ў пажары 1894 г. (а ці не 1895 г.?), а праз год не стала і самога бібліяфіла.

Цесныя кнігагандлёвыя і кнігавыдавецкія сувязі існавалі паміж Брэст-Літоўскам і Вільняй. Арганізацыя першых кніжных лавак як у Брэсце, так і Гродне, Нясвіжы, Віцебску, Мінску і інш. належыць Юзафу Завадскаму, якому да 1810 г. удалося разгарнуць шырокую сетку падобных невялікіх складаў па розных гарадах Віленскай навучальнай акругі[35]. Вядома, што Ю. Завадскі ў такіх «пунктах кнігараспаўсюджання»

32 *Kowkel L.* Prywatne książgozbiory na Grodzieńszczyznie... S. 171.

33 Fedorowski M. Samuel Heft, bibliofil (obrazek z galeryi oryginałów litewsk.) // Przewodnik Antykwarski. 1911. № 2. S. 10.

34 Fedorowski M. Samuel Heft, bibliofil (obrazek z galeryi oryginałów litewsk.) // Przewodnik Antykwarski. 1911. № 3. S. 4.

35 Умецкая Е.С. Из истории распространения книги в Белоруссии... С. 55.

прымаў таксама і тэксты для друку ў Вільні. Сярод такіх выданняў — праграмная літаратура па прадметах для навучання ў павятовай Брэсцкай публічнай школе, складзеная брэсцкімі базыльянамі на 1807—1808 (1808) і 1818—1819 навуч. гады (1818)[36]. Выкарыстоўвалася берасцейцамі таксама кнігагандлёвая і паліграфічная база Варшавы, Гродна, Мінска і інш. Напрыклад, Брэсцкае Таварыства дабрачыннасці свае статуты друкавала ў Варшаве ў 1809, 1823, 1849 гг.[37]. У 1833 г. К. Нямцэвіч выдаў у Парыжы «Pamiętnik o powstaniu w Brzeście Litewskim w roku 1831»[38].

У павятовым жа Брэсце ў першай палове XIX ст., акрамя друкарні Л. Шарашэўскага, спрабавалі наладзіць тыпаграфскую справу Л. Гільберт (адно выданне 1843 г.) і І. Тамашэўскі (адно выданне 1858 г.). У губернскім цэнтры — Гродне — таксама ў гэты час вызначыліся сваёй дзейнасцю толькі тры друкарні.

Неспрыяльна на кніжнай справе адбіліся падзеі 1831 і 1863 гг. Як вядома, ужо пасля паўстання 1831 г. у Брэсце шматлікія з уніяцкіх і рымска-каталіцкіх кляштараў і касцёлаў, якія валодалі ўласнымі кнігазборамі, былі знішчаны або выкарыстоўваліся на іншыя патрэбы. Так, з манастыра бернардынаў і бернардынак зрабілі кадэцкі корпус, з манастыра аўгустынаў — камітэт для інжынераў крэпасці, з езуіцкага калегіума — дом каменданта, з манастыра базыльян — артылерыйскія казармы з царквой, уніяцкія цэрквы былі разбураныя пад крэпасць і г. д.[39]. Новы ўклад у кніжным жыцці горада асабліва адчуўся пасля 1863 г. Напачатку ў друкарскай справе назіралася зацяжное зацішша — да 1880 г. За гэты час не зафіксавана ніводнага брэсцкага выдання (?!). І толькі паступова ў 80—90-я гг. XIX ст. у Брэсце-Літоўскім пачынае наладжвацца тыпаграфская вытворчасць. У перыяд 1880—1904 гг. у горадзе працуюць наступныя прыватныя друкарні: нашчадкаў Шарашэўскага (1880—1888), І. Л. Ракава (1887 (?) — 1914), А. Разенталя (1892—1896), І. Кобрынца (1898—1914), Б. С. Лібермана (1901), М. Л. Глікмана (1902—1912), братоў Глікман (1904—1912), якія выпусцілі паводле звестак у каталогу «Кніга Беларусі, 1517—1917» 33 экз. выданняў (у 1811—1862 гг. — 7 экз.). У параўнанні з іншымі губернямі друкарская справа ў Гродзенскай губерні развівалася

36 Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия. Ч. 2. С. 38, № 173 ; С. 42, № 187.
37 Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия. Ч. 1. С. 308, № 1576.
38 Белоруссия в печати XIX — начала XX столетия. Ч. 1. С. 204, № 1051.
39 Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею. Т. 4. Акты Брестского гродского суда. Вильна: Тип. Губ. Правл., 1870. С. XLXVII—XLXVIII.

вельмі слаба. Лічаныя друкарні ў Гродне (С. Лапіна, Э. Мейлаховіча) і Брэсце (І. Ракава, І. Кобрынца) выпусцілі 10—15 выданняў[40].



К. Г. ШТЕЙНБЕРГЪ.

зала 18
шкафъ 295
полка 4
№ 269

ПОЖАРЪ

4 МАЯ 1895 ГОДА

въ Брестъ-Литовскѣ

Доходъ отъ продажи этой брошюры предназначается въ пользу погорѣльцевъ города Брестъ-Литовска.

Брестъ-Литовскъ.

ТИПО-ЛИТОГРАФІЯ А. РОЗЕНТАЛЯ

1895.

Паводле тэматыкі брэсцкіх выданняў вызначаецца літаратура па пытаннях адукацыі (10 назваў), ваеннай справе (8); па два выданні выйшла па медыцыне, сельскай гаспадарцы, мовазнаўстве, бібліяграфічнай і сацыяльна-эканамічнай тэматыцы; па адным — па рэлігіі, філасофіі, фізіцы. Чытацкае прызначэнне асноўнай групы друкаванай прадукцыі — гэта афіцыйныя (14 назваў), навукова-папулярныя (9), вучэбныя (3), даведачныя (3); па адным выданні прыпадае на рэлігійныя, навуковыя і папулярныя выданні. Мова большасці брэсцкіх кніг 1880—1904 гг. — руская. Толькі адно з выданняў нашчадкаў Шарашэўскага, як відаць, было на французскай мове [Дадат. № 6].

Аднымі з асноўных спажыўцоў кніжнай прадукцыі ў горадзе з'яўляліся навучальныя ўстановы. Найперш трэба ўспомніць пра Брэсцкую павятовую школу, якую ўтрымлівалі мясцовыя базыльяне (1797—1830), а пазней яна стала павятовай школай для шляхты (1830—1865), на аснове якой і была створана ў горадзе мужчынская прагімназія. Князь Адам Чартарыйскі, які наведаў школу ў 1817 і 1822 гг., адзначыў, што пры выкладанні геаграфіі найперш трэба знаёміць вучняў з уласным краем, а потым і з іншым светам, а пры выкладанні гісторыі асаблівую ўвагу звярнуць на польскую гісторыю. Значная ўвага надавалася ім і лацінскай мове. Прыкладна ў 1820-я гг. у бібліятэцы павятовай школы налічвалася

40 Бярозкіна Н.Ю. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі... С. 118.

200 тамоў кніг пераважна на лацінскай мове[41]. Пазней, асабліва пасля 1865 г., у Брэсцкай мужчынскай прагімназіі (з 1901 г. — гімназія) (1865—1915) вывучалі найперш рускую мову, а таксама французскую, нямецкую, лацінскую, гісторыю, геаграфію, прыродазнаўства, матэматыку, маляванне, музыку і спевы[42]. У 1904—1915 гг. у Брэсце дзейнічалі жаночая гімназія[43], чатырохкласнае гарадское вучылішча, казённае пачатковае яўрэйскае вучылішча і інш., якія забяспечваліся ў асноўным ужо рускамоўнымі выданнямі з С.-Пецярбурга, Масквы і Вільні.

Народныя вучылішчы атрымлівалі навучальную літаратуру бязвыплатна са склада Гродзенскай дырэкцыі народных вучылішч «в количестве возможном по средствам дирекции и далеко недостаточном для наличного числа учащихся»[44]. Пры народных вучылішчах існавалі бібліятэкі для чытання для пісьменных сялян. Так, у Брэсцкім павеце такіх бібліятэк было найбольш, чым у іншых паветах Гродзенскай губерні — 51 бібліятэка з фондам у 4885 тамоў, найбольшую кнігавыдачу якіх давалі навучэнцы (колькасць прачытаных імі кніг за 1901 г. — 3870)[45].

Для распаўсюджання рускай кнігі «в местном разноверном и разноплеменном населении» служылі і гандлёвыя склады (продажныя) пры народных вучылішчах (у сярэднім на кожны склад прыходзілася па 34 тамы кніг). Аднак вучылася ў Брэсце ў гэты час толькі 36% дзяцей школьнага ўзросту (апошняе месца па Гродзенскай губерні). Да прыкладу ў Кобрыне — 96%.

Паводле таго ж «Агляду Гродзенскай губерні» за 1901 г. у Брэсце-Літоўскім дзейнічалі дзве асобныя бібліятэкі, тры бібліятэкі пры кніжных магазінах. Усяго ж кнігарняў налічвалася 10, друкарняў, літаграфій — 9, што падымала горад на трэцяе месца ў Гродзенскай губерні па гэтых паказчыках (наперадзе былі Беласток і Гродна). Аднак, як відаць, не ўсе друкарні займаліся выданнем кніг, а найбольш — этыкетак, бланкаў, канцылярскай і іншай дробна-спажывецкай прадукцыі. Асноўнымі выданнямі, якія запаўнялі кнігарні, бібліятэкі і адпаведна навучальныя

41 Spis szkół w Grodzieńskiej gubernii na początku XIX wieku / Wołyniak. Poznań : Kuryer Poznański, 1885. S. 18—19.

42 Брэсцкая мужчынская гімназія // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мн., 1994. Т. 2. С. 97.

43 Обзор Гродненской губернии за 1901 год. Гродно: Губ. Тип., 1902. С. 82—83.

44 Обзор Гродненской губернии за 1901 год. Гродно: Губ. Тип., 1902. С. 98.

45 Обзор Гродненской губернии за 1901 год. Гродно: Губ. Тип., 1902. С. 102.

ўстановы, у гэты час былі, як сведчаць нават друкаваныя каталогі брэсцкіх бібліятэк, рускамоўныя кнігі з сталічных гарадоў Расійскай імперыі.

У канцы XIX—пач. XX стст. у Брэсце ўзнікаюць розныя грамадскія таварыствы, як Таварыства ўрачоў (1903—1915), якое засноўвае сваю бібліятэку (бібліятэкары — Б.Б. Хват, М.С. Крастоў)[46]. Паводле статута, Таварыства займалася таксама арганізацыяй публічных чытанняў, выданнем папулярных твораў па праблемах агульнай і асабістай гігіены. Невялічкая бібліятэка збіралася ў Брэсцкім гарадскім шляхетным таварыстве. У 1890 годзе ў ёй налічвалася 367 асобнікаў кніг і 18 назваў перыядычных выданняў за 1889 г., 7 ілюстраваных альбомаў[47]. Асобна вылучаны даведачныя выданні — правілы гульні ў віст і каляндар Гопэ на 1890 г. У фондзе пераважалі кнігі, якія выходзілі ў якасці дадаткаў да часопісаў «Вестник Европы», «Исторический Вестник», «Наблюдатель», «Пантеон Литературы», «Русская мысль», «Русское Богатство», «Северный Вестник», «Труд». Мела сваю бібліятэку таксама Брэсцкае пажарнае таварыства [Дадат. № 42]. У 1913 г. у брэсцкай друкарні І. Ракава быў надрукаваны «Каталог библиотеки Брестского Пожарного общества», складзены ў алфавіце аўтараў і назваў: кнігі і зборнікі — 1483 тамы, перыядычныя выданні — 1046 тамоў, усяго — 2529 тамоў. Большасць кніжнага фонду складала мастац-

46 Памятная книжка Гродненской губернии на 1907 год. Гродно : Губ. Тип., 1907. С. 231.

47 Первое прибавление к каталогу Брестского благородного собрания, напечатанному в 1889 году. — Варшава: Тип. Марии Земкевич, 1890. — 18 с.

кая літаратура. На жаль, апісанні пададзены без выхадных дадзеных. Сярод мясцовых выданняў адлюстраваны толькі «Памятные книжки Гродненской губернии» за 1902, 1907, 1909 і 1912 гг.

Ствараліся і дзейнічалі ў Брэсце вайсковыя бібліятэкі (бібліятэка 6-га пяхотнага Лібаўскага палка, 5-га Калужскага імператара Вільгельма I палка, 149-га пяхотнага Чарнаморскага палка), аб складзе фондаў якіх сведчаць іх друкаваныя каталогі [Дадат. № 40, 45, 75]. Так, праца па складанні «Систематического «Указателя» книг 6-го пехотного Либавского полка» (1902, друкарня Глікмана) [Дадат. № 45] у яго аўтара капітана (?) Кісялёва, які, відаць, і загадваў бібліятэкай, заняла чатыры гады. Бібліяграфічны дапаможнік быў адначасова і сродкам для праверкі фонда бібліятэкі, выконваў пошукавыя функцыі, быў крыніцай бібліяграфічнай інфармацыі і папулярызаваў бібліятэку. Матэрыял у паказальніку сістэматызаваны па 10 аддзелах, пачынаючы з багаслоўскіх і ваенных навук. Значную частку ў каталогу займала мастацкая літаратура — белетрыстыка — 1200 назваў, а таксама кнігі па вайсковай справе — 557. Усяго сістэматызавана 2381 назва выданняў, якія ўсе выключна на рускай мове. Прыводзяцца дапаможныя паказальнікі: алфавітны паказальнік аўтараў, алфавітны паказальнік да ваеннага аддзела, алфавітны спіс драматургаў. Разам з пэўнымі дадатнымі бакамі, трэба адзначыць, што, на жаль, апісанні кніг прыводзяцца без месца і года выдання.

Яшчэ адна крыніца інфармацыі пра вайсковую бібліятэку ў Брэсце — «Систематический каталог офицерской библиотеки 149-го пехотного Черноморского полка» (1911, друкарня І. Ракава) [Дадат. № 40]. Уключае 3862 назвы кніг, 50 назваў перыядычных выданняў. Размешчаны таксама ў сістэматычным парадку, па 16 аддзелах, пачынаючы з «нравственных наук», філасофскіх, дзяржаўных, ваенных і г.д. Асобна вылучаны руская і замежная мастацкая літаратура, дзіцячая літаратура, перыядычныя выданні. Складзены загадчыкам бібліятэкі паручнікам (?) Клюевым. У апісанні падаецца месца і год выдання, а таксама колькасць экзэмпляраў. Пераважаюць с.-пецярбургскія і маскоўскія выданні. Аднак, паводле каталога, можна зрабіць вывад, што геаграфія кніжных выданняў у бібліятэцы была даволі шырокай: Адэса, Арол, Арэнбург, Берлін, Варонеж, Варшава, Казань, Кіеў, Кутаісі, Лейпцыг, Мітава, Нарва, Ніжні Ноўгарад, Паўлаўск-на-Доне, Рыга, Сумы, Томск, Тыфліс, Харкаў, а таксама — унікальная рэч — Вільня (9 назваў); Гродна (3), Беласток (1). Як

А. ДРЕЙЦЕРЪ.

УЧЕБНИКЪ

ФИЗИКИ

ВЪ ОБЪЕМѢ КУРСА

СРЕДНИХЪ УЧЕБНЫХЪ ЗАВЕДЕНІЙ.

ВЫПУСКЪ I-й.

Брестъ-Литовскъ,
ТИПОГРАФІЯ БРАТЬЕВЪ „ГЛИКМАНЪ".
1910.

відаць з каталога, у бібліятэцы былі кнігі ў асноўным таксама на рускай мове, аднак можна заўважыць і выданні на французскай, нямецкай мовах, асабліва сярод перыёдыкі, якая мела ваенную тэматыку.

У 1902—1906 гг. у горадзе пачынаюць выдавецкую дзейнасць арганізаваныя палітычныя партыі: БУНД, Брэсцкая арганізацыя польскай сацыялістычнай партыі ў Літве, Брэсцкая арганізацыя РСДРП, якія практыкавалі захоп прыватных друкарняў і выдавалі такім чынам лістоўкі, адозвы, пракламацыі[48]. Па нашых падліках не менш 12 назваў такіх выданняў былі аддрукаваны на друкарскіх станках І. Кобрынца і І.Л. Ракава.

З 1905 і да пачатку Першай сусветнай вайны 1914—1915 гг. у Брэсце дзейнічала 6 друкарняў — І.Л. Ракава, І. Кобрынца, М.Л. Глікмана, братоў Глікман, А. Гендлера (1909—1912), О(?). Глікмана (1912—1913), якія выпусцілі 49 назваў выданняў, тэматыка якіх паводле колькасных паказчыкаў наступная: грамадска-палітычная (14 назваў); бібліяграфічна-бібліятэчная (7); ваенная, сацыяльна-эканамічная (па 5); мастацкая літаратура і фальклор (5); гісторыя, адукацыя, медыцына, мовазнаўства, сельская гаспадарка (па 2); рэлігія, арыфметыка, літаратуразнаўства і інш. (па 1). Па чытацкім прызначэнні вылучаюцца масава-палітычныя (14 назваў), афіцыйныя (8), даведачныя (7), вучэбныя (4); навукова-папулярныя, літаратурна-мастацкія, папулярныя (па 3); рэлігійныя і навуковыя (па 1). Што да мовы, то, адпаведна паводле выяўленых брэсцкіх выданняў 1905—1915 гг., — гэта руская мова. Аднак

48 Біч М.В. Брэсцкія выступленні працоўных 1905 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. Мн., 1994. Т. 2. С. 108—109.

у гэты час у Брэсце выходзіла літаратура і на ідыш, сведчаннем чаму з'яўляецца каталог кніг яўрэйскай бібліятэкі І. Рыбацкага на ідыш і на рускай мовах [Дадат. № 39].

Нягледзячы на нешматлікую колькасць брэсцкіх выданняў, трэба адзначыць іх агульную культуру выдання (афармленне і змест), якую, у прыватнасці, прэзентуюць такія даведачна-бібліяграфічныя выданні, як каталогі і паказальнікі бібліятэк. Хаця і не ўсе дадзеныя выданні ўдалося прагледзець (у асноўным з прычыны адсутнасці ў бібліятэках Беларусі), тым не менш, менавіта гэтыя выданні, а таксама, зразумела, і іншыя брэсцкія рарытэты XIX—пач. XX стст., з'яўляюцца важкай крыніцай інфармацыі і сведчаннем месца і ролі кнігі ў тагачасным грамадстве.

Аўтар артыкула выказвае вялікую падзяку Міколу Нікалаеву, супрацоўнікам Навуковай бібліятэкі Вільнюскага універсітэта за ўдакладненне звестак аб брэсцкіх выданнях, за атрыманне копій некаторых з іх, што захоўваюцца адпаведна ў РНБ у С.-Пецярбургу і Вільні. Асаблівая ўдзячнасць і спадарыні Ліліі Коўкель за адшуканую ёю і перададзеную інфармацыю з Гродзенскага гістарычнага архіва.

ДАДАТАК

Спіс брэсцкіх выданняў XIX—пач. XX стст.

(у храналогіі дзейнасці друкарняў і выхаду выданняў)

Друкарня Л. Шарашэўскага

1. Węgiełski, W. Kronika zbioru ewangelickiego. — Brześć Litewski, **1811**. — В. Ч. 2. С. 359. № 1961.
2. P. F. S. Krótki zbior ksiąg … starego i nowego testamentu … dla użytku młodzieży. — Brześć Litewski, **1858**. — 224 s. — В. Ч. 2. С. 359. № 1960.
3. Elementarz polski, czyli nauka czytania polskiego z małemi powiastkami I bajeczkami, ułożony przez przyjaciela dzieci. — Brześć Litewski, **1860**. — 39 s. — В. Ч. 2. С. 32. № 141.
4. Ołtarzyk mały, albo ćwiczenia się w nabożeństwie. — Brześć Litewski, **1860**. — 284 s. — В. Ч. 2. С. 359. № 1959.
5. Весна жизни. Новый русский букварь, изданный приятелем детей. — Брест-Литовск, **1862**. — 32 с. : ил. — КБ. С. 329. № 322. — РНБ.

Друкалітаграфія нашчадкаў Л. Шарашэўскага

6. Ганд, Вильгельм. Quadrille francuise et quadrille a ta cour (Les Lanaers). — Брест-Литовск, **1880**. — 9 с. — КБ. С. 333. № 413.
7. Шишко, Яков Устинович. Советы унтер-офицерам и готовящимся к этому званию в учебных командах. — 4-е изд., испр. и изм. — Брест-Литовск, **1888**. — 229, III с. : ил. — КБ. С. 565. № 3861—3862. — РНБ, РДБ.
8. Шишко, Яков Устинович. Советы учителям молодых солдат. — Брест-Литовск : [Я. У Шишко], **1888**. — 34 с. : ил. — КБ. С. 565. № 3863. — РНБ.

Друкалітаграфія А. Разенталя

9. Будущая война по Сарматикусу и Антисарматикусу. С карт. Европы между меридианами Москвы и Парижа в масштабе 50 в. в дюйме / сост. Казак. — Брест-Литовск, **1892**. — 130 с., 1 л. карт. — КБ. С. 324. № 243. — РНБ, РДБ.
10. Шуровский, Н. Практические книги сельскохозяйственной отчетности по двойному счету. — Брест-Литовск, **1892**. — 15 с., 3 вкл. л. табл. — Авт. указан в конце текста. — КБ. С. 373. № 3887. — РНБ, РДБ, НББ (Ба 110881бр).
11. Штейнберг, Ксаверий Германович. Пожар 4-го мая 1895 года в Брест-Литовске. — Брест-Литовск, **1895**. — [2], 22 с. — КБ. С. 566. № 3881. — РНБ.
12. Братское слово бывшим униатам Подляшья, по случаю коронования их императорских величеств государя императора Николая II и императрицы государыни Александры Федоровны, 14 мая 1896 г. / свящ. Н. И. Л. — Брест-Литовск, **1896**. — 48 с. — КБ. С. 408. № 1476. — НББ (Ба 48100).

Друкарня І. Кобрынца

13. Меркулов, Н.А. Суждение о бытии. — Брест-Литовск, **1898**. — 34 с. — КБ. С. 402. № 1400. — РНБ.
14. Глыбовский, Федор Григорьевич. Пережитое и перечувствованное в Пинском духовном училище Минской губернии (1865—1868 гг.). — Брест-Литовск, **1899**. — 40 с. — КБ. С. 336. № 450. — РНБ, РДБ.
15. Бутурлин, Сергей Александрович. Охотничье пульное оружие / изд. Н. Анофриева. — Брест-Литовск, **1902**. — 197 с. : ил., табл. — КБ. С. 324. № 248. — РНБ, РДБ, НББ (Ба112496).
16. Анофриев, Николай Юрьевич. Русская охотничья библиотека. Полный список книг и брошюр с кратким о каждой из них отзывами. — Брест-Литовск, **1905**. — 160 с. — КБ. С. 315. № 69. — РНБ, РДБ.
17. Зоненберг, Х. История города Брест-Литовска. 1016—1907. По достоверным источникам и правдоподобным умозаключениям / сост. Х. Зоненберг. — [Брест-Литовск], **1907**. — 104 с. — На обл.: 1908. — КБ. С. 372. № 875. — РНБ, РДБ, НББ (м/ф).
18. Фридман, Яков. Характеристика «героя» нашего времени Санина. (По роману Арцыбашева «Санин». — Брест-Литовск, **1908**. — 32 с. — КБ. С. 559. № 3755. — РНБ.
19. Ральбе, Самсон Давидович. Сборник арифметических задач, расположенных по типам. Вып. 1. Задачи и примеры на целые и именованные числа / Самсон Давидович Ральбе, Яков Львович Шескин ; изд. И. Кобринца. — Брест-Литовск, **1909**. — [4], 105, III с. — КБ. С. 500. № 2603. — РНБ, РДБ.
20. Журнал годичного общего собрания Брестского сельскохозяйственного общества 29 мая 1910 г. — Брест-Литовск, [**1910**]. — 43 с. — КБ. С. 358. № 747. — РНБ, РДБ, НББ (Ба3080).
21. Грулев, Михаил Владимирович. Злобы дня в жизни армии. — [Брест-Литовск], **1911**. — [8], 331 с. — КБ. С. 340. № 523. — РНБ, РДБ, НББ (В16932).
22. Журнал годичного общего собрания Брестского сельскохозяйственного общества 21 мая 1911 г. — Брест-Литовск, [**1911**]. — 78 с., 1 вкл. л. табл. — КБ. С. 358. № 747. — РНБ, РДБ, НББ (Ба3081).
23. Хмелевский, Я.М. Перед урной, или Размышления избирателя. — Брест-Литовск, **1911**. — 18 с. — КБ. С. 560. № 3778. — РНБ.
24. Авербух, З. Н. Преступное равнодушие. — [Брест-Литовск], **1912**. — 16 с. — КБ. С. 310. № 11. — РНБ, РДБ.
25. Хмелевский, Я.М. Календарь-справочник гор. Брест-Литовска на 1912 год. — Изд. 1 год. — Брест-Литовск, [**1912**]. — 106 с., 1 л. план. — КБ. С. 381. № 1012. — РНБ, РДБ, НБВУ, НББ (м/ф).
26. Хмелевский, Я.М. Календарь-справочник гор. Брест-Литовска на 1913 год. — Изд. 2 год. — Брест-Литовск, [**1913**]. — 136 с., 2 л. план. — КБ. С. 381. № 1012. — НБВУ.

27. Хмелевский, Я.М. Календарь-справочник гор. Брест-Литовска на 1914 год. — Изд. 3 год. — Брест-Литовск, [**1914**]. — 140 с., 1 л. план. — КБ. С. 381. № 1012. — НБВУ, НББ.

Друкалітаграфія І. Л. Ракава

28. Отчетодеятельности Правления Общества вспомоществования нуждающимся ученикам Брестской прогимназии за 1901 г. — Брест-Литовск, **1902**. — 11 с. — КБ. С. 433. № 1812. — НББ (Ба39897).
29. Памятка Таманцу «XXV» по случаю 25-летия сражения при Деве-Бойну 23-го октября 1877 года. — 23 октября 1902 года / сост. кап. Богуцкий. — Брест-Литовск, **1902**. — 38, [2] с. — Описано по обл. — КБ. С. 476. № 2249. — РДБ.
30. Штейнберг, Ксаверий Германович. Современное санитарное состояние города Брест-Литовска. — Брест-Литовск, **1902**. — 30 с. — КБ. С. 566. № 3882. — РНБ, РДБ.
31. Якубович, Иван Николаевич. 1. Причина всемирного тяготения. 2. Гипотеза о приближении Земли к Солнцу. — 2-е изд., испр. И доп. — Брест-Литовск, **1902**. — 16 с., 4 л. ил. — В первом изд. загл.: Причина тяготения. — КБ. С. 568. № 3924. — РДБ, РНБ.
32. Росселевич, Л. Русский в Германии и Австрии : подробный дорожный словарь / сост. Л. Росселевич. — Изд. Е. Н. Кобозев. — Брест-Литовск, **1904**. — 41 с. — КБ. С. 503. № 2659. — РНБ.
33. Гадалка. Описание святочных и др. гаданий. — Брест-Литовск, **1908.** — 8 с. — КБ. С. 333. № 404. — РНБ.
34. Каталог музея П. П. Эзерц. — Брест-Литовск, **1908**. — 32 с. : ил. — КБ. С. 386. № 1105. — НБВУ (R4-2/96).
35. Предсказатель. — Брест-Литовск, **1908**. — 18 с. — КБ. С. 490. № 2456.
36. Парабалов. Письма из Аркадии. — Брест-Литовск, **1909**. — 16 с. — КБ. С. 480. № 2262. — РНБ, РДБ.
37. Антонов. Стрелковые записи для баталионных, ротных, эскадронных, сотенных командиров, начальников учебных пулеметных команд гг. офицеров и юнкеров. С 300 решенными стрелковыми задачами на все табл., прил. к «Наставлению для обучения стрельбе из винтовок издания 1909 г.» / сост. руководителем штабс-капитанских стрелковых курсов подполк. Антоновым. — 1-е изд. — Брест-Литовск, **1911**. — [6], 77, [3], 21 с. ; 2 л. табл. — КБ. С. 315. № 71. — РНБ.
38. [Каталог]. — Брест-Литовск, **1911**. — [12] с. — (Брест. Евр. б-ка). На обл. загл.: Б-ка И. Рыбацкого в Брест-Литовске. — КБ. С. 383. № 1036. — РНБ, РДБ, ЦНБ НАНБ (Фр 98 — м/ф).
39. Систематический каталог офицерской библиотеки 149-го пехотного Черноморского полка. — Брест-Литовск, **1911**. — 336 с. — КБ. С. 514. № 2859. — РНБ, РДБ, НБВУ (В15).
40. Положение о школе офицерских детей 150-го пехотного Таманского полка. — Брест-Литовск, **1912**. — 14 с. — КБ. С. 484. № 2344.

41. Каталог книг библиотеки собрания Брестского Пожарного Общества. — Брест-Литовск, **1913**. — [279] с. — КБ. С. 385. № 1071. — РНБ, РДБ.
42. Зюзин, Н. И. Каталог цен на все русские монеты с древнейших времен до настоящих, с подробными историческими сведениями появления, развития, способов чеканки, различия и определения ценности и годности / сост. Н. И. Зюзин. — Брест-Литовск, [**1914**]. — 35 с. — КБ. С. 373. № 879. — РНБ.

[Друкарня] Б. С. Лібермана

43. Ватштейн, Я.М. Практическая русская грамматика, применяемая к потребностям инородческих школ, с приложением орфографических упражнений. — Брест-Литовск, **1901**. — [4], 110 с. — КБ. С. 326. № 290. — РДБ, РНБ.

Друкарня М. Л. Глікмана

44. Систематический «Указатель» библиотеки 6-го Пехотного Либавского полка. Сост. по 1901 г. включительно / [сост. кап. Киселев]. — Брест-Литовск, **1902**. — [574] с. ; разд. паг. — КБ. С. 514. № 2861. — РНБ, РДБ, ЦНБ НАНБ (Фр 36 — м/ф).
45. Харкевич, Филипп Казимирович. О памятниках на брестском Суворовском поле сражения. — Брест-Литовск, **1902**. — [2], 41 с. — КБ. С. 560. № 3771; ВР. 1998. Т. 4. S. 29. — РНБ, РДБ, БВУ
46. Иосем, Ф.Ш. Значение зубов и гигиена их / сост. Ф.Ш. Иосем, дантист при Брест-Литовской гимназии. — Брест-Литовск, **1903**. — 18 с. — КБ. С. 377—378. № 977. — РНБ, РДБ.
47. Симонов, Лев Васильевич. Один из потомков Нашебургского полка [3-й кавказский линейный батальон] / ген.-майор Л. Симонов. — Брест-Литовск, **1904**. — 79 с. — КБ. С. 513. № 2851. — РНБ, РДБ.
48. Хмелевский, Я.М. Партийность и депутатство. — Брест-Литовск, 1912. — 21 с. — КБ. С. 560. № 3777. — РНБ.

Друкарня братоў Глікман

49. Мышляев. Описание боевой жизни 152-го пехотного Владикавказского полка в минувшую войну 1877—1878 годов. — Брест-Литовск, [**1904**]. — 152 с. — КБ. С. 408. № 1471. — РНБ.
50. Ватштейн, Я.М. Упражнения в изложении мыслей, в связи с элементарными сведениями из синтаксиса. Внешнее построение речи. Т. 1. — Брест-Литовск, **1908**. — 95 с. — КБ. С. 326. № 291.
51. Правила и Программы приемных испытаний в низшие (пригот. [овительные] — V) классы Брестской мужской гимназии. — Брест-Литовск, **1908**. — 57с. — КБ. С. 488. № 2407. — РНБ, НББ (Ба115853).

52. Дрейцер, Александр Абрамович. Учебник физики в объеме курса средних учебных заведений. Вып. 1. — Брест-Литовск, **1910**. — 40 с. — КБ. С. 355. № 687. — РНБ, РДБ.
53. Тебиев, Иосиф Георгиевич. Подготовка молодых солдат к стрельбе. — Брест-Литовск, **1912**. — 36 с. — КБ. С. 531. № 3107. — РНБ, РДБ.

Друкарня О(?). Глікмана

54. Бакрадзе, В.И. Несчастная женщина : драма в 4-х д. и 8-ми карт. В.И. Бакарадзе. — Брест-Литовск : Изд. автора, **1912**. — 70 с. — КБ. С. 318. № 136. — РНБ, РДБ.
55. Ватштейн, Я.М. Упражнения в изложении мыслей. Внешнее построение речи : уч. пособие для нач. училищ. — 2-е изд. — Брест-Литовск, **1913**. — 95, 1 с. — КБ. С. 326. № 292.
56. Пачиковский, Константин Игнатьевич. Подробный алфавитный указатель болезней и телесных недостатков, освобождающих от военной службы и не препятствующих приему на нестроевые должности / сост. и. д. делопроизводителя Брест-Лит. уезда по воин. повинности присутствия К. И. Пачиковский. — Изд. неофиц. — [Брест-Литовск], **1913**. — 74 с. — КБ. С. 481. № 2265. — РНБ.

Друкарня А. Гендлера

57. С. Б. Как открыть в деревне бесплатную библиотеку-читальню / сост. С. Б. и Н. Р. [С. Е. Босяков, Н. Л. Романовский]. — Брест-Литовск, **1909**. — 15 с. — Перед загл. авт.: С. Б. — БД. С. 133. № 503 ; КБ. С. 323. № 216. — РНБ, РДБ, НББ (м/ф).
58. Копылов, Александр Гаврилович. 6-й пехотный Либавский принца Фридриха Леопольдовича прусский полк в Отечественную войну 1812 г. / сост. штабс-кап. Копылов. — Брест-Литовск, 1912. — 40 с. : 4 л. портр. — КБ. С. 390. № 1174. — РДБ.

Іншыя выданні

59. Богданов, Иоанн. Объяснение литургии. По программе, одобренной Священнейшим синодом и утв. Его имп. Высочеством 1848-го г. 10 сент. — Брест-Литовск, [**1848**]. — [2], 45 с. — Написано от руки. литогр. — КБ. С. 321. № 192.
60. Отчет о деятельности правления Общества вспомоществования нуждающимся ученикам Брестской прогимназии за 1900 г. — Брест-Литовск, типо-литография Х. Розенталь, **1901**. — 12 с. — КБ. С. 433. № 1812. — РНБ, РДБ.
61. Инструкция для действующих членов Брест-Литовского городского пожарного общества. — Брест-Литовск, **1898**. — 18 с. — КБ. С. 376. № 942. — РНБ.

62. Отчет собрания Брестского городского пожарного общества с 21-го ноября 1900 г. по 21-го ноября 1901 г. — Брест-Литовск, **1901**. — 10 с. — КБ. С. 434. № 1832. — РНБ.
63. Устав Общества вспомоществования нуждающимся ученикам Брестской прогимназии [Утв. 18 сент. 1881 г.]. — Брест-Литовск, **1901**. — 15 с. — КБ. С. 551. № 3526. — РНБ.
64. Отчет о деятельности правления Общества вспомоществования нуждающимся ученикам Брестской прогимназии за 1907 г. — Брест-Литовск, **1908**. — 11 с. — КБ. С. 433. № 1812. — РДБ.
65. Устав Пружанского общества взаимного кредита. — Брест-Литовск, **1908**. — 26 с. — КБ. С. 554. № 3634. — РНБ.
66. Треепольский, Антоний М. Поломническое путешествие православных учеников Брестской мужской наследника цесаревича Алексея Николаевича гимназии в Яблочинской Свято-Онуфриевский монастырь Холмской епархии 29—30 августа 1910 г. / сост. свящ. Треепольский. — Брест-Литовск, **1910**. — 17 с. — КБ. С. 533. № 3153. — РДБ.
67. Устав 2-го ссудо-сберегательного товарищества Брест-Литовска. — Брест-Литовск, **1910**. — 41 с. — КБ. С. 543. № 3306. — НБВУ (В59-6/231).
68. Каталог книгам библиотеки 5-го пехотного Калужского императора Вильгельма I-го полка. 1911 г. — Брест-Литовск, **1911**. — 184 с. — БД. С. 167. № 736.
69. Караффа-Корбут, Казимир Викентьевич. Краткое руководство практической дезинфекции в условиях военного времени. — Брест-Литовск ; Слоним ; Минск, [**1915**]. — 62 с. с черт. — КБ. С. 382. № 1020. — РНБ.

Скарачэнне назвы бібліятэкі	Поўная назва бібліятэкі
БВУ	Бібліятэка Варшаўскага універсітэта
НББ	Нацыянальная бібліятэка Беларусі
НБВУ	Навуковая бібліятэка Віленскага універсітэта
РДБ	Расійская дзяржаўная бібліятэка ў Маскве
РНБ	Расійская нацыянальная бібліятэка ў С.-Пецярбургу
ЦНБ НАНБ	Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Карев Д. В.

Библиотечные и рукописные собрания Западной Беларуси в конце XVIII — первой половине XIX веков (историографические и источниковедческие аспекты проблемы: собирание, изучение и введение в социокультурный контекст эпохи)

После вхождения в состав Российской империи западные земли Беларуси фактически до середины XIX в. не рассматривались ни царским правительством, ни дворянской российской историографией как отдельная исторически сложившаяся этническая единица. Их рассматривали как часть более широкого территориального комплекса, именовавшегося «губерниями от Польши возвращёнными», «Западным краем», «Западной Русью» и, наконец, «Литвой»[1].

Последняя четверть XVIII — нач. XIX вв. были для русского учёного мира периодом «первого знакомства» с Белоруссией. Поэтому, неслучайно, первые научные экспедиции русских исследователей в крае (И.И. Лепёхина в 1773 г., В.И. Севергина в 1802 г.) имели по преимуществу ознакомительный естественнонаучный характер. Между тем белорусские земли хранили в своих библиотеках, государственных и частных архивах и собраниях рукописей богатейшие исторические источники, позволявшие создать полнокровную синтетическую картину её бурной и драматической истории. Сознательным коллекционированием памят-

1 Улащик Н.Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода. М., 1973. С. 7.

ников материальной культуры и исторической документации в Белоруссии ещё со времён средневековья занимались представители знатнейших магнатских фамилий — Радзивиллы в Несвиже, ставшем уже в XVIII в. важнейшим хранилищем документов Великого княжества Литовского, Сапеги в Деречине, Хрептовичи в Щорсах, Тышкевичи в Логойске и др. У многих из них (как у Радзивиллов) были свои частные историографы[2].

Последовавшие за разделами политические репрессии не уничтожили духа реформ, свободомыслия в общественном сознании элиты Белоруссии и Литвы. Одна её часть, наиболее активная, отправилась добывать свободу погибшей Польше в «польские легионы» Домбровского, другая — большая, оставшаяся на родине, сделала ставку в возрождении государства, на Просвещение, сохранение языковых, бытовых и исторических традиций. Громадное значение истории как средства сохранения «социальной памяти» народа отчётливо осознавалось многими шляхетскими идеологами к XVIII — нач. XIX вв.

Поэтому разделы Речи Посполитой отразились на истории, пожалуй, более чем на какой-либо другой науке вследствие теснейшей её связи с политической жизнью края, а также её роли в формировании и утверждении национального самосознания. В этом плане падение Речи Посполитой в определённом смысле стало поворотным моментом в истории не только собственно польской историографии, но и польскоязычной, по преимуществу, белорусской историографии дореформенного периода. Это не только отразилось на направлении и формах её развития, но и в значительной мере обусловило то место, которое она занимала в общественной жизни края. По представлениям полонизированной белорусской шляхетской интеллигенции история должна была служить в борьбе за сохранение ее культуры, традиций и своеобразия[3]. В силу этого элита Белоруссии и Литвы (в лице различных её социальных групп — магнатов, шляхты, части мещанства) оказалась очень восприимчивой к исторической проблематике и историческим исследованиям. Сохранение остатков прошлого, их поиски, сбор, описание, публикация источников, понимаемые то как долг перед Отчизной, то как своего рода

2 *Каханоўскі,Г.А.* Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі ў XVI — XIX стст. Мн.: Навука і тэхніка, 1984. С. 17—22.

3 Materialy do dziejow literatury i oswiaty na Litwie i Rusi z archiwium drukarni i ksiegarni Jozefa Zawadskiego w Wilne z lat 1805 — 1865. Zebral T. Turkowski. Tt. 1 — 3. — Wilno. : Nakl. T-wa Przyjaciol Nauk w Wilne. 1935 -1937. — 424 s. + 316 s. + 324 s.

«мода» на старину, то как средство прославления собственного рода, в конечном итоге привели в первой трети XIX века к ситуации если не источниковедческого, то уж во всяком случае «источникового» бума. Спрос рождал предложение, а практика широко распространённого частного коллекционирования настоятельно требовала осмысленного, рационального, критического подхода к изучению и оценкам письменных свидетельств седого прошлого.

Наиболее мощным генератором и пропагандистом рационалистических, общественно-политических, философских, исторических идей эпох Просвещения и Романтизма Белоруссии и Литвы первой трети XIX века был, несомненно, Виленский университет. В изучении истории своего края учёные и воспитанники Виленского университета нередко выступали в роли первопроходцев на мало освоенной ещё тропе находок, открытий и изучения документальных сокровищ минувших столетий.

В руках университета находилось ещё одно очень важное средство пропаганды исторических и общественно-политических взглядов и идей — цензура всех книг, выходивших на территории 9 подведомственных губерний Украины, Белоруссии и Литвы, входивших в состав Виленского учебного округа. Он являлся основным поставщиком образованных кадров учителей для школ округа. Отсюда понятно то существенное воздействие, которое оказывал Виленский университет на характер и «температуру» общественного сознания «образованного меньшинства» края[4]. Направление и качество этих идей во многом определялось содержанием курсов, читаемых либерально и демократически настроенным профессорско-преподавательским корпусом вуза. В числе главных архитекторов исторического мышления интеллектуальных элит Белоруссии и Литвы той эпохи, несомненно, следует назвать И. Лелевеля, И. Даниловича, И. Ярошевича, И. Онацевича, И. Лобойко — наиболее авторитетных знатоков истории края и памятников его исторического прошлого.

«Охота» за историческими источниками, желание превратить Виленский университет в центр собирания ценнейших письменных раритетов по истории захватили даже ректора вуза — математика и естествоиспытателя Я. Снядецкого. Снядецкий деятельно собирал и стягивал в

4 Карев Д.В. Виленский университет — центр археографических исследований Литвы и Белоруссии первой трети XIX в. // Исследования по источниковедению истории СССР доокт. периода. М., 1988. С. 151—161.

библиотеку университета рукописи из собраний (»тек») М. Догеля, Альбертранди, копии документов из библиотеки гр. Залусских.

И.Н. Лобойко (1786—1861), профессор российской словесности Виленского университета, помимо своей преподавательской деятельности, энергично занимался палеографией, археологией, поиском памятников славянской письменности. Он сообщал гр. Н.П. Румянцеву о личности и творчестве историков Белоруссии и Литвы: И. Даниловича, И. Онацевича, М. Бобровского, Т. Нарбута, содержании архивохранилищ и наиболее интересных частных коллекций рукописей. Под руководством И.Н. Лобойко студенты университета составили большое описание 80 местечек и городов Западной Белоруссии и Литвы, он был одним из ревностных поборников организации археографических экспедиций на территории края[5].

И.Н. Данилович (1787—1843) — сын белорусского униатского священника, студент, а затем и профессор права Виленского университета, получил солидную подготовку в области истории законодательства в Варшаве и Петербурге. Первый исследователь белорусско-литовского летописания, он был энергичным и удачливым археографом, одним из основателей источниковедения Белоруссии. Во время своих археографических разысканий в архивах Западной Белоруссии, Варшавы, Петербурга и Москвы он активно собирал материалы по истории «древней Литвы». Виленские студенты привозили своему профессору целые груды пергаментных рукописей, преимущественно из униатских церквей и монастырей. Ещё в студенческие годы Данилович, изучавший право, серьёзно интересовался вопросами изучения письменных памятников старины. В то же время в Вильно образовался кружок молодёжи (из сыновей униатских священников), хорошо знавшей церковнославянский и белорусский языки (М. Бобровский, А. Мартиновский, И. Онацевич, П. Сосновский и др.), в которых Данилович разбудил охоту к поискам древних старославянских книг и рукописей. А когда при университете была создана Главная Духовная семинария (1816), которая дала краю несколько хорошо подготовленных (и в научном отношении) молодых униатских священников, поиск славянских рукописей распространился на обширные территории Литвы и западной Белоруссии, начал приобретать характер систематических археографических экспедиций. По-видимому, здесь надо

5 Русский биографический словарь. О. СПб., 1905. С. 367.

искать источники тех богатых собраний, которыми располагал И. Данилович к началу 40-х годов XIX в. Активно помогали ему в этих поисках как польские и белорусские (И. Лелевель, М. Бобровский, Г. Бандтке), так и русские ученые и собиратели старины (гр. Н.П. Румянцев, В.Г. Анастасевич). Огромные собрания рукописей, приобретённые учёным в период его работы в университете (до 1824 г.), он умело классифицировал и критически разбирал. В библиотеке гр. Н.П. Румянцева он нашёл Судебник Казимира IV, а в Супрасльском монастыре ему посчастливилось обнаружить замечательный памятник белорусско-литовского летописания — так называемую Супрасльскую летопись. В 1840 г. он сообщил из Москвы известному виленскому издателю И. Завадскому, что готовит из материалов своих находок большой документальный сборник (около 2 500 источников) под названием «Сбор дипломатов по истории Литвы». Однако болезнь и смерть учёного помешали закончить задуманное и практически уже завершённое дело. Рукописи учёного были приобретены в 50-е годы XIX века Виленским Музеем Древности и при деятельном участии его сотрудников под названием «Скарбец дипломатов...» были изданы в 1860 и 1862 гг.[6]

Большое значение для развития исторической науки в Белоруссии и Литве 20-х—нач. 30-х годов XIX в. имела деятельность адъюнкта, а затем профессора статистики Виленского университета И.Ж. Онацевича (1780—1845). Сын униатского священника из Гродненской губернии, воспитанник, а затем и преподаватель университета И. Онацевич был известен современникам прежде всего как выдающийся археограф, источниковед и архивист, который одним из первых занялся описанием интересовавшего его края в историко-топографическом отношении. Практически каждое лето он совершал специальные археографические поездки по белорусским и литовским губерниям края, осматривая все встречающиеся ему государственные и частные архивы и библиотеки. Количество документов, собранных Онацевичем, было громадным. К сожалению, уникальные рукописи и редкие книги, собранные историком, перешедшие после его смерти коллекционеру К. Свидзинскому, впоследствии оказались «распыленными» во времени и пространстве[7].

---

Дакладны аналіз карэспандэнцыі дае магчымасць выявіць толькі некалькі дзесяткаў кніг, якія трапілі ў хатнюю бібліятэку Юндзілаў у Грудаполі ў 40-я гады XIX ст. з віленскай кнігарні Завадзкіх. У сувязі з тым, што не ўдалося адшукаць аніводнага каталога кнігазбораў сям'і Юндзілаў з маёнткаў Слонімскага павета, адзінай іх характарыстыкай могуць паслужыць сціплыя і надзвычай павярхоўныя апісанні кшталту: «польска-французская бібліятэка» ці «бібліятэка, багатая на рэдкія польскія друкі», якія змяшчаюць працы Хвалевіка ці Радзішэўскага[14].

У Літоўскім гістарычным архіве ў Вільні захавалася таксама шмат лістоў Уладзіслава Трэмбіцкага з Лінова з 1839—1844 гадоў да Завадзкіх[15]. Карыстаючыся дасланымі каталогамі, вядомы бібліяфіл і бібліёграф рэгулярна замаўляў у Вільні патрэбныя кнігі, выпісваў часопісы. Часта ў лістах Трэмбіцкага сустракаюцца запыты адносна чарговых частак бібліяграфіі Йохера, якая толькі пачала выходзіць з друку ў 1840 годзе. Зразумела, што перад усім Трэмбіцкага цікавілі працы па гісторыі літаратуры, якія збіраў у Лінове. На іх падставе ён пісаў крытычныя

11 Lietuvos valstybės istorijos archive (Дзяржаўны Гістарычны Архіў Літвы) [далей LVIA], F. 1135 ap. 7 b. 417 l. 117—131, 153—161v., 195—196v., 198—210; f. 1135 ap. 7 b. 415 l. 209—216.

12 Тамсама. F. 1135 ap. 7 b. 418 l. 41—53

13 Тамсама. F. 1135 ap. 7 b. 417 l. 196.

14 Chwalewik E. Zbiory polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerie, muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w ojczyźnie i na obczyźnie w zestawieniu alfabetycznym według miejscowości ułożone. T. 1. Warszawa, 1926. S. 125. T. 2. Warszawa, 1927. S. 152 ; Radziszewski F. Wiadomość historyczno-statystyczna o znakomitszych bibliotekach i archiwach publicznych i prywatnych. Kraków, 1875. S. 21.

15 LVIA, f. 1135 ap. 7 b. 463 l. 80—114v.

артыкулы з дапаўненнямі працы Йохера ў часопіс «Biblioteka Warszawska». Свой уласны кнігазбор у адным з лістоў Уладзіслаў Трэмбіцкі характарызуе наступным чынам: «Я валодаю цудоўнаю і багатаю на старыя друкі бібліятэкаю»[16]. На жаль, пакуль што няма магчымасці правесці колькасны аналіз гэтай калекцыі з прычыны адсутнасці адпаведных крыніц.

Дакладны колькасна-тэматычны аналіз прыватных кнігазбораў Берасцейшчыны ў XIX стагоддзі можна правесці толькі на падставе аналізу захаваных фрагментаў калекцый або адшуканых інвентароў тагачасных бібліятэк. Супастаўленне зместу інвентароў з актуальным станам паасобных збораў схіляе да думкі аб тым, што дагэтуль аніводнай суцэльнай калекцыі кніг не збераглося. У гэтым сэнсе яскравым прыкладам з'яўляецца кнігазбор Пуслоўскіх-Красінскіх, вывучаны на падставе ўладальніцкіх знакаў (захоўваецца ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі). Варта заўважыць, што і ён заслугоўвае далейшага, больш грунтоўнага аналізу.

Згаданая калекцыя складаецца з дзвюх частак. Першая гэта кнігі Вандаліна Пуслоўскага, якія першапачаткова збіраліся ў Косаўскім палацы (хаця на кнігах захаваліся запісы пра «бібліятэку ў Мерачоўшчыне»). Бацькоўскую калекцыю ў спадчыну атрымала дачка Марта Красінская, якая, як можна меркаваць, перавезла яе ў Свіслач, з часам папаўняючы новымі набыткамі. Пазней гэтыя каштоўныя зборы трапілі ў Гародню.

Аналагічная праблема стасуецца інвентароў кнігазбораў і падрабязных апісанняў бібліятэк. Выяўленыя на сённяшні дзень архіўныя інвентары пераважна былі складзены чыноўнікамі падчас канфіскацыі маёнткаў мясцовай шляхты пасля паўстанняў 1831 і 1863 гадоў, і з гэтай прычыны не вызначаюцца дасканаласцю. Акрамя таго, звесткі пра колькасны склад збораў, якія сустракаюцца ва ўспамінах ці падобных крыніцах, звычайна перабольшаныя і не заўсёды адпавядаюць рэчаіснасці. Таксама ліставанне ці дзённікі даволі рэдка змяшчаюць дакладныя апісанні бібліятэк, а тым больш колькасныя паказчыкі.

Найбольшыя прыватныя кнігазборы Берасцейшчыны ў XIX стагоддзі складаліся з некалькіх тысяч тамоў. Да такіх, бясспрэчна, належала калекцыя Вандаліна Пуслоўскага, якая налічвала па меншай меры 8 тысяч

16 Тамсама, f. 1135 ар. 7 b. 463 l. 85. Ліст Уладзіслава Трэмбіцкага да Завадзкага, 14 ліпеня 1843 г. Лінова.

тамоў[17]. Акрамя згаданага збору, архіўныя пошукі дазволілі высветліць колькасную характарыстыку наступных бібліятэк:

— калекцыя Францішка Сапегі ў Ружанах паводле каталога з 1797 года налічвала 2221 том[18];

— спіс канфіскаванай пасля 1863 г. бібліятэкі Валенты Швыкоўскага ў Пружанах складаўся з 1407 тамоў[19];

— захаваныя рэестры кнігазбору Караля Нямцэвіча, канфіскаванага ў маёнтку Скокі пасля паўстання 1831 года, паказваюць на тое, што ён валодаў бібліятэкай, у якой чыноўнікі налічылі 481 том[20].

Абапіраючыся на вынікі аналагічных даследаванняў, прысвечаных Гарадзеншчыне, можна дапусціць, што і на Берасцейшчыне стандартная ўзорная шляхецкая бібліятэка налічвала ў тыя часы некалькі сот тамоў, у якіх пераважала кніга на польскай і французскай мовах, а таксама карысталася попытам нямецкая і лацінская. Такімі калекцыямі валодалі асобы адукаваныя, якія мэтанакіравана фарміравалі хатнія бібліятэкі, пра што сведчаць звесткі, якія паходзяць з розных крыніц. Тым часам не выклікае сумнення той факт, што большасць шляхецкіх збораў характарызавалася малалікасцю і складалася з некалькіх асобнікаў ці ў лепшым выпадку некалькіх дзесяткаў кніг, якія не належалі да літаратуры высокага ўзроўню. Найлепшым сведчаннем гэтай думкі з'яўляюцца выказванні сучаснікаў. Так, напрыклад, Браніслаў Ортык у апісанні шляхты Лідскага павета ў 70-я гады XIX стагоддзя занатаваў: «У доме тыповага шляхціча на стале бывае калода зашмальцаваных карт да гульні ў кікса ці мар'яш, шэраг кніжачак для набажэнства: кантычкі, жыцці свя-

17 Гл. артыкул Алесі Саўчук.

18 Бібліятэка Віленскага Універсітэта, Аддзел Рукапісаў, F 3-221 — Catalogue des livres de la bibliothèque de Rozana 1797 [Franciszka Sapiehy] [2221 том].

19 Нацыянальны Гістарычны Архіў Беларусі ў Гродне [далей НГАБ у Гродне], Ф. 31. Воп. 1. Спр. 47: О передаче конфискованного им. Пружаны Пружанкого уезда помещика Швыковского участника восстания 1863 года в казенное ведомство, 1863—71. Арк. 105-106: Опись с оценкою книгам... 20.12.1863 [1407 тамоў], арк. 182—185: Аукционный лист на продажу движимого имущества... [книги].

20 LVIA, f. 567 ap. 2 b. 3932 l. 73, 74, 78v-79, 87-87v — Книги Карла Немцевича, им. Скоки, 1836. Российский Государственный Исторический Архив [далей РГИА], ф. 384 оп. 15 д. 460 л. 46—53v. — Реестр разным книгам..., найденным в домашней библиотеке при принятии имения Скоки в ведение Казенной палаты, 1833 [420 томов.] ; ф. 384 оп. 15 д. 1286 — О библиотеке мятежника Карла Немцевича 1838-1842, л. 21-28 — [реестр книг, 191 кн. в 481 т.].

тых, і рэдка калі якая свецкая кніжыца, хіба што старая хроніка, *Марфей тлумачальнік сноў* ці *Гісторыя аб Мелузіне*»[21].

Філамат Ануфры Петрашкевіч у лісце да Іаахіма Лялевеля ў 1830 годзе пісаў: «...рэдка які дом што Фенікс, дзе прыемнай забавы шукаюць у чытанні, бо карты з поўначы прыбыўшы апанавалі шляхецкія дамы і ўвесь знак жыцця, што картамі кідаюцца» [22].

А ўпамянуты вышэй Уладзіслаў Трэмбіцкі пра чытацкія густы сваіх суседзяў з Пружанскага павета выказаўся наступным чынам: «Я пісаў у ваколіцы, якая не абдзелена разумнымі людзьмі [...], бо на некалькі міль навакол у самых бібліятэках прыватных дамоў можна без цяжкасці налічыць больш за дзесятак тысяч тамоў, якія аднак амаль поўнасцю складаюцца з новых ці замежных прац. [...] Сёння хатнія кнігазборы папаўняюцца пераважна ілюстраванымі выданнямі або раманамі новай школы ці каментарамі на адну з дзесяці запаведзяў — усё ж такі шчыра скажу, што такія працы, як *Вобраз* Йохера ці *Гісторыю літаратуры* сустрэць цяжка»[23].

Аналіз зместу кнігазбораў выяўляе залежнасць паміж атрыманай адукацыяй і асабістымі зацікаўленнямі ўладальніка-гаспадара. На змест збораў аказваў таксама ўплыў склад сям'і. Жанчыны-шляхцянкі ахвотна бавілі вольны час чытаннем, сачылі за моднымі літаратурнымі напрамкамі, таму пераважна яны заказвалі найноўшыя французскія раманы[24]. Можна меркаваць, што наяўнасць значнай колькасці падручнікаў сведчыць пра адукацыйныя патрэбы сям'і. Тагачаснай бібліятэкі не можна сабе ўявіць без гаспадарскіх календароў, слоўнікаў, апісанняў падарожжаў, гравюр і карт. Адпаведна з пануючай модай найбольш актыўна назапашваліся «помнікі даўніны», г.зн. калекцыі даволі шырокага профілю, якія былі прысвечаны мінуламу Вялікага княства Літоўскага.

---

21 Ortyk B. Szlachta okoliczna lidzka // Tygodnik Ilustrowany. 1876. Nr 7. S. 109 [пераклад Л.К.].

22 Archiwum Filomatów. Listy z zeslania. Oprac. Z. Sudolski. T. 1. Warszawa, 1997. S. 110. Ліст А. Петрашкевіча да І. Лялевеля, 24.07.1830 Заполе [пераклад Л.К.].

23 Trębicki W. Uwagi nad pierwszym poszytem tomu drugiego dzieła p. Jochera pod tytułem «Obraz bibliograficzny» // Biblioteka Warszawska. 1841. t. 3. S. 576 [пераклад Л.К.].

24 Kowkiel L. Czytelnictwo kobiet na prowincji litewsko-bialoruskiej w zaborze rosyjskim. // Wspólnota pamięci. Studia z dziejów kultury ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej. Red. J. Gwiożdzik, J. Malicki. Katowice, Biblioteka Śląska. 2006. S. 133—144.

У прыватных кнігазборах сярод старых друкаў можна было сустрэць працы, прысвечаныя заканадаўству літоўска-беларускіх зямель. Даволі часта сустракаўся *Статут Вялікага княства Літоўскага*. У хатніх калекцыях Берасцейшчыны захоўваліся розныя выданні *Статута*, напрыклад, у Вандаліна Пуслоўскага друк з 1619 года[25], у Нямцэвіча ў Скоках выданне 1744 года[26].

Падчас паўстанняў узрастала зацікаўленасць гістарычнай і патрыятычнай літаратурай і паэзіяй. Падчас рэвізіі ў вядомага мастака і кампазітара Напалеона Орды ў Варацэвічах пасля падзей 1863 года былі канфіскаваны рукапісы наступных вершаў на польскай мове: *Na zgon Adama, Mowa rabina Jastora w Warszawie, Stary mąż, Na nutę Kiedy ranne wstają zorze, Zdrowaś Mario!, Mowa polska (improwizacja), Litania za Ojczyznę, Módlmy się, Pobyt w Paryżu od 1833* і рукапісная версія газеты «Czas» з 23 мая 1861 № 69[27].

Сустракаліся на Берасцейскай зямлі спецыялізаваныя бібліятэчныя калекцыі. Вышэй згадваліся гістарычна-нумізматычна-краязнаўчая калекцыя Вандаліна Пуслоўскага ці змястоўны кнігазбор Уладзіслава Трэмбіцкага, які складаўся са старых друкаў на польскай мове. Да вузкаспецыялізаваных можна аднесці таксама фрагмент бібліятэкі Сапегаў, перапісаны ў Дзярэчыне падчас канфіскацыі маёнтка. Сказанае стасуецца і адметнай групы друкаў, каля 60 тытулаў, звязаных тэматычна з ваенным мастацтвам[28]. Хутчэй за ўсё іх пазбіраў Францішак Сапега, генерал літоўскай артылерыі. У азначаную групу ўваходзілі кнігі, выдадзеныя ў другой палове XVIII стагоддзя на французскай, нямецкай і польскай мовах, прысвечаныя артылерыі і фартыфікацыі, а таксама падручнікі для афіцэраў і ваенныя статуты.

Амаль у кожнай бібліятэцы можна было знайсці граматыкі, падручнікі і дапаможнікі для вывучэння замежных моў. Прыкладам можа быць наяўнасць у Нямцэвічаў трох граматык грэчаскай мовы і адной французскай[29]. Не з'яўлялася рэдкай мастацкая літаратура на замежных мовах. У

25 Гродзенскі Дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Аддзел рэдкіх кніг і старадрукаў, № 22453 «Inwentarz biblioteki Muzeum w Grodnie, wpisy z lat 1929—1930, nr 12001-1710» [галоўным чынам дары Марты з Пуслоўскіх Красінскай], запіс пад № 12462.

26 РГИА, ф. 384 оп. 15 д. 1286 л. 26.

27 НГАБ у Гродне: Ф. 1. Воп. 31. Спр. 119. Арк. 98—157адв.

28 Wojakowski J. Księgozbiory Eustachego Kajetana Sapiehy (1797-1860) i Waclawa Rzewuskiego (1785—1831). Warszawa. 1996. S. 39—41. Nr 713—773.

29 РГИА, ф. 384 оп. 15 д. 1286 л. 24, 28.

Швыкоўскіх у Пружанах захоўваліся шматлікія працы Віктора Гюго (38 тамоў), Аляксандра Дзюма (6 тамоў), Альфонса дэ Ламарціна (7 тамоў), Поля дэ Кока (7 тамоў)[30]. Рэкорды папулярнасці білі ў тыя часы творы Мадам дэ Жэнлі, у французскім арыгінале і ў перакладзе на польскую мову. Яны прысутнічалі ў розных бібліятэках — ад шматтысячных калекцый арыстакратыі да невялічкіх хатніх бібліятэчак мясцовай шляхты. Прыватныя бібліятэкі Берасцейшчыны натуюць наступныя творы дэ Жэнлі: у інвентары Сапегаў *Nouveaux contes moraux* (2 тамы, Парыж 1802)[31], у Караля Нямцэвіча *La religion considérée comme l'unique base du bonheur* (Арлеан 1787)[32]. Даволі рэдка ў шляхецкіх кнігазборах XIX стагоддзя сустракаюцца мастацкія творы на ангельскай і нямецкай мовах. Аднак і такія трапляліся сярод берасцейскіх калекцый: напрыклад, лорда Байрана *English Bards and Scotch Reviewer* (Жэнева 1820) і творы Вальтэра Скота ў томіку *Pocket Lybrary of English Classies* пералічаны сярод кніг, канфіскаваных у Сапегі[33], *Творы* Фрыдрыха Шылера ў 12 тамах аздаблялі бібліятэку Швыкоўскіх[34].

Да найбольш папулярных друкаў адносіліся календары. Вельмі цікава акрэсліў ролю календара ў шляхецкай бібліятэцы Уладзіслаў Трэмбіцкі: «Каляндар [...] лічыўся лекарам, дарадчыкам, астролагам, барометрам і гадзіннікам на ўвесь год для гаспадара, абавязковым прадметам хатняга ўжытку ў яго доме, усёй яго бібліятэкай і энцыклапедыяй, адлюстраваннем густу і асветніцтва народу»[35]. Друкаваныя календары прысутнічалі не толькі ў сціплай хаце незаможнага шляхціча, але таксама ўладальнікі багатых бібліятэк не грэбавалі такой літаратурай. У кнігазборы Швыкоўскіх у Пружанах налічвалася 49 гаспадарскіх календароў на польскай мове[36]. Шматлікі збор календароў меў Вандалін Пуслоўскі. Толькі з XVIII стагоддзя з яго калекцыі захавалася 11 календароў, сярод якіх львоўскі на 1741 год, гродзенскія з 1778 і 1785 гадоў, 6 віленскіх: з 1775, 1776, 1783, 1789 і 1785 (2 адзінкі) гадоў, два варшаўскія календары на

30 НГАБ у Гродне: Ф. 31. Воп. 1. Спр. 47. Арк. 105—105адв.
31 Wojakowski J. Księgozbiory... S. 49.
32 РГИА, ф. 384 оп. 15 д. 1286 л. 21v.
33 Wojakowski J. Księgozbiory... S. 38, 50.
34 НГАБ у Гродне: Ф. 31. Воп. 1. Спр. 47. Арк. 105.
35 Trębicki W. Uwagi nad pierwszym poszytem... S. 556 [пераклад Л.К.].
36 НГАБ у Гродне: Ф. 31. Воп. 1. Спр. 47. Арк. 106.

1761 і 1767 гады[37]. Пуслоўскі збіраў таксама і календары XIX стагоддзя, асабліва выдадзеныя на літоўска-беларускіх землях, у тым ліку назапасіў шмат календароў, выдадзеных у Полацку[38].

Аналіз зместу прыватных шляхецкіх кнігазбораў сведчыць пра наяўнасць разнароднай і шматлікай літаратуры пра садова-паркавае мастацтва, садаводства і агародніцтву. Асабліва выразна выяўляецца такая зацікаўленасць сярод уладальнікаў палацава-паркавых ансамбляў. Таму не здзіўляе факт, што самымі вялікімі калекцыямі кніг па гэтай тэматыцы валодалі Швыкоўскія ў Пружанах (сярод іншых 51 том французскамоўнага перыядычнага выдання, прысвечанага садаводству[39]), а таксама Сапегі ў Дзярэчыне (шматтомныя публікацыі з розных часоў і на розных мовах)[40].

Яшчэ адна цікавая рыса шляхецкіх бібліятэк, якая характарызавала асяроддзе арыстакратыі і заможнай шляхты, — наяўнасць у калекцыях гравюр і карт. У каталозе бібліятэкі Сапегаў у Ружане з 1797 года атласы і геаграфічныя карты, а таксама гравюры былі спісаны асобна, было іх адпаведна 5 і 10 асобнікаў[41]. Дадатковы каталог, складзены ў 1800 годзе, рэгіструе 8 «cartons» (тут хутчэй за ўсё папак) і 39 «livres d'estampes reliès» (таксама, можна меркаваць, што гэта папкі ці альбомы з гравюрамі)[42]. У Валенты Швыкоўскага гравюры на «готланскай» паперы захоўваліся ў кардонных папках, знаходзіліся ў кабінеце[43]. Атласы і карты ў інвентары бібліятэкі Швыкоўскага былі ўнесены ў моўныя аддзелы, таму, напрыклад, карта Германіі знаходзілася сярод кніг на нямецкай мове[44], а 2 атласы і 3 неапісаныя карты патрапілі ў французскі аддзел[45].

Рэканструкцыя лёсаў прыватных кнігазбораў на Берасцейшчыне падаецца магчымай, дзякуючы захаваным і адшуканым крыніцам. У першую чаргу гэта сведчанні пра страты і знішчэнні каштоўных

37 Шоцік В.І. Калекцыя календароў-старадрукаў у кнігазборы АРКіС Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея // Краязнаўчыя запіскі. Гродна, 1995. Вып. 3. С. 16—30.

38 Напрыклад Kalendarz polityczny Polocki na rok pański 1802 (Гродзенскі Дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей, Аддзел рэдкіх кніг і старадрукаў, 096/01412).

39 НГАБ у Гродне: Ф. 31. Воп. 1. Спр. 47. Арк. 105адв.

40 Wojakowski J. Księgozbiory... напрыклад s. 33 nr 458, s. 34 nr 473, s. 36 nr 563, s. 43 nr 857.

41 Бібліятэка Віленскага Універсітэта, Аддзел Рукапісаў, F 3 — 221, l. 70—71.

42 Тамсама, l. 1—3 (на дадатковых аркушах).

43 НГАБ у Гродне: Ф. 31. Воп. 1. Спр. 47. Арк. 101.

44 Тамсама. Арк. 105.

45 Тамсама. Арк. 105адв.

калекцый. Найбольшыя з іх былі выкліканы канфіскацыяй маёнткаў пасля паўстанняў XIX стагоддзя (Сапегаў, Нямцэвічаў, Швыкоўскіх) ці з'яўляліся наступствамі сусветных войнаў. Даволі часта кнігі станавіліся ахвяраю пажараў (бібліятэка Самуэля Хэфта). Ратункам для некаторых прыватных калекцый заставалася перадача іх у публічныя фонды бібліятэк, архіваў і музеяў. І толькі нязначную частку калекцый удалося захаваць пасля Другой сусветнай вайны. Застаецца спадзявацца, што далейшыя пошукі крыніц паспрыяюць пашырэнню ведаў пра кніжныя багацці продкаў.

Ильин А. Л.

Имение Гремяче — культурный очаг Полесья конца XIX — начала XX века

Полесская шляхта в XIX в. была довольно образованной: многие шляхтичи учились в Виленском университете, Свислочской гимназии и в других учебных заведениях. Большинство дворян интересовались историей, литературой и искусством. Они подписывались на польские и русские периодические издания, покупали книги. Некоторые из них были настоящими библиофилами. Великолепные библиотеки собрали граф Вандалин Пусловский (1814—1884) в коссовском дворце, помещик Владислав Трембицкий (?—1861) в имении Линово Пружанского уезда, племянник знаменитого писателя Юзефа Крашевского и известный коллекционер Богуслав Крашевский (1857—1916) в имении Долгое того же уезда… Очаги польской культуры создавались и в других полесских имениях.

Имение Гремяче, которым владели знаменитые магнатские роды (Илиничи, Гонсевские, Сапеги, Флеминги, Чарторыйские, Понятовские и Пусловские), находилось в Брестском уезде недалеко от местечка Волчин. Около 1870 года[1] оно стало собственностью представителя не менее известного рода: князя Юзефа Адольфа Пузыны (1848—1914).

1 Федорук А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины. Мн., 2004.

Пузыны — княжеский род, происходивший от князей Глазын, осевших в XV веке на Смоленщине. Некоторые исследователи считают их Рюриковичами — потомками козельских князей. Часто именовались «князьями с Козельска Пузынами». Князья Пузыны никогда не забывали своих православных корней и всегда были патриотами Великого княжества Литовского (ВКЛ). Можно предположить, что Юзеф Адольф Пузына перевез в имение Гремяче богатый семейный архив и библиотеку, в которой, наверно, преобладали книги исторической тематики. Обитатели имения жили насыщенной духовной жизнью, пропитанной польским и литвинским патриотизмом, а также глубокой религиозностью. Только этим можно объяснить, что двое детей Юзефа Адольфа Пузыны стали известными польскими культурными и политическими деятелями.

Его старший сын — Юзеф Эдвард Пузына (1878—1949), родившийся в имении Гремяче, был историком, поэтом и журналистом. Он имел прекрасное образование: изучал историю и литературу в Фрибургском университете (Швейцария), в котором получил диплом доктора философии. После окончания университета прожил в Швейцарии 20 лет, где начал свои исторические исследования, в которых преобладала тематика происхождения и политической роли литовско-русских князей во времена экспансии ВКЛ на Русь. В этих работах проявился его литвинский и полесский патриотизм, да и собственное русинское происхождение. В своих трудах большое внимание уделял и Полесью, например, происхождению пинских князей. Этому вопросу посвятил статью «Потомство Наримунта Гедиминовича». Генеалогические исследования ученого принесли ему признание коллег: в 1930 году Юзеф Пузына вошел в состав редакции «Геральдического ежемесячника». Самый известный его исторический труд — книга «Великое Княжество Литовское до Миндовга» (1937). А поэтическое творчество началось еще во время учебы в варшавской гимназии. В 1905 году издал сборник стихов «Огни», в котором чувствуются младопольские мотивы. Критика встретила этот сборник благосклонно. Писал Юзеф Эдвард Пузына и прозу, занимался также переводами.

Не менее интересной личностью была его младшая сестра Ирена Пузына (1881—1933), которая получила известность как общественный и католический деятель, руководитель Национальной организации женщин и депутат польского сейма. Ее, по праву, можно назвать одним из организаторов женского движения в межвоенной Польше. Она получила хоро-

шее образование в престижной частной школе под Веной. После окончания школы жила в Варшаве и в имении Гремяче, в котором родилась. В Варшаве богатая и образованная княжна вращалась в аристократических и литературных кругах, где, наверно, познакомилась с известным поэтом и композитором Генриком Скирмунтом (1868—1939), владевшим имением Молодово на Пинщине. В июне 1900 года в газете «Край» было помещено сообщение о помолвке Генрика Скирмунта и Ирены Пузыны. Однако свадьба не состоялась. О том, что было причиной размолвки, можно только догадываться. Возможно, консервативному и очень религиозному Скирмунту не понравилась эмансипированность молодой девушки. В будущем оба так и не создали семей. Можно предположить, что у неё в имении Гремяче гостили многие известные писатели, художники и музыканты (и не только Генрик Скирмунт). На лесистых и очень живописных берегах речки Пульвы, где располагалась усадьба, возможно, тогда отдыхал и великий польский писатель Стефан Жеромский (1864—1925), захотевший после этого здесь поселиться. После смерти отца в 1914 году Ирена Пузына взяла в свои руки управление имением, которое перешло по наследству к ней, брату Юзефу Эдварду, сестре Янине и их матери. Но летом 1915 года русские военные власти заставили княжну Ирену вместе с матерью княгиней Марией Пузыной эвакуироваться вглубь России.

Только в начале 1919 года Ирена Пузына смогла вернуться в родное имение, которое было опустошено и разграблено. Ценный семейный архив и библиотека были уничтожены. Видя всю эту разруху, она поняла, что не в силах сама возродить разрушенное хозяйство.

В Государственном архиве Брестской области нами найден интересный документ (ф. 2031, оп. 2, ед. хр. 5, л.7—9): договор о пятилетней аренде имения Гремяче между его владельцем Марией Пузыной и будущими арендаторами Стефаном Жеромским и Франтишком Рожинским, подписанный 26 июля 1919 года. Договор довольно обширный, содержит 23 пункта. Из его текста следует, что еще 1 января 1919 года был подписан договор об аренде между княгиней и Стефаном Жеромским. Литературовед Артур Гутникевич в своей книге «Жеромский» пишет, что писатель после войны не имел собственного угла[2], а в нем глубоко сидел потомственный шляхтич, владеющий кусочком собственной земли.

2 Hutnikiewicz A. Zeromski. Warszawa, 2000.

Писательская слава и материальное положение позволяли ему пустить где-то корни. Вначале он хотел приобрести дом на Поморье. Из найденного документа следует, что, наверно, вначале Стефан Жеромский хотел все-таки обосноваться на Полесье, но, приняв в управление разрушенное войной имение, испугался трудностей и решил взять в помощь компаньона Франтишка Рожинского. Что их связывало кроме аренды, за которую они обязались выплачивать княгине ежегодно 20% прибыли, нам установить не удалось. Усадебный дом был тогда непригоден для жилья, и компаньоны должны были жить в сохранившемся флигеле. Уже 13 декабря 1919 года Мария Пузына стала судиться с Рожинским, обвинив его в невыполнении условий договора аренды. В судебном иске отмечалось, что Стефан Жеромский после подписания договора 26 июля не принимал участия в управлении имением. Вскоре жена второго компаньона Изабелла Рожинская прислала телеграмму, что ее муж скончался 28 января 1920 года. Вот так закончилась попытка великого писателя поселиться на Полесье. Думается, что на его решение отказаться от аренды имения Гремяче повлияли не только экономические причины, но и сложность поездок из Варшавы в это имение, располагавшееся в 14 километрах от захолустной железнодорожной станции Лыщицы, (от которой, чтобы добраться до столицы, надо было еще доехать до Бреста).

После неудачной аренды семейство Пузын в конце 1921 года продало имение Гремяче Станиславу Форышевскому и Владиславу Барщу, кроме фольварка Соколье (оставлен для Янины Пузыны) и дворца (завещан под школу), хотя исследователи Сергей Басов и Анатолий Федорук считают, что князь Юзеф Эдвард Пузына продал земли имения польским осадникам в 1933 году[3]. Более вероятно, что в этом году им продали земли все-таки Форышевский и Барщ. Однако как очаг шляхетской культуры имение Гремяче прекратило свое существование еще в 1915 году. Удивительно, но импозантный усадебный дом сохранился до наших дней, хотя и в плачевном состоянии, будто напоминая нам, что не все тайны гремяческого имения еще раскрыты.

3 Basow S. Album hrabiego Kossakowskiego // Echa Polesia. 2008. № 3. S. 13 ; Федорук А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины. Мн., 2004. С. 405.

Папко В. М.

Паэт Альбін Дзяконскі (1892—1940) і кніжны збор роду Быхаўцаў

Вялікімі кніжнымі зборамі традыцыйна валодалі манастыры. Аднак у XIX ст. расійскія ўлады актыўна закрывалі каталіцкія і ўніяцкія манастары, а іх кнігазборы перавозілі ў іншыя месцы, часцей за ўсё ў вялікія гарады, нават у Расію. Такі лёс напаткаў Лыскаўскі базыльянскі манастыр, які быў зачынены ў XIX ст. Бібліятэка манастыра часова была перададзена ў Лыскаўскае народнае вучылішча. 25 ліпеня 1869 г. гродзенскі дырэктар народных вучылішчаў звярнуўся да гродзенскага губернатара з просьбай вырашыць лёс бібліятэкі. Прапанову аб выкарыстанні гэтага кнігазбору выказаў папячыцель Віленскай навучальнай акругі, які прасіў дазволу перадаць калекцыю кніг і рукапісаў у фонды Віленскай публічнай бібліятэкі. На той момант зборы манастыра захоўваліся ў будынку вучылішча, у выкладчыка Закона Божага, мясцовага святара айца Агіевіча[1]. Далейшы лёс іх высветліць не атрымалася (з матэрыялаў справы не вынікае, чым яна скончылася).

1 Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (Далей НГАБ). Ф. 1. Воп. 6. Спр. 1933. Переписка с гродненским директором народных училищ за 13-28 июля 1869 г. о передаче книг и рукописей закрытого в местечке Лысково Волковысского уезда Базилианского монастыря в Виленскую публичную библиотеку.

Нават у другой палове XIX ст. публічныя бібліятэкі былі рэдкасцю ў правінцыі. У 1882 г. па афіцыйных звестках у Ваўкавыскім павеце было толькі дзве публічныя бібліятэкі. Адна з іх размяшчалася ў Ваўкавыску і належала Гродзенскай дырэкцыі народных вучылішчаў. Другая была прыватнай, яе гаспадыняй значылася дваранка Тэрэза Антонаўна Булгарына. Бібліятэка знаходзілася ў яе маёнтку Каласар (?) і працавала з 1879 г. У абодвух гэтых бібліятэках кнігамі не гандлявалі. У той самы год у суседнім павятовым горадзе Пружаны па звестках мясцовага іспраўніка не было ні друкарні, ні літаграфіі, ні кніжных лавак, ні бібліятэк. З усіх даброт цывілізацыі існавала толькі «фатаграфічнае завядзенне», якое было адкрыта ў верасні 1882 г. і належала Іосіфу Салавейчыку[2].

Шляхецкія сядзібы, нават не самыя багатыя, утрымлівалі кніжныя калекцыі, якія часам збіраліся на працягу некалькіх стагоддзяў. Кнігазборы пераходзілі ад аднаго гаспадара да другога як частка спадчыны, самога маёнтка. Адной з самых знакамітых бібліятэк на землях сучаснай Брэсцкай вобласці валодалі ў XIX ст. Быхаўцы. З XVI ст. шляхецкаму роду Быхаўцаў належалі маёнткі Магілёўцы і Лыскава ў Ваўкавыскім павеце (зараз на тэрыторыі Пружанскага раёна).

У 1863 г. памёр Аляксандр Быхавец, пакінуўшы сваю немалую спадчыну двум сынам. У 1878 г. маёнтак Магілёўцы яшчэ знаходзіўся ў агульным валоданні бяздзетных братоў С.А. і К.А. Быхаўцаў, абодва былі генерал-маёрамі расійскага войска. У канцы 1870-х — пач. 1880-х гг. пасля іх смерці маёнтак разам з бібліятэкай атрымаў у спадчыну сын іх адзінай сястры Софі (Юліі) Дзяконскай з Быхаўцаў. Пляменніка звалі Казімір Яўстафіевіч Дзяконскі (?—1913). З гэтага часу да 1939 г. маёнтак, сядзіба і бібліятэка належала роду памешчыкаў Дзяконскіх. Казімір быў вельмі адукаваным чалавекам, скончыў Дорпацкі універсітэт з дыпломам урача. Яго жонкай стала Стэфанія, дачка гаспадара маёнтка Вердамічы Ваўкавыскага павету Эдуарда Талочкі і Марыі з роду Маршалковічаў[3].

Усё жыццё гэтай сям'і было звязана з Магілёўцамі. Вялікі сядзібны будынак захаваўся да нашых дзён, зараз у ім месціцца псіхіятрычная бальніца. На думку Р. Афтаназы, аднапавярховы дом быў пабудаваны ў сярэдзіне XVIII ст. Быхаўцамі, а прыблізна праз 100 гадоў значна

2 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1. Воп. 8. Спр. 793. Переписка с Главным управлениям по делам печати о правилах цензуры и печати. Арк. 123.

3 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 405. Метрическая запись о смерти помещицы Дзеконской Стефании. Арк. 1.

павялічаны за кошт дабудовы бакавых крылаў. Парадны ўваход з порцікам падтрымлівалі чатыры іанічныя калоны. З кожнага боку ад порціка было па 9 акон, сцены атынкаваныя белага колеру. Унутраны інтэр'ер дома фарміраваўся на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў, у ім адлюстраваліся розныя эпохі і стылі[4].

Стыль жыцця сям'і Дзяконскіх быў тыповым для заможнай шляхты на гэтых землях. Няпярэдадні Першай сусветнай вайны Магілёўцы былі цэнтрам мясцовага свецкага жыцця. Музычныя захапленні гэтай сям'і прыцягвалі на вечары шмат родзічаў і знаёмых. Гаспадар дома іграў на скрыпцы, фартэп'яна і аргане. Яго жонка акампаніравала яму. Аднавіць тагачасны выгляд дома дапамагаюць успаміны Ц. Цішэўскай, роднай пляменніцы Стэфаніі. Любімым пакоем гаспадароў была вялізная бібліятэка, уздоўж сцен якой ішлі шафы з карэльскай бярозы. Бібліятэка Дзяконскіх была адной з самых багатых і знакамітых у ваколіцах, славілася калекцыяй старажытных рукапісаў. Некалі тут захоўвалася знакамітая хроніка Быхаўца, якая была выяўлена ў гэтай бібліятэцы ў 1820-я гг. У другой палове XIX ст. рукапіс быў згублены, аднак надрукаваны і добра даследаваны.

Пасярэдзіне бібліятэкі стаяў вялікі стол з газетамі і часопісамі, які абкружала круглая канапа, разлічаная на 20 асобаў. Каля гэтага стала часта сядзеў гаспадар маёнтка, Казімір Дзяконскі. Любімае крэсла і столік гаспадыні стаялі ў нішы каля аднаго з трох акон, дзе яна часта сядзела з працай. Пакой асвятлялі тры жырандолі з каляровага венскага шкла, якія віселі ў аконных нішах[5]. Хутчэй за ўсё, Казімір Дзяконскі папаўняў бібліятэку новымі кнігамі, сярод якіх павінны былі быць творы па медыцыне.

Восень 1913 г. прынесла шмат сумных падзей у сем'і Талочкаў і Дзяконскіх. Сведка гэтых падзей, Цішэўская, падрабязна апісвае апошнія дні жыцця Казіміра Дзяконскага: «Мы (з кузенам Эдзем Тарасовічам) засталі цёцю вельмі прыгнечанай болем. Моцна ўзрадавалася нашаму прыезду. Дзядзя ляжаў вельмі зменены, але таксама намі вельмі ўсцешыўся. Штодзень было горш, але гэта працягвалася пару тыдняў. Крэсовая салідарнасць: дом быў поўны сваякоў і сяброў, Цёця і Дзядзя

4 Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Województwa brzesko-litewskie, nowogródzkie. Tom 2. Wrocław-Warszawa-Kraków. 1992. S. 266—269.

5 Ciszewska z Tołłczków C. Gawęda o tym, co było. Рукапіс. 1961. Biblioteka Narodowa w Warszawie, zbiory specjalne. S. 24—25.

аточаны апекай сяброў, Цёці дапамагалі ва ўсім, слугі на пальцах хадзілі, у вочы глядзелі, а ў саміх слёзы ў вачах, таму што Дзядзю вельмі любілі... 30 кастрычніка 1913 г. у тры гадзіны ночы Дзядзя закрыў вочы на вякі...

Цёця з сухімі, палымнеючымі вачыма сядзела ў бібліятэцы ў сваім крэсле... Абняўшы мяне за шыю, яна заснула на некалькі гадзін. Я сядзела на каленях, не смеючы абудзіць цёцю, бо два тыдні не была ў ложку. Кожны з прыезджых узяў на сябе якія-небудзь справы, так што цёця ні пра што не павінна была думаць. Прыехала Цёця Алібінава з сынам Альбінам (Бінусем), брат Дзядзі, Юліян, а на самое пахаванне натоўп суседзяў, сваякоў, сяброў...»[6].

Сітуацыя са спадчынай Казіміра была вельмі не простай. З матэрыялаў судовай справы пра выкананне тэстаменту вынікае, што Казімір Дзяконскі пакінуў сваю спадчыну жонцы Стэфаніі, «за выключэннем родавых нерухомых маёмасцей». Тэстамент быў складзены Дзяконскім у красавіку 1909 г. і быў пасведчаны ў віленскага натарыуса. Стэфаніі пакідалася права пажыццёва валодаць маёнткам, яе доля складала 1/7 частку[7]. Верагодна, Казімір не хацеў, каб маёнткам валодаў яго брат, немалады ўжо чалавек, у якога таксама не было дзяцей. Для гэтага за некалькі гадоў да смерці Казімір зрабіў некаторыя захады, каб пазбегнуць страты маёнтка. У 1909 г. Стэфанія пазычыла мужу 126 тыс. руб. пад заклад маёнтка Магілёўцы. Нам падаецца, што гэта было мерай забеспячэння яе больш трывалага матэрыяльнага становішча ў выпадку смерці мужа. Да таго ж Казімір меў нейкія грашовыя прэтэнзіі да брата Юліяна на суму звыш 100 тыс. руб.[8].

Аднак галоўным планам, які прыйшоў у галаву бяздзетным сужанкам, было ўсынаўленне сына далёкіх родзічаў — Альбіна і Ядвігі Дзяконскіх, Альбіна-Міхала (1892—1940). Альбін-Міхал нарадзіўся 28 красавіка (па старым стылі) 1892 г. у маёнтку Пятровічы Кобрынскага павета. Яго бацькамі былі Альбін Дзяконскі (1838—1918) і Ядвіга Ажэжка ў першым шлюбе Бяртольдзі (1859—1931)[9]. Дзяцінства будучага паэта праходзіла

6 Ciszewska z Tołłczków C. Gawęda o tym, co było. Рукапіс. 1961. Biblioteka Narodowa w Warszawie, zbiory specjalne. S. 254.

7 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 410. Дело об утверждении завещания помещика Дзеконского Казимира жене Дзеконской Стефании. Арк. 1—2.

8 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 624. Соглашение помещицы Дзеконской Стефании с помещиком Дзеконским Альбином о продаже ему им. Могилёвцы. Арк. 1—2.

9 НГАБ у г. Мінску. Ф. 1781. Воп. 46. Спр. 38. Книга Кобринского костёла о рождении за 1887—1894 гг. Арк. 131адв.—132.

ў радавым маёнтку бацькі ў вялікай сям'і сярод братоў і сясцёр. Пасля нараджэння дзяцей у шляхецкіх сем'ях распачыналася працэдура атрымання імі спецыяльных пасведчанняў. У 1895 г. яго бацька звярнуўся ў Гродзенскі Шляхетны Дэпутацкі Сход з просьбай аб далучэнні сына Альбіна Міхала і дачкі Ганны-Крысціны да шляхетнага саслоўя. Дэпартаментам Герольдыі былі выкананы спецыяльныя «пасведчанні на дваранства», якія былі накіраваны ў Гродзенскі Сход[10].

Верагодна, пачатковую адукацыю Альбін атрымаў ад хатніх настаўнікаў. Дзяцей у сям'і было шмат, розніца паміж імі была невялікай. Таму без гувернантак у гэтай сям'і не маглі абысціся. Звестак пра адукацыю Альбіна захавалася мала. У самай поўнай яго друкаванай біяграфіі, якая папярэднічае зборніку вершаў, сцвярджалася, што сярэднюю школу Альбін пачаў наведваць у Варшаве, а гімназію з атрыманнем атэстата скончыў у Рызе[11]. Аднак гэтыя звесткі былі не зусім дакладнымі. У НГАБ у г. Гродна захавалася пасведчанне аб заканчэнні шостага класа Рыжскай Аляксандраўскай гімназіі, выдадзенае 17 мая 1910 г. па старым стылі. З гэтага дакумента вынікае, што Альбін толькі здаў экзамены за шосты клас (можна сказаць, экстэрнам), а адукацыю атрымліваў дома, таму што экзамены праводзіліся ў адпаведнасці з правіламі, якія былі складзены для асобаў з хатняй адукацыяй у 1897 г. Гэты дакумент адлюстраваў не вельмі бліскучыя веды Альбіна ў большасці прадметаў. На «выдатна» ім былі здадзены толькі Закон Божы і французская мова. Усе астатнія прадметы — руская, нямецкая і лацінская мовы, матэматыка, фізіка, гісторыя і геаграфія, на думку выкладчыкаў гімназіі, заслугоўвалі толькі пасрэдных адзнак[12]. Аднак прычына такіх адказаў магла быць у дрэнным веданні Дзяконскім рускай мовы, што ў тыя часы было нормай для колаў, у якія ўваходзіў Альбін. У сваіх мемуарах Ц. Цішэўская ўспамінала, што размаўляць з рускімі па-руску не было прынята сярод яе знаёмых — або па-французску, або ніяк.

Да пасведчання далучаны тагачасны здымак Альбіна (дарэчы, ён ніколі не друкаваўся), на якім стаіць адбітак пячаткі Аляксандраўскай

10 НГАБ у г. Гродна. Ф. 332. Воп. 4. Спр. 4. Указы Сената о причислении к дворянскому сословию жителей Гродненской губернии. Арк. 23—23адв.

11 Dziekonski A. Wybór poezji. Opracował i wstępem poprzedził Jerzy Poradecki. Warszawa, 1985. S. 9.

12 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 401. Свидетельство об окончании помещиком Дзеконским Альбином-Михаилом 6 класса Рижской гимназии. Арк. 1—2.

гімназіі ў Рызе. Гэта самы ранні здымак паэта, з тых, што захаваліся. На ім мы бачым маладога, добра апранутага мужчыну. Гэты здымак паказвае Альбіна-Міхала ў тыя часы, калі ён даў згоду на сваё ўсынаўленне Стэфаніяй і Казімірам Дзяконскімі.

Адразу пасля смерці Казіміра Дзяконскага яго жонка Стэфанія пачала ўладкоўваць спадчынныя справы такім чынам, каб захаваць свае інтарэсы і забяспечыць права на маёмасць Альбіну. Менавіта таму, што большая частка маёнтка Магілёўцы адносілася да катэгорыі радавых, то атрымаць іх мог бліжэйшы родзіч мужчынскага полу. З той прычыны, што Альбін не быў усынаўлены, 6/7 частак маёнтка пераходзіла ва ўладанне брата пакойнага гаспадара, Юліяна. Верагодна, проста завяшчаць іх Казімір Альбіну не мог. Менавіта таму ўзнікла ідэя афіцыйнага прызнання Альбіна ў якасці прыёмнага сына.

У снежні 1913 г. было складзена пагадненне паміж Стэфаніяй, Альбінам і бацькамі Альбіна. На жаль, удалося знайсці толькі непадпісаны варыянт, таму невядома, ці меў ён законную сілу. Між іншым, гэты дакумент можна ўмоўна назваць «дамовай аб намерах». Пагадненне абвяшчала згоду ўсіх бакоў на імкненне перадаць Альбіну маёнтак Магілёўцы, а Стэфаніі пры гэтым быў забяспечаны грашовы штогадовы даход і пражыванне ў доме. Размова ішла нават пра тое, што Альбін купіць у яе 1/7 частку маёнтка[13]. Аднак, першапачатковай задачай было ўстанаўленне дамоўленасці з галоўным нашчадкам, Юліянам.

Юліян Дзяконскі займаўся нейкай камерцыйнай дзейнасцю. Па ўсім відаць, што справы яго ішлі добра. Пасля смерці Казіміра Стэфанія павінна была выплаціць яму яго частку спадчыны. Юліян згадзіўся прадаць яе за 45 тыс. руб. Хутка пасля смерці брата ў снежні 1913 г. Юліян склаў свой асабісты тэстамент. Сваіх дзяцей у яго не было, жонка Разалія памерла. Усю сваю рухомую маёмасць Юліян Дзяконскі завяшчаў Сігізмунду Антонавічу Буйноўскаму, жыхару г. Сувалкі. Спадчынай пасля Юліяна было ўсё тое, што знаходзілася ў яго доме па вул. Садовай, д. 8, значныя грашовыя капіталы ў працэнтных паперах, 45 тыс. руб., якія павінен быў выплаціць яму за Магілёўцы Альбін Дзяконскі і сумы, якія былі пазычаны ў яго іншымі асобамі. Усе гэтыя грошы былі завешчаны Буйноўскаму, якога Юліян успрыймаў як свайго прыёмнага сына. Буйноўскі быў сынам

13 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 624. Соглашение помещицы Дзеконской Стефании с помещиком Дзеконским Альбином о продаже ему им. Могилёвцы. Арк. 1—2.

бліжэйшых суседзяў Дзяконскага, вырас на яго вачах. Юліян дапамог яму адкрыць сваю лаўку і вёў нейкія агульныя справы.

12 мая 1914 г. у Вільні быў складзены раздзельны акт на спадчыну Казіміра Дзяконскага. Яшчэ раней Альбін згадзіўся выплаціць 45 тыс. руб. за яго долю ў маёнтку. Аднак вельмі хутка, праз месяц — 16 (29) чэрвеня 1914 г. Юліян Дзяконскі памёр. Буйноўскі патрабаваў выплаціць яму грошы, абяцаныя Юліяну за Магілёўцы. Стэфанія Дзяконская была вымушана закласці маёнтак, каб разлічыцца, што і было зроблена да канца 1914 г.[14]. Так частка спадчыны К. Дзяконскага вельмі хутка трапіла ў рукі чужога яму чалавека, Буйноўскага.

Пытанне ўсынаўлення Альбіна-Міхала даволі заблытанае. Біёграфы паэта адназначна сцвярджаюць, што яно адбылося ў 1910 г., а завяшчанне было складзена на карысць прыёмнага сына. Аднак дакументы не пацвярджаюць гэтую версію. У гэтым ёсць некалькі спрэчных момантаў. Для Ц. Цішэўскай перадача Альбіну ў спадчыну Магілёўцаў у 1913 г. была нечаканай. Верагодна, гэты намер утойваўся імі нават ад самых родных людзей. Тым болей, што ў 1910 г., калі, паводле меркавання аўтараў, адбылося ўсынаўленне, Альбіну было ўжо 18 гадоў.

Усынаўленне афіцыйна адбылося толькі ў 1916 г. паводле рашэння Арлоўскага Акружнога суда ад 16 лютага. Суд санкцыянаваў усынаўленне, зыходзячы з пададзеных дакументаў: пісьмовага дазволу бацькоў Альбіна-Міхала і даведкі, выдадзенай міравым суддзёй Кобрынскага павета Канстанцінам Скірмунтам аб тым, што Стэфанія Дзяконская бяздзетная[15]. Аднак сэнс у гэтым акце быў хутчэй псіхалагічны, чым юрыдычны. Альбіну-Міхалу было на той момант 24 гады.

Верагодна, што яго адукацыя пасля 1910 г. ажыццяўлялася на грошы Казіміра і Стэфаніі. Родзічы вырашылі накіраваць Альбіна на вучобу ў Бельгію, дзе, хутчэй за ўсё не па сваёй волі, ён штудзіраваў сельскую гаспадарку. Рашэнне накіраваць Альбіна для навучання на факультэт сельскай гаспадаркі было лагічным, як-ніяк яго рыхтавалі ў спадкаемцы вялікага маёнтка. Каб кіраваць ім і мець даход, трэба было разбірацца ў гэтай справе, знайсці падыходы да мадэрнізацыі вытворчасці. Толькі год працягвалася навучанне Альбіна. Цяжкая хвароба прымусіла Дзя-

14 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 411. Дело о передаче помещику Буйновскому Сигизмунду части наследства помещика Дзеконского Юлиана. Арк. 1—18.

15 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 400. Дело об усыновлении помещицей Дзеконской Стефанией дворянина Дзеконского Альбина. Арк. 1—2.

конскага пераехаць у Давос, але пасля паляпшэння стану здароўя ён працягвае навучанне ў Лазане, на гэты раз абраўшы раманістыку.

Адначасова з Альбінам у Лазане вучылася дачка віленскага адваката Максіміліяна Мамертавіча Малінскага, Соф'я. В. Церахава, верагодна, спасылаючыся на лісты Соф'і Дзяконскай, сцвярджае, што тая была хрышчонай дачкой Казіміра. Прозвішча адваката Малінскага часта сустракаецца ў дакументах Дзяконскіх. Ён быў сведкам пры складанні тэстаменту Казіміра ў 1909 г. Пачатак Першай сусветнай вайны прымушае Альбіна і Соф'ю вярнуцца на радзіму. На пачатку вайны Альбін не быў мабілізаваны, бо меў слабае здароўе. Ён застаўся ў Магілёўцах і займаўся справамі гаспадаркі. Дакладна невядома, якія хваробы не дазволілі Альбіну-Міхалу пайсці ў рэгулярную армію. Афіцыйна ён лічыўся «ратнікам апалчэння II-га разрада, прызыву 1913 г.» У верасні 1915 г. Аршанская павятовая прысутнасць па воінскай павіннасці прызнала яго непрыгодным да службы ў войску. Аднак ён апынуўся ў падначаленні Асобаўпаўнаважанага па снабжэнні прыпасамі бежанцаў і насельніцтва тылу арміі Паўночна-Заходняга фронту[16].

Аднак потым Альбін трапіў у расійскую армію, служыў пры штабе нейкай вайсковай часці ў Арле, куды да яго прыехалі Соф'я і Стэфанія Дзяконская. Прыёмная маці падштурхоўвае маладых людзей да шлюбу[17]. Вянчанне адбылося 28 красавіка (па старым стылі) 1917 г. — у дзень нараджэння Альбіна, у Арлоўскім рымска-каталіцкім прыхадскім касцёле. Малады на той момант меў 25 гадоў, яго нявеста — на год маладзейшая[18].

Першая сусветная вайна значна пашкодзіла дому і гаспадарцы ў Магілёўцах. Падчас яе пачасціліся факты грабяжу ў маёнтках, сяляне вялі сябе нахабней, разумеючы, што ўладам не да таго. Пазіцыі памешчыкаў аслабелі: многія мужчыны пайшлі на вайну, а гаспадаркай займаліся жанчыны. Сялянскія хваляванні апісвала ў сваіх успамінах Цэцылія Цішэўская. Перасоўванні войска прыносілі сельскай гаспадарцы значныя страты, гэта былі патравы злакавых і рэквізіцыі. У верасні 1915 г. у маёнтку Магілёўцы рэквізіцыю жыта, аўса, пшаніцы, канюшыны, вікі,

16 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 402. Удостоверение о негодности помещика Дзеконского Альбина-Михаила к военной службе. Арк. 1.

17 Dziekonski A. Wybór poezji. Opracował i wstępem poprzedził Jerzy Poradecki. Warszawa, 1985. S. 9.

18 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 403. Метрическая запись о бракосочетании помещика Дзеконского Альбина с Малинской Софьей. Арк. 1.

саломы і бульбы праводзіў маршалак шляхты Гродзенскага павета, аб чым выдаў квітанцыю на 120 тыс. 610 руб. прадстаўніку Дзяконскай, яе брату Юліяну Эдуардавічу Талочку[19].

У гэты час Альбін знаходзіўся ў апалчэнні расійскай арміі, а Стэфанія пераехала ў глыб Расійскай імперыі. У лютым 1916 г. у арлоўскага натарыуса Стэфанія афармляе на Альбіна даверанасць на права прадстаўляць яе інтарэсы ў справе кампенсацыі страт, панесеных у маёнтку Магілёўцы ў сувязі з ваеннымі дзеяннямі[20]. У 1920 г. былі зроблены падлікі страт ад рускіх і нямецкіх войскаў. Верагодна, кампенсаваць маглі толькі тое, што было занатавана на паперы. Рэквізіцыя харчу на суму 120 тыс. 610 руб. на патрэбы рускага войска склала 8 % ад перадваеннага кошту маёнтка (1,5 млн. руб.) У лютым рускія ўлады кампенсавалі Стэфаніі 104 тыс. 410 руб. Страты ад дзеянняў немцаў склалі 9 % ад кошту маёнтка, або 161 тыс. 49 руб. Ніхто не плаціў за гэта. З дакументаў відаць, як значна ад немцаў у 1915—1918 гг. пацярпеў дом Дзяконскіх і прыватныя рэчы гаспадароў. У спісе забраных немцамі прадметаў значацца вопратка, абутак, коўдры, залатыя ўпрыгожанні, калье з манет. Рэквізавалі таксама мэблю з кабінета і сталовай — шафу, камоду, столікі. Упраўляючаму былі менавіта немцамі выдадзены даведкі аб рэквізіцыі[21]. У шматлікіх публікацыях сцвярджаецца, што немцы разрабавалі бібліятэку Быхаўцаў.

Напрыканцы вайны 5 студзеня 1918 г. у Варшаве памёр Альбін Дзяконскі-стары. Прыблізна ў той самы час туды прыехаў яго сын Альбін з жонкай, маладыя пасяліліся ў вялікім прыватным доме па вуліцы Хожай, 22, які застаўся пасля бацькі. Магчыма, менавіта з мэтай разабрацца са спадчынай бацькі, Альбін з жонкай пераязджае ў 1920 г. у Магілёўцы, каб надоўга ўжо іх не пакідаць. Ад бацькі ў спадчыну Альбін атрымаў фальварак Каралін у Кобрынскім павеце[22]. Пасля вайны жыццё паступова наладжвалася. Вельмі хутка, у 1923 г., Альбін Дзяконскі прадаў

19 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664, воп. 1, спр. 626. Дело о реквизиции посевов в им. Могилёвцы Волковысского уезда (1915 г.). Арк. 1—2.

20 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664, воп. 1, спр. 416. Доверенность помещицы Дзеконской Стефании помещику Дзеконскому Альбину по делу выдачи вознаграждения за реквизицию посевов (1916 г.). Арк. 1—1адв.

21 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 417. Декларация о нанесении войсками ущерба имуществу помещицы Дзеконской Стефании (1920 г.). Арк. 1—8.

22 Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці [далей ДАБВ]. Ф. 79. Воп. 1. Спр. 1709. Дело об утверждении Деконьского Вацлава в правах собственности на недвижимое имущество. Арк. 18—22адв.

фальварак Каралін доктару Казіміру Зачку[23]. Магчыма, адной з прычын продажу стаў цяжкі стан маёнтка Магілёўцы.

Пасля вайны Альбін разам з жонкай і Стэфаніяй вярнуўся ў Магілёўцы, дзе застаў разгромлены маёнтак. Відаць, адносіны паміж Цішэўскай і сям'ёй Альбіна Дзяконскага пагоршыліся пасля Першай сусветнай вайны, што вынікае з некаторых намёкаў у мемуарах. Пасля смерці Стэфаніі Цішэўская болей не ўзгадвае нікога з гэтага роду. Гэта можа даць карысны матэрыял для даследавання. Апошнія ўспаміны Цішэўскай пра Магілёўцы: «У Магілёўцах былі мы некалькі дзён, але гэта ўжо былі не тыя самыя Магілёўцы. Цёця Стэфця ёсць, новай гаспадыняй дома з'яўляецца Зося Бінусева, з дому Малінскіх. Зося цудоўная і мілая, зразумела, што стыль дома іншы, чым перад вайной, настолькі, што ў процілегласць Вердамічам дом стаіць, але знішчаны, абрабаваны[24]. Няма ўжо таго былога настрою дома, які пакаленнямі не змяняўся. Няма следу саскай парцэляны, карэльская бяроза знішчана, парк занядбаны, вайна далася ў знакі ў кожнай дробязі»[25].

Стэфанія Дзяконская склала свой тэстамент у кастрычніку 1921 г. у варшаўскага натарыуса на карысць Альбіна-Міхала[26]. Стэфанія Дзяконская памерла 13 верасня 1924 г. у Магілёўцах ва ўзросце 58 гадоў і была праз тыдзень пахавана побач з мужам на могілках каля касцёла Сэрца Хрыстова ў Лыскаве[27]. На жаль, знайсці гэтыя магілы не атрымалася.

З 1924 г. Альбін стаў паўнапраўным гаспадаром маёнтка. Па сведчанні Соф'і Дзяконскай і Ежы Бяртольдзі, Альбін не вельмі быў зацікаўлены ў сельскай гаспадарцы. Яго маёнтак прыносіў добры даход толькі дзякуючы аканому Сядлецкаму. У 1922 г. Альбін Дзяконскі як гаспадар маёнтка Магілёўцы па колькасці займаў 427-е месца ў рэйтынгу 500 найбольш заможных памешчыкаў Польшы[28]. Гэта быў самы вялікі маёнтак

23 ДАБВ. Ф. 79. Воп. 1. Спр. 1644. Дело об утверждении Деконьского Альбина в правах собственности на недвижимое имущество. Арк. 18.

24 Палац Талочкаў у Вердамічах цалкам згарэў у 1915 г.

25 Ciszewska z Tołłoczków C. Gawęda o tym, co było. Рукапіс. 1961. Biblioteka Narodowa w Warszawie, zbiory specjalne. S. 244.

26 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 410. Дело об утверждении завещания помещика Дзеконского Казимира жене Дзеконской Стефании. Арк. 10.

27 НГАБ у г. Гродна. Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 405. Метрическая запись о смерти помещицы Дзеконской Стефании. Арк. 1.

28 Roszkowski W. Gospodarcza roła większej prywatnej własności ziemskiej w Polsce 1918—1939. Warszawa. 1986. S. 356—376.

з уладанняў, якія належалі прадстаўнікам роду Дзяконскіх. У 1930 г. маёнтак Магілёўцы налічваў 3300 дзес. зямлі[29]. Вёска Магілёўцы ў 1920-30-я гг. пры пану Альбіну налічвала 559 жыхароў і некалькі маленькіх прадпрыемстваў: цагельны завод, па дзве сталярных, кавальскія і цяслярскія майстэрні, тры кравецкія, водны млын. Даходы з маёнтка былі даволі значныя. У Магілёўцах Альбін меў машыну маркі «Адлер», што на гэтых землях у той час было вялікай рэдкасцю. У 1927 г. у павятовых Пружанах было ўсяго два аўтамабілі, якія належалі мясцовым адвакатам. А сам бурмістр карыстаўся службовым веласіпедам[30].

Сядзібу ў Магілёўцах, у якой Альбін пасяліўся ў 1913 г., у адным са сваіх вершаў ён назваў «домам, падобным на паром». Прыгожы парк у Магілёўцах вельмі падабаўся яго гаспадару, аднак і выклікаў трывожныя пачуцці. У вершы «Шкляны парк» Дзяконскі піша: «Баюся свайго парку, Неба ў парку — са шкла». Верш перадае панічны настрой напярэдадні Другой сусветнай вайны, яшчэ не ведаючы, што хутка яго ўтульны свет згіне, будзе знішчаны пад абломкамі польскай дзяржавы. Дом у Магілёўцах быў прытулкам, якое паэт любіў, хаця і адчуваў сябе яго вязнем. Менавіта тут нарадзілася большасць вершаў Дзяконьскага.

Ланцуг пакояў
(крокі — крокі)
туды і назад
50 перамен
ад святла да мроку
(чорны бляск вокнаў
у праёмах сцен)
50 крокаў туды
і назад
дарогі накладваю
жыццё адкладваю
напотым
напотым
напотым.[31]

Такі настрой аўтара сведчыць аб тым, што ён адчуваў сябе адарваным ад таго, да чаго імкнуўся. Што гэта было? Сталіца, багатае на падзеі

29 Spis ziemian Rzeczpospolitej Polskiej w roku 1930. Województwo Białostockie. Oprac. T. Epsztein, S. Górzyński. Warszawa, 1990. S. 7.

30 Папко В.М. Войска польске на ровэрах // Раённыя будні (Пружаны). 2007. 8 мая. С. 5.

31 Пераклад з польскай мовы Вольгі Папко.

і сустрэчы літаратурнае жыццё, прызнанне? Магчыма, проста верш быў напісаны ў момант цяжкага душэўнага стану. Не вельмі добра складваліся адносіны паэта з чытачамі і літаратурным светам. Яго кнігі амаль не былі заўважаны сучаснікамі. Чытачу ён прысвячае некалькі вершаваных радкоў, адкрыта гаворыць, што яго не любіць:

Таўчэцеся нячулыя
паміж мной і небам —
не даяце мне жывіцца
маім паветраным хлебам.

Між іншым, першая кніга «Байкі» Дзяконскага пабачыла свет яшчэ ў 1920 г. Гэта быў невялікі зборнік вершаваных баек, сярод якіх «Шпак», «Алень», «Ліс і барсук», «Ваявода», што часам складаліся ўсяго з некалькіх радкоў. У якасці прыкладу прывядзём тут верш «Цішыня» з гэтага першага зборніка.

Люблю самотную цішыню,
Калі сэнс падзеяў цягнучы, нібы гнуткую пражу,
Пляту тканіну рыфмай, час у марах імчыцца,
І пішу.
Смех тады з вуснаў маіх сцякае выпадкова,
Смутак пазней прыходзіць — калі здзяйсняецца казка[32].

У 1925 г. у Польшчы даволі шырока святкаваліся ўгодкі смерці знакамітага паэта XVIII ст., заснавальніка польскага рамантызму Францішка Карпінскага, які доўга жыў па суседстве з Магілёўцамі і быў пахаваны каля лыскаўскага касцёла. Дэлегацыя польскіх літаратараў, якая прыбыла ў гэтыя мясціны, гасцявала ў Альбіна Дзяконскага. У 1938 г. у сваім маёнтку Дзяконскі прымаў літаратараў з Варшавы, Кракава і Львова. Аднак падчас гэтых падзей госці, хутчэй за ўсё, успрымалі яго як багатага землеўладальніка, а не калегу па літаратурным цэху. Магчыма, менавіта гэтай падзеі прысвечаны верш «Думкі з раніцы» з апошняга зборніка, у якім аўтар піша: «Пра літаратараў мяркую незычліва...»

На працягу 1920—30-х гг. выходзяць наступныя тамы паэзіі Дзяконскага: «Байкі. Сатыры. Лірыка» (1926 г.), «Элегія» (1929 г.), «Эклогі» (1931 г.), «Матывы з горада» (1931 г.), «На захад» (1932 г.), «Два галасы» (1933 г.), «Драма Люцыфера» (1934 г.), «Падазроныя (падгледжаныя)

32 Пераклад з польскай мовы Вольгі Папко.

рэчы» (1936 г.), з якіх толькі першая была надрукавана ў Вільні, астатнія ўсе — у Варшаве. Апошняя кніга «Зялёныя Магілёўцы» пабачыла свет у 1939 г. напярэдадні Другой сусветнай вайны. Кнігі свае Дзяконскі выдаваў невялікім тыражом. Напрыклад, «Эклогі» былі надрукаваны ў 110 нумараваных экзэмплярах. Дакладна не вядома, як успрымаў і трактаваў сваю творчасць сам паэт. Яго даходы дазвалялі яму друкаваць творы, аднак ён асэнсавана не ішоў на шырокую папулярызацыю сваіх вершаў. Пра гэта гаворыць зусім невялікі наклад яго зборнікаў. Першыя 10 экзэмпляраў некаторых з іх (дакладней «Байкі, сатыры, лірыка» і «Элегія») багата аздабляліся, былі ўкладзены ў саф'янавы пераплёт. З. Станкевіч, які трымаў у руках адзін з такіх шыкоўных тамоў, назваў яго «творам пераплётнага мастацтва»[33].

Марыя Трэмбіцкая займалася друкаваннем 5-ці тамоў паэзіі брата ў 1929—1933 гг. у элітнай друкарні У. Лазарскага ў Варшаве. Яе прозвішча значыцца на тытульнай старонцы: «Наклад і ўласнасць Марыі Трэмбіцкай»[34]. Варшава прымала яго непрыхільна, папросту не заўважала. Абражаны гэтым, паэт не імкнецца сам завесці знаёмствы ў літаратурных колах. Аднак дакладна вядома, што ён перапісваўся з вядомай польскай паэткай і навелісткай Сусаннай Рабскай, якая ўдзельнічала ў 1921 г. у арганізацыі Таварыства Польскіх Бібліяфілаў у Варшаве[35]. У аддзеле рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі Польшчы захаваўся адзін з лістоў Дзяконскага, які стасаваўся бібліятэкі ў Магілёўцах і быў напісаны 21 чэрвеня 1932 г.:

«Шаноўная Пані,

Стары збор кніг сям'і Быхаўцаў, пра які я ўзгадваў, не ўтрымлівае экслібрысаў. Кнігі пазначаны пячаткай з ініцыяламі A. L. B. (Аляксандр і Ліберта Быхаўцы). Кнігі гэтыя разам з Магілёўцамі перайшлі ў маё валоданне ў 1913 г.

Калекцыя, моцна пашкоджаная ў часы апошняй вайны, утрымлівала шмат цікавых кніг, між іншым «Слоўнік» Ліндэ, «Гербоўнік» Нясецкага..., і выданне «Валгалы» кс. Вайкі з 1599, друкі з кракаўскіх афіцын.

33 Stankiewicz Z. Poeta Kresów // Głos znad Niemna. 2003. 14 lutego. S. 10.

34 Dziekonski A. Wybór poezji. Opracował i wstępem poprzedził Jerzy Poradecki. Warszawa, 1985. S. 13.

35 Literatura polska XX wieku. Przewodnik encykłopedyczny. Warszawa, 2000. T. 2. S. 89.

Захавалася «Хроніка» Быхаўца» і Марціна Бельскага, Біблія лацінская друк з 1497 г., «Тэалогія» Ламбардзі з 1481 г.

Прыкладваю 4 томікі «Rerum Veneterum», злучаныя ў адзін. Выданне, якое выйшла з друкарняў Людвіка Эльзэвіра ў Амстэрдаме ў 1644 г. Гэта трэці з раду Людвік Эльзэвір майстар друкарскага мастацтва (1604—1670). Амстэрдамскія друкарні былі закладзены ў 1638 годзе.

Буду вельмі рады, калі Шаноўная Пані захоча гэты томік далучыць да сваіх збораў замест абяцанага мною экслібрыса.

Вокладка крыху пашкоджана, але не хацеў бы яе мяняць з прычыны яе старажытнасці. Не ведаю, з якога года паходзіць гэтая вокладка, у любым выпадку, кніга ў сучасным стане знаходзіцца 150 гадоў з гакам у Магілёўцах.

Пры зручным выпадку асмелюся запэўніць у самай глыбокай павазе і сапраўднай пашане.

Альбін Дзяконскі»[36].

Гэты ліст вельмі цікавы таму, што ў ім згадваецца знакамітая «Хроніка Быхаўца» і іншыя кнігі са збораў магілявецкай бібліятэкі. З яго вынікае, якімі знакамі пазначаліся кнігі з бібліятэкі Быхаўцаў.

Спакойнае жыццё ў правінцыйных Магілёўцах, поўнае клопатаў аб гаспадарцы і паэтычнай творчасці, было раптоўна перарвана ў верасні 1939 года. Пасля таго, як Чырвоная армія заняла тэрыторыю Заходняй Беларусі, А. Дзяконскі быў арыштаваны разам з войтам лыскаўскай гміны Станіславам Вічфінскім[37], які быў яго сябрам і таксама жыў у маёнтку. Пасля арышту яго ўтрымлівалі ў Мінску. Вядома, што ў сакавіку 1940 г. ён яшчэ быў жывы, далейшы лёс яго невядомы. В. Церахава ў сваіх артыкулах прыводзіць успаміны старых людзей і чуткі пра лёс Дзяконскага пасля арышту. А.Л. Канькоўская ўспамінала, што адначасова з Дзяконскім арыштавалі яе прафесара латыні Адамоніса, якому яна дасылала пасылкі з правізіяй. Потым гэты прафесар згадваў пра Дзяконскага. Ена Брухальскі, які пасля вайны пераехаў у Ізраіль, сведчыў,

36 Dziekonski A. List do Z. Rabskiej. Biblioteka Narodowa w Warszawie, zbiory spec. 2723. Korespondencja Z. Rabskiej z lat 1895—1946, k. 231. Арк. 218—219.

37 А. Дзяконскі пазнаёміўся з Вічфінскім падчас службы ў расійскім войску і забраў з сабой у Магілёўцы. Той выконваў функцыі кансультанта. Па чутках, Дзяконскі пазычыў сябру вялікую суму грошай, але гэта не перашкаджала іх адносінам. Вічфінскаму прысвечаны верш «Жаўрукі» са зборніка «Зялёныя Магілёўцы». Гл.: Церахава В. Пясняр зялёных Магілёўцаў // Раённыя будні (Пружаны). 2002. 27 красавіка. С. 4.

што Дзяконскі служыў у арміі Андэрса і жыў у Ізраілі. Сын лакея Дзяконскага згадваў, што пан марыў пераехаць у Бразілію і хацеў узяць з сабой некаторых адданых людзей. Трагічны лёс паэт сам прадракаў сабе ў вершы «Ідылія«, надрукаваным у яго апошнім зборніку[38].

Жонка Дзяконскага Соф'я пераехала ў Варшаву. Невядома, як перажыла яна нягоды сусветнай вайны і якім быў яе далейшы лёс.

У архівах і прыватных зборах Польшчы і Беларусі захавалася толькі тры здымкі Альбіна Дзяконскага. Самы ранні здымак ад 1910 г. быў знойдзены аўтарам у фондах НГАБ у г. Гродна ў 2008 г. Праз чатыры гады — у 1914 г. быў зроблены наступны здымак. Без малога сто гадоў ён захоўваўся ў сям'і Бяртольдзі. Толькі знаёмства з Ілонай Бяртольдзі дазволіла атрымаць гэты каштоўны здымак Альбіна, які да гэтага часу ніколі не быў надрукаваны. У артыкулах Веры Церахавай змешчаны здымак 1937 г., на якім, па сведчанні аўтаркі, Альбін Дзяконскі сфатаграфаваны разам са сваёй траюраднай сястрой Марыяй Трэмбіцкай, якая дапамагала яму друкаваць зборнікі вершаў. Мужчына на здымку падаецца значна старэйшым за тыя 48 гадоў, якія пражыў на свеце Альбін Дзяконскі. І галоўнае, ён вельмі не падобны на здымак маладога Альбіна, які захоўваўся ў сям'і Бяртольдзі і паходзіць з 1914 г. Магчыма, дрэнны выгляд Дзяконскага на здымку 1937 г. абумоўлены яго хваробай на цукровы дыябет, ад якога ён пакутаваў апошнія гады свайго жыцця, што тлумачыць і містычны настрой яго апошніх вершаў, і адчуванне страху, якімі яны прасякнуты[39].

Да ліку захапленняў Дзяконскага можна далучыць маляванне, разьбу і музыку (асабліва Клод Дэбюсі)[40]. Зразумела, што ён быў добра адукаваным, рознабаковым і вельмі таленавітым чалавекам. Жонка паэта Соф'я ўспамінала пра мужа: «Мой муж быў цалкам пазбаўлены бяздзейнасці, ніколі не шукаў славы і папулярнасці, але я чула, што яго вершы не пазбаўлены каштоўнасці і што ў іх утрымліваецца паэтычнае зярнятка. Лічу некаторыя яго вершы дзіўнымі, часам нават незразумелымі. Іншыя ж занадта прымітыўныя, сентыментальныя...».

---

38 Stankiewicz Z. Poeta Kresów // Głos znad Niemna. 2003. 14 lutego. S. 10.

39 Dziekonski A. Wybór poezji. Opracował i wstępem poprzedził Jerzy Poradecki. Warszawa, 1985. S. 9.

40 Церахава В. Пясняр зялёных Магілёўцаў // Раённыя будні (Пружаны). 2002. 27 красавіка. С. 4.

Пасля вайны некаторыя польскія даследчыкі прызнавалі вартасць творчасці А. Дзяконскага, некалькі разоў яго вершы траплялі ў зборнікі паэзіі міжваенных дзесяцігоддзяў. Першым з даследчыкаў літаратуры, хто звярнуў увагу на творы быў прафесар Ю. Кшыжаноўскі, які выпадкова напаткаў дзве кніжкі Дзяконскага сярод збораў пакойнага літаратурнага крытыка Л. Паміроўскага і набыў іх. Кшыжаноўскі ў размовах з калегамі часта хваліў вершы А. Дзяконскага. Гэтае меркаванне падштурхнула да даследавання гэтых твораў Казіміра Выку, які выступаў у якасці рэцэнзента кнігі Р. Матушэўскага і С. Полака «Польская паэзія 1914—1939 гг.» і садзейнічаў таму, што ў гэтую кнігу трапілі 5 вершаў паэта. Гэтая і іншыя публікацыі прыцягнулі ўвагу да творчасці Дзяконскага, аднак малая колькасць яго кніг перашкаджала яе папулярызацыі.

Вялікага рэзанансу яго творчасць не атрымала. Апошні зборнік вершаў быў надрукаваны ў 1985 г. стараннямі Ежы Парадэцкага, які ва ўступе адзначыў: «Цяжка ацэньваць спадчыну Альбіна Дзяконскага. Не належыць ён да паэтаў, якія, па-аматарску пішучы вершы, стварылі некалькі ці больш за дзесятак значных твораў. Ён не адыграў ніякай ролі ў міжваенны перыяд, таму нельга пісаць пра яго заслугі ў творах гісторыі літаратуры. Безумоўна, быў па прызванні і па прафесіі паэтам, які ствараў уласную філасофію жыцця і літаратуры. Хаця не цяжка выбраць з яго спадчыны больш за дзесятак выбітных вершаў, уяўленне пра Дзяконскага будзе няпоўным. Гэты арыгінальны паэт прапануе чытачу новыя эстэтычныя якасці, новыя настолькі, што іх цяжка разглядзець пры першым кантакце з гэтай паэзіяй»[41].

Лёс Альбіна Дзяконскага быў цесна пераплецены з гісторыяй Пружаншчыны. На гэтых землях паэт і памешчык пражыў 29 гадоў, уся яго творчасць была звязана з Магілёўцамі. Так здарылася, што апошнім гаспадаром знакамітай бібліятэкі Быхаўцаў быў самабытны паэт А. Дзяконскі.

41 Dziekonski A. Wybór poezji. Opracował i wstępem poprzedził Jerzy Poradecki. Warszawa, 1985. S. 29-30.

Сацута І. У.

З гісторыі народных бібліятэк Берасцейшчыны

Астрамечаўская бібліятэка Брэсцкага раёна з'яўляецца адной з першых бясплатных сельскіх бібліятэк-чытальняў Беларусі. Заснаваная ў 1905 годзе, яна была равесніцай першай рускай рэвалюцыі і цесна звязана з гэтай гістарычнай падзеяй.

Ініцыятыва стварэння народных бібліятэк у Расійскай імперыі належыць земствам. На тэрыторыі ж Беларусі ў гэты перыяд земстваў не было. Грамадскай сілаю, якая ўзялася тут за арганізацыю бібліятэк для сялян, стала мясцовая інтэлігенцыя, у першую чаргу студэнты пецярбургскіх вышэйшых навучальных устаноў і вясковыя дэмакратычна настроеныя настаўнікі. У першым дзесяцігоддзі XX ст. пры Пецярбургскім універсітэце ўзнік беларускі навукова-літаратурны гурток, куды ўваходзілі студэнты-беларусы. Адной з задач гуртка з'яўлялася арганізацыя на Бацькаўшчыне культурна-асветніцкіх устаноў, у тым ліку бібліятэк для народа.

У гэты час у Пецярбургу сваю дзейнасць па арганізацыі народных бібліятэк развівае Паўленкаўскі фонд. Па завяшчанні вядомага рускага кнігавыдаўца Фларэнція Фёдаравіча Паўленкава на адпісаныя ім грошы яго душапрыказчыкі на чале з В. Якаўленкам адкрылі ў Расіі на пачатку

XX ст. звыш 2000 бясплатных народных бібліятэк-чытальняў, якія атрымалі назву паўленкаўскіх, з іх 11 — на тэрыторыі Беларусі.

Аб адкрыцці народных бібліятэк на Беларусі ў 1908 годзе паведамлялася ў часопісе «Русская школа»: «В 1905 году возникли по частному почину библиотеки-читальни в Брестском уезде в с. Остромечево и Слонимском уезде в м. Жировицах. В 1906—1907 годах были открыты новые библиотеки-читальни в Бельском уезде и в Кобринском — в одном селении»[1].

Аднак, як канстатавала ў 1910 годзе газета «Наша ніва», «у Беларусі народных бібліятэк і чытальняў вельмі мала. Гэта за тым, што нямнога ёсць людзей, каторыя ведаюць, як адкрываць бібліятэкі, а шмат хто думае, што на гэта трэба многа грошай. Тым часам, адкрыць бібліятэку можна з капеек і год за годам з капеечнай яна вырасце ў вялікую святыню асветы для народа»[2].

Ініцыятарамі стварэння бібліятэкі ў Астрамечаве сталі студэнты Пецярбургскага універсітэта браты Сяргей і Мікалай Раманскія — сыны астрамечаўскага святара і два іх сябры з Брэста — Сяргей Басякоў і Яўген Жуковіч. Скарыстацца сродкамі з Паўленкаўскага фонду можна было, калі меўся дазвол губернатара на адкрыццё бібліятэкі і сведчанне з воласці або ад настаўніка, што на месцы сабралі грашыма або кнігамі не менш за 30 — 50 рублёў; «тады з фонду імя Паўленкава высылаюць кніжак на 150 рублёў і далей памагаюць. Так, у адкрытыя з 1905 па 1910 год бібліятэкі імя Паўленкава ў Гродзенскай губерніі выслалі адразу кніг на 150 рублёў, а цяпер зноў выслалі на столькі ж і яшчэ будуць высылаць»[3].

Афіцыйна загадчыкам Астрамечаўскай бібліятэкі губернатар назначыў мясцовага святара Л. Раманскага, а наглядальнікам — настаўніка народнага вучылішча Антона Зянкевіча. Па сутнасці ж святара не меў дачынення да работы бібліятэкі. Усё ўзяў на сябе Антон Паўлавіч Зянкевіч. Ён і ўвайшоў у гісторыю як першы бібліятэкар гэтай кніжнай установы.

Па звестках самога А. Зянкевіча, першапачаткова фонд бібліятэкі ацэньваўся сумай у 100 рублёў. Кнігі збіраліся арганізатарамі са сваіх хатніх бібліятэк і часткова на ахвяраванні мясцовай інтэлігенцыі.

1 Мезьер А. Из хроники библиотечного дела // Русская школа.. 1908.
2 Наша ніва. 1910. № 52.
3 Наша ніва. 1910. № 52.

Бібліятэка-чытальня размяшчалася ў будынку школы, у асобным пакоі. Кнігі мясціліся ў дзвюх вялікіх шафах. Цудам захавалася адна з першых кніг, выдадзеная ў 1903 годзе. Яе аўтар А.Н. Сцяпанаў, называецца кніга «Сельская гаспадарка і сельскае жыццё». На тытульным лісце захавалася авальная пячатка з тэкстам: «*Народная бібліятэка імя Ф.Ф. Паўленкава ў вёсцы Астрамечава*». Кніга ў добрым стане, і яе праз сто гадоў можна без цяжкасцяў чытаць.

У 1907 годзе, гэта значыць праз два гады пасля яе заснавання, Астрамечаўская бібліятэка мела ўжо больш за тысячу кніг. У наступным годзе яе фонд значна папоўніўся ў сувязі з наступнымі абставінамі. Гродзенская дырэкцыя народных вучылішч, жадаючы, відаць, зменшыць прагрэсіўны ўплыў паўленкаўскай бібліятэкі на мясцовае насельніцтва, вырашыла адкрыць у Астрамечаве пры народным вучылішчы другую бібліятэку. Для гэтай мэты было адпушчана, па словах А. Зянкевіча, 400 рублёў. На іх настаўнік склаў спіс літаратуры для новай бібліятэкі так, што адабраныя ім кнігі не ішлі ўразрэз з ідэйным накірункам паўленкаўскай бібліятэкі. Юрыдычна новая бібліятэка лічылася самастойнай. На яе кнігі быў складзены асобны інвентарны вопіс, аднак гэта не мяняла сутнасці справы. Фактычна другой бібліятэкі не існавала. Была і заставалася адна бібліятэка — паўленкаўская.

У перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гадоў былі адменены правілы 1884 года аб міністэрскіх каталогах і часовыя правілы ад 15 мая 1880 года аб народных бібліятэках і парадку нагляду за імі, якія абмяжоўвалі камплектаванне фондаў публічных бібліятэк. У сувязі з гэтым бібліятэкі атрымалі магчымасць набываць літаратуру, якая мелася на кніжным рынку. Па сведчанні А. Зянкевіча, здараліся выпадкі, калі нелегальныя кнігі і забароненыя выданні былі пераплецены разам з легальнымі, так што іх цяжка было выявіць.

У перыядычным друку таго часу ёсць паведамленне, што Астрамечаўская бібліятэка атрымала дапамогу грашыма і кнігамі ад «аднаго таварыства з Францыі, ад расейскага пісара Максіма Горкага»[4]. Дасылала сюды свае выданні беларуская выдавецкая суполка «Загляне сонца і ў наша ваконца», бібліятэка атрымлівала таксама газеты «Наша доля» і «Наша ніва», іншыя перыядычныя выданні.

4 Наша ніва. 1908. № 46

Цяжкімі і складанымі пуцявінамі ішло развіццё беларускага афіцыйнага перыядычнага друку. Спатрэбілася больш за чатыры дзесяцігоддзі, каб пасля «Мужыцкай праўды» К. Каліноўскага — першай ластаўкі беларускай перыёдыкі — з'явілася нарэшце, у 1906 годзе, беларуская легальная газета. І то лёс яе быў няпростым, як няпростым было нацыянальнае адраджэнне беларусаў. Спробы для стварэння легальнай перыядычнай газеты ў Беларусі рабіліся і раней. 15 ліпеня 1870 года ў Парыжы выйшаў першы і адзіны нумар польска-літоўска-беларускай газеты «Змова». Беларускія народавольцы — студэнты Пецярбургскага універсітэта — наладжваюць выданне гектаграфаванага часопіса «Гоман» на рускай мове. Другі яго нумар, выдадзены 15 лістапада 1884 года, быў цалкам прысвечаны абмеркаванню нацыянальнага пытання ва ўмовах Беларусі і будучыні роднага краю.

Сапраўднае абуджэнне нацыянальна-вызваленчага руху прынесла рэвалюцыя 1905 года. Магутны штуршок для развіцця атрымала беларуская літаратура, пачалася барацьба за нацыянальную школу, тэатр, кнігадрукаванне і перыёдыку на роднай мове.

12 жніўня 1906 года віленскі жыхар Іван Адамавіч Тукеркес атрымаў у канцылярыі віленскага губернатара пасведчанне № 11532 на права выдання і рэдагавання штотыднёвай газеты «Наша доля» — першай беларускай газеты для вясковага і местачковага рабочага народу. Яна пабачыла свет 1 верасня 1906 года на васьмі старонках невялікага фармату. Выхад газеты адзначылі ўсе віленскія рускія, польскія, літоўскія перыядычныя выданні, а таксама некаторыя мінскія.

Нядоўга жыла першая легальная грамадска-палітычная і літаратурная газета «Наша доля» (1 верасня — 14 снежня 1906 года). З шасці нумароў на пяць была аб'яўлена канфіскацыя, рэдактар асуджаны на год турэмнага зняволення, а само выданне забаронена.

Горкі вопыт «Нашай долі» спатрэбіўся «Нашай ніве», якая пачала выходзіць з 10 лістапада 1906 года, пасля чацвёртага нумара сваёй папярэдніцы. Газета была разлічана пераважна на сялянскага чытача і вясковую інтэлігенцыю. У ёй друкаваліся матэрыялы пра побыт беларускай вёскі, адстойваліся патрабаванні грамадзянскага і палітычнага раўнапраўя беларусаў, свабода карыстацца роднай мовай, развіваць на ёй літаратуру, асвету. «Наша ніва» адыграла значную ролю ў выяўленні і збіранні беларускіх літаратурных сіл, у выданні і прапагандзе беларускіх кніг. «Мы бачым, — пісала газета на чацвёртым годзе свайго жыцця, —

што з самых глухіх куткоў Беларусі, дзе ніхто дагэтуль не толькі пісаць у газету, але і чытаць друкаванае слова не меў ахвоты, плывуць у «Нашу ніву» сотні карэспандэнцый, напісаных мазолістай рукой селяніна, бо ён ужо пазнаў, што гэта яго газета і для яго. Шырэй, байчэй, чым тыя гады, ідуць у народ і беларускія кніжкі, і з гэтага відаць, як узрастае патрэба іх».

Рэдакцыя газеты выдавала таксама беларускія календары, прапагандавала тэатр У. Буйніцкага, беларускія спевы, танцы. «У Вільні, Гародні, Полацку, Дзісне, Пецярбургу выступаюць дружыны артыстаў-аматараў, і з тэатральнай сцэны плыве жывое беларускае слова, будзячы прыспаныя сэрцы беларусаў і паказваючы ўсім, што «жыве Беларусь!»

Пры тэатрах пазакладаліся хоры, каторыя пяюць нашы народныя песні, хапаючы людзей хараством беларускай музыкі. Таксама арганізаваны былі гурткі танцораў: яны на сцэне паказвалі, як танцуе прыродны беларус, каторага не папсавалі «модныя» кадрылі, вальсы, даводзячы яшчэ раз, што і гуляць у сваёй нацыянальнай вопратцы шмат пекней, чым у пазычанай у чужых».

У 1911 годзе тыраж «Нашай нівы» складаў ужо каля 3000 экзэмпляраў. Яна бясплатна высылалася ў народныя бібліятэкі, у тым ліку і ў Астрамечаўскую, за што А. Зянкевіч і М. Паўлючык, добры памочнік бібліятэкі і адзін з першых яе чытачоў, падзякавалі рэдакцыі і пажадалі ёй «далейшай карыснай працы ў імя беларускага народа». Гісторыя захавала яшчэ некалькі прозвішчаў актыўных чытачоў таго часу: А. Мацвяюк, А. Данілюк, М. Місюк, П. Шыш, С. Краўчук і іншыя.

На старонках «Нашай нівы» неаднаразова паведамлялася пра дзейнасць Астрамечаўскай бібліятэкі. «За 1908 год бібліятэка выдала 2 тысячы 500 кніг. Найбольш кніг чытаюць позняй восенню. Чацвёртая частка чытачоў — кабеты і дзяўчаты. Карысць ад кніг вялікая . У іх напісана ўся мудрасць, да каторай дайшоў свет. Адзін чалавек, як пачаў чытаць кніжкі, дык кінуў піць гарэлку,» — чытаем у адным з нумароў згаданага перыядычнага выдання. Там жа надрукавана: «Астрамечаўская бібліятэка прасіла ў воласці 25 рублёў з штрафаў, каб паправіць кніжкі, што бадзяюцца па руках, падзёрліся. Воласць павінна адпусціць, бо чытаюць усе вёскі гэтай воласці»[5].

5 Наша ніва. 1909. № 17.

Наведвальнікі бібліятэкі не ў апошнюю чаргу цікавіліся новымі творамі беларускіх аўтараў. «Бо ж дагэтуль, бадай, не было друкаванага беларускага слова, бадай, зусім не было пісьменнікаў. А калі і жыў адзін-другі з іх, дык моўчкі пісаў дзесь у цішы, рэдка калі выдаваў што-небудзь (дый то невялікай вартасці) і не быў нічым звязаны са сваім чытачом. Можа, праз гэта ніводзін з іх і не вырас у праўдзівага пісьменніка свайго часу, бо толькі адна глеба можа ўзгадаваць такога. Гэта глеба — чытач. У непарыўнай еднасці, у жывых стасунках увесь час павінен знаходзіцца пісьменнік са сваім народам. А такой супольнасці не мела папярэдняя беларуская літаратура. Праз гэта і згінула яна для свайго часу, застаўшыся нам не як жывое слова, а толькі як гістарычны ўспамін»[6].

Валодаючы багатым фондам класічнай рускай і замежнай літаратуры, бібліятэка далучала насельніцтва навакольных вёсак да скарбаў сусветнай культуры.

Дзякуючы асветніцкай дзейнасці бібліятэкі, у Астрамечаве пачынаюць ствараццa іншыя культурна-бытавыя арганізацыі. «Кожная бібліятэка шмат памагае асвячаць народ. Апрача гэтага яна робіцца як бы цэнтрам культурнай работы. Калі дзе адкрыецца бібліятэка, лягчэй ужо завесці і крэдытнае таварыства, і якую рамесную майстэрню, і ўсё тое, чым самі сабе могуць памагчы сяляне. Але аб адным ніколі не маюць права забываць тыя, хто працуе над прасветай між беларусаў: у кожнай бібліятэцы, у кожнай чытальні наш селянін павінен знайсці і кніжкі на сваёй роднай мове»[7].

У Астрамечаве бібліятэка пачала аказваць медыцынскую дапамогу хворым: «У нашым сяле доктара няма, дык хворым даводзіцца ездзіць да яго за 20 вёрст. Цяжка гэта — вядома, дык цёмны мужык ідзе за радай да ўсялякіх знахароў, аддае ім свае капейкі, а хваробы косяць ды косяць народ. Часам невялікая нават помач, дадзеная ў час, можа шмат памагчы. Карыстаючыся з пазвалення артыкула 226 устава ўрача, бібліятэка адкрыла ў сябе маленькую аптэчку, з каторай выдае за сваю цану лякарствы, даючы раду дарма. Лекі выпісваюцца з найлепшых складоў Пецярбурга ад «Рускага таварыства гандлю аптэкарскімі таварамі». Кожную нядзелю прыходзяць па лекі 10 — 15 хворых ды нават з чужых вёсак»[8].

6 Наша ніва. 1910. № 70.
7 Наша ніва. 1910. № 52.
8 Наша ніва. 1909. № 34.

Восенню 1912 года А. Зянкевіч паехаў з Астрамечава ў Пецярбург вучыцца, але бібліятэка працягвала сваю плённую дзейнасць і пасля ад'езду загадчыка. Яна праіснавала да моманту акупацыі ў 1915 годзе тэрыторыі Заходняй Беларусі войскамі кайзераўскай Германіі. Што здарылася з бібліятэкай у час нямецкай акупацыі, дакладна ўстанавіць не ўдалося. Напрыканцы 20-х гадоў, у перыяд панскай Польшчы, бібліятэка зноў адкрылася, аднак ненадоўга. Кааператыўная спажывецкая арганізацыя, якая апекавала ўстанову культуры да 1933 года, спыніла сваю дзейнасць у сувязі з фашызацыяй Польшчы. Разам з ёю ў 1934 годзе польскімі буржуазнымі ўладамі была ліквідавана і бібліятэка. Яе фонд амаль не ўдалося ўратаваць. Толькі невялікая частка кніг засталася на руках у чытачоў, астатнія былі канфіскаваны або раскрадзены. У 1939 годзе, пасля ўз'яднання беларускіх зямель, бібліятэка ў Астрамечаве адраджаецца, але з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны яна зноў прыпыняе сваю дзейнасць, каб аднавіць яе ў 1946 годзе.

Нягледзячы на ўзрастаючую канкурэнцыю з боку электронных сродкаў інфармацыі, і сёння ў Астрамечаве працягваюць чытаць. Кніжны фонд і фонд перыядычных выданняў бібліятэкі складае больш за 14 тысяч экзэмпляраў. З сакавіка 1995 года яна месціцца ў новым будынку Дома культуры. У зоне абслугоўвання пражывае больш за дзве з паловай тысячы чалавек, з якіх амаль кожны другі — чытач бібліятэкі. У розныя гады пры бібліятэцы працавалі лялечны тэатр, дзіцячыя клубы па інтарэсах, аматарскія аб'яднанні па вывучэнні гісторыі роднага краю, вяліся рукапісныя альбомы, ладзіліся шматлікія літаратурныя вечарыны і выставы, іншыя цікавыя мерапрыемствы. Яна стала сапраўдным культурна-асветніцкім цэнтрам, куды людзі прыходзяць не толькі па кнігі, але і каб змястоўна правесці свой вольны час.

Тры разы гінула ў пякельных вогнішчах гісторыі бібліятэка ў Астрамечаве. Аднак, як толькі наступалі мірныя часы, астрамечаўцы адраджалі яе. Насенне, кінутае аднойчы на жыватворную народную глебу, не засохла, не задыхнулася, а дало добрыя ўсходы на нялёгкай, але ўдзячнай ніве Адраджэння.

Саітава В. І.

Бібліяграфічнае адлюстраванне гісторыі Брэсцкага краю ў часопісе «Ateneum wileńskie»

Засваенне новых дакументальных крыніц стымулюе паспяховае развіццё краязнаўчых ведаў. Гістарычны раздзел краязнаўства ўзбагачаецца ўвядзеннем у навуковы ўжытак невядомых дакументаў, публікацый, якія па тых ці іншых прычынах недастаткова выкарыстоўваліся. Абласныя, публічныя масавыя і навуковыя бібліятэкі кожнай вобласці, як буйнейшыя суб'екты інфармацыйнай інфраструктуры краязнаўства, са свайго боку імкнуцца бесперапынна пашыраць кола крыніц папаўнення краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў. У гістарычнай рэтраспектыве багатыя інфармацыйныя пласты пра кожны край захоўваюцца ў перыядычных і бягучых выданнях. Важнасць бібліяграфічнага раскрыцця іх зместу падкрэсліваецца пастаянна. Больш таго вядучыя даследчыкі краязнаўчай бібліяграфіі лічаць, што такую ж значнасць мае і ўважлівае вывучэнне бібліяграфічных матэрыялаў, змешчаных у гэтых выданнях. Цалкам справядліва А.В. Мамантаў і М.М. Шчэрба аднеслі латэнтную бібліяграфічную інфармацыю да асноўных крыніц выяўлення дакументаў пры падрыхтоўцы краязнаўчых бібліяграфічных дапаможнікаў[1].

1 Мамонтов А.В. Краеведческая библиография: учебник. М., 1989. С. 136.

Часопіс «Ateneum wileńskie», які выдаваўся ў 1923—1939 гг. III аддзяленнем Таварыства сяброў навук універсітэта імя Стэфана Баторыя ў Вільні, заслугоўвае разгляду як крыніца гісторыка-краязнаўчых навуковых ведаў і бібліяграфічнай інфармацыі. Выданне было прысвечана публікацыі матэрыялаў вывучэння мінулага былых зямель ВКЛ, у т.л. беларускіх. Кола аўтараў — пераважна віленскія даследчыкі, але друкаваліся вучоныя і з іншых гарадоў Польшчы і нават замежжа. Сярод іх такія вядомыя гісторыкі і бібліёграфы, як М. Брэнштэйн, С. Заянчкоўскі, А. Прахаска, Я. Якубоўскі, Я. Івашкевіч, Ф. Канечны, М. Амброс, С. Віславух, Г. Лаўмянскі і інш.

Асноўнымі раздзеламі выдання былі: навуковыя трактаты, сумесь і матэрыялы, крытычны і бібліяграфічны, раздзел хронікі і справаздач. У першым раздзеле «Навуковыя трактаты» змяшчаліся вялікія даследаванні, аб'ёмам і структурай падобныя да манаграфій і дысертацый. У другім раздзеле «Сумесь і матэрыялы» друкаваліся навуковыя артыкулы і ў вялікай колькасці гістарычныя крыніцы. Тэксты гістарычных дакументаў падаваліся на мове арыгіналу (таму ёсць і на рускай мове) і паралельна ў перакладзе на польскую мову. У крытычным раздзеле змяшчаліся рэцэнзіі на новыя навуковыя выданні, зборнікі актавых дакументаў па профілі часопіса, якія выходзілі ў Польшчы, БССР, Германіі і іншых краінах. Кожнае рэцэнзаванае выданне атрымлівала поўнае бібліяграфічнае апісанне. У бібліяграфічным раздзеле змяшчаліся паказальнікі мясцовых выданняў, краязнаўчыя паказальнікі і паказальнікі да самога выдання.

Тэматыка навуковых даследаванняў, апублікаваных у «Ateneum wileńskie», ахоплівала мноства праблем і пытанняў мінулага беларускіх зямель пераважна за перыяд XIV—XIX стст. Гэта: вялікія князі і ўнутраная палітыка ВКЛ, адносіны з Польшчай і Масковіяй, крыжакамі, крымскімі татарамі; права ВКЛ; эканоміка гарадоў, мястэчак, маёнткаў; гісторыя княжацкіх родаў, біяграфіі знакамітых дзеячаў; войны і войска; комплексныя апісанні населеных пунктаў; моўныя спрэчкі; рэлігійнае жыццё; вызваленчыя паўстанні і іншыя падзеі. У тэрытарыяльным аспекце ў часопісе можна выявіць матэрыялы пра населеныя пунктых, адміністрацыйна-тэрытарыяльныя і геаграфічныя аб'екты, якія адносіліся да Беларусі. Сярод іх дзесяткі аб'ектаў на землях Брэсцкага краю. Гэта старажытныя княствы, адміністрацыйныя і эканамічныя адзінкі (Брэсцкае ваяводства, Драгічынскі, Кобрынскі, Пінскі паветы, Кобрынская

эканомія і іншыя); гарады і мястэчкі, маёнткі, палацы, сельскія населеныя пункты, дарогі; прыродныя рэгіёны і аб'екты: Белавежа, Палессе, рэкі Буг, Мухавец, водныя шляхі, лясныя масівы і інш.[2] Такія даследаванні, артыкулы і гістарычныя дакументы самі заслугоўваюць адлюстравання ў краязнаўчых бібліяграфічных рэсурсах бібліятэк Брэсцкага рэгіёна, але яны нясуць і паток уключанай, латэнтнай бібліяграфічнай інфармацыі. Н.А. Сляднева адзначыла, што латэнтная бібліяграфічная інфармацыя зліваецца з вытворчасцю новых ведаў: аўтар навуковага тэксту ў ходзе яго стварэння ўключае спасылкі, цытаты, упамінанні, пераказы і ацэнкі тэкстаў (ідэй) іншых аўтараў[3].

У «Ateneum wileńskie» прымяняліся разнастайныя формы латэнтнай бібліяграфічнай інфармацыі: прыартыкульныя спісы літаратуры, бібліяграфічныя звесткі ўнутры артыкулаў, даследаванняў і гістарычных дакументаў, агляды навуковых твораў, уключаныя ў тэксты артыкулаў, бібліяграфічныя звесткі ў падрадковых заўвагах. У большасці публікацый аўтары выкарыстоўвалі некалькі формаў. Пераважалі спасылкі ў падрадковых заўвагах і ўнутры тэкстаў, а таксама аглядныя матэрыялы.

Так, да працы З. Абертыньскага «Літоўскі план польскіх капуцынаў» — 179 падрадковых спасылак, В. Шульца «Спрэчкі Акадэміі віленскай з піярамі аб выключным праве на школы. 1723—1753» — 202 спасылкі, С. Віславуха «Развіццё межаў і тэрыторыі Кобрынскага павету да паловы XVI стагоддзя» — 110 спасылак і інш. Вялікія матэрыялы, якія раздзеламі змяшчалі ў некалькіх выпусках, мелі самастойную нумарацыю падрадковых спасылак у кожным выпуску, напрыклад, раздзел даследавання Г. Лаўмянскага «Уваходы літоўскіх гарадоў»[4] змяшчае 159 падрадковых спасылак і інш. Упамінанне адміністрацыйных, эканамічных і прыродных адзінак, размешчаных на тэрыторыі сучаснай Брэстчыны, суправаджаецца спасылкамі на шматлікія дакументальныя крыніцы, што дазваляе разглядаць іх з пазіцый развіцця краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк вобласці.

Адметнасцю падрадковых спасылак з'яўляецца сумяшчэнне бібліяграфічных і фактаграфічных звестак. Фактаграфічныя спасылкі

---

2 На жаль, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі не поўны камплект выпускаў «Ateneum wileńskiego», таму некаторыя звесткі засталіся па-за ўвагай аўтара артыкула.

3 Сляднева Н.А. Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа. М., 1993. С. 47.

4 Ateneum wileńskie. 1924. R. II. S. 1—30.

падмацоўвалі думкі аўтараў, пашыралі аргументацыю, адлюстроўвалі іншыя прыклады. Бібліяграфічныя спасылкі забяспечвалі ідэнтыфікацыю дакументаў, уключаных у навуковы кантэкст.

Кола крыніц, якія пададзеных ў формах латэнтнай бібліяграфічнай інфармацыі, характарызуецца тэматычнай разнастайнасцю і шырынёй відавога складу. Гэта шматлікія выданні гістарычных першакрыніц, манаграфіі польскіх, рускіх, нямецкіх і іншых вучоных, артыкулы з навуковых часопісаў і зборнікаў, дакументы з прыватных, дзяржаўных і ведамасных архіваў розных краін і іншыя на розных мовах. Звесткі, якія прыводзяцца ў падрадковых заўвагах, паказваюць, што паводле відавога складу дамініруюць выданні гістарычных першакрыніц і навуковыя манаграфіі. Выданні актавых дакументаў, апублікаваныя ў Расійскай імперыі, БССР, Польшчы, Аўстрыйскай імперыі і ў некаторых іншых краінах, былі асноўнымі крыніцамі для польскіх гісторыкаў. З найбольшай частотнасцю прыводзяцца спасылкі[5] на выдадзеныя і рукапісныя кнігі Літоўскай метрыкі, «Акты, относящиеся к истории Западной России…» (A.Z.R.I.; СПб, 1846 — 1853), «Акты Виленской археографической комиссии», «Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России…» (СПб, 1863—1892), «Писцовую книгу бывшего Пинского староства…» (Вильна, 1874), «Ревизию Кобринской экономии…» (Вильна, 1876), «Писцовую книгу Пинского и Клецкого княжеств…» (Вильна, 1884), «Историко-юридические материалы, извлеченные из архивных книг губерний: Витебской и Могилевской…» (Витебск, 1871—1906), «Архив комиссии исторической» (A.Kom.H.; 1909), асобныя тамы «Полного собрания русских летописей» (P.S.R.L.), «Archiwum książąt Sanguszków» (Arch. Sang.; Lwów, 1889—1890), «Собрание государственных грамот и договоров» (Москва, 1813), «Kodex mazowiecki» (Kod. maz.), «Codex Epistolaris saeculi XV» (Cod. Ep.S XV; Kraków, 1876—1894) і многія інш. Сярод вучоных частыя спасылкі на працы М. Доўнар-Запольскага, А.С. Грушэўскага («Пинское Полесье»: «Очерк истории Турово-Пинского княжества», «Туров, Городок и Пинск в составе ВКЛ», «Пинское староство к. Боны XIV—XVI вв. — Пинские акты XV—XVI вв.», Я. Длугаша, Ф.І. Леантовіча, М.К. Любаўскага і інш.

5 Для арыентацыі ў дужках прыведзены і варыянт самага сціслага скарачэння назваў выданняў, якія прымяняліся ў латэнтнай бібліяграфічнай інфармацыі ў «Ateneum Wileńskim».

На гэтыя выданні спасылаецца Г. Лаўмянскі, калі характарызуе даходы гарадскіх пасяленняў Брэстчыны. Так, спасылкамі на «Ревизию Кобринской экономии» ён пацвярджае распаўсюджанасць у XVI ст. мясных лавак і мяснікоў у невялікіх гарадах, і ў прыватнасці ў Кобрыне і Пружанах, а на пяты том «Актов Виленской археографической комиссии» — дазвол «кобрынцам і пружанцам» лавіць рыбу ў Мухаўцы. Л. Каланкоўскі ў артыкуле «Валочная памера» спасылаецца на працы М. Доўнар-Запольскага і матэрыялы з першага тому «Źródla do historji sztuki», калі прыводзіць звесткі пра Станіслава Хвальчэўскага і Станіслава Свідэрскага, якім належала важная роля ў правядзенні рэформы на землях Брэстчыны[6]. Севярын Віславух, даследуючы фарміраванне тэрыторыі Кобрынскага павета да адміністрацыйна-тэрытарыяльнай і судовай рэформы 1565—1566гг., цытуе і спасылаецца на дзесяткі актавых крыніц і навуковых прац[7]. Такіх прыкладаў нямала, і выяўляць іх хутчэй магчыма па паказальніках да гадавых выпускаў «Ateneum Wileńskie» (Indeks autorów, osób i miescowości), якія ахопліваюць шэраг персанальных і геаграфічных рубрык, звязаных з Брэстчынай. Так, з паказальніка за 1924 г. відаць, што горад Брэст узгадваўся на старонках выдання 28 раз, Кобрын — 11, Пінск — 9, Пружаны — 6, Белавежа — 3 і шэраг спасылак да іншых аб'ектаў[8].

Некаторыя падрадковыя заўвагі аб'ядноўвалі бібліяграфічную інфармацыю, цытаты і фактаграфічныя дадзеныя. Так, спасылка № 5 у артыкуле Г. Лаўмянскага «Віленскія друкарні XVI стагоддзя» змяшчае цытаты з шэрагу крыніц і высновы самога аўтара, дакладныя звесткі з «Кнігі каморы Брэсцкай» пра дастаўку паперы ў Кобрын, Пінск, Магілёў, Мінск, Слуцк. Усе дадзеныя суправаджаюцца шэрагам бібліяграфічных апісанняў[9].

Аглядная ўнутрытэкставая інфармацыя сустракаецца часцей за ўсё ва ўступах да даследаванняў, артыкулаў і тэкстаў гістарычных крыніц. Адметнай іх рысай з'яўляецца ацэнка твораў у кантэксце распрацаванасці выбранай тэмы, што праяўляецца ў характарыстыцы крыніцазнаўчай базы прац папярэдніх даследчыкаў, меркаваннях пра іх навуковую і ідэйную вартасць. Так, у 12-м сшытку «Ateneum wileńskie» за 1927 г. Аляксандр Ёдзевіч змясціў сакрэтны «Список с докладной

6 Ateneum wileńskie. 1927. R. IV. Z. 13. S. 237—251.
7 Ateneum wileńskie. 1929 R. VI. Z. 1—2. S. 16—46.
8 Ateneum wileńskie. 1924. R. II.
9 Ateneum wileńskie. 1924. R. II. Z. 5—6. S. 409—422.

записки корпуса жандармов полковника Камаевского начальнику 4-го округа сего же корпуса генерал-майору графу Буксгевдену от 1 марта 1848 за № 12», у якім падрабязна апісваюцца падзеі экзекуцыі па справе Рэра і яго супольнікаў, удзельнікаў тайнага таварыства, у т. л. Аполіна Гофмейстара, маладога памешчыка з маёнтка Шастакова пад Брэстам[10]. У аўтарскім тэксце [А. Ёдзевіча], разгледжаны творы, прысвечаныя тэме артыкула. У падрадковых фактаграфічных спасылках пададзены звесткі пра далейшы лёс будучага «начальніка ваяводства Брэст-Літоўскага» у паўстанні 1863 г. (Месца смерці А. Гофмейстара ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» ўказана як Галіцыя, але Ёдзевіч і М. Дубецкі — аўтар артыкула пра Гофмейстара, апублікаваным у «Ateneum wileńskim» у 1923 г.[11], дакладна называюць Кракаў).

Бібліяграфічныя звесткі ўнутры тэкстаў пры цытаванні дакументаў ці ў агляднай форме прыводзіліся ў адвольным парадку, часам у дужках.

Большасць бібліяграфічных спасылак у падрадковых заўвагах, унутры тэкстаў, і ў аглядных матэрыялах дазваляе дакладна ідэнтыфікаваць дакументы, нягледзячы на непаўнату элементаў, на адвольна скарочаныя формы бібліяграфічных апісанняў, у т.л. загалоўкаў выданняў, і апісанне рускамоўных выданняў лацінскім шрыфтом, што непрыймальна ў сучаснай бібліяграфічнай практыцы. Непаўната праяўлялася ва ўключэнні абмежаванай колькасці элементаў бібліяграфічнага апісання, звычайна аўтара, назвы, тома. Старонкі дакладна ўказваліся заўсёды. Аднак часам не адзначаліся год і месца выдання ці іншыя звесткі. Таму ідэнтыфікацыя некаторых дакументаў, дастаткова вядомых у навуковым асяроддзі на той час, выклікае цяжкасці. Скарачэнне «ibid.» з дакладнымі старонкамі замяняла бібліяграфічныя звесткі пры паўторных спасылках на дакумент.

З пачатку існавання «Ateneum wileńskiego» рэдакцыя імкнулася весці бібліяграфічную інфармацыю пра новыя выданні і артыкулы, адпаведныя яго зместавай накіраванасці. Калі Публічная бібліятэка Віленскага універсітэта распачала бібліяграфічную рэгістрацыю выданняў, якія выйшлі на тэрыторыі ваяводстваў, размешчаных на землях Заходняй Беларусі (так званага Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну) і выпуск паказальнікаў «Віленская рэгіянальная бібліяграфія ў…годзе», а пазней і «Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну», гэта

10 Ateneum wileńskie. 1927. R. IV. Z. 12. S. 200—207.

11 Не змяшчае бібліяграфічных звестак.

вельмі зацікавіла рэдакцыю і чытачоў «Ateneum wileńskiego». Выпускі гэтых паказальнікаў перадрукоўваліся ў часопісе, а таксама змяшчаліся аналітычныя артыкулы пра тэндэнцыі кнігадруку на іх падставе. Па гэтых паказальніках дастаткова зручна выяўляць мясцовыя друкаваныя матэрыялы, што сёння важна пры вядзенні каталогаў і базаў дадзеных мясцовых выданняў. Бібліяграфічная інфармацыя і дадзеныя пра выдавецкую дзейнасць — каштоўны матэрыял і для вывучэння гісторыі кнігадрукавання ў Брэсцкім рэгіёне. Друкарні Брэстчыны займалі значнае месца ў выдавецкім працэсе на заходнебеларускіх землях. Брэст вызначаецца як трэці асноўны цэнтр кнігавыдання пасля Вільні і Беластока. Нават у першай палове 1930 г. з 379 выданняў[12], зарэгістраваных у Віленскім бібліяграфічным рэгіёне, 18 выйшлі ў Брэсце, Пінску, Баранавічах і Кобрыне[13]. У паказальніку «Перыядычныя выданні Віленскага бібліяграфічнага рэгіёна» адлюстроўваліся выданні за год. Газеты, часопісы і іншыя перыядычныя выданні групаваліся па раздзелах у алфавіце месцаў выхаду, унутры раздзелаў — перыядычныя выданні дадаткова дыферэнцаваліся па відах. Так, з паказальніка за 1929 г. можна даведацца, што ў Баранавічах і Кобрыне выходзілі па 2 перыядычныя выданні, у Брэсце —16, Пінску — 5 і інш.

У канцы 20-х гг. на тэрыторыі Польшчы была заснавана дзяржаўная бібліяграфічная рэгістрацыя выданняў і пачалі выходзіць бягучыя нацыянальныя бібліяграфічныя паказальнікі, таму ўлік новых выданняў у межах Віленскага бібліяграфічнага рэгіёну быў прыпынены, а сам рэгіён у 1930 г. скасаваны.

Але справа бібліяграфічнага інфармавання пра новую літаратуру, прысвечаную гістарычнаму вывучэнню зямель ВКЛ, была паспяхова прадоўжана ў Публічнай бібліятэцы імя Я. і Э. Урублеўскіх (Вільня), у якой на працягу 1929—1936 гг. складаўся бібліяграфічны паказальнік «Бібліяграфія гісторыі зямель б.ВКЛ за год…». Паказальнік выходзіў асобнымі выпускамі, а таксама публікаваўся ў часопісе «Ateneum wileńskie». Адлюстроўваліся творы друку, апублікаваныя пераважна ў Польшчы, а таксама ў БССР, СССР, Германіі, Англіі, Літве, Латвіі, ЗША і іншых краінах. Краязнаўчыя творы як навуковыя, так і папулярныя, інфармацыйна-рэкламныя ўлічваліся вельмі ўважліва. Так, у паказальніку адлюстраваны нават выданні, прыс-

12 Гэта год рэзкага скарачэння кнігадрукавання з-за эканамічных прычын.
13 Ateneum wileńskie. 1930. R. VII. Z. 1-2. S. 351—354.

вечаныя Палеска-Пінскаму краю, напісаныя сябрамі краязнаўчага гуртка дзяржаўнай гімназіі імя Ю. Пілсудскага ў Пінску. Збіраючы дакументальныя крыніцы і вусныя аповеды старажылаў пра мінулае Піншчыны, пра унікальную прыроду краю, вучні напісалі і апублікавалі ў сярэдзіне 30-х гг. шэраг твораў у дэцызыяльнай друкарні і друкарні братоў Вільковіч: «Polesie pod znakiem »nastawki» i dykty«, »Z krainy wjunów«, »Czar Polesia czar«, »Polesie i turysta», два выданні «Słów kilka o Pińsku oraz święta, obrzędy i wierzenia ludu poleskiego».

У «Бібліяграфіі гісторыі зямель б.ВКЛ…» прымянялася сістэматычная групоўка бібліяграфічных запісаў, што дазваляла ў гістарычным аспекце паказаць розныя галіны гаспадаркі, культуры і мастацтва, вайсковай справы, рэлігійнага жыцця, літаратурна-мастацкія творы, звесткі па этнічнай гісторыі, аб насельніцтве і інш. Асобна выдзяляліся і раздзелы краязнаўства, бібліяграфічных прац, біяграфій, мемуарнай літаратуры, рэцэнзій і крытычных матэрыялаў. Усяго ў паказальніку было адлюстравана 2075 дакументаў. У кожным выпуску ёсць бібліяграфічныя апісанні дакументаў, прысвечаных Брэстчыне, а таксама звесткі пра кнігі і іншыя дакументы, якія выходзілі ў гарадах рэгіёна. Так, у паказальніку за 1930 г. адлюстраваны працы вядомага краязнаўцы Рамана Гарашкевіча, выдадзеныя ў Брэсце-над Бугам: «Powiat Stoliński: notatki historyczne», «Krótki rys powiatu Brzesko-nad-Bużańskiego», «Sprawa Szlachty Zaściankowej Polesia»; кніжачка З. Гасяроўскага «Szkola na Polesiu na tle stanu i potrzeb szkolnictwa Rzeczypospolitej». У 1936 г. зарэгістраваны выдадзеныя ў Брэсце «Przewodnik po Polesiu» М. Марчака, «Poleska szopka polityczna» Г.Е. Грушчынскага і інш. Звесткі пра ілюстратараў, рэдактараў, друкарні, тэматыку выданняў і іншыя дадаткова могуць выкарыстоўвацца пры даследаванні развіцця кнігавыдання ў Брэсцкім рэгіёне ў міжваенны перыяд.

Бібліяграфічныя апісанні ва ўнутрычасопісных паказальніках аформлены уніфікавана, а колькасць элементаў дазваляе дакладна ідэнтыфікаваць самастойныя выданні і артыкулы. Недахопам бібліяграфічных апісанняў з'яўляецца транслітарацыя лацінскім шрыфтам рускіх і яўрэйскіх выданняў.

Часопіс «Ateneum wileńskie» дазваляе выкарыстоўваць выданне як крыніцу для папаўнення краязнаўчых інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк і для вывучэння гісторыі мясцовага кнігадрукавання.

Ильин А. Л.
Игнатюк Е. А.

Судьба библиотеки и архива молодовско-поречских Скирмунтов

Известный дворянский род Скирмунтов очень много сделал для развития экономики и культуры Полесья. Причем пионером промышленного развития Пинщины был Александр Скирмунт (1798—1870), получивший прекрасное образование. Он в 1818 году окончил физико-математический факультет Виленского университета, затем изучал химию в немецких, французских и бельгийских высших учебных заведениях. К 50-м годам XIX века на Пинщине сложилось два крупных центра культуры: сам город Пинск и Лунин — имение князей Друцких-Любецких. К пинскому культурному кружку можно отнести историка и писателя Антония Мошинского, скульптора и художника Елену Скирмунт, художника и композитора Наполеона Орду, к лунинскому — этнографа и фольклориста Ромуальда Зенькевича, поэта и ботаника Павла Гениюша и композитора Геркуланума Кремпского. В своем родовом имении Молодово Пинского уезда Александр Скирмунт также стал создавать один из очагов культуры, в первую очередь собирать библиотеку, содержавшую природоведческую, техническую, историческую и художественную литературу. Для библиотеки во дворце была отведена специальная комната. Известно, что его сын Генрик Скирмунт (1834—1918) в 1858 году выписывал популярный тогда литературно-исторический журнал «Тека виленьска», который издавал

известный историк Адам Киркор. Этот журнал был рупором литвинского патриотизма виленского интеллектуального кружка, в недрах которого вызревала белорусская национальная идея. Этим литвинским патриотизмом был заражен и сам Александр Скирмунт, который хорошо помнил о литовских корнях своего рода. Поэтому он скрупулёзно собирал семейный архив, особенно то, что касалось литовского происхождения рода Скирмунтов, герба Дуб. Неслучайно, что Александр Скирмунт был одним из попечителей Виленского музея древностей, руководителем которого являлся Адам Киркор[1]. Отсюда и то, что в начале XX века лидерами краёвого движения стали его внуки: Роман и Констанция Скирмунты, а первый — председателем правительства БНР[2].

После смерти в 1870 году Александра Скирмунта его имения были разделены между шестью его сыновьями: Молодово досталось четвертому сыну Генрику, а соседнее имение Поречье с суконной фабрикой и сахарным заводом — третьему сыну Александру Скирмунту (1830—1909). В Поречье одно из фабричных зданий было перестроено в усадебный дом, и в новой резиденции поселился Александр Скирмунт, где активно занялся хозяйственной деятельностью. Думается, что молодовская библиотека была разделена: художественная и историческая часть осталась в Молодово, а научно-техническую часть перевезли в Поречье. Кроме того, Александр Скирмунт, возможно, забрал и часть семейного архива.

Вскоре владельцу Молодова в управлении имением стал помогать младший сын Генрик Скирмунт (1868—1939) — известный поэт и композитор. Тогда, естественно, молодовская библиотека стала пополняться художественными и музыкальными произведениями. Стал складываться и новый архив, который состоял в основном из черновиков произведений поэта и композитора, а также писем к нему, в том числе и известных деятелей культуры. В архиве хранился и «альбом для Элизы Ожешко, которая неоднократно навещала Молодово и назвала альбом «Подручная книжечка с жемчужинами». Она была в зеленом кожаном с позолотой переплете и имела позолоченные края. В альбом Элиза вписывала полюбившиеся стихи, цитаты и собственные афоризмы. На

1 Каханоўскі, Г. Руплівец нашай старасветчыны / Г. Каханоўскі, А. Каханоўскі . Мн., 1991. С. 31.

2 Смалянчук, А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй : Пол. рух на беларускіх і літоўскіх землях, 1864—1917 г. / А.Ф. Смалянчук ; Установа адукацыі «Гродз. дзярж. ун-т імя Я. Купалы». — Гродна : ГрДУ, 2001. — 320, [1] с. — Бібліягр.: 285-304 (508 назв.).

первой странице альбома имелась надпись: «Эту книгу с собственноручно записанными мыслями своими, цитатами из чужих произведений Элиза Ожешко передает Константину Скирмунту. 1909.» Здесь же хранились альбомы со стихами Александра Ходько, Юлиана Корсака и др. Во время Первой мировой войны молодовский дворец в течение трех лет находился в прифронтовой полосе. И только благодаря тому, что Генрик Скирмунт не покинул тогда своего имения, молодовский и поречский дворцы были спасены и не разграблены. Но в период 1919—1920 гг. молодовскую усадьбу разграбили большевики, а старинная библиотека и архив погибли. Хотя по некоторым сведениям библиотека частично сохранилась: «Собрание книг не превышало в 1920 г. тысячи томов на польском и французском языках»[3]. Но 1939 год уже не пощадил и владельцев дворца: Генрик Скирмунт вместе с сестрой Марией были зверски убиты. Отметим также, что Генрик Скирмунт собирал местный фольклор. Так, в соседнем селе Табулки им была записана народная песня о католическом святом Андрее Боболе. Вполне вероятно, что погибло и собрание фольклора, хранившееся в молодовском дворце. Да и вообще вопрос о влиянии полесского фольклора на музыкальное творчество Генрика Скирмунта совершенно не изучен.

Печатный каталог И. Рыбацкого представляет собой брошюру из 12 ненумерованных листов. На форзаце первого листа каталога напечатано: ***Библиотека И. Рыбацкого в г. Брест-Литовске. Белостокская улица, дом Тымянского***. На титульном листе даны более развернутые сведения «***Брестская еврейская библиотека (Белостокская улица, дом Тымянского, где Ссудо-сберегательное т-во»),*** включающие дополнительную информацию о режиме работы библиотеки и абонентской плате за пользование: «***Абонентная месячная плата 20 коп. Залог 2 руб. Библиотека открыта ежедневно, кроме пятницы и субботы, от 3 ч. дня до 8 ч. вечера по местному времени»***. Внизу титульного листа указано место и способ издания: ***Брест-Литовск. Типо-Литография И.Л. Ракова, 1911***.

Как видно из каталога, весь фонд библиотеки был поделен на три условных раздела и своеобразного приложения в виде отдельного списка авторов и сборников. Отдельно был выделен и «Особый отдел литературы и журналов».

В начале каталога представлена информация о том, что «***из более 6 000 книг, находящихся в библиотеке, имеются 1) Полные собрания сочинений следующих авторов…»,*** где в алфавитном порядке приведены фамилии авторов, в основном без инициалов. Исключение составили лишь Л.Н. Толстой, А.К. Толстой, М. Твен, Г. Успенский. Некоторые фамилии приведены, возможно, в искаженном виде. Представляем, согласно каталогу, список авторов, чьи полные собрания сочинений находились в библиотеке И. Рыбацкого, сохраняя, при этом особен-

ности орфографии составителя. Это книги: «Андреева. Ауэбаха. Аша. Андерсена. Андреевича. Агафонова. Айхенвальда. Анучина. Ахматова. Ахад-Гаана. Алтаева. Анского. Байрона. Бороздина. Бялика. Буки-бен-Иогли. Белинского. Бершадского. Бьернсона. Бебеля. Брандеса. Боборыкина. Бен-Ами. Базилевского. Беренже. Брерт-Гарта. Бичер-Стоу. Бокля. Берне. Беллами. Вербицкой. Вересаева. Вассермана. Водовозова. Виндельбанда. Гоголя. Гончарова. Гейне. Грибоедова. Гауптмана. Герцеля. Гессена. Гюго. Горького. Гамсуна-Кнута. Грима. Гарина. Гаршина. Герцена. Геккеля. Геттерна. Гросса. Гете. Греца. Гиршбейна. Гомера. Диккенса. Дефо. Додэ. Дорошевича. Достоевского. Дубнова. Данилевского. Дрэпера. Данченко-Немир (Немировича-Данченко). Дарвина. Жуковского. Жюль-Верна. Жаботинского. Жорж-Занд. Зангвиля. Золя. Зудермана. Загоскина. Ибсена. Карамзина. Кляузнера. Куприна. Когана. Короленко. Карнелеса. Лацаруса. Леванды. Лассаля. Лилиенблюма. Леруа-Болье. Липперта. Лермонтова. Лейкина. Леббока. Лукашевича. Льюса. Майн-Рида. Метерлинга. Матенгацци. Михайловского. Мирбо. Мамин-Сибиряка. Мордовцева. Минье. Ницше. Нордау. Надсона. Найденова. Оршанского. Оржешко. Островского. Овсян-Куликовск. Пушкина. Пружанского. Потапенко. Пшибышевского. Писарева. Паульсена. Пасманика. Пэна. Переца. Реклю. Р[э]анна. Рабиновича. Рывкина. Скотта В. Сенкевича. Сю. Сапира. Спенсера. Салтыкова—Щедрн. Станюковича. Свифт. Сеньобоса. Сеченова. Толстого А.К. Толстого Л.Н. Твэн М. Тетмайера. Тургенева. Т[э]н. Туган-Баран. Тимирязева. Успенского Глеба. Фламмариона. Фруга. Фулье. Французоа. Фейерберга. Флавия. Хвольсона. Чирикова. Чехова. Членова. Челпанова. Чижова. Чернышевского. Шиллера. Шиллер-Михайл. Шпильгагена. Шермана. Шекспира. Шницлера. Шопенгауэра. Шелгунова. Шера. Шолом-Алейхема. Шахрая. Эллиотъ. Эмара. Эберса. Юшкевича. Ярошевского. Яффе».

Второй раздел указанного каталога включал: 2) «Все сборники: «Знание». «Земля». «Пережитое». Еврейск. сборники. Все альманахи «Шиповник». Нижегородский сборник. Народная энциклопедия изд. Сытина (20т.), Еврейская энциклопедия, изд. Брокгауза и Ефрона. Еврейская библиотека 80-х годов. «Восход» за первые 10 лет. Универсальная библиотека (400 выпусков.). Жизнь замечательных людей, изд. Павленкова (все выпуски). Еврейск. Старина. Вестник О-ва р. пр. между евреями и мн. др. книгъ».

Третий раздел составляли: 3) «Журналы: Современный Мир. Русское Богатство. Новый журнал для всех. Новая Жизнь. Русская Мысль. Разсвет. Юный Израиль. Маяк. Путеводный огонёк. Образование. Еврейская Жизнь. Восход. Мир Божий. Еврейский Мир. Запросы Жизни. Восходы».

После трех разделов отдельным списком шла группа авторов, которые не имели полных собраний и, скорее всего, были представлены отдельными изданиями. Это произведения: «Айзмана. Амфитеатрова. Арцыбашева. Аксенова. Аннунцию. Бернштейна. Бунина. Ведеки[н]да. Вейнигера. Григоровича. Гамзе. Дымова. Джерома. Елпатьевского. Конопницкой. Каменского. Лухмановой. Лункевича. Мопассана. Манна Томаса. Маргерат. Михаэлис. Некрасова. Ольнема. Посадова. Горбунова. Ремизова Алекс. Сервантеса. Серошевского. Сологуба. Скитальца. Тэффи. Тимковского. Тана. Фореля. Чуковского. Шоу. Шапиръ Ольги. Шехерезады. Эделя. Федорова», а также сюда же были отнесены: «Сборники: Сборник Италия. Сборник Дети изгнания. Всеобщая библиотека (180 вып.). Библиотека современной литературы (50 вып.)».

«Особый отдел литературы и журналов для детей» фактически вообще не был расписан составителем.

Вторая часть этого каталога издана на еврейском языке, и, вероятнее всего, составляет перевод первой части.

Как видим, каталог библиотеки И. Рыбацкого не отличается доскональностью, не отвечает общепринятым требованиям, предъявляемым к подобного рода изданиям.

В то время библиотечное делопроизводство было хорошо развито, и, анализируя данный документ — каталог, приходим к выводу, что описанием библиотеки занимался человек, далекий от правильного и точного учета и описания вверенного ему книжного фонда.

Сохранилось много аналогичных инвентарей-каталогов того времени, которые были описаны по канонам библиотечного делопроизводства, давали полную и объективную картину библиотечного собрания того или иного владельца. В нашем же случае нет достаточного представления о репертуаре хранившихся в библиотеке изданий, выходных данных и др.

Тем не менее, несмотря на все негативные характеристики данного каталога, можно утверждать, что это издание имеет положительное значение для истории книжной культуры, в частности, для исследований

библиотечных собраний. Так, имея сведения о количественном составе данной коллекции (6 тыс. экземпляров), ее персоналиях, частично (на примере журналов и сборников) о репертуаре, можно сделать вывод, что библиотека И. Рыбацкого, как видно из ее названия, прежде всего была ориентирована на еврейского читателя, хотя по каталогу трудно определить процентное соотношение еврейских и других изданий, находящихся в ее фонде. В коллекции довольно широко представлена как русская, так и в целом мировая литература, причем многие книги, на наш взгляд, являлись прижизненными изданиями произведений большинства из перечисленных в каталоге авторов. Смеем предположить, что такие библиотеки были популярны среди среднего сословия.

Интересна и следующая деталь: за пользование книгами необходимо было внести залог в размере 2 рублей. Абонентская плата составляла 20 копеек. Вероятно, эта мера была предпринята владельцем для защиты фонда от возможной кражи, но нельзя исключить и коммерческого характера данного введения.

Тумилович В. Н.

Развитие библиотек и контроль государства за распространением печатных изданий в Лунинецком повете в 1921—1939 годах

С началом 1921 года село Лунинец получает статус города и становится центром одноименного повета Полесского воеводства. Возрожденная Польша отсчитывала третий год бытия, но среди тысяч задач, которые нуждались в срочном разрешении, развитие библиотек и отслеживание поступающей в библиотечные фонды литературы не ушли из- под контроля молодого государства. Этот контроль с годами только усиливался и преследовал, прежде всего, идеологические цели. Государство было заинтересовано в увеличении библиотечной сети, но не могло допустить поступления в библиотеки, как тогда называли, запрещённой литературы.

Можно назвать ряд причин, сдерживающих рост числа библиотек в Лунинецком повете в начале 1920-х годов. Очевидно, главная из них — низкий процент грамотности в Полесском воеводстве.

Здесь в 1921 году из лиц, старше 10 лет, 71,7% населения было безграмотно. Но через 10 лет статистика заметно улучшилась, и число безграмотных сократилось до 48,4%. Несмотря на это, полесский регион оставался самым безграмотным в Польше. В таких условиях было преждевременно и нецелесообразно форсировать рост числа библиотек: читателей было — единицы. К середине 1920-х годов число образован-

ного населения стало увеличиваться за счёт молодёжи — учащихся повшехных (общеобразовательных. — *В.Т.*) школ. С этого времени и начинается уверенный рост числа польских библиотек на Лунинетчине.

Как сообщала в своё время газета «Жыце Полеся», 1 апреля 1925 г. «Товажиство Унивэрситэту Роботничэго» открыло в Лунинце библиотеку, пользоваться которой мог любой житель города и окрестных деревень, старше 16 лет. Библиотека была платной. О численности книжного фонда в печати не сообщалось[1].

В городе в 20-х годах имелось русское народное училище, которое вместе с русским благотворительным обществом располагало библиотекой. Она носила имя графа Льва Толстого. Сохранился библиотечный книжный штемпель, позволяющий судить, что в данном случае в библиотеке было свыше 500 книг[2].

В 1921 г. в Лунинце была открыта государственная гимназия им. Владислава Ягелло. Учебное заведение подобного рода также невозможно представить без библиотеки, но сведений о численности её книжного фонда обнаружить пока не удалось.

Наиболее полная информация о библиотечной сети отдельных гмин и целого повета сохранилась в «Статистических отчетах, касающихся общественных домов и домов культуры». Но в отчётах — только перечень общего числа библиотек, а численность книжного фонда не указана. Так, в 1936 г. ситуация в повете выглядела следующим образом:

— гмина Чучевичи — 3 дома людовых; в них, светлицах, школах — 8 библиотек;

— гмина Лаховская — 1 дом людовы; в нем, светлицах, школах — 6 библиотек, 5 радиоприёмников;

— гмина Ленинская — 4 дома людовых; в них, светлицах, школах — 6 библиотек, 8 радиоприёмников;

— гмина Лунинская — 6 домов людовых (и 1 строящийся), в них, светлицах, школах — 20 библиотек, 8 радиоприёмников, 4 любительских театра;

— гмина Круговичи — 4 дома людовых (и 3 строящиеся); в них, светлицах, школах — 4 библиотеки, 4 радиоприёмника;

---

1 Туміловіч В. Папяровыя сведкі мінулага // Лунінецкі сшытак. № 5. Лунінец, 2005. С. 6—14.

2 Колосов Л. Лунинецкая сфрагистика // Лунінецкі сшытак. № 6. Лунінец, 2006. С. 21.

— в Лунинце и повете — 19 домов людовых (и 5 строящихся); в них, светлицах и школах — 47 библиотек, 38 радиоприёмников, 8 любительских театров[3].

Названная выше цифра — сорок семь — только часть библиотек бывшего повета; к ним нужно добавить примерно столько же общественных библиотек, принадлежавших частным лицам, а также армии, церквам, костёлам, синагогам и т.д. Нужно учитывать и то, что границы бывшего повета и нынешнего района не совпадают.

Именно перечисленные выше 47 библиотек — из числа действующих при домах людовых, светлицах, школах (а также при государственных учреждениях и проправительственных объединениях) — могли относительно спокойно осуществлять свою деятельность.

Что касается библиотек политических объединений, объединений национальных меньшинств, то в 20—30-е годы над ними постоянно витал дух тотальной слежки и полицейского контроля. Другими словами, государственная политика в отношении негосударственных библиотек была не вполне лояльной, и Лунинетчина — тому яркий пример.

В 1920-е и особенно в 1930-е годы в Лунинецком повете возникает ряд общественных организаций, и некоторые из них имели в своих уставах чётко обозначенный пункт: создание библиотек. Для полиции это добавило хлопот: нужно было отслеживать, не попадает ли в те библиотеки запрещенная литература. В числе организаций, устав которых предусматривал создание библиотек, были «земледельческие кружки» (кулка рольничэ); они, в частности, действовали в Кожан-Городке, Лахве, Любожерди и, вероятно, в некоторых других населённых пунктах. Как правило, все «кулка» имели небольшие библиотечки. Но это не вызывало озабоченности у полиции: вся литература таких библиотек была сельскохозяйственной тематики, изданий политического характера не встречалось.

С 12 марта 1931 г. на Лунинетчине возникают сионистские организации «Гехалюц-Пионэр». Власти зарегистрировали сеть таких ячеек и тут же повели против них борьбу. Устав «гехалюцев» требовал создания библиотек. А литература в таких библиотеках — сплошь политического характера. И полиция затребовала у сионистов подробные описи

3 Государственный архив Брестской области (ГАБО) Ф. 2002. Оп.2. Д. 582. С. 14—32.

их книжных фондов. Выяснилось, например, что ганцевичекие «гехалюцы» имели в библиотеке 92 книги. В марте 1931 г. Казимеж Бариничек, руководитель реферата безопасности (т.е. одного из отделов полиции), провёл люстрацию ганцевичских «пионеров» и среди прочих недостатков выявил, что «число членов организации — 27 — не соответствует действительности. Нет штатного библиотекаря, а библиотечный фонд — на руках»[4].

Если устав общественной организации не предусматривал создания библиотеки, то, дабы не иметь дела с полицией, библиотеку не создавали. В повете было несколько товариществ, напрямую причастных к сфере образования и, как ни странно, структуры эти не всегда имели библиотеки.

Так, с 1928 г. в Лунинце существовало товарищество «Друзей профобучения...» (Пшыяцюл осьвяты заводовэй и научыцели шкул заводовых), которое в 1933 г. возглавил Красковски Андрей, директор Кассы Комунальной и редактор «Кроники Лунинецкэй». В годовых отчетах товарищества мы не находим никакого упоминания ни о библиотеке, ни о штатной единице библиотекаря. В описи имущества (1933) значится несколько схем и таблиц, 8 географических карт, 24 учебника — это вошло в опись как обычное имущество, но не как библиотека[5].

Среди общественных объединений мы находим такое, которое уже в силу своего названия обязано было иметь библиотеку, — «Товарищество помощи студентам евреям». Но оно по причине бедности вообще библиотеки не имело. В 1933 г. его касса насчитывала лишь 63 злота 60 грошей; эту сумму в виде помощи поделили между тремя бедными студентами[6].

С 12 августа 1930 г. действовало в Лунинце еще одно товарищество — «По оказанию помощи еврейским школам и культуре» (сокращенно — «Шуль-Культ»). Казалось бы, тут библиотека должна быть обязательно! Да и товарищество было многочисленно: насчитывало в 1933 г. 83 члена. Но власти признали, что оно «фактически бездействовало», и распоряжением воеводского правления от 10.04.34 предписывалось его закрыть.

---

4 ГАБО. Ф. 2002. Оп.2. Д. 285. С. 174.
5 ГАБО. Ф. 2002. Оп.2. Д. 219.С. 20.
6 ГАБО. Ф. 2002. Оп.2. Д. 346. С. 7.

Составили опись имущества, где указано, что среди прочего, у Шуль-Культа было 3 таблицы, 4 плаката по зоологии и… никаких книг![7]

Пыталось расширить в Лунинце свою деятельность и украинское национальное общество «Ридна школа», но власти с самого начала увидели в нем замаскированную «коммунистическую» организацию.

«Украиньськэ сэляньськэ объеднання» возникло в Лунинце 19 июля 1931 г. при поддержке партии Сельроб-Едность как новая пристройка компартии», — это строки из секретного письма воеводского правления, отправленного властям Лунинца в марте 1933 г. Письмо намекало старосте, чтобы усилиями повета вынудить означенное суспильство не разворачивать, а сворачивать свою деятельность. О «Ридной школе» в Лунинце сохранилось очень мало сведений, и была ли у «Школы» библиотека — неизвестно[8].

Один только Лунинец — без повета — насчитывал в 1920—1930-е годы свыше двух десятков различных товариществ, обществ, союзов, которые не были структурами, созданными органами власти. Все они имели уставы, печати, вели отчетную документацию. Некоторые из них были совсем крошечными: насчитывали по 5—7 человек. И только немногие из них брали на себя хлопоты по открытию библиотек.

Власти не только пресекали распространение запрещенной литературы, но и прослеживали личную жизнь несговорчивых редакторов и корреспондентов. Так, староста Лунинецкого повета получил срочное сообщение из Варшавы, что редактор «Дэр Данцигер Форпостэн» с корреспондентом В. Ленцем имеют намерение отправиться автомобилем из Варшавы в Румынию, при этом будут следовать через Пинск, Луцк, Львов. Об этом были тут же оповещены власти Бреста, Кобрина, Дрогичина, Пинска, Лунинца — тех поветов, на территории которых ожидалось появление нежелательных гостей.

А вот схема недопущения запрещенной литературы в руки читателя выглядела так.

Едва воеводское правление узнавало, что где-то издается, например, коммунистическая литература — тут же старостам поветов рассылались распоряжения о необходимости усиления контроля за распространением печатных изданий и изъятием тех из них, которые перечислены

7 ГАБО. Ф. 2002. Оп.2. Д. 346. С. 80.
8 ГАБО. Ф. 2002. Оп.2. Д. 582. С. 3.

в списке воеводского правления. При этом старосты поветов время от времени письменно докладывали, как выполняется распоряжение.

Так, в 1936 г. полесское воеводское правление направило старостам (в том числе и лунинецкому) циркуляр об изъятии периодического издания на белорусском языке «Наша воля» (двухнедельника) и еврейского еженедельника «Зыбн Таг».

В этом же списке — и другие издания, подлежащие изъятию из продажи: «Попросту», «Смена», «Пшэкруй тыгодня», «Левы тор», «Обличэ дня», «Наша праца», «Знания»[9].

Перечень печатных изданий, подлежащих изъятию, время от времени менялся. В Лунинце как-то получили указание об изъятии коммунистической литературы на… французском языке! Таковая, однако, в полесской глубинке обнаружена не была.Выискивать запрещенную литературу помогали так называемые «тайные экспозиты» — информаторы, завербованные полицией из числа местного населения. В 1925 г. их в Лунинце насчитывалось 39[10].

Воеводскому правлению стало известно — и это отмечено в циркулярных письмах, — что на территории Лунинецкого повета обнаружена запрещенная пресса у Шишко Яна (д. Будча) и у Берковича Менахема (г. Ганцевичи) — речь шла о периодических изданиях «Карта», «Зыбн Таг» и «Кверазнит», выходящих в Вильно.

Дальнейшие расследования показали, что запрещенные издания обнаружены в повете в общей сложности у 8 человек. Бывали проблемы и при подписке на газеты. Так, 6 мая 1936 года войт гмины Бостынь доложил в повет о том, что 20 человек упомянутой деревни расторгли подписку на «Газету Полесскую»[11].

Заметим, что «Газета Полесская» не значилась в воеводском списке запрещенных изданий. Видимо, из опасения, что газету закроют и подписываться на это издание нет смысла, бостынцы и расторгли договор.

При поступлении в киоск нового, ранее неизвестного издания, владелец киоска запрашивал у старосты повета право на продажу такого СМИ. Именно так поступил в 1936 г. владелец буфета при железнодорожной станции Микашевичи некто В. Хома. Он выяснял вопрос, можно ли

9 ГАБО. Ф. 2002. Оп.2. д. 907. С. 6.

10 Туміловіч В. Аб тайнай экспазітуры паліцыі ў былым Лунінецкім павеце // Лунінецкі сшытак. № 8. Лунінец, 2008. С. 7.

11 ГАБО. Ф. 2002. Оп. 2. Д. 907. С. 17, 56.

ему продавать печатное издание «Рух», издаваемое Полесским Товариществом Железнодорожных Обществ[12].

Посмотрим теперь, чем же торговали, например, в газетном киоске в Лунинце у Менахема Лещинского. В перечне печатной продукции — «Дэр Момэнт» — 20 штук; «Гайнт» — 22 штуки; «Дас нойе Ворт» — 20 штук; «Бадъё» — 11 штук; «Гайнтидэ Нойес» — 3 штуки; «Хвиля» — 3 штуки; «День — добрый» — 4 шт. В Лахве, в киоске Николая Столярчука, как следует из донесения участкового полицейского, продавались следующие издания: «Газэта польска», «Экспресс поранны», «Курьер поранны», «День — добрый», «Пшеглёнд Спортовы», «Кино», «На широком свете», «Ас», «Муха». Кроме перечисленных изданий, есть и на русском языке: «Меч», «Русское слово»[13].

Профессиональный, относительно спокойный и уравновешенный подход к созданию новых библиотек, взявший на Полесье начало к середине 1920-х годов, в течение последующего времени сменился постоянным вмешательством полиции в контроль за библиотечными фондами, в различные сферы общественной, политической, культурной жизни, в распространение печатной продукции. Незаметно взяв на себя роль цензора в вопросах комплектации библиотечных фондов новыми поступлениями, полицейские власти стали практиковать себя и в роли цензоров театра: прежде чем разрешить театральную постановку, чиновники требовали предварительно ознакомить их с репертуаром.

И общество сделало ответный шаг: часть общественных организаций не стала регистрировать свои книжные сборы в качестве библиотек, т.к. демонстрировать их означало привлечь внимание полиции. По этой причине очень трудно назвать число библиотек, бывших на Лунинетчине в 1921—1939 годах. И ещё: на Лунинетчине примерно с середины 1930-х годов всё чаще и чаще стали встречаться домашние библиотеки у горожан и простых крестьян, даже не у самых зажиточных.

12 ГАБО. Ф. 2002. Оп. 2. Д. 907. С. 20.
13 ГАБО. Ф. 2002. Оп. 2. Д. 907. С. 44, 46.

Турмасава Л. І.

Берасцейскія землі ў дакументах Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага

Берасцейшчыну і Гарадзеншчыну звязвае велічная агульная гісторыя. Акрамя таго, што нашы вобласці — суседкі, у XIX—пачатку XX стст. гэтыя землі ўваходзілі ў адну адміністрацыйна-тэрытарыяльную адзінку — Гродзенскую губерню. Землі былых Брэсцкага, Кобрынскага, Пружанскага, часткова Слонімскага паветаў займаюць немалую частку сучаснай Брэсцкай вобласці.

Гродзенскае губернскае праўленне мела сваю губернскую друкарню. Гродзенская абласная бібліятэка ганарыцца калекцыяй выданняў гэтай друкарні, якія змяшчаюць інфармацыю і аб землях Берасцейшчыны. У асноўным, яны прадстаўлены працамі Гродзенскага губернскага статыстычнага камітэта. Сярод іх — агляды, памятныя кніжкі, манаграфіі. Выяўленне дакументаў вялося па краязнаўчаму і алфавітнаму каталогах нашай бібліятэкі.

Наша бібліятэка з'яўляецца буйнейшым фондатрымальнікам «Аглядаў Гродзенскай губерні» у рэгіёне, якія ў нас захоўваюцца з 1879 па 1913 гг., дзе адлюстраваны матэрыялы аб яе жыццядзейнасці не толькі ў цэлым, але і па паветах. «Памятных кніжак Гродзенскай губерні» — усяго толькі тры: за 1871, 1889 і 1899 гады. Яны складаюцца з адрасоў-календароў і

статыстычна-даведачных матэрыялаў. Адрасы-календары змяшчаюць звесткі не толькі аб усёй губерні, але і аб паветах.

Павышаным попытам сярод чытачоў карыстаецца яшчэ адно выданне Гродзенскага статыстычнага камітэта. Гэта — «Список землевладений в Гродненской губернии» (1890), які змяшчае статыстычныя звесткі аб землеўладаннях па населеных пунктах паветаў згодна з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем Гродзенскай губерні з указаннем землеўладальнікаў і колькасці зямлі.

У Гродзенскай губернскай друкарні выдадзена кніга вядомага гродзенскага гісторыка і краязнаўца, члена гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта, супрацоўніка «Гродненских губернских ведомостей» Уладзіміра Сяргеевіча Манасеіна «Крестьянский вопрос в Гродненской губернии в XIX столетии» (1902).

Аўтар гэтай кнігі мае непасрэднае дачыненне і да Берасцейшчыны, таму што служыў на розных афіцэрскіх пасадах у Кобрынскім пяхотным палку. Гэта выданне для нас яшчэ каштоўнае і тым, што змяшчае аўтарскі аўтограф.

Асобнае выданне змяшчае дакументы Гродзенскага таварыства сельскай гаспадаркі, якое дзейнічала ў 1900—1915 гг. Пад адной вокладкай сабраны статут, інструкцыя для Савета, Сакратара, Казначэя і членаў (1901), пратакол Агульнага Сходу членаў ад 10 лютага 1901 года, журналы звычайнага агульнага сходу ад 10 чэрвеня і 17 лістапада 1901 года, 31 сакавіка, 31 мая і 24 лістапада 1902 года. Напрыклад, у Журнале звычайнага агульнага сходу Гродзенскага таварыства сельскай гаспадаркі ад 31 сакавіка 1902 г. надрукаваны даклад князя С.І. Пузыны аб заснаванні Кобрынскага аддзела Таварыства і спрэчкі з нагоды гэтага пытання.

Інфармацыю пра Берасцейшчыну адлюстроўвае і шэраг санктпецярбургскіх крыніц. Не з'яўляецца сакрэтам, што першакрыніцай па вывучэнні Гродзенскай губерні з'яўляюцца «Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния» ў 2-х частках, складзеныя знакамітым гісторыкам і этнографам Паўлам Восіпавічам Баброўскім. У працы — звесткі пра гісторыю, гаспадарку, этнаграфію, асвету, пра гарады і найбольш значныя мястэчкі губерні.

Каштоўнейшым набыткам аддзела з'яўляюцца матэрыялы Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі 1897 года. Вып. XI. Гродзенская губерня (1904), які змяшчае звесткі па паветах і гарадах.

У аддзеле захоўваюцца статыстычныя матэрыялы «Волости и гмины 1890 года. XI. Гродненская губерния » (СПб. 1890).

Даследчыкі гісторыі сельскай гаспадаркі актыўна выкарыстоўваюць «Працы мясцовых камітэтаў аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці. Вып. XI. Гродзенская губерня» (СПб. 1903). У гэтым выданні, у тым ліку, знаходзяцца дакументы Брэсцкага, Кобрынскага і Пружанскага павятовых камітэтаў. Гэтая тэма асвятляецца і ў статыстычных матэрыялах «Главнейшие данные поземельной статистики по обследованию 1887 года. Вып. IX. Гродненская губерния.» (СПб. 1896).

Звесткі пра развіццё адукацыі, пра буйнейшыя навучальныя установы ў губерні адлюстроўвае «Памятная книжка Виленского учебного округа за 1911 — 1912 учебный год» (Вільня, 1912).

Каштоўным выданнем міжваеннага перыяду з'яўляецца «Обзор народного хозяйства Польши» (Варшава, 1927), дзе можна знайсці звесткі аб развіцці берасцейскіх зямель таго перыяду, якія ўваходзілі ў склад Беластоцкага, Наваградскага, Палескага ваяводстваў Другой Рэчы Паспалітай. Выданне падрыхтавана Польска—Савецкай Гандлёвай палатай для пазнання гаспадарчымі арганізацыямі СССР народнай гаспадаркі Польшы і выдадзена на рускай мове.

Несумненна, даследчыкаў прыроды зацікавіць манаграфія прафесара Аляксея Іванавіча Кайгарадава «Клімат Заходняй Беларусі» (Мн., 1932), якая змяшчае кароткі нарыс прыродных умоў Заходняй Беларусі, кліматычную характарыстыку краю, аналіз уплыву клімату на развіццё сельскай гаспадаркі.

Такім чынам, названыя асноўныя выданні XIX—пачатку XX стст. і міжваеннага перыяду дапамогуць даследчыкам больш глыбока спазнаць мінулае Берасцейшчыны.

Жылко В. В.
Туміловіч В. М.

Бібліятэкі на Лунінеччыне ад узнікнення (XVI ст.) да 1940-х гадоў

На Лунінеччыне ў часы сярэднявечча землеўладанні належалі знакамітым родам Кішкаў, Мантыгірдавічаў, Радзівілаў, але кіраваліся звычайна адміністратарамі[1]. Так што казаць пра існаванне значных бібліятэк пры маёнтках у XVI ст. на Лунінеччыне пакуль няма важкіх падставаў. Хаця кнігі тут меліся, тым болей у наступныя стагоддзі. У сваім «Дыярыюшы» Міхал Казімір Радзівіл у 1753 годзе зрабіў запіс, што, знаходзячыся ў Лахве, «вечарам чытаў «Псалтыр»[2].

У XVI ст. мы знаходзім першыя згадкі пра існаванне на Лунінеччыне хрысціянскіх цэркваў. А пры апошніх павінны былі быць хаця б невялікія кнігазборы. У прыватнасці, у канцы XVI ст. праваслаўныя цэрквы былі ў Лунінцы, Луніне, Кажан-Гарадку, Бастыні, у канцы XVII ст. — у Лунінцы, Дзятлавічах (разам з манастыром), Моршчынавічах, каталіцкія — у Кажан-Гарадку, Лахве, уніяцкія — у Луніне, Бастыні, Язвінках, Вічыне, Кажан-Гарадку, Лахве, Мокраве, Сінкевічах, Краснай Волі, Сітніцы, Вільчы, Вялікіх Чучавічах[3].

---

1 Памяць. Лунінецкі раён. Мн., 1995. С. 33.
2 Нефідовіч С. Радзівілы ў Лахве // Лунінецкі сшытак. № 3-4. Лунінец, 2005. С. 14—17.
3 Памяць. Лунінецкі раён. С. 35, 42.

Інвентар 1588 года згадвае ў Лунінцы новазбудаваную праваслаўную царкву; у 1594 годзе адзначана дзейнасць царквы ў Лахве[4]. У канцы XVIII ст. на Лунінеччыне налічвалася 2 праваслаўныя, 2 каталіцкія і 13 уніяцкіх храмаў[5].

Не пазней XVII ст. на Лунінеччыне з'явіліся яўрэі, якія мелі свае кнігазборы. Яўрэйскія дзеці павінны былі ўмець чытаць і пісаць як на старажытнаяўрэйскай мове, так і на новаяўрэйскай (ідышы). Жыццё патрабавала ўмець чытаць і пісаць і на польскай, пазней на рускай мове. Найбольшыя іудзейскія абшчыны былі ў Кажан-Гарадку, Лахве, Луніне, Лунінцы, Мікашэвічах, іншых населеных пунктах.

Першы кальвінісцкі храм быў збудаваны ў 1635 годзе ў Кажан-Гарадку. Звесткі пра наяўнасць кальвінісцкай літаратуры да нас не дайшлі. Вядома, што ў Лахве быў каталіцкі манастыр, але яго пабудовы ў XIX ст. разабралі. З гэтага матэрыялу ў 1864 г. была ўзведзена праваслаўная царква ў імя Найсвяцейшай Багародзіцы, якая мела «бібліятэку і нават значную»[6].

У 1870-я гады ў Барысаглебскай царкве ў в. Лунін «у маёмасці значыліся... поўны набор богаслужбовых кніжак і адно Евангелле ў металічна-пасярэбраным акладзе». Апісанне 1879 г. згадвае ў Георгіеўскай царкве ў в. Мокрава «Евангелле адно, у адну восьмую долю аркуша, у суцэльным металічным акладзе». У Прэабражэнскай царкве ў вёсцы Язвінкі «мелася тры Евангеллі, адно з іх — у аксамітавым пераплёце з сярэбраным адлюстраваннем Уваскрасення і евангелістаў». У лунінецкай Крыжаўзвіжанскай царкве мелася «бібліятэка значная». Гэтая царква «мела два Евангеллі, але не было «псалтыри общей и месячных миней». Усе кнігі былі старажытнага друку і вельмі старыя»[7].

Дзяцелавіцкі праваслаўны манастыр узнік прыкладна ў 1622—1625 гг. «У манастыры мелася даволі вялікая бібліятэка старажытных рукапісных і друкаваных кніг, пераплётная майстэрня». У ліпені 1812 г. французамі была разгромлена багатая бібліятэка Слуцкай духоўнай семінарыі, акупанты раскладвалі з кніг вогнішчы. Захаваліся кнігі на

4 Памяць. Лунінецкі раён. С. 56, 94.
5 Памяць. Лунінецкі раён. С. 45.
6 Памяць. Лунінецкі раён. С. 96—97.
7 Памяць. Лунінецкі раён. С. 102, 104, 108, 122—123.

руках у выкладчыкаў і семінарыстаў. Іх сабраў студэнт Ф. Смоліч і тайна вывез у Дзяцелавіцкі манастыр[8].

У верасні 1840 г. манастыр пазбавіўся вялікай часткі фонду сваёй бібліятэкі: яна была передадзена слуцкаму Троіцкаму манастыру і семінарыі. У 1855 г. манастыр быў зачынены. Частка кніг трапіла ў Дзятлавіцкую Прэабражэнскую царкву. «З манастырскіх рэліквій у царкве засталося «одно рукописное Евангелие в бархатном переплёте без означения, когда и кем оно писано». Другое Евангелле — богаслужбовае, у металічным з фініфцю акладзе»[9].

З Дзятлавіч быў перададзены ў Лунінецкі раённы краязнаўчы музей старадрук, які, відаць, некалі належаў Дзяцелавіцкаму манастыру. Дарэчы, зараз у асноўным фондзе Лунінецкага музея больш за 3450 друкаваных выданняў, у тым ліку 5 рукапісных царкоўных кніг, 15 старадрукаў (праўда, пераважная большасць датуецца XIX стагоддзем). Што тычыцца кнігі з Дзятлавіч, то захавалася толькі верхняя частка драўлянага пераплёту, пашкоджаная караедам. Лісты з чорнымі і чырвонымі літарамі забруджаныя, парваныя. Тытульная старонка сведчыць, што гэта «Мінея. Месяц жнівень», выдадзеная ў Расіі ў 1705 годзе[10].

Невялікія кнігазборы меліся ў XIX ст. пры народных вучылішчах, царкоўна-прыходскіх школах, пры вучылішчы на станцыі Лунінец. У пачатку XX ст. у адным з прыстанцыйных дамоў ужо мелася бібліятэка. «У фондах Лунінецкай бібліятэкі было звыш 1500 кніг, меліся тэхнічны аддзел спецыяльнай літаратуры, чытальная зала з часопісамі і газетамі»[11].

«Эвалюцыю» школьных кнігазбораў можна прасачыць на прыкладзе Вялікачучавіцкай школы з 1857 г. Краязнавец Яўген Хвастоў зазначае, што ў канцы XIX ст. «у школе была бібліятэка, але рэлігійнага напрамку… Літаратурнае чытанне вялося толькі па падручніках»; у часы II Рэчы Паспалітай «у школе была вялікая бібліятэка, шмат наглядных дапаможнікаў»[12].

---

8 Памяць. Лунінецкі раён. С. 85—86.

9 Памяць. Лунінецкі раён. С. 89.

10 Жылко В. Сучасніца Пятра I з Дзятлавіч // Лунінецкія навіны. 1994. 24 мая.

11 Памяць. Лунінецкі раён. С. 136, 141.

12 Хвастоў Я. Гісторыя Вялікачучавіцкай школы ў 1857—1941 гг. // Лунінецкі сшытак. №2. Лунінец, 2003. С. 14—17.

З прыватных бібліятэк найбольшую цікавасць уяўляе страчаная каля 1920 года бібліятэка князёў Друцкіх-Любецкіх з іх сядзібы ў вёсцы Лунін. В. Туміловіч у сваёй кнізе па гісторыі Кажан-Гарадка прыводзіць са спасылкай на завуча мясцовай школы Рыгора Змітровіча расповед старажылаў пра знаходжанне тут балахоўцаў восенню 1920 года: іх афіцэры ў вольны час чыталі шмат кніг без пераплётаў, у тым ліку А. Дзюма, В. Гюго. «Ёсць падазрэнне, што кнігі тыя былі з разграбленай лунінскай бібліятэкі Друцкіх-Любецкіх. Князі, між іншым, мелі ў кнігазборы нават рукапісныя трактаты па медыцыне на арабскай мове»[13].

Лёсам таямніча зніклай бібліятэкі зацікавілася АН БССР, у выніку чаго ў 1970-х гадах на Лунінеччыну была накіравана навуковая экспедыцыя. На жаль, вынікі даследаванняў не ўнеслі яснасці ў справу знікнення гэтай спадчыны.

У першыя гады існавання II Рэчы Паспалітай пачаў праглядацца прафесійны падыход да наладжвання бібліятэчнай справы. Трэба згадаць даследаванне E.Chwalewik «Zbiory polskie» (Варшава, 1926, том 1), дзе гаворка ідзе і пра зніклую бібліятэку князёў Друцкіх-Любецкіх з Луніна (с. 445).

У часы польскай улады (1921—1939 гг.) дзяржава прыступае да стварэння «домув народовых», «святліц», школ. Так, у Лунінецкім павеце налічваліся 62 «святліцы», пры многіх былі і бібліятэкі. Належнага фінансавання не было. Захавалася рэзалюцыя на запыце пра выдзяленне 300 злотых для набыцця кніг: «Вельмі дорага».

У Лунінцы меліся бібліятэкі пры польскай гімназіі імя Ягеллы і пры рускім рэальным вучылішчы. Яго навучэнка Аляксандра Лабачэўская згадвала ў мемуарах, што вучні маглі чытаць кнігі савецкіх аўтараў, якія выдаваліся ў Латвіі.

Леў Коласаў згадвае, што ў Лунінцы «Рускае дабрачыннае таварыства мела сваю бібліятэку, выпісвала з Парыжа эміграцкія газеты («За свободу», «Русское слово», «Новое время»), падручнікі і кнігі на рускай мове з Латвіі і СССР. Бібліятэка знаходзілася ў доме былога афіцэра царскай арміі капітана Раброва. Але ўлады перашкаджалі «прарускай дзейнасці». У 1928 г. «у мэтах рэканструкцыі вуліцы» дом Раброва быў знесены, сад

13 Туміловіч В. Кажан-Гарадок 500-гадовы. Гістарычныя даследаванні. Лунінец, 2005. С. 55—56.

знішчаны, пляц прададзены. У пасляваенны час мне давялося пабачыць кнігі з гэтай бібліятэкі, на якіх стаяў штамп з тэкстам «Лунинецкое русское благотворительное общество имени графа Л.Н.Толстого. Библиотека» і штамп для інвентарнага нумара «РБО. г. Лунинец. № 537»[14].

Тыя суполкі, што не ставілі перад сабою палітычных мэтаў, не баяліся рэгістраваць свае кнігазборы ў якасці бібліятэк. Напрыклад, у Кажан-Гарадку была зарэгістравана суполка «Грамадства падтрымкі будаўніцтва грамадою паўшэхнай школы». Яна дзейнічала з 1921 г. і карысталася бібліятэкай, што налічвала на 17 лістапада 1933 г. 101 том на польскай мове[15].

У Лунінецкім павеце было некалькі палітычных аб'яднанняў, у тым ліку легальных (напрыклад, сіяністы-рэвізіяністы, «Бейтар», «Брыт-Ацаір», «Брыт-Ахаіл»), якія мелі літаратуру для агітацыі, але легалізаваць кнігазборы ў якасці агульнадаступных бібліятэк было для іх справай рызыкоўнай і маладасягальнай.

У 1930-х гадах у Лунінцы меліся бібліятэкі: чыгуначная «Огніско» (1268 тамоў), польскай мацярынскай школы (600 тамоў), перасоўная школьнага інспектарату (57 тамоў), настаўніцкая (208 тамоў), паліцыі (1200 тамоў), аддзела Стралецкага саюза (3600 тамоў)[16], а таксама яўрэйская бібліятэка «Тэль-Хай», названая так у гонар паселішча ў Палясціне, якое яўрэйскія пасяленцы абаранялі ад арабаў у час аднаго з тагачасных канфліктаў. У 1925 годзе выданне «Zycie Polesia» (Палескае ваяводства) паведамляла: «У дзень 1 красавіка была адкрыта ў Лунінцы бібліятэка «Таварыства Універсітэту Работнічага» (ТУР), якою карыстацца могуць усе жыхары Лунінца і наваколля, старэйшыя за 16 гадоў, якія ўнеслі сяброўскі ўнёсак у памеры 1 злоты. Не сябры плацяць 2 злотыя. Аплата за пазыку кніжак уносіцца 1 злоты 50 грошаў штомесяц»[17].

Жыхар Лунінца Ян Савіч пэўны час трымаў «кнігарню» і прыватную бібліятэку, але пазней перайшоў на больш прыбытковы від прадпрымальніцтва. Кніжную краму, друкарню і склад паперы мелі браты Айзенбергі. Вядома прозвішча мясцовага пераплётчыка Рэзніка

14 Коласаў Л. Увасабленне высакароднасці // Лунінецкія навіны. 1999. 11 лютага.

15 Туміловіч В. Грамадска-культурнае жыццё Кажан-Гарадка ў часы польскай улады // Лунінецкі сшытак. № 8. Лунінец, 2008. С. 11.

16 Памяць. Лунінецкі раён. С. 266.

17 Папяровыя сведкі мінуўшчыны. Пераклад з польскай В.Туміловіча // Лунінецкі сшытак. №5. Лунінец, 2005. С. 10.

і адрас яго майстэрні (вул. Пілсудскага)[18]. Сам факт наяўнасці ў горадзе прадстаўніка такой прафесіі сведчыў пра попыт на яго працу і існаванне шэрагу хатніх бібліятэк. У Лунінцы было некалькі прыватных газетных кіёскаў, якія належалі Бесану, Яўгену Касцючэнку, Лявіцкай-Марчынскай. Кіёскі не толькі гандлявалі перыёдыкай і аказвалі паштовыя паслугі, але і давалі напракат газеты і часопісы[19]. Дарэчы, у міжваенны час у Лунінцы выдаваліся польскамоўныя газеты «Glos Luniniecki» і «Kronika Luniniecka»[20].

Зборы каталіцкай богаслужбовай літаратуры меліся пры касцёлах у Лунінцы, Мікашэвічах, Сінкевічах, Лахве, Кажан-Гарадку, Луніне.

Лунінецкія кнігазборы пакінулі свой след у мясцовай сфрагістыцы. Леў Коласаў у адной з публікацый дэманструе адбіткі пячаткі і інвентарнага штэмпеля бібліятэкі Рускага дабрачыннага таварыства ў Лунінцы[21]. Л. Коласаў прыводзіць і выявы экслібрысаў лунінчан Аляксандры Тулейка (1920 г.), А.А. Рыбчынскага, яго сястры Антаніны Рыбчынскай (апошні — на польскай мове). Васіль Туміловіч прыводзіць выявы бібліятэчнай маркі «Таварыства, арганізацыі і гуртка земляробаў» у Лунінцы ў 1930-х гадах (з нумарам 190) і пячатку на кнігах «Земляробчага гуртка «Любажэрдзі» Кажан-Гарадоцкай гміны[22].

У верасні 1939 г. Заходняя Беларусь была далучана да БССР. Выдача кніг з былых польскіх бібліятэк была часова прыпынена і ўзята пад строгі кантроль. У вёсках ствараліся хаты-чытальні; у Лунінцы існавала чыгуначная бібліятэка (на месцы цяперашняга рынку). Яўген Хвастоў сведчыць, што перад вайною ў Вялікачучавіцкай бібліятэцы «была вялікая бібліятэка з кнігамі рускіх класікаў»[23]. Леў Коласаў згадвае, што ў адкрытай у 1939 г. у Лунінцы няпоўнай сярэдняй школе № 1 мелася бібліятэка,

18 Колосов Л. Вымершие и умирающие профессии. Лунинец, 2003. С. 63.

19 Колосов Л. Вымершие и умирающие профессии. Лунинец, 2003. С. 42.

20 Цітовіч І. Краязнаўчы рух на тэрыторыі Лунінецкага павета (1921 — 1939 гг.). Лунінецкі сшытак. №2. Лунінец, 2003. С. 43.

21 Колосов Л. Лунинецкая сфрагистика // Лунінецкі сшытак. №6. Лунінец, 2006. С. 21—22.

22 Тумилович В. Был ли ренессанс православной литературной деятельности в Западной Беларуси в 1918-39 годах? // Лунінецкі сшытак. №2. Лунінец, 2003. С. 3—14 ; Туміловіч В. Грамадска-культурнае жыццё Кажан-Гарадка ў часы польскай улады // Лунінецкі сшытак. №8. Лунінец, 2008. С. 9—12.

23 Хвастоў Я. Гісторыя Вялікачучавіцкай школы ў 1857—1941 гг. // Лунінецкі сшытак. №2. Лунінец, 2003. С. 14—17.

падораная вучнямі з усходніх абласцей БССР; аўтар прыводзіць яе інвентарны штэмпель з нумарам 1640[24].

Другая сусветная вайна нанесла вялікую шкоду кніжнаму фонду Лунінеччыны. У прыватнасці, кнігі на іўрыце і ідышы падлягалі абавязковаму знішчэнню германскімі нацыстамі. Былі знішчаны і многія са школьных бібліятэк. Будучы пісьменнік Уладзіслаў Нядзведскі згадваў вогнішча, распаленае немцамі і паліцаямі з кніг школьнай бібліятэкі[25]. Леў Коласаў згадвае, што акупанты выкінулі на вуліцу, а пазней знішчылі кнігі і газеты з чыгуначнай бібліятэкі, статуты і іншыя вайсковыя кнігі з будынку казармы… Не дзіўна, што, як сведчыць Я. Хвастоў, пасля аднаўлення працы школы ў Вялікіх Чучавічах (восень 1944 г.) «чытанне дзеці ўспаміналі па абрыўках газет». Праўда, ужо праз некалькі гадоў «у школьнай бібліятэцы з'явіліся праграмныя і мастацкія кніжкі»[26].

Ужо з 1944 г. у будынку цяперашняй друкарні, сведчыць Л. Коласаў, месцілася прафсаюзная бібліятэка, а неўзабаве туды перабралася чыгуначная бібліятэка. Бібліятэчны фонд і чытальная зала займалі амаль увесь другі паверх. Што да гарадской бібліятэкі, то цяперашнія яе супрацоўнікі вядуць адлік сваёй гісторыі з 1946 года. Да канца 1940-х гадоў на Лунінеччыне поўным ходам ішло стварэнне густой сеткі бібліятэк; так бы мовіць, «чытач стаў масавым».

24 Колосов Л. Лунинецкая сфрагистика // Лунінецкі сшытак. № 6. Лунінец, 2006. С. 23.

25 Жылко В. Размова з прысутнымі. Уладзіслаў Нядзведскі: старонкі жыцця і творчасці. Лунінец, 2001. С. 4.

26 Хвастоў Я. Гісторыя Вялікачучавіцкай школы з 1941 года па цяперашні час // Лунінецкі сшытак. №6. Лунінец, 2006. С. 7—8.

Кнігі і кніжная культура Берасцейшчыны
XVI — XVIII стст.

Лаўрык Ю.М.

Кнігазборы Пінскага Лешчынскага манастыра: новыя знаходкі

Да праблемы вывучэння кніжных збораў пінскага Лешчынскага манастыра аўтар гэтых радкоў звяртаўся ўжо ў артыкуле, апублікаваным летась у часопісе «Наша вера»[1]. З таго часу, аднак, у зборах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі было выяўлена некалькі новых кніг з лешчынскімі правіненцыямі, што дазволіла зірнуць на праблему па-новаму. Прапанаваны выступ мае на мэце азнаёміць навуковую грамадскасць як з самімі знаходкамі, так і з некаторымі высновамі, якія дзякуючы апошнім (як, зрэшты, і раней вядомым матэрыялам) можна сёння зрабіць адносна гэтай бібліятэкі.

Тэма, на жаль, не забяспечана дакументальнай базай у поўнай меры, што звязана з дваістым характарам наяўных матэрыялаў: з аднаго боку ў навуковым «абарачэнні» знаходзіцца некалькі бібліятэчных інвентароў, якія паходзяць з розных гадоў; з другога — была вядомая толькі адна ацалелая да нашых часоў кніга, прыналежнасць якой да лешчынскай бібліятэкі адназначна пацвярджалася прысутным на ёй надпісам. Гэтай кнігай была праца De bello belgico Фаміяна Страды (Famiani Stradae),

1 Лаўрык Ю. Кнігазборы пінскага Лешчынскага манастыра // Наша вера. 2007. № 4. С. 58—62.

апублікаваная ў 1653 г. у Рыме[2]. У папярэднім артыкуле я толькі згадаў пра яе. Сёння, бадай, надыйшоў час прыгледзецца да яе — а дакладней, да прысутных на ёй пазнакаў — больш уважліва.

Згаданы паасобнік апраўлены ў жоўты пергамент на кардоне, без аздаблення. Знешнім выглядам і якасцю выканання аправа нагадвае заходнееўрапейскія таго часу. Кніга мае некалькі інскрыпцый, якія праліваюць святло на яе бытаванне. У прыватнасці, на форзацным аркушы прысутнічае ўладальніцкі надпіс Лешчынскага манастыра: «Ex Libris Samuelis Joannis Wierzbicki», а таксама некалькі разоў паўторана спроба пяра: «Joannes Joannes Joannes … Josafat». На тытульнай старонцы — згаданы вышэй уладальніцкі надпіс, што быў пакінуты бібліятэкарам-базыльянінам: «Bibliotheca Monasterij Leszczyniensis».

Гэтыя інскрыпцыі дазваляюць меркаваць, што першым ці, прынамсі, адным з першых уладальнікаў кнігі быў раней невядомы Самуэль Ян Вярбіцкі. Прозвішча на Беларусі даволі распаўсюджанае; на жаль, у навуковай літаратуры не ўдалося знайсці інфармацыі пра гэтую канкрэтную асобу. У надпісе таксама адсутнічаюць звесткі, якія б бліжэй характарызавалі Самуэля Яна, указвалі б на прыналежнасць да духоўнага або свецкага стану, ці, тым больш, да пэўнага закону. Аднак тое, што ў спробах пяра імя «Ян» суаднесена з імем «Язафат» — а культ св. Язафата Кунцэвіча быў пашыраны ў той час як у грэка-каталіцкай царкве навогул, так і ў базыльянскім законе—ў прыватнасці, схіляе думаць, што аўтар інскрыпцыі быў грэка-каталік, і, магчыма, належаў да базыльянскага ордэну. Такая трактоўка гэтых надпісаў дае гіпатэтычны адказ адразу на два пытанні, а менавіта: 1) якім шляхам выданне трапіла на Беларусь? і 2) з якой прычыны кніга апынулася ў Лешчынскай бібліятэцы?

Ad 1mo: прадстаўнікі Закону Св. Васіля Вялікага нярэдка атрымлівалі адукацыю ў Рыме, а значыць названае выданне магло быць куплена ўладальнікам у час вучобы ў Італіі.

Ad 2do: зборы памёрлых базыльянаў зазвычай пераходзілі ва ўласнасць закону, а значыць, гэтакім жа чынам і дадзены паасобнік мог трапіць у манастырскую кніжніцу.

2 НББ: шыфр 094 /4739.

Паколькі названы тытул не значыцца ў інвентарах манастырскай бібліятэкі ані ў 1620-м,[3] ані ў 1820-х гг. і ўсутыч да 1839 г.,[4] значыць, кніга знаходзілася ў Лешчы, а затым пакінула яго кнігасховы ў перыяд між гэтымі дзвюма крайнімі датамі: 1620 і 1820 гг. (на жаль, раскідка даволі шырокая — ажно 200 гадоў!).

Другой кнігай з уладальніцкім надпісам Лешчынскага манастыра ёсць Speculum homini ecclesiastico супрасльскага выдання 1741 г.[5]На верхнім вечку аправы паасобнік мае экслібрыс Фундаментальнай бібліятэкі Мінскай духоўнай семінарыі з шыфрамі захоўвання (Ч. І А № 460 № 9:), а на тытульнай старонцы ды наступным па ёй ненумараваным аркушы — дзве падобныя між сабой інскрыпцыі: «Bibliothecae Monasterij Leszczyn[ensis]» і «Bibliothecae Monasterij Leszczynensis». Гэтая кніга прысутнічае ў вопісах бібліятэкі 1820 г.[6] і 1839 г.[7] (у апошнім з іх яна аднесена да раздзелу «Dzieła Ascetyczne», дзе значыцца пад № 3). Прысутнасць на аправе экслібрысу дае нам магчымасць не толькі прасачыць шляхі гэтай кнігі, але і зрабіць пэўныя высновы адносна лёсу ўсяе Лешчынскае бібліятэкі. Так, у прыватнасці, можна сцвярджаць, што названая бібліятэка не была цалкам знішчаная, як меркавалася раней, бо, прынамсі, частка яе кніг перайшла ў фонды Мінскай духоўнай семінарыі, якая на той час з'яўлялася вядучай праваслаўнай навучальнай установай Беларусі. У 1918 г. Мінская духоўная семінарыя была ліквідаваная бальшавікамі, а яе маёмасць — нацыяналізаваная. Вядома, што семінарыйныя кнігазборы агульнай колькасцю каля 15 тыс. тамоў у 1920-х гг. былі перададзеныя ў Дзяржбібліятэку БССР,[8] хоць, на вялікі жаль, дакументаў, пра гэта да нашага часу не захавалася — немцы пры вывязенні культурных каштоўнасцяў падчас вайны акуратна знішчалі ўсю звязаную з гэтымі каштоўнасцямі дакументацыю.

3 Параўн.: Миловидов А.И. Архив упраздненного Пинского Лещинского монастыря. Б.в.д. (1909). С. 18-19.

4 Параўн.: Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НГАРБ), ф. 136, воп. 1, спр. 42312, арк. 9 — 12; ф. 136, воп. 1, спр. 22239, арк. 8 — 10 адв.; ф. 3245, воп. 3, спр. 68, арк. 9 адв. — 12.

5 НББ: шыфр 094 /7031.

6 Параўн.: НГАРБ, ф. 136, воп. 1, спр. 22239, арк. 9.

7 Параўн.: НГАРБ, ф. 3245, воп. 3, спр. 68, арк. 10 адв.

8 Рощина Т.И. Белорусские исторические книжные коллекции в фондах Национальной библиотеки Белоруссии: (проблемы изучения) // Белорусский сборник: ст. и матер. по истории и культуре Белоруссии / РНБ ; Санкт-Петербургская ассоциация белорусистов. СПб, 2002. С. 200.

Такім чынам былі вывезены ў Германію і фонды Дзяржбібліятэкі, якія пазней вярнуліся ў Мінск толькі часткова — у колькасці ўдвая меншай, чым было да вайны[9]. Прыкладна палова колішніх збораў знікла, і лёс іх невядомы — гэтыя кнігі маглі загінуць у пажары вайны, маглі застацца рассеянымі па ўсёй Еўропе, а, урэшце, нават пры вяртанні ў Савецкі Саюз маглі быць перададзеныя не ў Мінск. Таму сёння існуе верагоднасць сустрэць семінарыйныя кнігі, а ў т.л. і тыя, што паходзяць з Лешчынскага манастыра, ці не ў кожнай буйной бібліятэцы былога СССР, сярод якіх размяркоўваліся прывезеныя з Нямеччыны культурныя багацці, а нават і за мяжой. Безумоўна, гэта вельмі ўскладняе задачу рэканструкцыі бібліятэкі Лешчынскага манастыра, калі б раптам такі праект знайшоў сваіх прыхільнікаў.

Трэцяй, урэшце, кнігай, якая змяшчае, бадай, найбольш інфарматыўныя лешчынскія правіненцыі, ёсць Annus apostolicus Захарыі Лясэльва, апублікаваны ў 1749 г. у Кёльне[10]. Паасобнік з НББ мае некалькі інскрыпцый. На тытульным аркушы знаходзіцца ўладальніцкі надпіс манастыра: «Bibliothecae M[onasterii] Leszczynen[sis]», а на форзацным аркушы прысутнічае купчы запіс, пакінуты адным з настаяцеляў Кіпрыянам Булгакам: «Hic Liber Emptus Tynfonis 8 & ½ per me Intrascriptum Applicatus Monasterio Leszczoviensis A°D: 1763 D. 29 Iunii in fidem Cyprianus Bułhak O.S.B.M: Abb: Leszcz: mmp». Гэтакі ж запіс — толькі са слоўнай расшыфроўкай лічбаў — таксама паўтараецца на паслядоўна размешчаных аркушах, пачынаючы з тытульнага: «Hic Liber Emptus // Tynfonis octo // medium // per me intra//scriptum // Applicatusq[ue] // Monasterio // Leszczynensi // Anno Domino // Milgesimo // Septingentesimo // Sexagesimo // Tertio // et Vigesima Nona // Iunij // In Fidem // Cyprianus Bułhak // OSBM Abb: Leszcz: mp». Гэтая кніга прысутнічае ў вопісах бібліятэкі 1820 г.[11] і 1839 г.[12] (а ў апошнім — у раздзеле «Dzieła Kaznodzieyskie»).

Гэтая інскрыпцыя, такім чынам, дае нам вельмі цікавую інфармацыю. Па-першае, мы даведваемся, калі дакладна гэтая кніга паступіла ў фонд — у 1763 г. Па-другое, з цытаваных надпісаў вынікае, што адным са спосабаў камплектавання бібліятэкі ў гэты час былі дарункі — калі б

9 Параўн.: Тамсама. С.199.
10 НББ: шыфр 094 /7169.
11 Параўн.: НГАРБ, ф. 136, воп. 1, спр. 22239, арк. 9.
12 Параўн.: НГАРБ, ф. 3245, воп. 3, спр. 68, арк. 10 адв.

кніга закуплялася на манастырскія грошы, інскрыптар, бадай, не ўказваў бы так настойліва сваё імя і суму, якую ён за яе заплаціў.

Дадатковым бонусам, які дае нам гэты надпіс, з'яўляецца тое, што дзякуючы ўказанай у інскрыпцыі суме мы можам прыкладна меркаваць, колькі ў 60-х гг. XVIII ст. каштаваў зборнік казанняў сярэдняга аб'ёму, і адпаведна атрымаць агульнае ўражанне, колькі грошай выдаваў манастыр на закупку літаратуры — хоць, безумоўна, для таго, каб зрабіць больш шырокія высновы, аднаго асобнага выпадку недастаткова.

Katechismus mniejszy, Katechismus większy, а таксама пераклад з лацінскай на польскую мову твора Крыштофа Імлера *Summariusz dziesięciorga przykazania Bożego..*, 1553 (Сума дзесяці запаветаў Божых) — твора катэхізічнага тыпу. Лютэранскі характар меў і катэхізіс Урбана Рэгіуса *Sposoby a obyczaje nyektore, ostrożnie y krom zgorssenta..*, 1554 (Некаторыя спосабы і звычаі...размовы аб значных месцах хрысціянскай навукі). Лютэранства не атрымала шырокага распаўсюджвання ў Вялікім княстве Літоўскім, а пасля прыняцця Мікалаем Радзівілам у 1557 г. кальвінізму змяніўся і характар кніжнай прадукцыі. Кальвінісцкую літаратуру друкарні Вялікага княства Літоўскага выпускалі на працягу ўсяго XVI ст., пачынаючы з выданняў 1558 г. С. Мурмеліуса[1].

Першы на ўсходнеславянскіх землях арыгінальны кальвінісцкі катэхізіс быў створаны арганізатарам віленскага збору Сымонам Закам. Яго катэхізіс пад тытулам «Рэгулы» выдадзены Ст. Мурмеліусам у 1559 г. у складзе зборніка *Akta tho iest Sprawy zboru Krzeciańskiego Wileńskiego, ktore się poczeli Roku 1557..*» (Акты ці справы віленскага хрысціянскага збору, якія пачаліся ў 1557 г.)[2].

У 1558 г. на Літве і Падляшшы стаў распаўсюджвацца анабаптызм. Антытрынітарскія ідэі прапагандавалі кнігі, якія выходзілі з Нясвіжскай тыпаграфіі, дзякуючы часовай прыхільнасці Мікалая Радзівіла Чорнага да арыян і знаходжанні ў Нясвіжы антытрынітарыяў С. Буднага і Л. Крышкоўскага. З цягам часу антытрынітарскія ідэі прапагандаваліся і Брэсцкай друкарняй[3]. Прыклад таму твор С. Буднага *O przedniejszych artykulach wiary chrystiańskiej*, 1570 (Аб асноўных артыкулах веры).

У 1563 г. у Брэсце было здзейснена выданне першай пратэстанцкай Бібліі. Гэта выданне насіла кальвінісцкі характар. Аднак, у заўвагах да Бібліі былі не толькі кальвінісцкія ідэі, але і антытрынітарскія. Брэсцкая Біблія была выдадзена на сродкі Мікалая Радзівіла Чорнага, і таму яе часам называюць Радзівілаўскай. Над перакладам Бібліі з яўрэйскай, грэчаскай і лацінскай моў працавала нямала літаратурных

1 Евженко И. Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. Мн., 1988. С. 69.

2 Саверчанка І. В. Хрысціянскі Катэхізіс у кніжна-пісьмовай культуры ўсходніх славян эпохі Адраджэння і барока: атрыбуцыя, паэтыка, семіётыка. Мн., 1998. С. 3.

3 Евженко И. Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. Мн., 1988. С. 70.

славутасцяў, у іх ліку Ян Ласкі, Гжэгаш Оршак, Якуб Любэльчык, Андрэй Тшэцецкі і іншыя. Новы запавет з Брэсцкай Бібліі пасля неаднаразова перадрукоўваўся ў Нясвіжы (1563, 1568 гг.), Брэсце (1566 г.), Вільні (1593 г.) і нават у Нюрнбергу (1599 г.). Брэсцкая Біблія была вельмі шырока распаўсюджана ў Расіі XVI—XVII стст. Пра вялікую папулярнасць Брэсцкай Бібліі ва ўсходнеславянскіх колах сведчыць і факт яе выкарыстання пры падрыхтоўцы да друку Астрожскай Бібліі. Велізарнае значэнне адыграў тэкст Брэсцкай Бібліі ў станаўленні і развіцці польскай літаратурнай мовы[4].

Выдаваліся ў Брэсце і тлумачэнні да біблійных тэкстаў. Так у 1566 г. былі надрукаваны дзве кнігі Томаша Фальконіуса *Sprawy y słowa Jezusa Krystusa...* (Справы і словы Ісуса Хрыста) і *Wtore księgi Lukasza swiętego...* (Дзве кнігі св. Лукі). Гэтыя працы зрабілі велізарны ўплыў на ўсю экзэгетычную традыцыю Вялікага княства Літоўскага[5].

З мэтай папулярызацыі рэфармацыйных ідэй для свайго часу вялікімі тыражамі выходзілі псалтыры і малітоўнікі. Увогуле пратэстанты надавалі вялікую ўвагу музычнаму афармленню набажэнства. Так у 1564 г. выйшлі: *Księgi Psalmow, abo Pieśni Dawidowych...* (Кнігі Псалмоў, або песні Давідавы...). А ў 1558 г. Ст. Мурмеліусам быў выдадзены *Kancjonal Brzeski* (Брэсцкі канцыянал). Музычны склад Брэсцкага канцыянала быў даволі разнастайны: гэта — аднагалосыя песні рэлігійнага і свецкага зместу, шматгалосыя харавыя творы[6].

У Брэсцкай друкарні выдаваліся і пропаведзі. Так у 1559 г. выйшла пропаведзь Белінгера *O prawdziwym przyymowanu prawdziwego ciala y krwie... Jezysa Christusa..* (Аб сапраўдным прыняцці цела і крыві Ісуса Хрыста), а таксама ў 1564 г. было надрукавана некалькі твораў Гжэгажа Бжэзіна (Grzegorz Bzrezin albo Pauli Grzegorz): *O roznicach teraznieyszych...* (Аб сучасных розніцах...), *O wyznanu wiary ksiądza Sarnickiego...* (Аб веравызнанні веры ксяндза Сарніцкага), *Wykład słow Pawła Sw...* (Тлумачэнне слоў Св. Паўла...).

Пры Ст. Мурмеліусе было выдадзена некалькі гісторыка-прапагандысцкіх брашур антыкаталіцкага зместу. Гэта ў першую чаргу

4 Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: беларуская друкаваная літаратура эпохі Рэнесансу. Мн., 1990. С. 171.

5 Саверчанка І. Aurea mediocritas: кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998. С. 53.

6 Дадзіёмава В.У. Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі. Мн., 2001. С. 29—30.


Czwarte Księgi Moiżeszowe.
Liſt. 75.
OCCIDENS
SIMEON
ZABVLON
ISSACHAR
MOYSES
IVDA
NEPHTHALI
DAN
GAD

Historya o Papieżu Janie tego imienia VIII, ktory był Gilleberta biała głowa.., 1562 (Гісторыя пра папу Яна VIII, які аказаўся жанчынай Жыльбертай), а таксама *Krótkie wypisanie o papieżu nowobranym, któremu imię Pius IV..,* 1561 (Кароткія запіскі пра новаабранага папу Пія IV).

Ужо ў другой полове XVI ст. друкаваліся свайго роду даследаванні па пытаннях тэалогіі і беларускай Рэфармацыі. Прыклад таму твор Лаўрэнція Дыскордзія *Nauka o prawdziwej i falszywej pokucie,* 1559 (Навука аб праўдзівым і фальшывым пакаянні), дзе падкрэсліваецца роля Мікалая Радзівіла Чорнага ў распаўсюджванні іншаверніцтва ў краі, або *Akta, to jest sprawy zboru krześciańskiego wileńskiego..,* 1559 (Акты, або дзейнасць хрысціянскага віленскага збору...), дзе асветлены асноўныя дактрыны кальвінізму. Апошні твор напісаны Сымонам Закам, вядомым рэлігійным пісьменнікам і паэтам.

У Брэсце былі надрукаваны і рэлігійныя павучанні. У перакладзе з лаціны на польскую К. Базылікам была надрукавана кніга прафесара тэалогіі М. Барлеціо *Historya o żywoćie y zacnych sprawach Jerzego Kastryota, ktorego pospolićie Szkanderbegiem zowa* (Гісторыя пра жыццё і слаўныя справы Юрыя Кастрыёта, звычайна званага Скандэрбегам.)[7].

Тэматыка выданняў брэсцкіх друкарняў для свайго часу дастаткова разнастайная. У іх былі надрукаваны кнігі як рэлігійнага, так і свецкага характару. У ліку апошніх юрыдычныя, гістарычныя, паэтычныя творы, павучальныя трактаты і некаторыя іншыя. Значную частку свецкіх кніг складаюць юрыдычныя творы, надрукаваныя С. Мурмеліусам на працягу 1560—1561 гг. Сярод іх можна назваць творы Барталамея Гроіцкага *Artykuły prawa magdeburskiego (*Артыкулы магдэбургскага права), *Postępek w sądziech karania na gardle* (Судовая працэдура пры пакаранні смерцю), *Porządek sądów prawa magdeburskiego* (Парадак у судах права магдэбурскага), *Ustawa płacej u sądów w prawe magdeburskim* (Палажэнне аб аплаце ў судах у магдэбурскім праве), выдадзеныя ў 1560 г., а таксама твор Яна Палчоўскага *Ustawy Prawa Polskiego*, 1561 г.

У брэсцкіх друкарнях упершыню на тэрыторыі Беларусі былі выдадзены публіцыстычныя творы *Dwa Listy,* 1559 г. і *Rosmowa Polaka z Litwinem,* 1565 г. *Dwa Listy,* надрукаваныя С. Мурмелісам, якія з'яўляюцца выдатным помнікам рэлігійнай палемікі XVI ст. Першы ліст Алаіза

7 Евженко И. Е. Книга в реформационном движении Белоруссии и Литвы второй половины XVI века // Книга в Белоруссии. Мн., 1988. С. 74

618.

Historya Żáłosna / á ku czytániu osobliwa / o srogiem oblężeniu / od Máhumetá Cesárzá Tureckiego / y potężliwym dobywániu miástá Szkodry / ná troie Kśięgi rozdźieloná.

¶ Spisána przez Máryná Bárlecyusá Szkodreńczyká / á teraz nowo ná Polski ięzyk przełożoná /

Przez Cypryaná Bázyliká.

Do łáskáwego Czytelniká Cypryan Bázylik.

Zokończenie sámo kśiąg tych przeszłych / łáskáwy Czythelniku / iedna ze trzech przyczyna iest przyłaczenia / tych Kśiąg o dobywániu Szkodry / ku thym przeszłym. Abowiem / gdym y sam zámknienie historyiey Szkánderbegowey / czytał / á vyrzałem / iże ten Pisarz / ktory tę Historya pisał / czyni wzmiánkę o nich / iáko o tych / ktore iuż był przed tym dobrze wydał / ia / łáskáwy Czytelniku / niechcąc ábyć ná moiey pracy ábo pilnośći co miáło schodźić / ieslizem więtsza y trudnieysza praca dla ćiebie podiał / przekłádáiąc Historya o Szkánderbegu / z chućia y tę podiałem / á thá iest pierwsza przyczyná przełożenia Kśiąg tych. Druga przyczyná iest / sámá they Historyiey zacność / bo nie tylko w tych

kśiążkach

Ліпамана біскупа Веронскага да Мікалая Радзівіла, а другі—пасланне папскаму нунцыю ў Польшчы Алаізу Ліпаману ад імя Радзівіла Чорнага. Гэтая перапіска на лацінскай і нямецкай мовах выйшла ў 1556 г. у Кёнігсбергу, а ў 1559 г. у перакладзе Мікалая Рэя на польскую мову ў Брэсце[8].

У Брэсце было здзейснена выданне аднаго з першых свецкіх друкаваных твораў *Rosmowa Polaka z Litwinem*, напісанага вядомым літоўскім пісьменнікам-гуманістам сакратаром вялікага князя Жыгімонта Аўгуста Аўгусцінам Ратундусам Мелескім у адказ на сачыненне польскага публіцыста С. Ажахоўскага. Брашура носіць чыста публіцыстычны характар, яна скіравана супраць палітычных тэорый Ажахоўскага. Ён прапаноўваў сваю мадэль канчатковай уніі Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, якая не выклікала захаплення ў прадстаўнікоў ВКЛ[9].

Сярод брэсцкіх кніг XVI ст. нельга не адзначыць паэтычныя творы. З тых паэтычных твораў, што захаваліся да нашага часу, найбольш цікавыя вершаваныя тэксты з выдадзенага ў 1558 г. кальвінскага канцыянала Яна Зарэмбы — верш Андрэя Валяна *Да Палякаў і да Літвы*, з трактата Аўгуста Ратундуса *Rosmowa Polaka z Litwinem,* 1565 г., ананімная паэма *Proteus albo Odmieniec,* 1564 г. (Пратэй, або Пярэварацень), вершы і паэма *Krótkie wypisanie sprawy przy śmierci i pogrzebie...Helżbiety z Szydłowca Radziwiłłowej, wojewodziny wileńskiej,* 1562 (Кароткае апісанне акалічнасцей смерці і пахавання Альжбеты Радзівілавай з Шыдлаўца, жонкі віленскага ваяводы)[10]. Акрамя таго, у Бярэсці былі надрукаваныя і іншыя паэтычныя творы, у прыватнасці драматычны твор *Postępek Prawa Czartowskiego..,* 1570 г. (Працэс чарцей супраць чалавечага роду) у перапрацоўцы Кіпрыяна Базыліка. Асобныя вершы К. Базыліка змешчаны ў творах Т. Фальконіуса.

Значнае месца сярод літаратурных твораў, выдадзеных у Брэсце, займаюць розныя хвалебныя прамовы — панегірыкі. Панегірыкі — невялікія (да 1 ліста) брашуры, выдадзеныя ў сувязі з важнейшымі сямейнымі абставінамі (нараджэнне дзіцяці, шлюб, смерць) членамі

8 Іванова Л. З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі (другая палова XVI — першая палова XVII ст.) // 480 год Беларускага кнігадрукавання: матэрыялы трэціх Скарынаўскіх чытанняў. Мн., 1998. С. 188.

9 Лабынцаў Ю. Пачатае Скарынам: беларуская друкаваная літаратура эпохі Рэнесансу. Мн., 1990. С. 169—170.

10 Кавалёў С.В. Станаўленне польскамоўнай паэзіі ў полілінгвістычнай літаратуры Беларусі эпохі Рэнесансу. Мн., 2002. С. 15.

багатых магнацкіх родаў для раздачы сваякам і гасцям і надрукаваныя малымі тыражамі (да 100 экзэмпляраў)[11]. У 1562 г. К. Базылікам быў напісаны і выдадзены вышэйадзначаны панегірык у гонар Альжбеты Радзівілавай, жонкі Мікалая Радзівіла Чорнага, дзе яна намалявана рэўнаснай кальвіністкай *Krótkie wypisanie sprawy przy śmierci i pogrzebie... Alżbiety..* (Кароткае апісанне падзей пры смерці і пахаванні Альжбеты Радзівілавай). Значна пазней К. Базылік выдаў і іншыя творы гэтага характару, у прыватнасці, *Pamiątka wszystkiemu cnotami hojnie obdarzonemu Janowi Baptyście hrabi na Tęnczynie* (Напамінак … шчодра адданаму Яну … графу на Тэнчыне (1563 або 1570)), твор, які належыць пяру класіка польскай сярэдневяковай паэзіі Яну Каханоўскаму, які крытыкаваў шляхту і каталіцкае духавенства; *Napis na grobie zacnego szlachcica Pawła Secygniowskiego*, 1570 г. (Надпіс на магіле знатнага шляхціца Паўла Сецыгнеўскага). Вершы на герб Радзівіла змешчаны і ў Брэсцкай Бібліі.

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што вельмі цяжка правесці мяжу паміж творамі рэлігійнага і свецкага характару. Вельмі часта ў творах рэлігійнага зместу змешчаны вершы, філасофскія трактаты і г.д. Таму пра дакладнасць прааналізаваных намі твораў па змястоўнай прыкмеце гаварыць цяжка. Дзяленне літаратуры на свецкую і рэлігійную — умоўнае.

Значную частку выданняў складаюць творы рэлігійнага зместу, астатнія — творы свецкага характару. Перавага твораў рэлігійнай тэматыкі над свецкай не выпадковая, таму што кнігадрукаванне ў Брэсце садзейнічала ўсё ж такі распаўсюджванню рэфармацыйных ідэй. Што моўнай прыкметы то, у асноўным гэта кнігі, брашуры на польскай мове. Некаторая частка выданняў — гэта пераклады з лацінскай на польскую мову.

З брэсцкіх выданняў XVI ст. у фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі захоўваецца вельмі мала экзэмпляраў. Гэта канвалют, які ўключае 2 кнігі: Sprawy y słowa Jezusa Krystusa Syna Bozego i Wtore księgi Lukasza swiętego, надрукаваны К. Базылікам у 1566 г. і ў асобным пераплёце другі экзэмпляр кнігі Святога Лукі[12]. Большасць брэсцкіх выданняў у бібліятэцы прапануецца мікрафільмамі: Katechismus mniyszy; Katechismus wyętszy; Dwa Listy na Polski ięzyk wlasnie wylożone; Akta tho iest Sprawy zbory Krzeciańskiego Wileńskiego; Proteus albo Odmieniec; Historya o żywoćie y zacnych sprawach Jerzego Kastryota.

---

11 Николаев Н.В. Книжная культура Великого Княжества Литовского : автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора филологических наук. СПб., 1997. 39 с.

12 Киреева Г.В. Брестские издания XVI века в фондах Национальной библиотеки Беларуси // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Мн., 1995. С. 24-29.

Гладышчук А. А.

Да вызначэння магчымага месца знаходжання першай беларускай друкарні на тэрыторыі сучаснага мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой»

455 гадоў таму назад з мэтай распаўсюджання рэфармацыйных ідэй слынны магнат ВКЛ, блізкі дарадца польскага караля Жыгімонта Аўгуста, канцлер ВКЛ, берасцейскі стараста Мікалай Крыштаф Радзівіл (1515—1565), больш вядомы за сваю бараду па мянушцы «Чорны», заснаваў у Берасці першую на тэрыторыі сучаснай Беларусі друкарню[1]. Гэта адбылося ў 1553 годзе, калі Мікалай Радзівіл Чорны публічна абвясціў аб сваёй прыхільнасці да кальвінізму і запрасіў з Кракава матэматыка, друкара і перакладчыка Бярнарда Ваявудку для заснавання друкарні ў Берасці. Заўважым, што дасведчаны князь М. Радзівіл Чорны быў добра на той час пасвечаны ў ідэі рэфарматарства і яго сувязі з еўрапейскімі кнігавыдаўцамі ўсталяваліся задоўга да заснавання ім першай друкарні ў Беларусі[2]. Таму не дзіўна, што неўзабаве ў Берасці з'явілася на свет першая друкаваная кніга, якой мог быць «Малы катэхізіс», што прызначаўся

1 Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII w. Z.5: Wielke Księstwo Litewskie. Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Korotaj. Wroclaw, 1959. S. 65 ; *Іванова Л.С.* З гісторыі рэфармацыйнага кнігадрукавання ў Беларусі (другая палова XVI — першая палова XVII стст.) // Інтэрнэт-версія: htth://www.belreform.org/ivanova.php ; Энцыклапедыя ВКЛ. Мн., 2005. Т. 1. С. 323.

2 Галенчанка Г. Беларуская культурная традыцыя. Лекцыя 15 // Інтэрнэт-версія: http://www.baj.by/belkalehium/belkulttrad/15halenczanka.htm

для паспалітага люду. На жаль, няшчасны выпадак прыпыніў дзейнасць берасцейскай друкарні (улетку 1554 года Б. Ваявудка загінуў у адной з берасцейскіх рэк), а яе абсталяванне магло быць прададзена ў Кракаў, аб чым паведамляюць некаторыя крыніцы. Застаецца ўсё-такі пытанне: чаму ж гэта Мікалай Радзівіл, так зацікаўлены ў працы сваёй друкарні для прапаганды рэфармацыйных ідэй, не знайшоў сродкаў, каб абсталяванне яе засталося ў Берасці? А можа гэта быў нейкі тактычны ход князя, каб не прыцягваць увагі да месца з'яўлення яго рэфармацыйных друкаў?

Але друкарскі двор хутчэй за ўсё заставаўся ў Берасці і пасля нечаканай смерці Б. Ваявудкі. «Апісанне староства Берасцейскага» Дзмітрыя Сапегі за 1566 год сведчыць[3], што за друкарняй значылася сядзіба на рыначнай плошчы Берасця ў $2^2/_3$ прута, што адпавядала прыкладна памерам у 63 м^2. Праўда, здзіўляе тое, што толькі праз чатыры гады пасля смерці Б. Ваявудкі ў Берасці з'явіўся новы друкар — Станіслаў Мурмеліус, які таксама паходзіў з Польшчы. Першай кнігай, выдадзенай ім, быў зборнік рэлігійных песень С. Зарэмбы «Песні хвал Боскіх». Але з С. Мурмеліусам неўзабаве таксама здарылася бяда: знаходзячыся ў Кракаве, ён за даўгі трапіў там у вязніцу.

У 1566—1570 гг. працу берасцейскай друкарні працягваў Кіпрыян Базылік (Cyprian Bazylik, кал. 1535—пасля 1591) — беларускі і польскі дзеяч культуры, паэт, перакладчык, кампазітар, кнігавыдавец, які паходзіў з мяшчанскай сям'і. Пасля заўчаснай смерці Мікалая Радзівіла ў 1565 г. ён працягвае займацца выдавецкай дзейнасцю. Менавіта пры ім берасцейская друкарня дасягнула найбольшага росквіту. Вядома таксама імя берасцейца Якуба-друкара, які жыў на Жыдоўскай вуліцы і хутчэй за ўсё выконваў у друкарні рамесніцкую працу. У 1570 годзе берасцейская друкарня спыніла сваю дзейнасць, прынамсі, яе выданні пасля гэтага часу невядомыя. Бібліёграфы натуюць каля 40 назваў, якія пабачылі свет у Берасці, хаця на самай справе іх напэўна было больш. Самае выдатнае месца сярод іх займае Берасцейская, альбо Радзівілаўская, Біблія, выдадзеная ў 1563 годзе[4].

---

3 Описание староства Берестейскаго // Документы Московского архива Министерства Юстиции / под ред. М. Довнара-Запольского. М., 1897. Т. 1. С. 205.

4 Нікалаеў М.В. Шэдэўр Брэсцкай друкарні // Помнікі мастацкай культуры Беларусі: новыя даследаванні / Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Мн., 1989. С. 144—149.

Узнікае лагічнае пытанне: у якім жа месцы сярэдневяковага Берасця магла знаходзіцца першая беларуская друкарня? Для гэтай мэты прывядзем урывак тэксту з ужо ўпамянутага і добра вядомага даследчыкам гістарычнага дакумента за 1566 год «***Описаніе староства Берестейскаго***»[5] з захаваннем яго правапісу: ***«...Место в паркане. Рынок. Первая полать ринку. Садибы, пруты. Станислав Пекарский: $2^2/_3$; Яско Олфирович, где Миколай зять живет: $2^2/_3$; Друкарня: $2^2/_3$ волных; Серафен Новоселский: $2^3/_4$; Андрей золотарь: $2^1/_3$...»*** Сустракаюцца, заўважым, у гэтым фрагменце словы, змест якіх сёння патрабуе тлумачэння: паркан — гэта тая частка горада, якая была абнесена земляным валам альбо плотам, сюды адносіўся замак і цэнтральная частка горада, сёння гэта Цэнтральны востраў, на якім размяшчаецца Цытадэль крэпасці. Адзінка меры прут у той час выконваў дзве ролі: як мера даўжыні ён раўняўся 4,87 м і дзяліўся на 10 прэнцікаў, як зямельная мера плошчы складаў сабой прамавугольнік з бакамі 1 шнур (10 прутоў) на 1 прэнцік, што адпавядае прыкладна 23,72 м^2. Самая складаная справа аказалася з тэрмінам «полать», які не мае адназначнага тлумачэння, але дзякуючы падказцы берасцейскага журналіста Юрася Рубашэўскага і практычнай дапамозе вопытнай супрацоўніцы абласной бібліятэкі Марыны Пуцілінай і гэтая праблема была вырашана. Крыніцы [5-6] дазволілі зрабіць меркаванне, што слова «полать» у дадзеным кантэксце выкарыстана як *старана, бок*[5]. Можна сказаць больш: гэта была першая спроба нумерацыі вуліц старадаўняга Берасця. Першая «полать» — правая (няцотная) старана вуліцы, другая «полать» — левая (цотная) старана, праўда, замест лічбаў былі выкарыстаны персанальныя імёны і прозвішчы ці мянушкі гаспадароў сядзіб, якія ў той час замянялі ім прозвішчы. Вядома, што нумерацыю вуліц, якая з'явілася шмат часу пазней, было часцей за ўсё прынята пачынаць ад рыначнай плошчы горада альбо ад ракі.

Рыначная плошча Берасця — гэта адна з самых старадаўніх, калі не самая старадаўняя плошча нашага 1000-гадовага горада. Калі супыніцца на ёй і, заплюшчыўшы на момант вочы, задумацца, колькі тут падзей за стагоддзі адбылося, колькі людзей на ёй пабывала... галава кругам пойдзе.

5 Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Мн. : Беларуская навука, 2006. Т. 26. С. 112 ; Фасмер М. Этимологический словарь русского языка. М. : Прогресс, 1987. Т. 3. С. 316 ; Даль В.И. Толковый словарь живого великорусского языка. М. : Русский язык, 1998. Т. 3. С. 249.



Плошча свае функцыі выконвала да будаўніцтва крэпасці, але і потым яе большая частка не была забудавана, а заставалася вайсковым плацам і скверам. Сёння незабудаваная частка плошчы — гэта газон. Вызначыць сімвалічны цэнтр Рыначнай плошчы, адной з самых старадаўніх плошчаў Берасця, не складае ніякай праблемы. А вось узведзенная невялікая класічная калона ў гэтым пункце плошчы з указальнікамі старадаўніх берасцейскіх гасцінцаў магла б адыграць вялікую станоўчую ролю ў шанаванні гістарычнай памяці нашага старажытнага горада. Давайце зробім!

Але вернемся да мэты. Рыначная плошча Берасця мела прыкладны выгляд няправільнага чатырохкутніка, арыентаванага доўгай стараной наўсцяж ракі Мухавец пры яе злучэнні з Бугам. На працягу стагоддзяў яна практычна не мянала сваіх памераў, што пацвярджаюць зведзеныя да аднаго маштабу планы Берасця 1657, 1740 і 1823 гг. Калі стаць у цэнтры былой плошчы тварам да сёняшняга Свята-Мікалаеўскага сабора, а



Фотоздымак з космаса Google Цэнтральнага вострава Брэсцкай крэпасці, дзе размяшчаўся да яе будаўніцтва старажытны Брэст, з адзнакай магчымага месца знаходжання першай беларускай друкарні.

спінай да кругавой казармы і ракі Мухавец, то першая «полать» рынка будзе па правую руку бліжэй да Холмскіх варотаў (удакладненні, што «первая полать поправе» сустракаюцца пры апісанні іншых вуліц у «Апісанні староства Берасцейскага»), другая «полать»— злева, у бок Цярэспальскіх варот, прама — трэцяя «полать» рынку, а там, дзе сёння казарма, — чацвёртая. Такую арыентацыю Рыначнай плошчы пацвярджае таксама тое, што ратуша, верагодна, знаходзілася на другой «полати» рынка, а шпіхлер (склад) солі — на чацвёртай, што пераблытаць месцамі ніяк нельга[6]. Не пярэчыць гэтаму і даўжыня першай «полати», якая была самай кароткай з усіх чатырох старон рынку, таму што ў гэтым месцы на Рыначную плошчу выходзіў Валынскі гасцінец, які злучаўся далей праз Кавальскую і іншыя вуліцы з Віленскім гасцінцам.

6 Описание староства Берестейскаго // Документы Московского архива Министерства Юстиции / под ред. М. Довнара-Запольского. М., 1897. Т. 1. С. 205-206.

З гэтага можна зрабіць меркаванне, што прыкладна пасярэдзіне ўсходняй стараны былой Рыначнай плошчы старадаўняга Берасця і мясцілася першая беларуская друкарня. Вызначыць само месца з зададзенай дакладнасцю магчыма з дапамагой сучасных тэхналогій. Параўнанне і аналіз зведзеных да аднаго маштабу планаў Берасця 1657 г. Э. Дальберга, 1740 г. Г. Фюрстэнгофа (Брэсцкя абласная бібліятэка) і плана 1823 г. (hppt://www.ibrest.ru), на якіх Рыначная плошча добра чытаецца, з сучасным касмічным здымкам Google Цэнтральнага вострава крэпасці даюць вынік, што гэтым месцам можа быць купка дрэваў на газоне паміж Холмскімі варотамі крэпасці і руінамі езуіцкага калегіума. Заўважым, што наўсцяж езуіцкага калегіума, пабудаванага пасля 1566 г., ішла тая ж вуліца Кавальская, якая стала звацца пазней Валынскай, таму захаваныя руіны былога езуіцкага калегіума таксама даюць добрую прывязку на мясцовасці магчымага знаходжання першай «полати» былой Рыначнай плошчы.

Праведзеныя дадаткова разлікі і маштабнае макетаванне Рыначнай плошчы па апісанні 1566 г. могуць удакладніць месцазнаходжанне Берасцейскай друкарні, таму што хутчэй за ўсё ні георадар, ні археалагічнае шурфаванне тут асабліва нічым не дапамогуць. Прапанаванае даследаванне толькі абазначае магчымае месца знаходжання першай беларускай друкарні ў старажытным Берасці. Але якое здзіўленне маглі б атрымаць берасцейцы і госці горада, калі б праз нейкі час маглі прачытаць на ўсталяванай тут памятнай дошцы тут імёны ўсіх тых, хто меў прамое дачыненне да заснавання друкарскай справы ў Берасці і пералік тых першадрукаў, якія тут пабачылі свет. Трэба памятаць, што Мікалай Радзівіл Чорны быў вялікім патрыётам сваёй радзімы і самастойнасці дзяржавы, што вельмі актуальна і сёння.

Іванова Л. С.

Роля Берасцейскай друкарні ў распаўсюджванні Рэфармацыі ў Вялікім княстве Літоўскім

Для распаўсюджвання рэфармацыйных ідэй у 1553 г. у Бярэсці пры падтрымцы віленскага ваяводы, буйнейшага магната ВКЛ Мікалая Радзівіла Чорнага пачала дзейнічаць першая на Беларусі (а таксама першая рэфармацыйная ў ВКЛ) друкарня. У Бярэсці працавалі запрошаныя Радзівілам з Польшчы друкары і выдаўцы: гуманіст, звязаны з эразміянскім колам у Кракаве, Бернард Ваявудка (1553—1554), Станіслаў Мурмеліус (1558—1561?) і таленавіты перакладчык, паэт, музыкант-кампазітар Кіпрыян (Цыпрыян) Базылік (1562? —1570)[1].

З дакументаў 1566 г. вядома, што друкарня размяшчалася на Рыначнай плошчы, а на Жыдоўскай вуліцы жыў «Якуб друкар»[2], які, мабыць, ажыццяўляў рамесніцкія функцыі. Дзейнасць берасцейскага друкарскага двара супала з часам канфесійнага і арганізацыйнага станаўлення рэфармацыі ў ВКЛ. Гэта быў час ажыўленай перапіскі і асабістых кантактаў з карыфеямі еўрапейскай рэфармацыі, палемікі на сеймах і сінодах, абмеркавання ідэі Народнага сабору. Вядома каля 40 тытулаў (назваў) кніг, якія былі надрукаваны ў Бярэсці, практычна усе — на

1 Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII w. Z.5: Wielkie Księstwo Litewskie. Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Korotaj. Wrocław, 1959

2 Документы Московского архива Министерства юстиции. М., 1897. Т.1. С. 205, 208.

польскай мове[3]. Тлумачыцца гэта перш за ўсё тым, што Рэфармацыю ў ВКЛ падтрымала пераважна магнатэрыя, шляхта — тая частка грамадства, якой уласціва пэўная інтэграцыя ў польскую культуру, а таксама частковай арыентацыяй друкарскага двара на кніжны рынак Польшчы.

Захаваліся звесткі аб трох выданнях друкарні Ваявудкі, апісаных у пачатку стагоддзя польскім даследчыкам Ф. Пуласкім — Вялікім і Малым Катэхізісах і перакладах тэалагічных твораў Урбана Рэгіуса і Крыштафа Імлера. Можна меркаваць, што іх было больш. У падрыхтоўцы выданняў прымаў удзел Андрэй Тшыцескі-малодшы, якога Радзівіл запрасіў разам з Ваявудкам для перакладу і выдання рэфармацыйнай літаратуры. На жаль, летам 1554 г. Ваявудка ўтапіўся ў адной з берасцейскіх рэк. Усе тры выданні захоўваліся ў бібліятэцы Красінскіх і загінулі у час Другой сусветнай вайны. Цікава, што адзіны экзэмпляр «Катэхізіса» быў куплены бібліятэкай у 1907 г. у Івана Луцкевіча, а раней належаў вядомаму прыватнаму кнігазбору мінскага жыхара Генрыха Татура.

Пасля трагічнага здарэння з Ваявудкам, Радзівіл меў намер запрасіць вядомага кракаўскага і прускага друкара Яна Сандэцкага-Малецкага, але няма звестак пра яго дзейнасць у Бярэсці. Друкарня аднавіла сваю працу ў 1558 г. пры Станіславе Мурмеліусе. Тут друкаваліся не толькі рэлігійныя, але і свецкія творы: збор юрыдычна-прававых сачыненняў Б. Граіцкага (1560 г.), два выданні «Закону польскага права» разам са «Статутамі варшаўскага сейму 1557 г.» (1559/1560 і 1561) у апрацаванні Яна Пальчоўскага, прызначаныя «для кожнага простага чалавека»; вершаваны панегірык К. Базыліка на смерць жонкі Радзівіла Чорнага — Эльжбеты з Шыдлавецкіх (1562 г.); антыкаталіцкія творы «Гісторыя пра папу Іаана VIII, які быў жанчынай» (1560 г.) і «Пратэй, або Пярэвараценъ» (1564 г.); палітычны твор «Размова паляка з літвінам» віленскага войта А. Ротундуса (каля 1564 г.) і інш.

З друкарні выйшаў першы друкаваны нотны зборнік на Беларусі — «Берасцейскі канцыянал» (альбо «Песні хвал Боскіх», 1558 г.) Яна Зарэмбы. Музыку для яго напісалі Кіпрыян Базылік і Вацлаў з Шаматул. Аўтарамі тэкстаў былі Сымон Зацыус, Андрэй Тшыцескі, Станіслаў Семідаліус. У прадмове да «Канцыяналу» адзначалася, што песні прыз-

3 Topolska M.B. Czytelnik i książka w Wielkim Księstwie Litewskim w dobie Renesansu i Baroku. Wroclaw, 1984. S. 90.
Katechizm Brzeski 1553/1554. Wyd. F. Pulaski. Warszawa, 1908.

начаюцца для тэнара і аматараў «фігурных» спеваў. Як адзначыў Ст. Кот, выданне Я. Зарэмбы было першым сапраўдным кальвінісцкім канцыяналам належнага ўзроўню, годным рэфармацыйнага руху[4].

У Бярэсці ўбачылі свет палемічныя творы польскіх арыянаў Паўла з Бжэзін і Яна Казаноўскага. Дарэчы, твор апошняга «Водпаведзь на павучэнне Яна Кальвіна польскім братам» (1564 г.) змяшчаў даволі рэзкія выпады супраць Кальвіна. Творы суперінтэнданта віленскага збору Сымона Зацыуса (усе 1559 г.) змяшчаюць каштоўныя звесткі пра першапачатковы этап арганізацыі віленскага збору і школы, пра асноўныя дагматы веравызнання кальвіністаў ВКЛ, іх канчатковае адмежаванне ад арыянаў і лютэран[5].

У 1559 г. у Бярэсці быў надрукаваны публіцыстычны твор «Два лісты» — пасланне папскаму нунцыю Ліпаману ад імя Радзівіла Чорнага. Алаізій Ліпаман, веронскі біскуп, быў накіраваны ў Польшчу і ВКЛ для актывізацыі дзейнасці вярхоўнай улады па выкараненні рэфармацыйнай «ерасі». У час свайго побыту ў Вільні нунцый сустрэўся з Радзівілам Чорным. Ліпаман, які слаба арыентаваўся ў палітычнай і рэлігійнай сітуацыі ў ВКЛ, накіраваў Радзівілу ліст з папрокамі ў адступніцтве ад каталіцтва і пастарскімі павучэннямі. Ад імя Радзівіла Ліпаману была паслана водпаведзь, якая між іншым змяшчала вострую крытыку інстытута папства і каталіцтва ўвогуле. Наўрад ці Радзівіл быў фактычным аўтарам гэтага ліста, насычанага філасофска-тэалагічнымі сентэнцыямі. Несумненна адно — рэзкая водпаведзь папскаму нунцыю была адпраўлена з санкцыі Радзівіла. У адным з лістоў нунцый скардзіўся, што пасля пасланння Радзівіла, у якім зневажаўся і Св. Айцец і ўвесь духоўны стан так, «што і сам д'ябал з пекла горшага б атрымаць не змог», ён страціў надзею зрабіць нешта добрае ў гэтым каралеўстве, бо віленскі ваявода для караля з'яўляецца ўсім: «і дарадчыкам, і канцлерам, і маршалкам, і даверaным прыяцелем, з якім кароль есць, танцуе і забаўляецца» і наогул, на думку Ліпамана, водпаведзь была напісана з дазволу караля [6].

4 Bazylik C. Pieśni. Opr. Z.M. Szweykowski / Wydawnictwo dawnej muzyki Polskiej. Kraków, 1958; *Kot St.* Kancjonal Brzeski Jana Zaręby z 1558 r. // Reformacja w Polsce. R. IX—X. № 33—40. 1937/39. S. 449.

5 Akta, tho iest sprawy krześciańskiego Wileńskiego, ktore się poczeli R.P. 1557 Miesięca Decembra Dnia 14. // Monumenta Reformationis Polonicae et Lithuanicae. Seria X. Zesz. 1. Wilno, 1913; Wyznanie wiary zboru wileńskiego...; O posciech i j ich własnościach i sposobach...

6 Relacye nuncyuszów apostolskich i innych osób o Polsce. Berlin ; Poznań, 1864. T. 1. S. 39.

Нунцый асуджаў Радзівіла за агульныя для еўрапейскай рэфармацыі ідэі: непрызнанне вяршэнства рымскага касцёла над усімі іншымі, папы рымскага за намесніка Хрыстова, чысцілішча для душ нябожчыкаў, цэлібату духавенства, а таксама за ўхваленне прычасця пад дзвюма постацямі і выкарыстанне народных моў замест латыні ў царкоўных службах. У адказах Радзівіла асвятляюцца адносіны пратэстантаў да важных пытанняў царкоўна-рэлігійнай дагматыкі, царкоўнай і багаслоўскай традыцыі, да дзяржаўнай і духоўнай улады.

Публіцыстычны запал перапіскі, яе грамадская актуальнасць прывялі пратэстантаў да думкі пра яе выданне. Яна была выдадзена ў 1556 г. у крулявецкай друкарні Даўбмана на лацінскай мове. У 1559 г. у Бярэсці, за кошт Радзівіла Чорнага, выйшаў скарочаны варыянт выдання «Двух лістоў» у перакладзе на польскую мову выдатнага паэта Мікалая Рэя. Берасцейскае выданне «Двух лістоў» вельмі рэдкае. Адзіны поўны экзэмпляр, які належаў бібліятэцы Віленскага евангеліцкага сіноду, выкарыстаў для публікацыі польскі даследчык Ігнацій Хжаноўскі (Храноўскі).[7]

Некаторыя берасцейскія выданні пачатку 60-х гадоў выйшлі без імя друкара ці назвы друкарні і ідэнтыфікаваны даследчыкамі пры дапамозе аналізу яе папярэдняй прадукцыі.

Выдатнае месца ў гісторыі кнігадрукавання ВКЛ і Польшчы належыць выданню Берасцейскай (ці Радзівілаўскай) Бібліі 1563 г., якая выйшла «ўласным коштам і накладам» Радзівіла Чорнага. У другой палове 50-х гадоў XVI ст., у перыяд арганізацыйнага і дактрынальнага афармлення кальвінісцкай царквы, наспела неабходнасць ажыццяўлення ўласнай рэдакцыі Бібліі. Асноўным цэнтрам падрыхтоўкі выдання стаў збор у Піньчове (Малая Польшча). Над перакладам, рэдакцыяй і складаннем каментарыяў да Бібліі працавала вялікая група польскіх, італьянскіх, французскіх тэолагаў, царкоўных дзеячаў, педагогаў, літаратараў. Асноўную частку працы выканалі рэктары пінчаўскай школы Гжэгаж Аршак і Пётр Статорыус, польскі паэт Якуб Любельчык і Ян Тэнаудус з Арлеану. У розны час над ёй працавалі таксама Ян Ласкі, Францыск Станкар, Францыск Лісманін, Бернард Ахіно, Георгій Бляндрата, Ян Павел Альцыатус, Сымон Зацыус, Андрэй Тшыцескі, Марцін

7 Chrzanowski I. Dwa listy lacińskie, Aloizego Lipomana i Mikołaja Radziwiłła, w przekładzie polskim Mikołaja Reja // Z wieku Mikołaja Reja. Warszawa, 1905.

Кравіцкі, Гжэгаж Павел з Бжэзін, Ежы Шоман і інш[8]. Пры падрыхтоўцы Бібліі выкарыстоўваліся не толькі старажытныя яўрэйскія, грэчаскія і лацінскія кнігі, але і іншыя крыніцы. Сярод іх — папулярны ў Еўропе французскі пераклад Бібліі Лефеўра д»Этапля (Антвэрпэн, 1530 г.) і Новы Запавет Эразма Ратэрдамскага.

У 1560 г. Чорны ўзяў пад сваю апеку выданне Бібліі. У 1563 г. Біблія выйшла ў Бярэсці без імя друкара (магчыма, Мурмеліус ці Базылік). Выданне вызначалася манументальнасцю (фармат — in folio, 738 ст.), багаццем мастацкага афармлення (гравюры, застаўкі, ініцыялы, гатычны друк), яскравым рэнесансным абліччам. Магчыма, тытульны ліст з'яўляецца копіяй гравюры Альтдорфера[9]. Пераклад Бібліі вылучаецца сваімі літаратурнымі вартасцямі, яснасцю і вобразнасцю стылю.

У прысвячэнні Жыгімонту Аўгусту Радзівіл Чорны адзначаў, што выданнем гэтай кнігі спадзяецца заслужыць падзяку «народа языка славянскага». Берасцейская Біблія была вядома і ў Заходняй Еўропе — нямецкі выдавец Эліяс Гуттэр выкарыстаў польскі тэкст Новага Запавету з яе для свайго выдання-паліглота на 12 мовах (Нюрнберг, 1599 г.)[10].

Рымская царква ўключыла Берасцейскую Біблію ў індэкс забароненых кніг. Нягледзячы на гэта, Віленскі Сінод 1617 г. пастанавіў, каб яна была пры кожным зборы ВКЛ[11]. Берасцейская Біблія была распаўсюджана і шанавана сярод кальвіністаў ВКЛ, пра гэта сведчаць пратаколы евангелічных сінодаў, інвентары збораў[12]. Берасцейскі земскі суддзя кальвініст Пётр Кахлеўскі ў 1646 г. кожнай са сваіх трох дачок падараваў па экзэмпляры Берасцейскай Бібліі[13].

Найбольшага росквіту берасцейская друкарня дасягнула пры Кіпрыяну Базыліку. У сяр. 50-х гг. Базылік прыняў кальвінізм і надоўга асталяваўся ў ВКЛ. Верагодна, ён прымаў удзел у стварэнні Берасцейскай Бібліі 1563 г. Неўзабаве пасля смерці Радзівіла ў 1565 г., Базылік стаў кіраўніком, а магчыма, і ўладальнікам друкарні. У 1567 г. ён завяршыў

8 Kossowska M. Biblia w języku polskim. Poznań. 1968. T. 1. S. 226.

9 Encyklopedia wiedzy o książce. Wroclaw, etc., 1971. S. 141.

10 Круминг А.А. Элиас Гуттер и Острожская Библия // Федоровские чтения 1981. М., 1985. С. 156.

11 Akta synodów prowincjalnych Jednoty Litewskiej 1611—1625. Wilno. 1915. S. 41.

12 Tworek S. Z dziejów Biblii kalwinów litewskich w XVII wieku// Odrodzenie i Reformacja w Polsce. T. 18., 1973. S. 169—170.

13 Śliż N. Książka w rodzinie szlacheckiej Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI wieku // Księga—nauka—wiara w średniowiecznej Europie. Poznań, 2004. S. 86.

пераклад і надрукаваў кампілятыўнае сачыненне «Гісторыя жорсткіх ганенняў царквы Божай...»[14], у якім з гуманістычных пазіцый асуджалася рэлігійная нецярпімасць у некаторых заходнееўрапейскіх краінах. У гэтай аб'ёмнай працы прыведзены мартыралог пратэстанцкіх пакутнікаў, пачынаючы ад Віклефа і Гуса. У прадмове Базылік называе аўтараў, творы якіх ён выкарыстаў пры падрыхтоўцы гэтай кнігі — гэта англічанін Джон Фокс, Генрык Панталеён і Ян Крэспін. Тытул кніжкі абрамляюць гравюры, на якіх паказаны пакутніцкая смерць пратэстантаў. На адной з іх — выява Яна Гуса ў час пакарання смерцю.

У 1569 г. у Бярэсці выйшаў твор Мартына Барлетыўса «Гісторыя пра жыццё і слаўныя справы Георгія Кастрыёта, звычайна званага Скандэбергам» у перакладзе Базыліка (часткова і Андрэя Волана). У прадмове Базылік змясціў звесткі пра героя вызваленчай барацьбы балканскіх народаў супраць туркаў, сына албанскага князя Георгія Кастрыёта (1404—1467), запазычаныя ім з твораў розных гісторыкаў XV—XVI стст., чым значна папоўніў яго біяграфію. У прысвячэнні свайму новаму патрону, серадзкаму ваяводу Альбрэхту Ласкаму, «коштам» якога выйшла кніга, Базылік называе свабоду «ад Бога дадзеным клейнотам» і адзначае, што пераклаў гэты твор для шляхты «рыцарскага стану», каб яна брала прыклад са Скандэберга. Там жа ён апявае шляхецкія вольнасці ў Рэчы Паспалітай, параўноўваючы іх з вартасцямі іншых еўрапейскіх народаў: «Хай пахваляюцца вучоныя італьянцы навукамі, якія даўно там квітнеюць, і багатымі зборамі тых пладоў, якія тут не растуць; хай пахваляецца ганарлівы немец і ўмелы фландр рознымі тонкімі рамёствамі, хай пахваляецца багаты француз багаццем і незлічонымі даходамі, хай пахваляецца доблесны венгр і імклівы мужны іспанец усім тым, што ўзвышае іх над іншымі народамі. Не могуць яны пахваліцца тымі вольнасцямі, якімі ганарыцца Польшча»[15]. Аўтар выказвае шчырае спачуванне славянскім народам Балкан (сербам, харватам, далматам), якія страцілі сваю свабоду пад турэцкай тыраніяй. Трагізм іх лёсу адлюстроўваецца нават у музыцы: «Прыслухайцеся да іх песняў, поўных жалоснай мелодыі, якая амаль разрывае сэрца, да музыкі, якая сумнай жалобе падобна».

14 Historya o srogiem prześladowaniu kościola Bożego. Brześć, 1567.

15 Barletius M. Historia o żywocie i zacnych sprawach Jerzego Kastryota, którego pospolice Szkanderbegiem zową. Brześć, 1569. S. A3—A4.

A

Historyiey o Zywocie y zacnych spráwách Jerzego Kástriotá/ ktorego pospolicie Szkánderbegiem zową/ Kśiążęcia Epireńskiego.

B

Kśięgi Jedennaste.

C

Gdy się Szkánderbeg w Appuliiey zábawiał/ pierwey niżli przyiechał/ á niżli przymierze miedzy nim/ á miedzy Cesárzem Tureckim vczynione wyszło/ Cesárzowi Tureckiemu / przez ten czás szczęśliwie się wodziło/ ábowiem był nie málo ziemie ku swemu páństwu przymnożył/ bo bárzo wiele był/ y Grekom y Máchometanom w Azyiey y w Europie pobrał. A ták podniozszy się w pychę/ z tákowego szczęśliwego powodzenia/ vmyślił/ (iákoż iednák to

D

záwżdy ná myśli miał) Szkánderbegá w niwecz obrocić/ przeciwko ktoremu/ posłał spráwcę swego Synámá z dwudziestą tysięcy ludzi/ áby się nań oborzył gdyby się on niespodziewał. Ale Szkánderbeg/ nátychmiast/ dowiedziawszy się tego od niektorych przyiaciół/ z ośmią tysięcy ludzi y iezdnych y pieszych / záiechał mu drogę / y vbieżał gorę Mokreą wnocy/ przez ktorą Szynám/ y z woyskiem swoiem ćiągnąć miał/ ná ktorego z nieobáczká vderzywszy/ poraził go y rozgromił ze wszytkiem woyskiem iego/ ktorego więtszą część/ odiawszy im chorągwie y insze sprzęty/ posieczono/ á sam Synam/ ledwy z trochą ludzi vciekł. Wiele Turkow/ ktore było żywo poimano/ pieniądzmi wykupiono/ ktore Szkánderbeg wespo-

Máhumet przeciw Szkánderbegowi Synámá wypráwuie.

Да выдання быў далучаны дадатак — «Пра аблогу і ўзяцце горада Шкодры» таго ж аўтара — М. Барлетыўса. Базылік у прадмове адзначае, што адной з прычын, якая прымусіла яго перакласці гэтую кнігу, была яе выключная рэдкасць — толькі ў бібліятэцы аднаго вучонага італьянца ён змог яе знайсці і не хацеў, каб «такая шляхетная каштоўнасць згінула»[16].

Менавіта з перакладу Базыліка ў XVII ст. быў зроблены пераклад гэтага твора на рускую мову. Пры гэтым даследчыкі выказваюць меркаванне, што наяўнасць шматлікіх беларусізмаў і асобных паланізмаў сведчыць аб тым, што пераклад быў зроблены на суседніх з Польшчай землях, магчыма, на Беларусі[17].

Нам невядома дзейнасць друкарні пасля 1570 г. Адным з апошніх выданняў была панегірычная паэма Яна Каханоўскага, прысвечаная Яну Тэнчынскаму.

Мастацкае афармленне берасцейскіх старадрукаў адпавядала тагачасным еўрапейскім узорам, у некаторых з іх упершыню былі выкарыстаны паказальнікі.

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі захоўваюцца некалькі выданняў берасцейскай друкарні[18], у Цэнтральнай бібліятэцы НАН Беларусі — няпоўны экзэмпляр Берасцейскай Бібліі 1563 г.

16 Ibid. S. 19.

17 Розов Н.Н. Повесть о народном герое Албании в древнерусской письменности // Известия АН СССР. Отд. Литературы и языкознания. М., 1953. Т. XII. Вып. 6. С. 504.

18 Киреева Г.В. Брестские издания XVI века в фондах Национальной библиотеки Беларуси // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі. Мн., 1995.

Цітоў А. К.

Берасцейскія злотнікі

Паводле рэвізіі места Берасцейскага, якая адбылася ў 1566 г., у горадзе налічвалася 4 залатары[1], пры гэтым *Андрэй, залатар* жыў на плошчы Рынку, побач з друкарняй[2]. Не выключана, што ён альбо нехта з ягоных калег па рамяству (*Пётр залатар*, які жыў на Кавальскай вуліцы за Віленскім гасцінцам, альбо *Марцін злотнік*) мелі ад друкарні заказы на шрыфты альбо неабходны металічны рыштунак тонкай работы.

Прывілей на заснаванне цэху быў нададзены берасцейскім злотнікам, першым сярод іншых местаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у *годзе 1599 красавіка 17 дня.* Статут быў зацверджаны мескімі ўладамі і, літаральна праз два тыдні, — 3 траўня ён быў канфірмаваны каралём Жыгімонтам III Вазай.

Адпаведна з каралеўскім Статутам курс вучэння праходзіў даволі працяглы час. Пасля 5 — 7 гадовага курсу навукаў, у званні вучня і атрымання статуса таварыша альбо падмайстры, ён трапляў у сваёй новай якасці ў

1 Забела Т. Места Бярэсцейскае ў XVI сталецці (Соцыяльна—эканомічны нарыс). — Запіскі аддзелу гуманітарных навук. Кніга 8. Праца клясы гісторыіі. Том III. Менск, 1929. С. 95.

2 Описание староства Берестейскаго // документы Московского архива Министерства Юстиции / под ред. М. Довнара-Запольского. М., 1897. Т. 1. С. 205.

майстроўскі варштат. Праўда, самастойна, без дазволу майстра займацца рамяством такі падмайстра-таварыш не мог. Калі б ён асмеліўся працаваць самастойна, яго чакаў штраф — памерам у «сем коп грошай». Далей гэты дакумент патрабаваў, што «калі каторы таварыш хацеў у Берасці стаць ***Майстрам***, павінен папярэдне працаваць у цэху два гады, каб ягоныя жыццё і паводзіны маглі быць пазнаны; затым, жадаючы стаць майстрам, добра выхаваны і вывучаны, ён мусіў два гады ў далёкіх і чужых местах займацца сваім рамяством пахвальна і прыстойна яго вывучаць». Пасля праходжання стажыроўкі за мяжой, падмайстра атрымоўваў дазвол трымаць іспыты на званне майстра. Але спачатку таварыш прымаў «права мескае» і прыносіў прысягу на вернасць Берасцю. Пасля гэтай працэдуры ў прысутнасці цэхмістра прэтэндэнт на званне бярэсцейскага злотнічага майстра быў абавязаны «паказаць штукі рамяства свайго»: па-першае, мусіў зрабіць келіх, па-другое, пячатку, на якой патрэбна было «вырыць» прылбіцу з наміткай альбо галінкамі ці кветкамі ўпрыгожаную, і, па-трэцяе, мусіў умацаваць каштоўны камень у залатым пярсцёнку.

Цікавай асаблівасцю берасцейскага цэху было тое, што, акрамя злотнікаў, у яго стварэнні прынялі ўдзел і мастакі (Злотніцка-Малярскі цэх). Напрыканцы цэхавага Статута было падкрэслена, «каб цэх і ратуш таго места Берасцейскага ўзбраеннем быў забяспечаны». Гэта значыла, што тутэйшыя рамеснікі, у адпаведнасці са згаданым прывілеем, былі абавязаны «кожныя пяць гадоў, ад зачацця цэху, набываць штогод пулгак [мушкет сярэдняга памеру — *А.Ц.*] і шэфелін [піку — *А.Ц.*], каб праз дзесяць гадоў яны мелі цэлую збраёўню». Прывілеямі іншым злотнічым цэхам таксама падкрэсліваецца, што цэху неабходна мець — «харугву, бубен і ўсялякую армату срэбную для абароны і аздобы места тамтэйшага».

Статут брацтва быў канфірмаваны сынам Жыгімонта — каралём Уладзіславам IV у годзе 1633 лютага 2 дня. Дадаткова да папярэдніх артыкулаў кароль падкрэсліў, што ніхто іншы, акрамя злотнікаў цэхавых, прысеглых, не можа «смалеваць» срэбра ў месце. У гэтым жа дакуменце было пазначана, што замкавы ўрад не можа прыцягваць злотнікаў да свайго суду, яны падлягаюць толькі юрысдыкцыі Берасцейскага ўраду.

У Берасці двойчы на месяц цэхмістры бралі ў кожнага майстра пробы срэбра, якія мусілі адпавядаць «пробе таляровай». Калі здаралася, што яна не супадае са стандартам, вінаваты плаціў (за першы раз) у цэхавую

скрынку штраф памерам у палову грыўні, другі раз — грыўню срэбра, а пасля трэцяга — дзве грыўні. Калі ж гэтыя меры не давалі пажаданага выхаваўчага плёну, на чацьвёрты раз паўтарэння падобнага ўчынку — вінаваты губляў права працы па гэтай спецыяльнасці. Пра яго дакладалася мескім уладам, магістрат зачыняў ягоныя варштат і крамы, ён выганяўся з асяродку цэхавых братоў.

За перыяд з другой паловы да канца XVI ст., па няпоўных дадзеных, зафіксавана сем майстроў, у XVII ст. іх фіксуецца звыш тузіна. Трэба адзначыць, што калі Берасце страціла свой ваяводскі статус і стала звычайным павятовым цэнтрам Гарадзенскай губерні, у XIX—пачатку XX ст., паводле архіўных статыстычных дадзеных, рамеснікаў, занятых злотніцкай і срэбраніцкай справай і рэзаннем пячатак, было трохі больш за дзесятак.

Крыніцы:

Laucevičius E., B. R. Vitkauskenė. Lietuvos Auksakalyste XV —XIX amzis. Vilnius. 2001. — Далей L—V №…

Łopaciuski E. Materiały do dziejów rzemieosla artystycznego Wielkiego Xięstwa Litewskiego (XV — XIX W). Warszawa. 1946. Далей — Łopacinski № —

Акты, издаваемые комиссию высочайше утвержденной, для разбора древних актов в Вильне. Далей — АВАК. Т.

Калекцыя мікрафільмаў Нацыянальнага гістарычнага архіву Беларусі ў Мінску — Далей — КМФ 18. Спр., Арк…

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску Далей — НГАБ у Мінску

ДАДАТАК

Рэестр берасцейскіх злотнікаў

АРАНОВІЧ *Давід берасцейскі злотнік, меў жонку Фрэду Леўкаўну Давыдаўну — 19 жніўня 1663 — памёр ад няправільнага, на думку яго родных, лячэння. Згадваецца ў* скарзе ягонага бацькі Арона Якубовіча на бярэсцейскага цырульніка Самуэля Шрэера
(АВАК. Т. 28. С. 398).

БАРКОЎСКІ … *(Borkowski…) — злотнік берасцейскі — 1624 — па справе М. Гронастайскага супраць цэху (КМФ 18. Спр. 305. Арк. 14зв. — 15).*

БЕРГЕЛЬ *Аўгусцін (Augustin Bergel) — злотнік берасцейскі — 1585 — у судовым працэсе з іншым злотнікам П. Туровічам (КМФ 18. Спр. 276. Арк. 20-20зв.).*

ВІЛЬЧКАЎ *Себестыян (Sebestyian Wilczkow) злотнік берасцейскі — памёр каля 1665, згадваецца ў «квіце», які ўнесла 25 траўня таго году ў берасцейскі гродскі суд ягоная жонка «блізкая памочніца» Марыяна» на «жыда берасцейскага» Якуба Ельяшэвіча Копыля, які прысвоіў сабе частку рухомасці нябожчыка (НГАБ у Мінску. Ф. 1705. Воп. 1. Спр. 13. Арк. 186—186зв.).*

ГАЎСІЎС *Аляксандр (Аляксандар (Wawrynec) Hausius) — таварыш берасцейскага злотніцкага цэху і майстры М. Гронастайскага — 1624 — па справе апошняга, як нанеслы шкоду у 3 тыс. коп грошай літоўскіх (КМФ 18. Спр. 305, арк. 1зв, 4зв. — 15).*

ГРОНАСТАЙСКІ *Міхал (Michal Gronostayski) — злотнік берасцейскі — 1599 — у прывілеі на цэх (КМФ 18. Спр. 106. Арк. 93); — 1623 — ад'язджае ў Гданьск (L—V № 1.356); — 1624 верасня 9 — у дэкрэце суда апеляцыйнага, як «актор» па справе супраць Берасцейскіх злотнікаў і ягонага таварыша — падмайстра Аляксандра Гаўсіуса, які нанёс яму шкоду ў 3 тыс. коп грошай літоўскіх, што прывяло яго да нястачы (КМФ 18. Спр. 305. Арк. 1зв. — 4зв. — 15).*

ГУТРОЎСКІ *Станіслаў (Stanislaw Gutrowski) — берасцейскі злотнік — 1624 — у справе М. Гронастайскага супраць тамтэйшага злотнічага цэху (АВАК. Т. 6. С. 256 — 257).*

ДРЭЗНЕР *Ян (Drezner, Dryznik Jan) — злотнік берасцейскі — 1599 — у прывілеі на цэх (КМФ 18. Спр. 106. Арк. 93); — 1624 — старшы цэху, у справе М. ГРОНАСТАЙСКАГА супраць цэху (КМФ 18. Спр. 305. Арк. 1зв, 4зв. — 15; АВАК. Т. 6. С. 256 — 257); — 1626 — старшы цэху ў справе злотнікаў супраць С. РАДВАНСКАГА (АВАК. Т. 6. С. 268 — 269).*

ЕЛЕНЕВІЧ *Францыск, сын Юзэфа. Нарадзіўся ў Берасці ў 1749; — 1767 — запісаны вучням да віленскага злотніка Н.Ф. Мая; — 1772.VI. 19 — кантракт працягнуты на 5 гадоў; — 1777 VI. 16 — запісаны падмайстрам у таго ж Мая, які выплаціў яму 20 талераў; — 1786 — прынёс прысягу «месту Віленскаму» і быў прыняты ў цэх; — 1820 —апошняя дакументальная згадка пра яго (L—V № 1.478).*

КЕЧНЕРСКІ *Юзэф (Kiecznierski Jozef) — мяшчанін, злотнік берасцейскі — 1673 — звінавачваецца М. Лейбовічам у нападзе 23. 06. 1673 на ягоны дом на вул. Кавальскай (НГАБ у Мінску. Ф. 1786. Воп. I. Спр. 4. С. 125 — 1254).*

МАЛЬТАН *Фрыдрых (Frydrych Maltan) — злотнік берасцейскі, старшы цэху — 1624 — у справе М. ГРОНАСТАЙСКАГА супраць цэху (КМФ 18. Спр. 305. Арк. 14зв. —15; АВАК. Т. 6. С. 256 — 257); — 1626 — у справе цэху супраць парушальніка статута С. РАДВАНСКАГА (АВАК. Т. 6. С. 268 — 269).*

МІТНАХ *Ганус (Hanus Mitnach, Stokwisz) — злотнік і мешчанін берасцейскі, арыянін — 1642 — звінавачваецца Ш. САПАЛЬСКІМ у гвалтоўным перахопе лістоў і рэчаў, называецца «непрыяцелем касцёла Божага і веры святой каталіцкай» (АВАК. Т. 6. С. 407 — 408, 411 — 414).*

ПАЎЛОВІЧ *Марцін (Martin Pawlowicz) паходзіў з Берасця —1748. VIII. 16 — запісаны на 4 гады вучнем да віленскага майстра Я. Лары. Пасля заканчэння вучобы атрымаў званне падмайстра (Łopacinski № 764; L—V. I.896).*

ПІАТРОЎСКІ *Станіслаў (Stanislaw Piotrowski) — злотнік берасцейскі — 1626 — скардзіцца ў магістрат разам з іншымі на злотніка РАДВАНСКАГА за «негодныя» паводзіны (АВАК. Т. 6. С. 268 — 269).*

РАДВАНСКІ *Станіслаў (Stanislaw Radwanski) — злотнік, «прыстаўшы да цэху Берасцейскага» — 1626 — як асоба, што парушае цэхавы статут, не прыняў «водлуг парадку мескія правы» і не прынёс гораду прысягу (АВАК, т. 6. СС. 268 — 269).*

РАЧКА *Якуб (Jakub Raczka) — злотнік берасцейскі — 1599 — у прывілеі на цэх (КМФ 18, спр. 106, арк. 93); — 1624 — ягоная ўдава Магдалена Якубава «злотнічка берасцейская» прадала агарод «жыду берасцейскаму Шлёме Насонавічу» (НГАБ у Мінску Ф. 1786. Воп. 1. Спр. 1. Арк. 167—168).*

РЫК *Ян (Jan Ryk) — злотнік берасцейскі — 1599 — у прывілеі на цэх (КМФ 18. Спр. 106. Арк. 93).*

САПАЛЬСКІ Шымон (Szymon Sapalski) — мешчанін, злотнік берасцейскі — 1642 — выступае з пратэстацыяй на Г. СТОКВІША, якога звінавачвае ў гвалтоўным перахопе рэчаў і лістоў (АВАК. Т. 6. С. 407 — 408, 411 — 414). На думку Я. Лапацінскаг, пазней з'ехаў з Берасця ў Люблін (Łopacinski № 144; L—V № 1.100).

ТУРОВІЧ *Пётра (Petro Turovicz) — злотнік берасцейскі — 1585 — у працэсе з А. БЕРГЕЛЕМ (КМФ 18. Спр. 276. Арк. 20 — 20зв.).*

ФЛАВІУШ *Аляксандар (Alexander Flawiusz) — злотнік, таварыш цэху берасцейскага; — 1624 — звінавачваецца М. ГРОНАСТАЙСКІМ у нанясенні яму матэрыяльнай шкоды (АВАК. Т. 6. С. 255 — 257).*

ЮТРОЎСКІ *Станіслаў (Stanoslaw Jutrowski) — злотнік берасцейскі — 1624 — у сувязі са справай М. ГРОНАСТАЙСКАГА супраць цэху (КМФ 18. Спр. 305. Арк. 14зв. — 15).*

ЯКУБОВІЧ *Абель (Abel Jakubowicz) — 1720 — берасцейскі злотнік, іудзей (Łopacinski № 606, L—V № 1.484).*

ЯСЬКА *Ганус — бярэсцейскі злотнік —1629 — звінавачвае берасцейскага яўрэя Леўку Шмуйловіча ў «падмове» ягонага вучня — «хлопца» са Славатычаў «пакрасці» золата ў майстра (АВАК . Т. 28. С. 119).*

Злотнікі, чые прозвішчы не ўстаноўлены

АНДРЭЙ — *берасцейскі «залатар» — 1566 — згадваецца ў рэвізіі места, мае адну валоку зямлі (Забела Т. Места Берасьцейскае ў XVI сталецьці (Соцыяльна-эканомічны нарыс // Запіскі адзелу гуманітарных навук. Кніга 8. Працы клясы гісторыіі. Том III. Менск, 1929. С. 95).*

МАРЦІН — *берасцейскі «залатар» — 1566 — згадваецца ў рэвізіі места, мае «з братам Каспрам» адну валоку зямлі (Описаніе староства Берестейскаго // Документы Московского архива Министерства Юстиции. Под ред. М. Довнара-Запольского. Т. 1. М., 1897. С. 223.).*

ПЁТР — *берасцейскі «залатар» — 1566 — згадваецца ў рэвізіі места, жыве на Кавальскай вуліцы за Віленскім гасцінцам (Описаніе староства Берестейскаго // Документы Московского архива Министерства Юстиции. Под ред. М. Довнара-Запольского. Т. 1. М., 1897 С. 206.)*

ЮРЕЙ *(Jendrzey) — злотнік берасцейскі — 1662 — выступае ў якасці ацэншчыка срэбранага сталовага набора «асбурскай» работы з 40 прадметаў (АВАК. Т. 5. С. 166 — 167).*

XXXXX … — *(імя і прозвішча не фігуруюць) вучань берасцейскага злотніка Гануса* ЯСЬКІ. *Паходзіў са Славатычаў — 1629 — яго «падбухторыў» абкрасці свайго майстру берасцейскі яўрэй Л. Шмуйловіч (АВАК. Т. 28. С. 119).*

Бразюнене Альма

Bibliotheca Sapiehana: попытка реконструкции тематического репертуара

Bibliotheca Sapiehana — так называлась библиотека, собранная Львом Сапегой (1537—1633), гетманом Великого Княжества Литовского, и его сыновьями: Яном Станиславом (1585—1635), Криштофом Николаем (1607—1631) и Казимиром Львом (1609—1656). Как известно, Казимир Лев Сапега своим тестаментом 1655 года 3 тысячи книг своей библиотеки записал Библиотеке Виленского университета (тогдашней *Bibliothecae Academiae Vilnensis*). Из Ружан, где хранились эти книги, в 1666 году они были перевезены в Вильну. Уже современниками эта донация была признана исключительно ценной из-за своего объема и сравнивалась с донацией для Виленской иезуитской академии короля Сигизмунда Августа 1571 года. Об этом писали Алоиз Миштольд (1724), Казимер Когновицкий (1792), Юзеф Ярошевич (1844), Юзеф Лукашевич (1851), Михаил Балинский (1862), Станислав Заленски (1905), Константинас Авижонис (1930), Паулюс Галауне (1961), Лев Владимиров (1970), Ноюс Фейгельманас (1975), Людвик Пехник (1983), Микола Никалаеу (1985), Георгий Голенченко (1987) и другие исследователи. Однако более крупного исследования, посвященного специально библиотеке Сапег, не имеется. В Библиотеке Вильнюсского университета в настоящее время по провененционным знакам, то есть по рукописным пометкам в кни-

гах и по суперэкслибрисам, установлено 252 названия (255 экземпляров) книг из этой библиотеки. Еще 35 экземпляров выявлено в разных других библиотеках: 21 книга хранится в Национальной Библиотеке Украины имени В.И. Вернадского, 10 книг — в Библиотеке Российской Академии Наук в Санкт-Петербурге, 2 книги — в Библиотеке Тартусского университета, 2 книги — в Библиотеке Академии Наук Литвы. На сегодняшний день имеются сведения о сохранившихся 290 книг из *Bibliothecae Sapiehanae*. Их может быть и больше.

Целью настоящего сообщения является попытка, основываясь на книгах, сохранившихся в Библиотеке Вильнюсского университета, восстановить тематический облик бывшей большой Ружанской библиотеки — какие книги в ней находились в первой половине XVII века, — и на том основании посмотреть, какие характеристики в соответствующей реконструкции обнаруживаются и проявляются в историческом и книговедческом контексте. Сразу необходимо отметить, что подобного рода реконструкция является условной. Ведь речь идет о сохранившейся только одной десятой части бывшей библиотеки. К примеру, Алодия Кавецка-Грычёва (Aliodia Kawecka-Grycziowa) для своей реконструкции библиотеки Сигизмунда Августа имела возможность опереться на данные о примерно четвертой части бывшей королевской библиотеки (из 4 тысяч книг Кавецка-Грычёва реконструировала издания 958 названий)[1]. Задача представить репертуарную характеристику *Bibliothecae Sapiehanae* стала бы легче в том случае, если бы существовал уцелевший каталог данной библиотеки. Факт существования каталога, точнее, списка переданных книг *Bibliothecae Sapiehanae* Виленской иезуитской академии, упоминается Алоизом Миштольдом в его книге «Historia Illustrissimae Domus Sapiehanae» (Vilnae, 1724), в одном из первых историографических источников *Bibliothecae Sapiehanae*. Там говорится: *Conscriptum indicem huius beneficii librum in separatis foliis conservamus sub titulo Bibliotheca Sapiehana*, то есть список книг этой бенефиции, написанный в отдельных листах, под названием *Bibliotheca Sapiehana* мы храним[2]. В настоящее время, увы, нет сведений о факте существования и о месте хранения этого рукописного каталога.

1 Kawecka-Gryczowa A. Biblioteka ostatnego Jagiełłona: pomnik kułtury renesansowey. Wrocław: zakład narodowy im. Ossolińskich, 1988. 344 p.

2 Misztolt A. Historia illustrissimae domae Sapiehanae. Viłnae, 1724. P. 61.

Что характерно для книг *Bibliothecae Sapiehanae*, находящихся теперь в Библиотеке Вильнюсского университета? При попытке распределить оставшиеся книги на тематические группы выясняется, что одну определенную предметную группу как преобладающую эти книги не составляют, то есть условные тематические группы распределяются достаточно равномерно.

Книги историко-географической тематической группы составляют 23 %. Среди них — исторические хроники отдельных государств — Бельгии, Франции, Индии, Испании, Бразилии, Германии, Британии и пр. анналы; имеются книги, освещающие историю одного определенного государства на всем протяжении его существования, а также рассматривающие один какой-либо исторический его промежуток. Например, истории Германии с 1617 по 1633 год посвящено произведение примерно из 1000 страниц, написанное Петром Лотихом (Petrus Lotich, 1598—1669) *Germanicarum gestarum libri*, изданное в 1646 году во Франкфурте-на-Майне, со множеством гравюр городов, битв и персон[3].

Исключительным является многотомное издание об Америке, в 1590—1614 гг. вышедшее в типографии знаменитого книгоиздателя Теодора де Бри и его сыновей, работавших во Франкфурте-на-Майне. В настоящее время это издание, обильно иллюстрированное гравюрами, стало популярным из-за представленных в нем сцен канибализма. Читателю начала XVII века издание Теодора де Бри служило источником информации о малознакомой жизни туземцев Америки. Сохранились только 1, 2, 3 и 9 тома из Сапегской библиотеки[4]. Последний попал к Сапегам из библиотеки гетмана ВКЛ Яна-Карла Ходкевича через родственные связи: его дочь Анна Ходкевич была замужем за Яном Станиславом Сапегой и, видимо, как приданое получила в наследство некото-

3 Lotichius J.P. Johannis Petri Lotichii *Rerum Germanicarum sub Matthia, Ferdinandis II & III Impp. gestarum libri LV...* Francofurti ad Moenum: typis exscripti Wolfgangi Hoffmanni, impensa Matthaei Meriani, 1646—1652. Ps 1. [20], 1154, [26] p., 8, [1], [45] il. fol.

4 *Hariot, Thomas* (1560—1621). Admiranda narratio... de commodis et incolarum ritibus Virginiae. Francoforti ad Moenum: Typis Ioannis Wecheli, sumptibus vero Theodori de Bry, 1590. 34, [6] p., XXIII, V fol. ; Le Moyne de Morgues, Jacques (1533—1588). Brevis narratio eorum quae in Florida... acciderunt. Francofurti ad Moenum: typis Ioannis Wecheli, sumptibus vero Theodori de Bry, 1591. [8], 30, [6] p., XLII, [11] fol. ; Staden, Hans (?—1556). Americae tertia pars. Francofurti ad Moenum: apud Ioannem Wechelum, impensis Theodori de Bry, 1592. [16], 296, [16] p. ; Americae nona et postrema pars. Francof.: apud Matth. Beckerum, 1602. [8], 362, [2], 56 p., [1], XXV fol., 100 p., [1], XIV, [1] fol.

рые книги отцовской библиотеки. Остается лишь догадываться, сколько томов об Америке, изданных Теодором де Бри, было приобретено Сапегами. Есть основание полагать, что у Сапег находился полный комплект этого издания, равно как и у Яна-Карла Ходкевича.

Произведения по философии, логике, экономике составляют 21 % от всего сохранившегося собрания. Полагается упомянуть издание «Institutionum aeconomicarum libri duo» (Лювен, 1649) с напечатанной авторской дедикацией Криштофу Николаю и Казимиру Льву Сапегам[5].

Теология, патристика и другая религиозная литература составляют 16 %. Это сборники трудов или отдельные сочинения отцов Церкви: Василия Великого, Аврелия Августина, Иоанна Златоуста, Кирилла, Амброзия, Бернарда и других. Все они находятся в исключительно хорошем состоянии, изданы академически, во многих случаях паралельно на двух языках — греческом и латинском, многотомные. Например, 11 томов фолиантов Аврелия Августина (Париж, 1635—1637)[6]. В большинстве это издания Парижской королевской типографии. Почти все они престижно переплетены: на кожаных обложках цвета красного дерева оттиснут позолоченый герб Сапег. Такая литература для Сапегов, государственных деятелей, была не столько предметом их теологических студий, сколько источником познания развития философской мысли вообще, репрезентантами мастерства престижных типографий Европы.

Книги тематики военного дела составляют 13 % от всего сохранившегося собрания. Это истории отдельных стран и отдельных войн, много произведений, посвященных определенным отраслям военного дела, например, артилерии, особенно фортификации, ее истории. Следовало бы отметить переведенное на польский язык произведение Диего Уфано «Artileria», выпущенное в Лещне в 1643 г., с многочисленными гравюрами и с изображением Смоленской битвы на фронтисписе[7]. Внимание Сапег к такого рода книгам понятно: Казимир Лев с братом Криштофом Николаем сами прошли обучение военному делу в Нидерландах,

5 Vernulaeus, Nicolaus (1583—1649). Institutionum Oeconomicarum libri duo... Lovanii: apud Ioannem Vryenborch, 1649. [8], 98, [2] p.

6 Augustinus, Aurelius (354—430). S. Aurelii Augustini... Opera tomis undecim comprehensa. Parisiis: [Compagnie du grand navire], 1635—1637. 11 t.

7 Ufano, Diego (?—1613). Archelia albo Artilleria... W Lesznie: u Daniela Vetterusa, 1643. [16], 32, 160 [i. e. 120], 72, [4] p., 60 il. fol.

особо заботились о войске ВКЛ, содержали по тысяче военных каждый, а Казимир Лев Сапега, который в битве под Рыховом в 1649 году нанес поражение казакам, прославился как умелый воевода.

В *Bibliothece Sapiehanie* были хрестоматийные издания по военному делу. Прежде всего имеется в виду проиведение Роберта Валтуриюса *De re militari*, изданное в 1534 г. в Париже, иллюстрированное гравюрами на дереве[8]. Данное произведение итальянского инженера, написано к 1460 г., первый раз напечатано в Вероне в 1472 году, стало весьма популярным, вышло семь его изданий в инкунабульном периоде, оно переведено на итальянский и французский языки. Издание, принадлежавшее Сапегам, является вторым французским изданием 1534 года. Произведение Валтуриюса считается исключительным примером истории науки — техники инженерного дела, одной из самых ранних иллюстрированных технических книг. В ней помещено 97 гравюр на дереве, изображающих разное военно-техническое оборудование и механизмы, схемы штурма замков и пр. Следует подчеркнуть, что эти иллюстрации вкомпонированы в текст, они не занимают отдельной страницы, т.е. целью иллюстрирования не является приукрашивание книги, как это намечается во многих других изданиях того времени, а наоборот — иллюстрации служат средством передачи авторской идеи, т.е. информации. Так что использование иллюстраций подобным образом являлось достаточным новшеством в эпоху инкунабулов и палеотипов.

Отдел правовой литературы, составляющий 8 %, казалось бы, слишком скромен, так как известно, что в 1644 г. Казимир Лев Сапега как меценат записал некоторые свои книги профессорам намечаемого юридического факультета Виленского университета. Найдено несколько книг с такими дарственными записями К.Л. Сапеги.

Тематическая группа художественной литературы наилучшим образом представляется произведениями античных авторов. Они составляют 8 % среди уцелевших книг *Bibliothecae Sapiehanae*. Это произведения Аристотеля (даже шесть книг), Плутарха, Платона, Ксенофонта, Пиндара, Тацита, Ливиюса и других авторов. Среди художественной литературы Ренессанса — книга сонетов Изабелы Андреини, издана в

8 Valturius, Robertus (1405—1482). De re militari... Parisiis: apud Christianum Wechelum, 1534. [12], 383, [1] p. il.

1601 году в Милане[9], а также знаменитый пасторальный роман Оноре Урфе «Астрея», славившийся тонкой психологической трактовкой своих героев[10], и даже три издания популярного анонимного романа XIII века «Амадись де Гауле»[11], названного именем нежно любящего юноши, — два издания на французском (Париж 1545, 1551) и одно на немецком (Страсбург, 1600) языках.

Остальные книги (9 %) не составляют самостоятельных тематических групп: несколько трудов по риторике, арифметике, три словаря, пара грамматик.

Странным кажется то, что в собрании отсутствуют труды по медицине. Они обычно находились во всех вельможных библиотеках, начиная с королевского собрания Сигизмунда Августа. Остается предполагать, что это только случайность, что именно такие книги потерялись по ходу столетий. Не кажется правдоподобным, что Сапеги составляли исключение из вельмож своего времени и могли не интересоваться достижениями медицины.

Упомянутые произведения выпущены в лучших издательствах Европы. Среди других книг тут находятся альды, ельзевиры, плантены, етьены. Книг, изданных издательствами ВКЛ, малое количество. Среди них надо упомянуть хронику Александра Гуагнини (Краков, 1578)[12], поэтическое произведение Яна Радвана *Radivilias*[13], в настоящее время хранящиеся в Библиотеке Академии наук Литвы. Есть большая вероятность, что в *Bibliothecae Sapiehanae* должна была находиться и *История Литвы* Альберта Виюка-Кояловича (Гданск, 1650), так как в ней напечатано авторское посвящение Казимиру Льву Сапеге, а также другие книги, подготовленные местными авторами. Казимир Лев Сапега славился как большой меценат и крупный государственный деятель, и

9 Andreini, Isabella (1562—1607). Rime d´Isabella Andreini… comica gelosa... In Milano: appresso Girolamo Bordone et Pietromartire Locarni compagni, 1601. [8], 311, [1] p.

10 Urfé, Honoré d' (1567—1625). L'Astree de Messire Honoré d'Urfé. A Lyon: de l'imprimerie de Simon Rigaud Marchand, 1631. P 1. [16], 623, [1] p.

11 Amadis de Gaula: Le neufiesme livre d´Amadis de Gaule... A Paris: pour Vincent Sertenas, 1551. [6], 190 fol.

12 Guagnini, Aleksandro (1538—1614). Sarmatiae Evropeae descriptio... Kraków: typis Matthiæ Wirzbistæ, [1578]. [5], 79, [1], 33, [1], 13, [1], 9, [1], 47, 10, [8] fol.

13 Radvan, Joannes. Radivilias sive de vita et rebus preclarissimae gentis… Nicolai Radivili… Vilnae: ex officina Joannis Kartzani, 1592. [168] p.

изданий, которые ему дедицировались и посвящались, библиография Эстрейхера насчитывает около сорока.

Тематический облик оставшейся части библиотеки Сапег наводит на заключительную мысль о том, что владевший этой библиотекой вельможный род Сапег ее собирал и формировал как библиотеку гуманитарного профиля, отражающую широкий кругозор своих владельцев. Книги, которые Сапеги приобрели и которыми пользовались, для хранения которых в Ружанах был сооружен специальный библиотечный зал, — являются репрезентантом того облика библиотек, который выражал книжную культуру самых высоких слоев жителей Великого княжества Литовского эпохи Ренессанса, их глубоко заинтересованное отношение к книге, преемственность книгоиздательского дела Европы, интенсивное функционирование книги в ВКЛ как части общего целостного европейского духовно-культурного пространства.

Нікалаеў М. В.

Абразкі старажытнай кніжнай культуры Берасцейшчыны (пераважна па матэрыялах Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі ў Санкт-Пецярбургу)

1. Старажытны перыяд: ад Тураўскага евангелля і «Codex Gertrudianus» да гіпатэтычнага пінскага летапісання

Кніжныя сувязі Берасцейшчыны з заходнееўрапейскімі краінамі пачаліся яшчэ ў XI ст., калі ў Тураў з жонкай князя Ізяслава Яраславіча Гертрудай прыбыла захаваная і да сёння[1] пергаменная лацінская кніга незвычайнай прыгажосці. Гертруда была дачкой польскага караля Мешка II і нямецкай маркграфіні Рыгезы, яна напэўна мела і іншыя лацінскія (магчыма нямецкія і польскія кнігі), але згадак аб іх не захавалася. «Кодэкс Гертруды» складаецца з Псалтыра, перапісанага пры канцы X ст. па заказе архіепіскапа Трэві (Ірландыя) Эгберта і ўпрыгожанага 34 мініяцюрамі, а таксама пазнейшай часткі, якая з'явілася на Русі (малітоўнік Гертруды) і пяці новых мініяцюр: «Раство Хрыста», «Укрыжаванне», «Багародзіца Пячорская», «Апостал Пётр з групавым партрэтам сям'і Яраполка» і «Каранаванне Яраполка»[2]. Малітоўнік узнік на

1 У горадзе Чывідале, на Поўначы Італіі.

2 Smorąg-Różycka M. Bizantyńsko-ruskie miniatury Kodeksu Gertrudy: O kontekstach ideowych i artystycznych sztuki Rusi Kijowskiej XI wieku. Kraków, 2003.

працягу 1078—1087 гг., пісала яго альбо сама Гертруда, альбо, як лічаць некаторыя даследчыкі, яе капелан[3]. Мініяцюры, згодна з гіпотэзай Віктара Шматава, маглі быць створаны ў Тураве, дзе жыў Ярапoлк са сваёй сям'ёй да пераезду ў Кіеў[4].

Гісторыя склалася так, што не лацінскае, але кірылічнае пісьмо (адпаведна і кніжнасць) сталі той асновай, на якой грунтавалася развіццё культуры Беларусі ў старажытнарускі перыяд. Зараз агульны фонд захаваных кірылічных кніг XI—XIII стст. складае прыкладна 262 кодэксы. Сярод іх з той ці іншай ступенню верагоднасці звязваюцца з тэрыторыяй будучай Беларусі толькі шэсць — Тураўскае, Дабрылава, Полацкае і Аршанскае Евангеллі[5], а таксама Супрасльскі рукапіс XI ст. і спіс «Лесвіцы» Іаана Лесвічніка XIII ст.[6] Як правіла, рэгіянальнае паходжанне, а хутчэй бытаванне, кнігі высвятляецца не па яе асноўным змесце, мастацкай аздобе ці моўных асаблівасцях, а паводле пазнейшых прыпісак альбо звестак з гісторыі рукапісу. Так, Тураўскае Евангелле XI ст. змяшчае ўкладны запіс князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага з жонкай і сынам ад 2 мая 1508 г.: ён надае да царквы Перамянення ў Тураве «сад с пасекою и поле з сеножатьми... на сюи стороне на пересельи села Вересни[ц]кого, на сюи стороне Воронине от замку». 10 лютага 1513 г. на іншым аркушы імі ж зроблены запіс-наданне да той самай царквы «три поли на пересельи, села Вересницкого, и з припашьми, и з сеножатьми, и з замежьками, по самую течьку и долину».

Шырока вядома дзейнасць выдатнага прапаведніка і кніжніка XII ст., епіскапа Кірылы Тураўскага. Адносна яго твораў думкі даследчыкаў палярна разыходзяцца: яго залічваюць то да арыгінальных аўтараў, то да простых перапісчыкаў багаслоўскіх тэкстаў. Для вырашэння праблемы была зроблена спроба вылучыць фармальныя прыкметы стылю Кірылы з дапамогай колькаснага аналізу, што прывяло да высновы аб прэваляванні ў 11 творах, якія традыцыйна прыпісваюцца яму, стылю выкарыстаных ім крыніц і, значыць, аб кампілятыўнай дамінанце ў яго

3 Potkowski E. Kobiety a książka w średniowieczu — wybrane problemy // KHist. 1998. № 3. S. 3—4.

4 Шматаў В. Ф. Партрэт Ярапoлка ў мініяцюрах // ПГКБ. 1980. № 4. С. 24—26.

5 Сводный каталог славяно-русских рукописных книг, хранящихся в СССР. XI—XIII вв. М., 1984. № 10, 55, 194, 195, 342.

6 Щапов Я. Н. Восточнославянские и южнославянские рукописные книги в собраниях Польской Народной Республики. Вып. 1. М., 1976. № 18, 206.

творчасці[7]. Тым самым ускосна сведчыцца аб даступнасці Кірылу карыстання добрым кнігазборам. Ні воднай кнігі, якую традыцыя непасрэдна звязвала б з Кірылам як перапісчыкам, не захавалася, але ад часоў Вялікага княства Літоўскага засталося багата спісаў яго малітоўных вершаў. Яны ўвайшлі ў многія рукапісныя і друкаваныя зборнікі[8], прынамсі, у кнігу «Молитвы повседневные», якую выдала Віленскае праваслаўнае брацтва ў 1596 г.[9] У XVII ст. Кірыла Тураўскі друкаваўся ў Вільні, Еўі, Куцейне[10]. Вынікі пошукаў яго малітоўнага цыклу ў рукапісных кнігах дазваляюць гаварыць пра больш чым 60 спісаў рознай паўнаты[11].

19 чэрвеня 1205 г. армія галіцка-валынскага князя і фактычнага дыктатара ўсёй Паўднёвай Русі Рамана Мсціславіча (вядомага ката і садыста, які ўжываў у буйных маштабах такія кары як закопванне жывым у зямлю, здзіранне скуры, выдзіранне вантробаў і да т. п.) была ля Завіхоста на Вісле нашчэнт разбітая войскам кракаўскага князя Лешка Белага. Загінуў і сам Раман. Палітычная раўнавага ў рэгіёне рэзка парушылася. Паміж 1208 і 1211 гг. на Валынь абрынуўся вораг, якога да той пары тут ведалі толькі з расказаў пра далёкія паходы Рамана. «Олександру седящу в Володимере, а брату его Всеволоду в Червьне, Литва же и Ятвезе воеваху и повоева же Туриск, и около Комова, оли и до Червена... Беда бо бе в земле Володимерьстеи от воеванья Литовьского и Ятвяжьского», — так кажа летапіс[12], фіксуючы з'яўленне на міжнароднай арэне новай самастойнай ваенна-палітычнай сілы — Літвы. Праходзіць некалькі гадоў, і ўдава Рамана падпісвае (каля 1219 г.) з літоўскімі князямі (пералічана звыш 20 імёнаў) мірную і саюзніцкую дамову. Сярод князёў называецца навагрудскі князь Міндоўг, а неўзабаве словы «Літва» і «Міндоўг» робяцца амаль што

7 Полянская И. В. Кирилл Туровский: творец или компилятор?! // От Нестора до Фонвизина. Новые методы установления авторства. М., 1994. С. 97—100.

8 Аб спадчыне Кірылы Тураўскага ў XVI—XVII стст. гл.: Саверчанка І. В. Aurea mediocritas. С. 34—36.

9 Кніга Беларусі 1517—1917: зводны каталог. Мн., 1986. № 44 (спасылкі даюцца на нумары першага раздзела гэтага каталога — «Старадрукаваныя кірылічныя выданні»). Рэпрынт выдання 1596 г. змешчаны ў кн.: Лабынцаў Ю. А. «Напой росою благодати...»: малітоўная паэзія Кірыла Тураўскага. Мн., 1992. С. 93-235.

10 Кніга Беларусі 1517-1917. № 58, 70, 96, 104, 114, 119.

11 Рогачевская Е. Б. Цикл молитв Кирилла Туровского: тексты и исследования. М., 1999. С. 17—42. Тут жа (с. 89-197) апублікаваны поўны сядмічны цыкл малітваў Кірылы па малітоўніку 1601 г. (Кніга Беларусі 1517—1917. № 58), які памылкова названы выданнем 1602 г.

12 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 721.

сінонімамі. «Літва Міндоўга» адчувае сваю сілу, але асцерагаецца Галіча, які пры ўсіх унутраных закалотах здаваўся сучаснікам моцнай ваеннай дзяржавай. Гэты абмежавальнік зняло мангольскае заваяванне 1237—1241 гг., пасля якога нарастае шэраг літоўскіх нападаў з Навагрудка на ўсе сумежныя землі — веерам, ад Полацка да Брэста. Нейкую абарону — і то з мангольскай дапамогай — трымае толькі Галіцка-Валынскае княства; у іншых раёнах супраціўленне цалкам адсутнічае. «Што хто приемлеть, собе держить», — з такой гарантыяй Міндоўг пасылае сваякоў ваяваць да Смаленска[13], прасцей кажучы: бярыце вы ў іх колькі хочаце, праблемаў не будзе. Сапраўды, з 1260-х гг. у Полацку ўжо de jure сядзяць літоўскія князі. Гэтак жа на працягу другой паловы XIII ст. валяцца Тураўскае і Пінскае княствы. Гісторыкі патрацілі шмат высілкаў, спрабуючы неяк прымірыць, звесці разам сведчанні рускіх, беларуска-літоўскіх і польскіх летапісаў і хронік аб гэтых падзеях. Справа аказалася цалкам безнадзейнай: храналогія і генеалогія атрымліваюцца самыя фантастычныя (накшталт змены чатырох пакаленняў за 30 гадоў), а чаргаванне на адным стале рускіх і літоўскіх князёў стварае настолькі дзіўную цераспалосіцу, што некаторыя аўтары прапанавалі нават тэорыю аб «літоўска-рускім сукіраўніцтве», напрыклад, у Тураве. Ад пачатку XIV ст. на большасці княжацкіх сталоў сядзяць ужо новыя гаспадары, і да гэтага ж часу абшары новай дзяржавы дасягаюць пэўных прыродных межаў — Дзвіны і Дняпра на паўночным усходзе і басейна Прыпяці на поўдні. Тэрыторыя стабілізуецца, пачынаецца новы перыяд.

І лепшы паказчык адрознення гэтай новай літоўскай Русі ад старых рускіх княстваў — манголы. Для іх межы літоўскіх заваяванняў сталі амаль неадольнай перашкодай. У 1259 г. Бурундай канчаткова ставіць на калені Галіцка-Валынскае княства; непасрэднай жа прычынай гэтага з'яўляецца крах (годам раней) саюзнай мангола-галіцкай экспедыцыі супраць Літвы. Наймаштабнейшая выправа, задуманая амаль як паўтор Батыевай, заканчваецца накшталт рабаўнічага наезду: «Василкови же (валынскі князь Васілька Раманавіч. — *М. Н.*) едущу по Борундаи одиному по Литовьскои земле, обрет негде Литву, избив ю и приведе саигат Бурондаеви»[14]. Адносна ваенных дзеянняў гісторык слушна заўважае, што «Валынскі летапіс» паведамляе галоўным чынам аб Васільку, які

13 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 815.
14 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 847.

беспаспяхова шукаў у Літве схопленага пляменніка, Наўгародскі ж абмяжоўваецца адной загадкавай фразай: «Тои ж зимы взяша татарове всю земли Литовскую, а самехь избиша»[15]. Два наступныя паходы (паводле летапісу, 1274 і 1277 гг.) завяршаюцца гэтак жа бяздарна. У адным выпадку саюзнае войска спыняецца, убачыўшы пару, якая ідзе з-за гары, і лічачы, што гэта конніца праціўніка; але выявілася, «оже нетуть рати, но паря идяшеть со истоков, текущих из гор, зане морозе бяхуть велице»[16]. У другім — пакуль манголы спусташаюць ваколіцы Наваградка, галіцка-валынскія князі адпраўляюць свайго ваяводу пад Ваўкавыск, дзе прусы і борты вынішчаюць альбо бяруць у палон увесь яго атрад. Князі вымушаны пайсці на перамовы — «и докончаша с горожаны, како города им не имати, а свое бояры выимати. Бояры свое поимаша, а городу не въспеша ничего же, тако возвратишася во свояси»[17]. З усёй гэтай невыразнасці, набору паўанекдатычных ці яўна ганебных для захопнікаў фактаў відавочна адно: пакарэнне Літвы цалкам праваліласа.

Зразумела, самая смутная і крывавая пераходная эпоха была маласпрыяльнай для захавання існуючых альбо ўзнікнення новых помнікаў культуры. Таму наўрад ці мае рацыю В. Насевіч, калі кажа аб «бясспрэчным дамінаванні» Русі над Літвой у культурнай сферы ў другой палове XIII ст.[18] Культурнае дамінаванне мае перадумовай, па-першае, пэўную ўнутраную сілу, перакананасць, нават агрэсіўнасць пануючай культуры, а па-другое, адзіную прастору культурнага ўзаемадзеяння, якая забяспечваецца ў першую чаргу адзінствам дзяржаўнай улады і тэрыторыі. У XIII ст. нічога падобнага яшчэ не было. Разрозненыя рускія гарады пад заўсёднай пагрозай мангольскага ці галіцкага нашэсця маглі думаць толькі аб ратаванні рэшткаў старой культуры. Практычна адзінае непасрэднае паведамленне наконт кнігаў гэтага часу змешчана ў Галіцка-Валынскім летапісе, дзе апісваецца, як князь Уладзімір Васількавіч заснаваў «многы городы», у Камянцы паставіў царкву Дабравешчання Багародзіцы і «положи» ў ёй апракасныя (г. зн. з тэкстам у паслядоўнасці пры богаслужэнні) Евангелле і Апостал, а таксама Парэмійнік (богаслужбовыя тэксты Старога Запавету) і некалькі загадкавы «съборникь

15 Насевіч В. Л. Пачаткі Вялікага Княства Літоўскага. Людзі і падзеі. Мн., 1993. С. 47.
16 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 873.
17 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 878.
18 Насевіч В. Л. Пачаткі Вялікага княства Літоўскага. С. 60.

отца своего». У Брэсце «постави ж церков святого Петра, и еуагелие да опракос оковано сребром... туто положи», і ў Бельску «поустрои церков иконами и книгами»[19].

Да гэтага ж класу з'яваў трэба аднесці і факты вядзення пінскіх летапісных запісаў[20] альбо нават стварэння найпазнейшай, пятай рэдакцыі Галіцка-Валынскага летапісу (1292) дзесьці ў Пінскай зямлі, верагодна, у самім Пінску[21]. Апошняя гіпотэза грунтуецца, мяркуючы па ўсім, толькі на ўпамінанні пінскіх князёў у апісанні пахода на Літву пад 1274 г. («идоша же с ними князи Пиньсции и Туровьсцеи»[22]), што наўрад ці можа лічыцца пераканальным довадам. Па праўдзе кажучы, яшчэ ў XIX ст. пецярбургскі беларус, прафесар Духоўнай акадэміі Міхаіл Каяловіч упэўнена пісаў, што «рускія ўцекачы ад татарскіх гвалтаў зносілі з сабой ў Літву сярод сваёй маёмасці і кнігі, у тым ліку невялікую колькасць летапісаў, і, у кожным выпадку, прыносілі ў Літву ўмельства і звычку да пісання летапісаў і чытання іх»[23]. Нам няясна, чаму канкрэтна вучоны зрабіў гэтую выснову, — у крыніцах няма звестак пра падобных уцекачоў, ратаванне імі помнікаў кніжнасці і да т. п., але тут не варта чапляцца да шаноўнага гісторыка: такое цалкам магло быць. Важна іншае: усе гэтыя факты і гіпотэзы адназначна паказваюць на тое, што ў эпоху набліжэння заняпаду Галіцка-Валынскага княства на нейкі момант адбылося ўзмацненне культурнага ўплыву яго паўночнай перыферыі, ад Бельска і Брэста да Пінска, г. зн. тых земляў, якія неўзабаве ўвойдуць у склад Вялікага княства Літоўскага. Ужо фармуецца фонд кніжных помнікаў, з якім Вялікае княства ўвойдзе ў перыяд свайго аформленага і стабільнага існавання.

2. Перыяд Вялікага княства Літоўскага. Экземпляры Брэсцкай Бібліі ў Пецярбургу і Маскве

У Вялікім княстве Літоўскім тым чыноўнікам, які адказваў за распаўсюджанне афіцыйных дзяржаўных дакументаў, у сярэдзіне XVI ст.

19 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 925, 927.

20 Приселков М. Д. История русского летописания XI-XV вв. СПб., 1996. С. 294.

21 Генсьорський А. І. Галицько-Волинський літопис (Процес складання ; редакції і редактори). Київ, 1958. С. 30—31.

22 ПСРЛ. Т. 2. Стб. 872.

23 Коялович М. О. История русского самосознания по историческим памятникам и научным сочинениям. 4-е изд. Мн., 1997. С. 63—64.

быў канцлер Мікалай Радзівіл Чорны. Ён атрымаў гэты ўрад адначасова з вышэйшай дзяржаўнай пасадай — віленскага ваяводы — у снежні 1550 г. Ужо праз два гады ён арганізаваў у Брэсце друкарню, якая стала другой у Вялікім княстве па часе заснавання (пасля віленскай Францыска Скарыны). Аднак для дзяржавы карысць ад брэсцкай друкарні была ніякая — выканаць пажаданні шляхты аб надрукаванні Статута ВКЛ (у рэдакцыі 1529 г.) яна не магла за адсутнасцю кірылічных шрыфтоў і друкароў, якія б разумелі дзяржаўную (беларускую) мову. Спатрэбіўся час, пакуль да ўлады ў Вільні прыйшлі іншыя асобы і дзяржава клопатам віленскага ваяводы Льва Сапегі і працай скарбнага Лукаша Мамоніча і яго брата, віленскага бургамістра Кузьмы Мамоніча арганізавала друкаванне ў сотнях аднолькавых паасобнікаў зводу сваіх законаў (Статут 1588 г.).

Якраз на перыяд працы «невядомага друкара» прыпадае стварэнне найбольш значнага выдання брэсцкай друкарні — «Biblia swięta, to jest księgi Starego i Nowego zakonu wlasnie z żydowskiego, greckiego i lacinskiego nowo na polski język z pilnoscią i wiernie wyłozone» 1563 г. — поўны пераклад Бібліі на польскую мову, самае буйнае па аб'ёме друкаванае выданне XVI—XVIII стст. у Вялікім княстве Літоўскім. «Не тое што насіць — вазіць цяжкавата», — з'едліва сказаў пра гэты фаліянт Сымон Будны.

Увагу кожнага, хто браў у рукі важкі том Бібліі 1563 г., прыцягвае аздоба: два гравіраваныя тытульныя аркушы (асобныя для Старога і Новага Запаветаў), гравюры-ілюстрацыі да першых частак Старога Запавету (кнігаў Быцця і Зыход), прыгожы, добра чытэльны гатычны шрыфт і рознага памеру ініцыялы. Гравюры-ілюстрацыі выканаў высакакласны майстар, верагодна, запрошаны толькі для гэтай мэты, — ні да, ні пасля Бібліі 1563 г. у кніжнай прадукцыі друкарняў ВКЛ яго працы не сустракаюцца. Аднак вельмі падобныя і па кампазіцыі і па тэхніцы выканання (хоць і меншыя памерам) медзярыты можна бачыць, напрыклад, у кніжцы слыннага італьянскага паэта Габрыэля Сімяонэ «Figure de la Biblia, illustrate de stanze tvscane» ў ліёнскім (друкарня Gvilielmo Rovillio) выданні 1565 г. Антверпенскі друкар Крыштаф Плантэн выдаў у 1583 годзе лацінскую Біблію in-folio, якая мела цудоўныя гравіраваныя ілюстрацыі, у тым ліку скапіраваную з Брэсцкай Бібліі 1563 г. гравюру «12 кален Ізраілевых». Антверпенскі гравёр цалкам захаваў кампазіцыю брэсцкай гравюры і яе асобныя дэталі, аднак зрабіў і некаторыя змены: антверпенская гравюра крыху большая памерам (240x360 мм), брэсц-

ская — (225х335 мм), на ёй не паказаны рэльеф мясцовасці і дробныя другарадныя персанажы.

Брэсцкая Біблія вывучана яшчэ вельмі слаба. Прычына гэтага часткова ў тым, што захаваныя паасобнікі раскіданыя па свеце і патрабуецца вялікая праца, каб зрабіць іх навуковыя апісанні (з запісамі ўладальнікаў-гаспадароў і карыстальнікаў-чытачоў, інакш сказаўшы — «з правіненцыямі»).

Патрэбны сістэмны пошук і рэгістрацыя захаваных паасобнікаў па ўсім свеце (па нашых меркаваннях, гэта будуць некалькі дзясяткаў экземпляраў). Прыгадаем некалькі самых цікавых паасобнікаў Брэсцкай Бібліі з расійскіх кнігасховішчаў:

Масква, аддзел рэдкіх кніг Расійскай Дзяржаўнай бібліятэкі:

1) паасобнік з пазначэннем на ніжняй крышцы пераплёту шыфру МК VII—12498. Мае авальны штамп «Библіотека московской духовной академии» і ўклеены лісток: «O to są punkta i wiersze wyjęte z Bibliy NN. Starego Testamentu: list 15, 109, 288, 313; z Novego Testamentu na Karcie 55, 112, 48, 344, 432, 507. x. Aloizy Osiński Profes. Litev.». Тытульны аркуш гэтага экзэмпляра (спрошчаны варыянт) выкананы ад рукі, пяром;

2) у экзэмпляры з шыфрам МК VII — 12497 няма канца, на ніжняй дошцы пераплёту запіс пяром (памылковы — М.Н.) аб тым, што кніга выдрукавана Якубам Вуйкам у Кракаве ў друкарні Лазара року 1599. Кніга паходзіць з Маскоўскай духоўнай акадэміі, мае цікавыя дапіскі пяром, беларускай мовай (лацінкай) з тлумачэннямі (аркуш 1—62).

3) добра захаваны паасобнік Брэсцкай Бібліі (інв. N 15892), які мае ўладальніцкі запіс расійскім скорапісам XVII ст.: «Книга Сія Фёдора Сожкова» належала пазней бібліятэцы Сергіевай Святатроіцкай Лаўры.

4) экзэмпляр з інвентарным нумарам 12496 мае выдатны пераплёт XVI(?) ст. з дошак у жоўтай ціснёнай скуры, масіўнымі навугольнікамі з пуклямі, металічныя зашпількі. Асаблівасць гэтага паасобніка яшчэ і ў расфарбаваных тытульным аркушы, гербе Радзівілаў, гравюрах і ініцыялах (на першых 75 аркушах).

5) паасобнік з РДБ з нумарам XVI-400 паходзіць з Пецярбурга і мае шыфр Імператарскай Публічнай бібліятэкі: «Зала 22 шкаф XVIII Полка 3 № 1».

Санкт-Пецярбург:

1) Бібліятэка Расійскай Акадэміі навук. Шыфр: 2187.f.max./2152. Паасобнік поўны, захаванасць здавальняючая. Тытульны аркуш рас-

Kiegi Sedziow.

Argument.

PO ōmierci Jozuego áż do czásow Saulá Krolá pierwszego rzecz pospolita Izráelská byłá przez niemáły czás spráwowaná przez niektore meże/obráne niez ktorego pewnego pokolenia ábo domu/ále dziś z iednego á iutro z drugiego. A tychci nie obierano pospolitym obyczáiem/ále byli pobudzáni y podáni od Bogá według iego vpodobánia/áiá ko baczył być rzecz potrzebna ku rządowi ludu onego. Ty przełożone ábo spráwce zwano Sedźmi/ábowiem byli postánowieni ku czynieniu Sądu y rozkazánia Páńskiego/ ktory ie dla tego obdárzał duchem swoim/ duchem mądrości y mocy. Był też vrząd ich spráwowáć lud w kárności podług zakonu/záchowywáiąc gi w prawdziwey wierze/y w prawdziwey chwale Bożey/bronić go od nieprzyiaciol/ czyniąc káżdemu spráwiedliwość według tego iáko w zakonie iest nápisano.

Kapitu. I.

6. Ale Adonibezek vciekł/ktorego oni gonili/á vlápiwszy gi vcięli pál-

Benjáminie/y obliczył ie począwszy od dwudziest hego roku y dáley/ á nálázło sie miedzy nimi mężow ná wybor gotowych ku boiowi trzy kroć sto tysięcy z drzewcy y z tarczami.

6. Ktemu z Izráela przyiął zá pieniądze sto tysięcy ludu rycerskiego zá sto tysięcy tálentow śrebra.

7. Przyszedł potym do niego mąż Boży y ták mowił/ O Krolu/ niechárże woysko Izráelskie z toba nie chodzi: Abowiemći nie mász Páná z Izráelem y ze wszytkimi synymi Isramowemi.

17. Wszedł potym Amázyasz Krol Iudski w rádę/y posłał do Joásá syná Joacházowego syná Jehu Krolá Izráelskiego z tym poselstwem Przyidź á vyrzy sie zemna.

18. A Joas Krol Izráelski posłał do Amázyaszá Krolá Iudskiego z táko mu powiedźiał/Izali cię obrano pánem rádnym Krolowi? Przestánże by cię snadź nie zábito: A ták go zániechał prozok mowiąc/Iuż znam że Bog vmyślił iżby cię zátrácił/gdyżeś to vczynił niechcąc słuchać rady moiey.

Joás Krol Izráelski.

фарбаваны, пад тытулам надпіс: «Heretycka». На першым аркушы надпіс «Biblia Polonica» і штамп бібліятэкі Віленскай акадэміі. Тут і стары шыфр: 1.4.1. На рэстаўрацыйнай паперы, падклеенай да тытулу, запіс: «*z Biblioteki akademii Wilenskiey darem Jw. Tadeusza Czackiego Taynego Sowietnika i Czlonka honorowego tojie akademii 1829*». *У тэксце шматлікія падкрэсліванні чырвоным* чарнілам.

2) Расійская Нацыянальная бібліятэка. Фонд «Паліграфія», шыфр: 17-а.14.1.19. Захаванасць здавальняючая. Гэты паасобнік цікавы тым, што ўсе часткі Бібліі падпісаны ад рукі славянскай мовай, кірыліцай, таксама кірыліцай прастаўлена нумарацыя псалмоў у Псалтыры.

3) Расійская Нацыянальная бібліятэка. Аддзел рэдкіх кніг, шыфр: 1.1.1.1. Добра захаваны экзэмпляр у пераплёце XVIII стагоддзя са срэбнымі зашпількамі. Шматлікія маргіналіі ў розных месцах тэксту, лацінскай і польскай мовамі.

4) Архіў Ваенна-Марскога Флота Расіі. Шыфр: Ф. 9 Дубасов, № 1496. Паасобнік выдатнай захаванасці ў шыкоўным пераплёце XIX ст. працы берлінскага майстра Карла Лемана. На пераплёце — герб «Наленч». На ўнутраным баку верхняй крышкі надпіс пяром: «Ex libr. Stanislaw Radziwil 859» і намалявана пяціканцовая зорачка. Асаблівасці яго ў шматлікіх маргіналіях XVI—XVIII стст., зробленых на беларускай, польскай і арабскай мовах. Арабскія прыпіскі зроблены ў тых месцах, дзе Біблія апавядае пра ліхвяроў, свіней, чужых багоў (балванаў) і інш. Не выключана, што гэты паасобнік належаў усходазнаўцу і падарожніку па Турцыі і Блізкім Усходзе Вацлаву Жэвускаму (гербу «Наленч») і трапіў да адмірала Дубасава разам з маёнткамі ў Стараканстанцінаве на Валыні. Калі гэтая кніга трапіла да Станіслава Радзівіла — невядома.

3. Інкунабула з картамі з бібліятэкі брэсцкага ваяводы

У друкаванай еўрапейскай кніжнай прадукцыі XV ст. пераважаюць царкоўныя і тэалагічныя кнігі, працы па філасофіі і праву, аднак сярод інкунабулаў ёсць выданні па астраноміі, матэматыцы, медыцыне, траўнікі, кнігі па гісторыі, працы антычных аўтараў, паэтычныя і празаічныя творы, рыцарскія раманы, календары і да таго падобныя творы. Важны пласт першадрукаваных кніг змяшчае першадрукаваныя ж геаграфічныя карты. Па словах гісторыка картаграфіі Льва Багрова,

«адным з першых сярод вучоных адчуў прыемнасць ранніх карт Йоган Готфрыд Грэгорый. У сваёй працы «Цікавыя думкі аб найбольш важных і дакладных старых і новых картах зямлі» (1713 г.) ён выказваецца так: «Гэтыя карты сталі цяпер вельмі рэдкія, і іх цяжка адшукаць. Яны робяцца такімі ж жаданымі, як старыя манеты».

Да такіх картаў належаць вядомыя яшчэ ў перыяд сярэднявечча творы антычных і сярэдневяковых аўтараў, якія да вынаходства кнігадрукавання распаўсюджваліся ў спісах. Сярод іх галоўнае месца належыць «Геаграфічнаму кіраўніцтву» Клаўдзія Пталемея — твору вельмі распаўсюджанаму, на які прыходзіцца большая частка карыстаных у сярэднявеччы картаў (далей мы будзем называць яго, як гэта прынята, «Геаграфіяй»)[24]. У Расійскай Нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу зараз захоўваецца паасобнік аднаго з самых ранніх друкаваных выданняў «Геаграфіі» — першага ульмскага выдання (1482 г.), які сваім лёсам звязаны з сярэдневяковым Брэстам. Кніга гэтая паходзіць з бібліятэкі брэсцкага ваяводы Крыштафа Зяновіча, які 20 красавіка 1585 г. «па Багдане Сапезе» (пасля Багдана Сапегі — *М.Н.*) быў прызначаны брэсцкім кашталянам, а 20 снежня 1588 г. заняў больш высокую пасаду брэсцкага ваяводы[25].

«Геаграфія» яшчэ ў IX ст. была перакладзена на арабскую мову, а ў Еўропе яна набыла шырокую вядомасць пасля перакладу на лацінскую мову александрыйскім вучоным Эммануілам Хрызалорасам і яго вучнем Якабам Ангелюсам у XV ст. Пасля гэтага кнігу з картамі неаднаразова капіравалі на заказ. Сярод перапісчыкаў былі такія вядомыя ілюмінатары, як француз Гуга Камміно, італьянец Пьетра Массайо, немец Мікалай Германус. Гэты апошні — Мікалай Германус, з чыім імем цесна звязана слова «Касмаграфія» (так быў названы лацінскі пераклад «Геаграфіі»), у 1466 г. паднёс у дар герцагу Борзо зробленую ім самім копію кнігі Пталемея. Прычым гэта была не проста копія трактата з картамі. Усе 27 картаў Мікалай Германус склаў у новай, канічнай праекцыі, пазней названай яго імем. Ён змяніў фармат картаў, увёў новы метад паказу гораў, рэкаў, мораў, межаў. Лічбы, якія азначаюць даўготы і шыроты, ён размясціў не на паралелях і мерыдыянах, як было пры-

24 З пачатку кнігадрукавання да канца XVI ст. выйшла трыццаць адно выданне «Геаграфіі».

25 Wulff J. Senatorowie i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego: 1386—1795. Kraków, 1885. S. 9.

Note ad inuenendum igitur regiones prouincias maris: flumina: montes & ciuitates necnon insularum situs vbi incipiunt vbi ve finiũt. Do primo exemplum tale in quo s. libro in quoto capitulo & in qua tabula sit posita mater nostra videlicet Ierusalẽ Intrabo igit' litteram I. et inuenio Ierusalem: libro quinto capitulo sedecimo tabula quarta alie Intrabo quintum libri ca. 16. & inuenio Ierosolima que nunc dicit' capitolia ex directo. 66 gradus longitudinis & 31 $\frac{2}{3}$. latitudinis. Intrabo ergo quartam tabulã alie cum 66 gradib'tã superius q̃ inferius ad notatos & fac pendiculum stare siue filum. Similiter accipe gradus latitudinis scq. 31 $\frac{2}{3}$. ex ambabus partibus: & fac iterum filum siue pendiculũ stare & precise sub cruce amboꝝ pendiculorum positus est punctus crocei coloris qui est ciuitas: & scriptura posita cum puncto est ierusalem. Sic cum omnibus & singulis est faciendum.

Item tria sunt cõsiderãda in hoc registro. Primo q̃ actor nõ intendit ostendere qualis nunc sit status religionis christiane sed q̃lis fuerit vt dolentes catholici de suo dãno pniam agentes: puidere studeant & que p victorias martyrum & sanctimonialium: confessorum conquisita erant his diebus perdita recuperare procurent.

Secundo q̃ nõ intendit principaliter ostendere vbi sancti venerant' & ecclesias habent cõstructas: aut corpora eorum translata sed precipue vbi nati: vbi militauerunt: & vbi mortui sunt.

Tercio q̃ lector attendat breuia scripta sub ciuitatibus: nã ibi in summario vt plurimi de vita sctõrũ inuenier aliquando breuia: aut pars eorum subscribitur ciuitatibus.

Illustri et Magnifico Domino. Dño Christophoro Zenouitio Palatino Brestensi Cecrascensi Propoiscensiq̃ Capitaneo, Musarum amatori, hisce tonum Maecenati perpetuo.

In
Pignus fraternæ obseruantiæ. Nicolaus Lasius
Secretarius Brestensis. Hæc opus
donauit Gulielmus

ANNO SALUTIFERO
M D L XCII
Julii 4 die

In Amore pignus donatio p. Thomas Wrzesinsky Ac et Dna Barcadur. ab Andrea Drawsky Anno 1625

нята перад тым, а паміж імі. Карты гэтага кодэксу (зараз захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы ў Неапалі) пазней сталі асновай картаў першага поўнага друкаванага выдання «Геаграфіі» (Балонья, 1477). Але хаця карты «Геаграфіі» стаялі нашмат вышэй твораў сярэдневяковай картаграфіі, яны не маглі задаволіць патрабаванняў часу. На антычных картах Пталемея геаграфічныя назвы толькі ў рэдкіх выпадках супадалі з сучаснымі, і толькі гісторыкі маглі ў іх разабрацца. Што да мноства недакладнасцяў і няправільных звестак пра мясцовасці, аддаленыя ад Александрыі, то пра іх няма чаго і казаць. З гэтай прычыны «Геаграфія» ў наступных выданнях дапаўняецца «сучаснымі картамі» («tabulae modernae»).

Хутка пасля стварэння Мікалаем Германусам першай копіі «Геаграфіі» Пталемея з'яўляецца другі, перапрацаваны варыянт. На гэты раз Мікалай Германус складае карту свету ў новай праекцыі — псеўдаканічнай. Да традыцыйных 27 картаў ён дадае тры новыя: Скандынавіі з паўночнымі землямі, Іспаніі і Італіі. На карце Скандынавіі ўпершыню ў гісторыі «Геаграфіі» з'яўляюцца сучасныя геаграфічныя назвы[26]. У 1468 г. Мікалай Германус робіць яшчэ адзін, ужо трэці варыянт картаў. Колькасць «сучасных картаў» павялічваецца яшчэ на дзве: з'яўляюцца карты Францыі і Палесціны. Менавіта гэты варыянт і быў выкарыстаны ў ульмскім выданні «Геаграфіі» 1482 г.

Карты ульмскага выдання гравіраваныя на дрэве і складзеныя ў маштабах ад 1:2 000 000 да 1:2 200 0000. На адвароце кожнай надрукавана яе назва — названа краіна (краіны), якая паказана на карце. «Зяновічаў» паасобнік «Геаграфіі» Пталемея 1482 г. цудоўна захаваны: фарбы, якімі расфарбаваны карты, ані не пабляклі; скураны пераплёт крыху крануты шашалем. Карты ў гэтым паасобніку расфарбаваныя: мора сіняе, унутраныя рамкі жоўтыя, знешнія — карычневыя. Межы адзначаны светла-аранжавай фарбай, суша жоўтай і светла-карычневай; рэльеф паказаны нейкім падабенствам гарызанталяў, размаляваны бурай фарбай. Трэба адзначыць цудоўны шрыфт выдання, мастацкія ініцыялы, арнамент, які ўпрыгожвае тлумачальны тэкст на адвароце картаў. На тытульным аркушы ад рукі чырвонай фарбай назва кнігі: COSMOGRAPHIAE.

---

26 Успамянутая карта з'яўляецца першай «сучаснай картай» у «Геаграфіі» і першай друкаванай картай Скандынавіі.

Таксама ад рукі на адвароце пераплёту чарніламі пазнейшая дапіска: «Inscriptus Catalogo librorum Monasterii Vitouensis».

На адвароце тытульнага аркуша зроблены ўкладны запіс:

Illustri et Magnifico Domino D[omi]no Christophero Zenovicio
Palatino Braestensi Cecerscensi Propoiscensique etc. Capitaneo,
Musarum amatori literatorum Maecenati perpetuo.
In
Pignus fratenae observantiae Nicolaus Pacius
Succamerarius Braestensis Hoc opus
dono dedit [Ciuacicys? Guacicys?]
ANNO SALUTIFERO
MDL.XCII
Julii 4 die

[Слаўнаму і вялікадушнаму Пану а Пану Крыштафу Зяновічу, Брэсцкаму ваяводзе, Чачэрскаму і Прапойскаму і іншых старасце, аматару муз, нязменнаму Мецэнату вучоных.

На доказ брацкага шанавання Мікалай Пац[27], падскарбі брэсцкі прыносіць як дар гэта сачыненне <?>

У год, што прыносіць збаўленне, MDL.XCII, 4 ліпеня][28].

Відавочныя дзень і месяц, калі была падпісана кніга: 4-га ліпеня. Аднак у лічбе году ёсць пэўная неадпаведнасць, прачытаць яго мы не змаглі. Надпіс зроблены без спешкі, выразна і каліграфічна, аднак уяўляецца, што аўтар зрабіў памылку (апіску). Прачытанне даты можа выглядаць наступным чынам:

MDL.XCII = 1592 у тым выпадку, калі трэці справа знак «L» — памылка (лішні знак).

MDL.XCII = 1592 у тым выпадку, калі другі злева знак «C» — памылка (трэба «L»).

Аднак застаецца верагоднасць іншага тлумачэння гэтай даты.

У снежні 1585 г. Крыштаф Юр'евіч Зяновіч быў прызначаны брэсцкім кашталянам (пасля Багдана Сапегі, які перайшоў на вышэйшую пасаду

27 Калі першую літару прачытаць не як «P», але як «L», тады прозвішча дарыцеля будзе гучаць «Lacius», што адпавядае лацінскаму напісанню прозвішча Ляцкі. Каго ў гэты час называюць брэсцкім падскарбіем іншыя крыніцы, нам невядома.

28 Пераклад: Раман Паўлоўскі, Мікола Нікалаеў.

Смаленскага ваяводы), а праз тры гады, у 1588 г., ён — ужо брэсцкі ваявода (таксама пасля Сапегі, Мікалая Паўлавіча, які 10 кастрычніка 1588 г. пайшоў на пасаду ваяводы Віцебскага). Жыў Крыштаф Зяновіч да 1614 г. і памёр на пасадзе брэсцкага ваяводы. Вядома пра яго багатыя кніжныя ахвяраванні для кальвінскага збору ў Смаргоні.

Шмат гадоў пазней, у 1626 г., чарговы ўладальнік «Геаграфіі» дадаў яшчэ адно прысвячэнне:

In Amoris pignus donatus V.[Venerabili?] Thomae Wrzebinsky Art[ium] et P[hi]l[o]s[oph]iae
Baccalaur ab Andrea Stavisky Anno 1626

[На доказ любові падаравана [шаноўнаму] Фаме Вжэбінскаму, бакалаўру мастацтваў і філасофіі, Андрэем Ставіскім у год 1626.]

Шматлікія заўвагі і допісы пяром на палях гэтага фаліянта сведчаць, што з ім актыўна працавалі чытачы (мяркуючы па палеаграфіі почыркаў — у XVI—XVII стст.).

4. Кнігі з бібліятэк Яна Фрыдэрыка і Аляксандра Сапегаў

Zwrócić trzeba uwagę na wiarygodność zapisów inwentarzowych, zwłaszcza w odniesieniu do liczebności księgozbiorów i opisu książek. Liczbę ksiąg odnotowano w zapisach inwentarzowych w woluminach, tomach, egzemplarzach, sztukach — od kilkunastu u dominikanów w Brześciu do ponad 3700 u benedyktynów w Horodyszczu.[10] Z inwentarzy bibliotecznych wynika także systematyczny przyrost książek w zasobniejszych bibliotekach klasztornych oraz fakt, że w spisach ksiąg nie zawsze podawano ich ilość, nierzadkie są też przypadki «anonimowego» inwentarza, bez podpisu osoby sporządzają-

9 Paszkiewicz U. Op. cit.

10 Paszkiewicz U. Inwentarze... Warszawa, 1998. Nr. 89.

cej dokument. Inwentarze biblioteczne zawarte w protokołach wizyt władz duchownych w klasztorach podpisywane były zwykle przez wizytatorów. Przykładem najlepiej rozpoznanego i opisanego w literaturze naukowej księgozbioru jest biblioteka kartuzów w Berezie wymieniana także w protokołach wizyt diecezjalnych od 1818 do 1834 r.[11] Księgozbiór liczący w 1818 r. 2510 książek, w 1821 r. zawierał 2177 dzieł, w kilka lat potem 2045 dzieł, w 1830 r. ponownie posiadał 2177 dzieł, w 1831 r. dopisano do tej liczby 64 dzieła w 137 woluminach zakupione przez zakonników. Przed 1834 r. z 2234 ksiąg wybrano i oddzielnie spisano 61 dzieł w 63 woluminach, były to głównie druki z XVI —XVIII w. wysłane z Grodnienskoj Kazennoj Pałaty do Wileńskiej Akademii Medyczno-Chirurgicznej.[12] Obszernie Kartuzję Bereską opisała Maria Popowska, zwróciła także w swoim opracowaniu uwagę na bibliotekę klasztorną i stosunek zakonników do posiadanych książek.[13] Klasztor został również bardzo negatywnie oceniony przez biskupa wileńskiego Józefa Kossakowskiego w 1805r., który w ostrych słowach krytykował wielkie wydatki kartuzów na alkohol i zupełnie małe na zakup książek, głównie kalendarzy.[14] Liczbę książek Kartuzji Bereskiej M. Popowicz ustaliła na podstawie protokołu wizyty z 1820 r. podając w swoim opracowaniu liczbę 2177 tomów. Także w protokole wizyty z 1830 r. widnieje taka liczebność księgozbioru kartuskiego. W różnych latach połowy XIX w. historycy piszący o klasztorze kartuzów w Berezie także niepochlebnie wyrażali się o stanie biblioteki zwracając uwagę na nieład panujący w księgozbiorze.[15] Po 1831 r. księgozbiór kartuski został w wyniku kasaty klasztoru prawie całkowicie rozproszony.

Wspomniano wyżej, że w Brześciu Litewskim działały klasztory sześciu zakonów. Znane są obecnie inwentarze i spisy książek z bibliotek augustianów, bazylianów, bernardynów, dominikanów, jezuitów i trynitarzy.[16] O bibliotece augustianów brzeskich wspomina protokół wizyty klasztoru z 1820 r.. Wymienione są w nim książki kościelne i biblioteka klasztorna spisana w układzie

11 Popowska M. Rys dziejów Kartuzji Bereskiej w latach 1648-1831. Wilno, 1938; Witkowski R. Szkice z dziejów Kartuzji Bereskiej 1648-1831. // Lituano-Slavica Posnaniesia 1995 (druk 1997). T. 7. S. 107—108.

12 Popowska M. Op. cit. S. 112—113.

13 ibidem

14 Tyszkiewicz E. Wiadomość historyczna o zgromadzeniach i fundacjach męskich i żeńskich rzymsko-katolickich klasztorów w diecezji wileńskiej. // Teka Wileńska. 1857. Nr. 1. S. 231-276.

15 Popowska M. Op. cit.

16 Paszkiewicz U. Op. cit.

działowym zawierająca kilkadziesiąt dzieł. Protokół wizyty podpisał w 1822 roku ksiądz Franciszek Klimaszewski, występujący w wielu innych dokumentach wizytacyjnych.[17] Zdecydowanie więcej informacji o bibliotece zawiera protokół wizyty władz duchownych dokonanej w grudniu 1804 r. W protokole wymienione są księgi cerkiewne, «znaczniejsze księgi» w bibliotece klasztornej. Zawarta jest też informacja o regestrze ksiąg bibliotecznych spisanym w 1794 r. i mieszczącym 700 dzieł.[18] Wizyta monasteru w 1830 r. i sporządzony wówczas inwentarz wymieniają 41 ksiąg cerkiewnych, natomiast w bibliotece monasteru doliczono się 1158 dzieł i 12 map.[19] U bernardynów W Brześciu dokonano kilku spisów książek. Najstarszym, zachowanym w archiwaliach litewskich był *Index librorum* z 1790 roku, kolejnym *Catalogus librorum* spisanym w 1799 r., następne spisy sporządzono w 1804, 1820, 1822 i 1828 r. Dane liczbowe odnoszące się do księgozbioru klasztornego pochodzą z inwentarzy klasztoru z 1820 r., kiedy spisano w układzie działowym «ksiąg następujących sztuk 439» i z 1828 r., wtedy w protokole wizyty odbytej w maju tegoż roku powtórzono powyższą liczbę ksiąg.[20] Przypuszczać należy, że w ciągu kilku lat dzielących obie wizyty w klasztorze nie zakupiono do biblioteki żadnej książki, lub też nie wpisano do inwentarzy nowych nabytków.

Ksiądz Franciszek Klimaszewski wizytował również klasztory dominikanów i trynitarzy w Brześciu. U dominikanów w 1822 r. zastał księgi kościelne i biblioteczne. W bibliotece było zaledwie 14 dzieł w 20 woluminach i stan ten wyjaśniała informacja: «Dalszey zaś biblioteki żadney nie ma, a to z powodu pożaru w roku 1801 [...]».[21] Natomiast u brzeskich trynitarzy wizytator w 1816 i 1822 r. zastał księgi kościelne i bibliotekę klasztorną w układzie działowym. W protokole nie wymieniono jednak liczby książek w bibliotece, można przypuszczać, że było od 200 do 300 dzieł.[22]

Lustracja kolegium jezuitów brzeskich rozpoczęta w listopadzie 1773 r. i zakończona w styczniu następnego roku objęła także bibliotekę. Zestawienie zbiorcze wymienia 1732 wol.[23] Do protokołu lustracji dołączone jest też zestawienie zbiorcze zawierające 180 wol. oraz 32 dzieła w 33 wol. «książek aptecz-

17 LPAHWil. rps F 694. Op. 1. D. 4020; *Paszkiewicz U.* Supl. 1. Nr. 55.
18 LPAHWil. rps F 567. Op. 2. D. 87; *Paszkiewicz U.* Supl. 1. Nr. 56.
19 CPAH Lw. rps F 201. Op. 4. Spr. 447; *Paszkiewicz U.* Supl. 1. Nr. 57.
20 BANLWil. rps F 18-180; BUWil. rps 35355 (A-2110); rps F-4-A-2112; rps F 4-35571 (a-2201); *Paszkiewicz U.* Supl. 1. Nr. 63-64.
21 LPAHWil. rps F 694. Op. 1. D. 4020; *Paszkiewicz U.* Supl. 1. Nr. 55.
22 BUWil. rps F 3-163; LPAHWil. rps. 694 Op. 1. D. 4020; *Paszkiewicz U.* Supl. 1. Nr. 63—64.
23 NAHB Min., rps F 1928. Op. 1. D. 265.

nych znaczniejszych» zgromadzonych w bibliotece kodeńskiej rezydencji jezuitów.[24]

Bazylianie prowincji litewskiej mieli w ziemi brzeskiej sześć siedzib klasztornych w Antopolu, Brześciu Litewskim, Chomsku, Kobryniu, Nowosiółkach i Pińsku, gdzie działały siostry bazylianki. W Kobryniu biblioteka monasterska powiększała się powoli, czego dowodzą zachowane inwentarze. Pierwszy z nich będący spisem majątku cerkwi i klasztoru archimandrii Kobryńskiej sporządzony i przedstawiony przez wizytatora księdza Justyna Kosowicza opatowi Kobryńskiemu księdzu Andrzejowi Bienieckiemu w grudniu 1741 r. wykazuje 14 ksiąg cerkiewnych i 220 dzieł ruskich, polskich, łacińskich, włoskich i greckich, w dużych i małych formatach, które znajdowały się w bibliotece monasteru.[25] Z biblioteki Kobryńskiej zachowało się siedem spisów ksiąg cerkiewnych i bibliotecznych. W 1800 r. w Inwentarzu klasztoru odnotowano kilka ksiąg cerkiewnych i bibliotecznych słowami: «w pierwszej stancyi opackiej od sali we framugach umieszczona biblioteka tymczasowie [!] bez klassyfikacyi autorow [...]» oraz: «...w teyże Bibliotece nayduią się wiele panegirykow, książek russkie i polskie [!] in folio, in 4o in 8o manuscriptow powiązanych i nieoprawnych.»[26] Kolejny inwentarz klasztoru opactwa Kobryńskiego wykonany w 1803 r. również sygnalizował na kilku kartach księgi cerkiewne i biblioteczne ułożone formatami.[27] W 1804 r. ksiądz Jan Kórhanowicz wymieniał w protokole wizyty księgi cerkiewne a o bibliotece pisał: «Oglądałem takoż bibliotekę blisko z czterechset ksiąg w znaczney liczbie pisanych y mniey użytecznych składająca się. Znaczniejsze między niemi księgi [...]»[28]. Następny inwentarz opackiego klasztoru sporządzony przez księdza Jozefata Raczyńskiego w czerwcu 1826 r. informuje o księgach cerkiewnych, których było 14 w 37 tomach oraz o bibliotece że: «Rejestr ksiąg Biblioteki Klasztoru Kobryńskiego umieszczonych w garderobie opackiey» zawiera dzieł 451 w układzie działowym.[29] Do biblioteki opackiej po 1804 r. wszedł także księgozbiór przyłączonego do monasteru w Kobryniu «byłego nowosielskiego bazyliańskiego klasztoru», o czym mówią dwa dokumenty. Pierwszy z nich to protokół wizyty kanoniczej monasteru w Nowosiółkach z października 1804 r., w którym wizytator ks. Jan Kórhano-

24 ibidem.
25 CPAHL, rps F 201. Op. 4. Spr. 457a
26 NAHB Grod., rps 1143. Op. 1. D. 102; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 271.
27 NAHB Grod., rps 1143. Op. 1 D. 101; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 272.
28 LPAHWil., rps F 567. Op. 2. D. 87; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 273.
29 NAHBGrod., rps F 1143 op.1 d.110; Paszkiewicz U. Supl.1 nr. 274.

wicz odnotował księgi cerkiewne oraz napisał: «Oglądałem bibliotekę klasztorną liczącą w sobie nie więcey iak [!] sztuk 38, książek niewielkich a małych y rękopisu sztuk 12 osobnym regestrem wyszczególnionych [...]»[30]. Drugi dokument, nie datowany «Inwentarz podawczy funduszu byłego Nowosielskiego bazyliańskiego klasztoru [...] przyłączającego się do Kobryńskiego opackiego klasztoru [...]» zawiera informację o księgach cerkiewnych i bibliotece klasztornej, w której było 65 dzieł. Inwentarz podpisali księża Samson Breim, Ignacy Proniewicz, Jozafat Słobodzki i Konstantyn Reymer.[31] Ostatni znany dokument inwentarski klasztoru w Kobryniu powstał «wskutek ukazu Jego Imperatorskiey Mości [...] pod datą 27 Oktobra 1836 roku». Odnotowano w nim kilkanaście dzieł cerkiewnych chórowych oraz «Regestr ksiąg znajdujących się w Bibliotece Klasztoru Kobryńskiego», w którym było spisanych w układzie działowym 2070 dzieł.[32] Po 1839 r., kiedy ukazem carskim zakon bazylianów został zlikwidowany, książki biblioteczne opactwa zostały rozproszone.

Z monasteru bazyliańskiego w Annopolu U. Paszkiewicz odnalazła 5 zapisów inwentarzowych z lat 1786—1788, 1804 i 1828r. W dwóch opisach inwentarzowych z XVIII w. (1786—1788) nie ma wyszczególnionej liczebności księgozbioru, a zapisy sygnalizują: «Księgi cerkiewne, Xięgi post fata [...] Porębski, Xięgi za pieniądze kupione, Księgi do biblioteki» W nie datowanym «Reiestrze ksiąg Biblioteki Antopolskiey» z końca XVIII w. (?) w układzie działowym zapisano 624 dzieła.[33] W 1804 r. wizytator ks. Jan Kórhanowicz napisał w protokole wizyty kanoniczej klasztoru, że są w klasztorze księgi cerkiewne a także: «Zrewidowałem klasztorną bibliotekę do pięciuset z górą ksiąg wynoszącą».[34] Natomiast w grudniu 1828 r. rozpoczęta inwentaryzacja klasztoru wykazała, że do użytku zakonników były: «Xięgi do nabożeństwa i porządku cerkiewnego służące», 22 dzieła oraz biblioteka klasztorna, w której w układzie działowym było co najmniej 380 dzieł. Katalog biblioteki kończył się działem: «Dzieła Mówców, Poetów, Gramatyków i Dykcyonarze, poz.22 i fragment dzieła bez tytułu».[35] U bazylianów w Chomsku w bibliotece klasztornej w 1805 r. było 190 ksiąg, a regestr książek znajdował się w refektarzu. W

30 LPAHWil., rps F 567. Op. 2. D. 87.
31 LPAHWil., rps F 634. Op. 1. D. 31.
32 LPAHWil., rps F 634. Op. 1. D. 35.
33 CPAHLw., rps F 201. Op. 4. Spr. 388; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 5.
34 LPAHWil., rps F 567. Op. 2. D. 87; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 82.
35 CPAHLw., rps F 201. Op. 4. Spr. 388; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 7.

protokole wizyty odnotowano także księgi cerkiewne.[36] Siostry bazylianki w Pińsku posiadały niewielki księgozbiorek liczący 46 dzieł, co stwierdził wizytator Paschazy Leszczyński wizytujący placówkę w latach 1814—1815.[37]

W klasztorach innych zakonów Kościoła rzymskokatolickiego dbałość o biblioteki i księgozbiory wykazywali też marianie w Raśnej, bernardyni w Pińsku i Brześciu Litewskim, jezuici w Kodniu i Brześciu, karmelici trzewiczkowi w Krupczycach, bonifratrzy w Wysokiem Litewskim, a potwierdzają to odnalezione inwentarze i spisy ksiąg bibliotecznych. U bernardynów w Pińsku w inwentarzach bibliotecznych z lat 1797—1799 odnotowano kilkaset książek w układzie działowym i osobno zapisano księgi znajdujące się w refektarzu oraz wypożyczenia książek.[38] W nie datowanym katalogu, w układzie działowym zapisano 587 książek wydanych w latach 1548—1818. Również nie datowany dokument w języku rosyjskim zatytułowany: «Podrobnaja opis polskim knigam nachodjaszczimsja w bibliotieke pri kostele Swjatogo Michaila s perewodom nazwania ich na russkij jazyk» jest prawdopodobnie tłumaczonym inwentarzem bibliotecznym pińskiego klasztoru bernardynów. W 1829 r. odnotowano «księgi polskie przysłane z rużnych [!] miast», wydane w latach 1625—1823 i spisane chronologicznie. Na kolejnych kartach inwentarza, w układzie chronologicznym, wymieniono także 489 książek wydanych w latach 1625—1825 i 1700—1829.[39] «Katalog knigam po czasti duchownoj» przygotowany przez Komitet dla raspredelenija po-monastyrskich bibliotek w Mińsku w marcu 1841 r. wymienia 292 tomy i dodatkowo 100 książek spisanych zbiorczo pochodzących z biblioteki pińskich bernardynów.[40] W zbiorach Uniwersytetu Wileńskiego znajdują się katalogi bibliotek bernardynów w Brześciu spisywanych od 1790 r., ale nie ma w nich podliczonych książek. Dopiero w protokole wizyty w klasztorze w 1820 r. odnotowano, że w bibliotece było «439 sztuk» dzieł w układzie działowym, ponadto 72 dzieła w 116 woluminach i w «Księgach różnych» 335 woluminów.[41] Protokół wizyty z 1828 r. powtarza liczbę 439 książek.[42]

36 LPAHWil., rps F 567. Op. 2. D. 87; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 82.
37 PMHAGrod., rps o91/05617; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 644.
38 BUWil., rps.F 3-147; Paszkiewicz U. Inwentarze. Nr. 617.
39 BUWil., rps.F 3-165 ; Paszkiewicz U. Op. cit. Nr. 618.
40 Ibidem; Paszkiewicz U. Op. cit. Nr. 619.
41 BUWil., rps F 4-35355 ; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 59.
42 BUWil., rps F 4-35571 (A-2201) ; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 61.

W klasztorze marianów w Raśnej regestry książek bibliotecznych wymieniają w 1804 r. 729 dzieł, w 1818 r. — łącznie 731 książek, a w raportach rządowych z 1828 i 1859 r. pomniejszoną do 700 liczbę książek. Kolejny «Katalog knig duchownogo soderżanija» z 28 marca 1865 r. wymienia 740 dzieł w 1101 tomach.[43] Z tego też roku pochodzi «Katalog knig swetskogo soderżanija», w którym zanotowano w układzie działowym 381 dzieł w 545 tomach.[44]

Bogaty zbiór znajdował się w bibliotece klasztoru benedyktynów w Horodyszczu, co rejestrowały dwa odległe w czasie dokumenty. Pierwszy z nich: «Generale summarum omnium librorum in Bibliotheca Monasterij Castro-Cassinensis alias Horodiscensis reperibilium» z 1783 r. poświadczony przez wizytatora Stanisława Kierkowskiego w 1788 r. sygnalizował bogatą już wówczas bibliotekę. Drugi dokument potwierdzał przekazanie części tego księgozbioru do Wileńskiej Biblioteki Publicznej. Po 1863 r. a przed represyjną kasatą klasztoru biblioteka benedyktynów liczyła 3712 dzieł, w tym cenne rękopisy.[45] Równie interesujące informacje o ilości ksiąg i ich treści znajdują się w inwentarzach klasztoru bonifratrów w Wysokiem Litewskim. Protokół wizyty z 1804 r. zawiera: «Regestr y opisanie Xiąg znajdujących się w tymże klasztorze», w którym zapisano 10 dzieł w 14 woluminach oraz księgi doktorskie 42 dzieła w 61 woluminach. Regestr zatwierdził własnoręcznym podpisem wizytator ksiądz Adam Kłokocki.[46] Następna wizyta w 1820 r. stwierdzała również obecność ksiąg w bibliotece. Wizytator ksiądz Franciszek Klimaszewski potwierdził, że « biblioteka klasztorna liczyła 46 dzieł w 56 woluminach, księgi doktorskie 29 dzieł w 35 woluminach i księgi aptekarskie — 2 dzieła».[47]

Dokumenty poświadczające istnienie biblioteki w klasztorze karmelitów trzewiczkowych w Krupczycach spisane w latach 1818-1842 wykazują różną liczbę książek. W 1819 r. biblioteka karmelicka liczyła według spisu w układzie działowym 82 książki, a w roku 1842 było 278 książek.[48] Natomiast w bibliotece karmelitów bosych, w spisie «Opis knigam ostawszimsja posle uprazdnenija Pinskogo Ujezda Karmelitanskogo monastyrja» odnotowano w 1841 r.

43 LPAHWil., rps F 738, 1864 r., nr 2430; Paszkiewicz U. Inwentarze… Nr. 672.
44 Op. cit.; Paszkiewicz U. Inwentarze. Nr. 673.
45 BUWil., rps F 3-161; Paszkiewicz U. Op. cit. Nr. 89.
46 BUWil., rps F 4-39650 (A-1362); Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 966.
47 LPAHWil., rps F 694. Op. 1. D. 4020; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 967.
48 LPAHWil., rps F 694. Op. 1. D. 4014; Paszkiewicz U. Supl. 1. Nr. 516.

163 dzieła.[49] Najstarszy, w omawianym zespole dokumentów, jest «Inwentarz Kościoła naszego pińskiego założenia Nayświętszey Panny Maryey Wniebowzięcia» spisany w czerwcu 1675 r. Na kolejnych kartach inwentarza wymienione są: « Mszały i insze Xięgi Conventu Pińskiego» [franciszkanów konwentualnych]. Przyjąć trzeba, że biblioteka konwentu liczyła wówczas kilkadziesiąt ksiąg. Inwentarz podpisał franciszkanin Martianus Michałowski, ówczesny minister prowincji ruskiej i litewskiej zakonu.[50]

Omówione wyżej, w oparciu o zachowane dokumenty, zawartość i liczebność bibliotek zakonów działających w ziemi brzeskiej pozwalają na ostrożne wnioskowanie, że w wymienionych księgozbiorach klasztornych mogło być w XIX w. około 17 tysięcy książek, które w wyniku represyjnych po 1831 i 1863 r. kasacji zostały rozproszone po wielu nowo powstających bibliotekach szkolnych, publicznych i prywatnych, także kościelnych diecezjalnych, lub po prostu zniszczone. Przybliżoną ich liczbę mogą w przyszłości ustalić żmudne badania proweniencyjne i systematycznie prowadzone kartoteki znaków własnościowych oraz dalsze poszukiwania inwentarzy, katalogów i spisów bibliotecznych.

49 BUWil., rps F 3-165; Paszkiewicz U. Inwentarze. Nr. 621.

50 BUWil., rps F 4-36467 (A-3862); Paszkiewicz U. Inwentarze. Nr. 620.

РЭЗЮМЭ

Підлыпчак-Маеровіч Марыя

Манастырскія бібліятэкі брэсцкай зямлі ў XVIII і XIX стст.

На Брэсцкай зямлі ў 12 мясцовасцях функцыянавала каля 20 мужчынскіх і жаночых манастыроў розных ордэнаў. У двух найбольшых адміністратыўных адзінках, у Брэсце і Пінску, свае сядзібы мелі аўгусцінцы, базыльяне, базылі, бернардыны, дамініканцы, францішкане, езуіты, кармеліты босыя, камуністы і трынітарыі (6 манастыроў у Брэсце і 5 у Пінску). У Антопалі (базыльяне), Бярозе Картузкай (картузы), Хомску (базыліяне), Гарадышчы (бенедыктынцы), Кобрыне (базыльяне), Крупчыцах (кармеліты абутыя), Навасёлках (базыльяне), Пінску (камуністы), Раснай (марыяне), Высокім Літоўскім (баніфратры) і Кодэні (езуіты-рэзідэнцыя) ордэны мелі па адной сядзібе. Кожны з ордэнаў праводзіў душпастырскую дзейнасць, а адрозніваліся яны паміж сабой формамі працы на ніве грамадскай працы: школьнай адукацыі, лекарства; ці, як трынітарыі, спецыялізаваліся ў выкупе палонных з мусульманскай няволі.

Манастырскія школы на брэсцкай зямлі арганізаваны былі на трох узроўнях: элементарным, сярэднім і вышэйшым. Элементарнае навучанне абмяжоўвалася навукай чытання, пісання, рахункаў і катэхізіса, настаўнікам звычайна быў прызначаны клерык. Сярэдняя школа была даменам езуітаў, якія мелі ў Брэсце калегіум для шляхецкай моладзі. У Пінску сярэднія школы ў другой палове XVIII ст. арганізавалі таксама камуністы, якія былі клерыкальным ордэнам. Вышэйшую школу арганізоўвалі ў добра забяспечаных манастырах усіх ордэнаў, яна ўключала курсы рыторыкі, філасофіі і тэалогіі, прызначаныя для манахаў. Да манастырскай навукі трэба залічыць навіцыят і духоўныя семінарыі.

Захавалася каля 60 інвентарных запісаў, якія падцвярджаюць існаванне 20 бібліятэк розных манастыроў брэсцкай зямлі. Найбольш інвентароў базыльянскіх манастыроў у Брэсце Літоўскім (2), Антопалі (5), Хомску (1), Кобрыне (7), Навасёлках (1), Пінску (1), а таксама манастыроў бернардынаў у Брэсце (4), Пінску (8) і марыянаў у Раснай (9). Ад картузаў у Бярозе Картузкай захаваліся 6 бібліятэчных інвентароў, кармелітаў

абутых у Крупчыцах (3), баніфратраў у Высокім Літоўскім (2) і езуітаў у Брэсце і Кодэні (2). Па адным інвентары паходзіць з бібліятэк аўгусцінцаў, дамініканаў і трынітарыяў у Брэсце, бенедыктынцаў у Гарадышчы а таксама базыльянак, францішканаў і кармелітаў босых у Пінску. Далейшыя пошукі ў архівах, бібліятэках і музеях напэўна зменяць гэтыя лічбы.

Колькасць кніг у інвентарных запісах паказвалася ў тамах, экзэмплярах, штуках. Прыкладам найлепш вывучанага і апісанага ў навуковай літаратуры кнігазбору з'яўляецца бібліятэка картузаў у Бярозе. Лічба кніг тут на падставе пратакола візітацыі 1820 г. склала 2177 тамоў. У 1805 г. манастыр у Бярозе быў вельмі негатыўна ацэнены віленскім біскупам Юзэфам Касакоўскім, які крытыкаваў вялікія выдаткі картузаў на алкаголь і зусім малыя на закуп кніг, галоўным чынам календароў. Пасля 1831 г. кнігазбор картузаў у выніку ліквідацыі манастыра быў раскіданы.

У Брэсце Літоўскім дзейнічалі манастыры шасці ордэнаў. Сёння вядомы інвентары і спісы кніг з бібліятэк аўгусцінцаў, базыльянаў, бернардынаў, дамініканаў, езуітаў і трынітарыяў. Пра бібліятэку брэсцкіх аўгусцінцаў успамінаецца ў пратаколе візітацыі манастыра 1820 г., што падпісаны кс. Францішкам Клімашэўскім. Уключана інфармацыя пра існаванне спісанага ў 1794 г. рэестра бібліятэчных кніг, які ўключае 700 пазіцый. У бернардынаў найстарэйшым, захаваным у архівах спісам быў *Index librorum* 1790 г., наступным *Catalogus librorum*, што складзены ў 1799 г. У інвентары гэтага манастыра 1820 г. падаецца лічба 439 штук кніг, спісаных у прадметным парадку. Ксёндз Францішак Клімашэўскі візітаваў таксама манастыр дамініканаў у Брэсце. У 1822 г. ён застаў у іх бібліятэцы 14 назваў у 20 тамах, і гэту лічбу тлумачыць інфармацыя: «Больш бібліятэкі ніякай няма, а то з прычыны пажару ў 1801 годзе [...]». Люстрацыя брэсцкага калегіума езуітаў, якая пачалася ў лістападзе 1773 г. і скончана ў студзені наступнага года, ахапіла таксама бібліятэку. Знайшлося там 1732 валюмінаў. Да пратаколу люстрацыі далучаны таксама звесткі аб 180 валюмінах, а таксама 32 творы ў 33 валюмінах «кніжак аптэчных значнейшых», сабраных у кодэньскай рэзідэнцыі езуітаў.

Базыльяне літоўскай правінцыі мелі на брэсцкай зямлі шэсць манастырскіх сядзібаў. У Кобрыне першы інвентар, які быў спісам маёмасці царквы і манастыра кобрынскай архімандрыі, складзены пасля візітацыі Юстына Касовіча ў снежні 1741 г. Ён называе 14 царкоўных кніг і 220 твораў рускіх, польскіх, лацінскіх, італьянскіх і грэцкіх, у вялікіх і малых фарматах, якія знаходзіліся ў бібліятэцы манастыра. У 1804 г. свя-

тар Ян Кургановіч адзначыў у пратаколе візітацыі царкоўныя кнігі, а пра бібліятэку пісаў: «Аглядаў таксама бібліятэку, якая складаецца з блізка чатырох сот кнігаў у значнай колькасці пісаных і мала ўжытэчных. […]». У бібліятэку пасля 1804 г. уключаны кнігазбор прылучанага да манастыра ў Кобрыне «былога навасельскага базыльянскага манастыра». Апошні вядомы інвентар манастыра ў Кобрыне з'явіўся ў кастрычніку 1836 г. Запісана ў ім некалькі дзясяткаў царкоўных кніг, а таксама «Рэестр кніг, што знаходзяцца ў Бібліятэцы Манастыра Кобрынскага OSBM», у якім было запісана 2070 твораў у тэматычным падзеле. Кнігазбор гэты расцярушаны пасля ліквідацыі базыльянаў у 1839 г.

З базыльянскага манастыра ў Антопалі паходзіць не датаваны «Reiestr ksiąg Biblioteki Antopolskiey» з канца XVIII ст. (?), у якім у прадметным парадку запісаны 624 кнігі. У базыльянаў у Хомску ў манастырскай бібліятэцы ў 1805 г. было 190 кніг, у пратаколе візітацыі занатаваны яшчэ і царкоўныя кнігі. Сёстры базыльянкі ў Пінску мелі, паводле візітацыі Пасхазія Ляшчынскага 1814 г., невялічкі кнігазбор у 46 кніг.

У бібліятэчных інвентарах бернардынаў у Пінску занатавана некалькі соцень кніг, асобна вялася кніга выдадзеных кніг. У зборы Віленскага універсітэта знаходзяцца каталогі бібліятэк бернардынаў у Брэсце, спісаныя пасля 1790 г., пратакол візітацыі 1828 г. падае лічбу 439 кніг. У манастыры марыянаў у Раснай рэестр бібліятэчных кніг натуе ў 1804 г. 729 тамоў. Інфармацыя пра колькасць кніг і іх змесце знаходзіцца ў інвентарах манастыра баніфратраў у Высокім Літоўскім. Пратакол візітацыі 1804 г. мае «Рэестр і апісанне Кніг, што знаходзяцца ў тымжа манастыры», у якім запісана 10 назваў у 14 тамах, а таксама «доктарскія кнігі» 42 назвы ў 61 валюмінах. Падчас наступнай візітацыі 1820 г. ксёнз Ф. Клімашэўскі падцвердзіў, што «манастырская бібліятэка налічвае 46 твораў у 56 тамах, кнігі дакторскія 26 назваў у 35 тамах і кнігі аптэкарскія — 2 назвы». Бібліятэка кармелітаў абутых у Крупчыцах налічвала ў 1819 г. 82 кнігі.

Усе ўспамянутыя вышэй факты дазваляюць, абапіраючыся на захаваныя дакументы, зрабіць асцярожнае мяркаванне пра тое, што ў названых манастырскіх бібліятэках у XIX ст. магло быць каля 17 тысяч кніг, якія ў выніку рэпрэсій і ліквідацыі манастыроў былі размеркаваны па некалькіх новаарганізаваных школьных, публічных і прыватных, а таксама касцельных дыяцэзіяльных бібліятэках альбо проста знішчаны.

Пераклад Міколы Нікалаева

Мароз В. В.

Бібліятэка і архіў Вальнянскага Свята-Траецкага манастыра

У жніўні 2000 года аўтару гэтых радкоў стаўся шчаслівы выпадак: на гарышчы Свята-Траецкай царквы ў Вольна (Баранавіцкі раен) патрапіць на моцна забруджаныя стогадовым пылам, смеццем і галубіным памётам рэшткі манастырскага архіва — зваленых у кучу папер, большай часткай сапсаваных вільгаццю, мышамі і насякомымі. Без аніякай надзеі знайсці нешта выняткове тут жа на месцы яны былі перабраны, складзены і за грашовую ахвяру на царкву забраны для далейшых ачысткі, разбору і вывучэння. Сярод спавядальных ведамасцяў XIX ст., рэшткаў метрычных кніг і іншых моцна пашкоджаных дакументаў быў знойдзены надзвычай забруджаны, пашарпаны і змяты том старажытных інвентароў вальнянскага Свята-Траецкага ўніяцкага манастыра, найранейшы з якіх датуецца 1675 годам. Вывучэнне гэтых матэрыялаў дало магчымасць атрымаць новыя звесткі з мясцовай гісторыі, даведацца пра змест манастырскага архіва і бібліятэкі.

У апісаннях архіва згадваецца датаваны 20 жніўня 1573 года ліст «ягамосці пана Хадкевіча, графа на Шклове і Мышы, старасты Жмудскага, маршалка Вялікага княства Літоўскага» (найбольш верагодна, Яна Геранімавіча Хадкевіча, каля 1537—1579 — *аўт.*) да намесніка вальнянскага пра наданне «дзесяціны, як здаўна было, з двара». З гэтага адпа-

даюць усе сумненні: у адзначаны час у Вольне ўжо існавала царква, а атрыманне ёю дзесяціны «здаўна» дакладна сведчыць, што святыня ўзнікла найменей як за некалькі дзесяцігоддзяў да 1573 года. У апісанні называецца дакумент ад 10 жніўня 1576 года — «ліст вымяру на царкву Вальнянскую грунту валок тры моргаў дваццаць». З гэтага вынікае, што фундатар надаў святыні зямельны фундуш. 23 жніўня 1577 года датаваны ліст Хадкевіча да вальнянскага адміністратара Кутака (?) аб наданні дзесяціны з двара для каплана. 23 красавіка 1581 года «ягамосць Астафій Валовіч, пан Віленскі» (верагодна, Астафій Багданавіч Валовіч, каля 1520-1587, канцлер ВКЛ і кашталян Віленскі з 1579 г. — аўт.) напісаў ліст намесніку ў Вольна «на адданне дзесяціны».

Старадаўняя царква з «залатога» XVI ст. састарэла, таму што рашэнне аб фундацыі на новую святыню ўзнікла ў 1631 годзе. У лютым 1632 года фундатар ужо звяртаўся ў лісце да Паўла (?) Корсака (больш верагодна, Рафаіла Корсака — у 1626—1640 гг. протаархімандрыта базыльянскага ордэна — аўт.) за дазволам на прызначэнне фундушу, які быў зроблены 30 красавіка 1632 года.

У архіве захоўваліся арыгінал фундушу на вальнянскі кляштар яго дабрадзея — падстолія наваградскага Крыштафа Радзівонавіча Крыштафовіча Камінскага (у некаторых іншых дакументах скарочана — Крыштафа Камінскага), датаваны 30 красавіка 1632 года, а таксама экстракт фундушу ад 11 мая 1632 года, актыкацыя (фіксацыя ў дзяржаўных актавых кнігах) якога была зроблена ў Віленскім Трыбунале 5 жніўня 1693 года.

Да гэтых звестак трэба дадаць раней вядомыя: разам з Крыштафам Камінскім базыльянскі кляштар фундавала яго жонка — Алена Друцкая—Горская. На ўтрыманне манастыра сужэнства запісала 10 валок населенай і 10 валок ненаселенай зямлі, 2 сенакосы ў Бражной і Маркаўшчыне з правам карыстацца Мілавідскім лесам[1].

У апісанні архіва ёсць запіс пра рэляцыю Ластоўскага, пададзеную Крыштафу Камінскаму і датаваную 1660 годам. Яе змест уяўляецца вельмі важным: Ластоўскі паведамляў фундатару пра спаленне царквы (другой па ліку), манастыра і вёскі Вольна рускімі войскамі на чале з князем Хаванскім.

1 Минская старина. Мн., 1911. С. 132—133.

Невядомы дакладны час будаўніцтва трэцяй драўлянай вольнаўскай святыні. Відаць, з гэтай справай не бавілі доўга. Найбольш верагодна, яе заснавальнікам таксама быў Крыштаф Камінскі, таму што ў 1677 годзе ён пакінуў вальнянскаму кляштару тэстамент на 3 тысячы злотых і 100 злотых на мясцовы шпіталь. Экстракт гэтага дакумента згадваецца ў інвентарным апісанні. Новая святыня, таксама драўляная, была пабудавана паміж 1660 і 1675 гадамі: інвентар ад 10 мая 1675 года, складзены суперыёрам Іаанам Каранеўскім, паведамляе, што царква накрыта саломай.

Пазней вальнянскім маёнткам валодаў сын К. Камінскага — Самуэль, а ўнук Юзафат у 1711 г. за 20 тысяч злотых прадаў частку маёнтка Дамаслоўскім[2].

Паводле інвентара, у манастырскім архіве захоўваўся «вячыста легацыйны запіс ягамосьці пана Тэафіла Дамаслоўскага ад 12 жніўня 1747 года на штогадовую выплату 200 злотых вальнянскаму манастыру з корчмаў вальнянскай, барсніцкай і рабкавецкай». У наступным 1748 годзе Тэафіл Дамаслоўскі зрабіў «вячыстае дараванне» на 3 валокі зямлі.

Да гэтага трэба дадаць раней вядомыя звесткі, што дабрадзеямі кляштара таксама былі Самуіл і Клара Камінскія, якія ў 1707 г. запісалі яму 900 польскіх злотых, забяспечаных на кагале Слуцкім. Міхаіл Дамаслоўскі ў 1766 г. дараваў на кляштар сенакос і 1050 рублёў срэбрам, забяспечаных на маёнтку Вольна. Казімір Маляўскі ў 1717 г. зрабіў запіс на 1600 польскіх злотых, забяспечаных на Мірскім кагале. У 1777 г. Павел Макушыцкі даў 1050 рублёў срэбрам, забяспечаных на маёнтку Задзвея[3].

Паводле інвентара ад 1 снежня 1704 г., царква была драўляная, падбітая гонтамі, на ёй адзін купал з жалезным крыжам, другі (малы) крыж стаяў над алтарнай часткай, форма якой не апісана. Пры царкве быў бабінец, да якога вялі дзверы на жалезных завесах з замком. У самой царкве з правага боку былі дзверы на завесах, «забітыя дрэвам». З правага боку знаходзіўся алтар, у якім было два абразы — св. Іасафата і св. Мікалая. Злева стаяў другі алтар з абразом Найсвяцейшай Багародзіцы. Падыход да вялікага алтара быў аддзелены балясовай перашкодай (балюстрадай) са спецыяльным месцам для паклонаў. У вялікім алтары змяшчаўся абраз Найсвяцейшай Дзевы Марыі «сніцарскай работы, часткова зала-

2 Федорук А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины. Мн., 2004. С. 371.

3 Минская старина. Мн., 1911. С. 133.

чоны, часткова маляваны». Вакол вялікага алтара знаходзілася 4 абразы: св. Іосіфа, св. Васіля, Сашэсця Святога Духа, Святога Крыжа. Называецца таксама пяты — вялікі абраз без паведамлення пра ягоны сюжэт. З левага боку ад вялікага алтара знаходзілася закрысце з двума абразамі маскоўскай работы. Сярод царкоўнага начыння называюцца 2 срэбныя залачоныя келіхі, у тым ліку келіх «пазлацісты ўнутры з патэнай пазлацонай з срэбра», пазначаны літарамі J.Z.D.K.J.M. Літургічная зала мела амбон. Пад царквою знаходзіўся мураваны склеп «трохі запалы, і таму патрабаваў рэстаўрацыі». Будынак меў 8 вокнаў, у тым ліку і 4 акны на хорах, зробленых на бабінцы. Каля царквы стаяў вялікі крыж.

Пад час візітацыі 13 жніўня 1723 г. адзначана, што манастырская царква «брусаваная» (зроблена з брусу), з бабінцам, на якім званіца са званамі і крыжам, званоў меншых чатыры. У алтар уваходзілі праз двайныя райскія дзверы — трэба думаць, у царкве ў гэты час быў іканастас. «Вялікі (галоўны, цэнтральны — аўт.) алтар сніцарскай работы ў слупах маляваны» і на ім цыборыум мелі срэбны колер. З левага боку малітоўнай залы знаходзіўся алтар з абразом Дзевы Марыі на палатне. «…На тым абразе Найсвяцейшае Панны цудоўным сукенка атласова, вышываная зоркамі. На галаве карона зялёная, гафтаваная золатам, упрыгожаная крышталёвымі каменьчыкамі — ружовага колеру — 2, зяленых каменчыкаў 2. Карона на галаве Дзіцяткі з матэрыі пакрыта золатам, фрэнзлямі і ўпрыгожана пацеркамі. Над гэтым абразом у алтары зверху карціна каранацыі Дзевы Марыі…». У алтары Багародзіцы было 2 срэбныя кароны ювелірнай работы. Правы алтар быў прысвечаны св. Васілю і меў яго выяву на палатне. Пры абодвух алтарах знаходзіліся антыпендыумы з тканіны — з вышыванымі і маляванамі кветкамі. У адным з інвентароў згадваецца два антыпендыумы «гербаваныя» — верагодна, з выявамі гербаў фундатараў. У гэтым выпадку мы маем згадку невядомага прыкладу царкоўнай геральдыкі. Сярод царкоўнага начыння адзначаны 1 срэбны келіх з медальёнам пасярэдзіне, унутры залачоны, да яго ж патына (паднос — аўт.) з срэбра залачоная, келіх срэбны аўгсбурскай работы звонку месцамі, а ўнутры цалкам залачоны з патынай са срэбра залачонай, цыборыум для захавання святых дароў аўгсбурскай работы «пёстра пазалочаны» з крыжыкам на накрыўцы і інш.

Вялікую цікавасць уяўляюць звесткі пра кляштарны кнігазбор. У маі 1675 г. у ім захоўвалася Евангелле друкаванае in octavo, Тэстамент, Служэбнік, Трыодзь посная, Апостал друкаваны, дзве друкаваныя Псал-

тыры, Ірмалой, Актоіх, Трэбнік друкаваны і некалькі іншых кніг, назвы якіх разабраць немагчыма.

Параўнальнае ўдакладненне апісанняў манастырскай бібліятэкі ў інвентарах 1675, 1718, 1723, 1726, 1740, 1753, 1767, 1781 гадоў дае магчымасць амаль поўнасцю аднавіць яе склад. Інвентары называюць алтарнае Евангелле, апраўленае ў срэбра, Служэбнік віленскага друку in folio, Служэбнік пісаны, Ірмалой пісаны малы in octavo з асьмагалоснікам на нядзелю, Мінею старасвецкую пісаную, Пралог павучальны (з дадатковым тлумачальным удакладненнем: alis Homilia) па-стараславянку пісаны без пачатку і без канца, Служэбнік друкаваны «старасвецкі» з друкарні Мамонічаў, Служэбнік друкаваны супрасльскі in folio, Актоіх новы львоўскага друку in folio, Мінею друкаваную in folio, Трэбнік друкаваны in octavo, «кніжку рускую аб чатырох апошніх рэчах» (у іншым запісе змест гэтага твора вызначаецца як «чатыры формы жыцця чалавечага»), Брэвяж (зборнік брэвэ) стары рымскі (лацінскі), 2 Служэбнікі друкаваныя супрасльскія, адзін з якіх выдадзены in folio, Служэбнік маскоўскага друку, Апостал рускі in folio, Паўустаў стары, друкаваны in quarto, Трыодзі каляровую і посную, Трыодзь каляровую пісаную in folio, Псалтыр старую, друкаваную in quarto, Псалтыр другую па ліку — новую, Люстра хрысціянскае, Жыццяпіс Пана Бога нашага Ісуса Хрыста віленскага друку 1704 г., Кніжку супраць ерэтыкаў, Засцярогу супраць яўрэяў, Збор прыпадкаў рускі (збор з апісаннямі містычных выпадкаў — цудаў), Рэгулу святога Аўгусціна, Часаслоў друкаваны in quarto, Трыфалагіен (Трыфалогік) новы in quarto з друкарні Куцеінскага манастыра, Служэбнік разам з трэбнікам пісаны, польская кніжка «Скарб кармалітанскі» (або «кніга аб старадаўнасці кармелітанскага закона» без пачатку), Евангелле поўнае in 12, Евангелле людзям для чытання і Евангелле літоўскага друку, Евангелле пісанае in quarto, Гісторыю аб цудадзейным абразе Жыровіцкім. У адным з інвентароў падаюцца назвы некалькіх кніг на лацінскай мове: і тых, што названы вышэй, і некалькіх іншых, назву якіх прачытаць не атрымалася праз бляклясць запісаў.

У інвентарах ёсць апісанне алтарнага Евангелля, срэбны аклад якога, без сумнення, уяўляў высокую мастацкую каштоўнасць. На пакрытай чырвоным атласам вокладцы знаходзілася 4 срэбныя накладкі з рэльефным адлюстраваннем чатырох евангелістаў. Іх выявы былі літыя, пазалочаныя. На вокладцы таксама знаходзіліся фігуры 2 срэбных анёлаў — аднаго ўверсе, другога ўнізе, 4 пазалочаных херувіма, 4 зорак або

каронак па вуглах, табліца ў карункавым аздабленні «гладка зроблена» для цалавання, з выявай (верагодна, гравіраванай — аўт.) укрыжаванага Хрыста. На адваротным баку Евангелля змяшчаліся 5 вялікіх срэбных залачоных накладак. У фаліянце былі закладкі — «клаўзулкі срэбныя, на матэрыцы завешоныя». Вага срэбра ў акладзе складала 4 грыўны і адну чвэрць лота.

Некаторыя з выданняў мелі філасофскі і палемічны змест («Кніжка руская аб чатырох апошніх рэчах», «Кніжка супраць ерэтыкаў», «Засцярога супраць яўрэяў»). Верагодна, яны выкарыстоўваліся ў вучылішчы, якое працавала пры манастыры для навучання базыльянаў філасофіі[4].

Асаблівую ўвагу сярод названых кніг заслугоўвае помнік музычнай культуры «Ірмалой пісаны (рукапісны — аўт.) малы in octavo з асьмагалоснікам на нядзелю» — старажытны нотны зборнік ірмасаў — трапароў і гімнаў. У інвентарах згадваюцца таксама Актоіх, Трыёдзі каляровая і посная, песнапенні якіх былі неад'емнай часткай малітоўнага служэння. У сукупнасці гэтыя звесткі з'яўляюцца безумоўнымі сведчаннямі высокага ўзроўню музычнай культуры вальнянскага манастыра.

Дараванне кніг разглядалася як акт дабрачыннасці і абавязкова адзначалася ў інвентарах. Так, у 1741 г. пан Лапіцкі падараваў вольнаўскай царкве Евангелле.

У інвентары 1781 г. адзначаецца, што ў манастыры вёўся рэестр кніг. Пры напісанні інвентароў вызначаліся асобныя раздзелы «Кнігі», «Бібліятэка» або «Архіў і бібліятэка». Сярод папер у 1704 г. названа «торба розных скрыптаў, а менавіта: устаў св. Васіля аб падражанні Госпаду Ісусу, малітвы розныя царкоўныя, кніга Пунта (Пункты?) на нядзелі (?) пасля Епіфанія (?) па-польску і па-жмудску, Трэваліо…(?) новая … позніх скутках …без пачатку».

Да кніжак ставіліся ашчадна і лічылі іх каштоўнасцю, таму на працягу многіх дзесяцігоддзяў захоўваліся пашкоджаныя і няпоўныя экзэмпляры.

З цягам часу бібліятэка павялічвалася, яе апісанню надавалася больш увагі, адзначалася наяўнасць рукапісных кніг. Пры пераліку кніг называліся друкарні, з якіх паходзілі наяўныя манастырскія выданні, і гэта дае добрае ўяўленне пра тое, кнігі якіх старажытных беларускіх і іншых друкарскіх цэнтраў мелі распаўсюджанне.

4 Минская старина. Мн., 1911. С. 133.

Будынак кляштара таксама быў «брусаваны», стары, меў ганак з парэнчамі, падлогу, стаяў на пагорку і быў «апарканёны». З правага боку да святыні прылягала закрысце з дзвярыма на завесах і ўнутраным замком з зашчапкай. У 1753 г. вяліся будаўнічыя работы: інвентар адзначае «новавыстаўлены кляштар праз прывялебнага ў Бозе ягамосць Самуэля Рымкевіча, старшага, поўнасцю яго коштам і клопатам». Паводле запісу 1753 года, абоч царкоўнага бабінца стаяла званіца — старая, мізерная, драўляная, гонтамі крытая, на якой было 2 званы (адзін разбіты) і невялікая сігнатурка замест звона, які некалі быў пашкоджаны.

Апошні раз драўляная манастырская царква ўзгадваецца ў інвентары 1767 года. Інвентары за наступныя гады (да 1781) адсутнічаюць. Згодна з візітацыйным запісам ад 1 жніўня 1781 года, у гэты час царква была ўжо мураваная. Гэта дае падставу будаўніцтва мураванай святыні адносіць да часу паміж 1767—1781 гадамі. Адначасова выклікаюць некаторае сумненне звесткі пра тое, што мураваная святыня пабудавана да 1768 года (дата асвячэння)[5]. Згодна з інвентарным апісаннем, новы будынак узнесены з дзвюма вежамі і купалам, падбітым бляхай і пафарбаваным у чырвонае. Дзве вежы таксама былі падбіты бляхай і пафарбаваны. У 1781 годзе ў святыні былі «алтар вялікі, мураваны, *але не скончаны* (адзначана мною — аўт.). Алтар для Маці Божай стары, драўляны». Ці магло будаўніцтва мураванай алтарнай перашкоды расцягнуцца больш чым на трынаццаць гадоў, калі святыня была пастаўлена да 1768 года?

Вядомы настаяцелі манастыра: іераманахі Іосіф Фішэр (1779), Іакім Абух з настаяцеляў Ракаўскіх (1799), Аркадзь Лабуц (1802), Клімент Клапатоўскі (1806), Адрыян Якшэвіч з настаяцеляў Лыскаўскіх, Клімент Бельскі (1816) (3, с. 133). Да гэтых звестак трэба дадаць спіс прыёраў, выяўлены і праз надзвычайную бляклясць тэксту з цяжкасцю расшыфраваны ў зробленым на лацінскай мове апісанні кляштару за 1749 год: Р(?)… Герваль (1632); Пятро …(?) Мімантовіч (1634); Максім Турчыновіч (1635); Барталамей (?) Трашкевіч (1636); Герман Гашытоўскі (1657); Арсеній Ластоўскі (?, 1660); Ігнат Камінскі (1673); …(?) Чыж (1674); Кас… (?) Сабалеўскі (1675); …(?) Жыромскі (1684); …(?) Булгак (1693); Іларыен Марціновіч (1707); Ісаацыус(?) ….(?, 1708); Сімяон Вішнярэўскі (1709); Сімяон Грыневіч (1710); Самуэль Грымкевіч (1723); Аляксей Прымале-

5 Федорук А.Т. Старинные усадьбы Берестейщины. Мн., «Беларуская энцыклапедыя», 2004.

жык Кабылінскі (1726); Мефодзій Цылінка (1727); Анастас Ясенскі (1728); Сімеон (?) Р(?) ….(?) (1734); Федар Зіневіч (1741); Станіслаў …(?) (1748); Ясафат Ліскевіч (1753); Фауст Жахоўскі (1767); Гедэон Стаенскі (?, 1781); Іосіф Рыбіцкі (1783).

Вальнянскаму манастыру падпарадкоўвалася ў якасці філіяльнай уніяцкая царква св. пакутніцы Параскевы ў Чэрніхаве (Баранавіцкі раён)[6]. Згодна з інвентарнымі апісаннямі, яна стаяла на асобным пляцы ля вёскі, не мела званіцы, цвінтар быў неапарканёны. У царкоўным архіве захоўваўся аўтэнтычны фундуш ад 18 ліпеня 1702 г. на 4 валокі зямлі ад навагрудскага старасты Марціна (Марцыяна) Дамініка Халецкага, што дае падставу датаваць царкву гэтым часам. У адным з дакументаў падаюцца звесткі, што фундатарамі царквы былі менавіта Халецкія. Згодна з інвентарамі і экстратамі яе візітаў 1752, 1758, 1765, 1781 гг. (архіў аўтара), яна была драўляная, крытая гонтамі, з дзвюма пры бабінцы вежамі і купаламі на іх без крыжоў. Пасярэдзіне ля алтарнай часткі быў купал з жалезным крыжам. У бабінцы вісеў адзін звон, захоўваўся працэсійны крыж. Другі вялікі крыж, маляваны на дрэве, з асобамі св. Яна і Багародзіцы знаходзіўся на бэльцы. Помнік меў бакавую закрысцію з абразом укрыжаванага Ісуса, «золатам вышываным на аксаміце кармазыновым». Будынак асвятляўся праз восем вокнаў. Інтэр'ер аздабляў вялікі (галоўны) алтар — «сталярскай і сніцарскай работы, стары, маляваны, у дзве кандыгнацыі (у два ярусы — аўт.), з гзымсамі і філярамі». У першым ярусе алтара быў змешчаны пісаны на палатне абраз Маці Божай Чанстахоўскай у кароне са срэбнай матэрыі і дзвюма срэбнымі таблічкамі пры ім, у другім ярусе знаходзілася адлюстраванне сцэны Дабравешчання Дзеве Марыі. Перад галоўным алтаром была перашкода — «парэнчы з балясамі». У бакавым алтары быў абраз Збавіцеля, на менсе знаходзілася невялікае драўлянае ўкрыжаванне, на другім бакавым алтары — выява св. Іллі. У абодвух алтарах пярэднія панэлі мелі роспісы — «антыпендыумы на дрэве маляваныя». Згодна з запісам 1781 г., царква была старая і патрабавала рэпарацыі (рамонту), пра што належала прасіць калятараў. Адным з іх, паводле інвентара 1765 г., быў буханоўскі стараста Іосіф Юдыцкі. Яго папярэднік — каштэлян мінскі Міхал Юдыцкі 10 мая 1738 года даў прэзенту на службу а. Антонію

6 Radwan M. Carat wobec kościoła grekokatolickiego w zaborze rosijskim 1796—1839. Roma-Lublin. Polski Instytut Kultury Chrześciańskiej. 2001. S. 239.

Далмацкаму, які змяніў пароха Стэфана Далмацкага. Пасля Антонія Далмацкага мясцовым парохам стаў Іосіф Ачапоўскі, які 30 мая 1758 г. атрымаў у Стайках прэзенту на чэрніхаўскую бенефіцыю ад кашталянавай мінскай пані Юдыцкай. Агульны памер царкоўнага грунту ў гэты час вызначаўся ў 6 валок. Побач з царквою была плябанія — «ізба белая з каморай і алькежыкам», а таксама гаспадарчыя пабудовы — 2 вялікія гумны, 2 хлявы, стайня і варыўня.

Згодна з інвентарамі, царкоўныя кнігазбор і архіў у Чэрніхаве былі невялікія: рукапіснае Евангелле in folio, апраўленае ў чорную скуру, вялікі мшал віленскага друку, малы мшал супрасльскага друку, Псалтыр друкаваная малая, супрасльскі Трэбнік, Паўустаў, Актаіх, Евангелле польскае, пісаная хуткапісам кніга, ірмалой рукапісны (моцна пашарпаны, без вокладкі), а таксама метрыка хростаў і шлюбаў.

Ціборовська-Римарович Ірина

Стародруки з бібліотеки Берестейського єзуїтського колегіуму в фондах Національної бібліотеки України імені В.І. Вернадського

Встановлення історії книгозбірень минулого на документальному грунті, історична і бібліографічна реконструкція їхніх фондів на базі попримірникового дослідження та анотованого опису видань, опрацювання давніх рукописних каталогів та інвентарів дають можливість реконструювати ці унікальні вербальні пам'ятки історії та культури, в яких втілюється і зберігається зв'язок інтелектуального надбання минулого із сучасністю. Весь фонд такої книгозбірні становить цілісну історико-культурну пам'ятку, яка допомагає в пізнанні історії та культури епохи, є показником культурного рівня суспільства, віддзеркалює інтелектуальні процеси, що відбуваються в ньому. Невблаганний час, людська діяльність і природні катаклізми змінюють державні та етнічні кордони, що разом із пожежами, повенями, епідеміями впливають на збереження історико-культурних пам'яток, статус яких мають і монастирські бібліотеки. Чим віддаленіша від сьогодення у часі книгозбірня, тим складніше реконструювати її історію та склад фонду.

Монастирі відігравали в історії суспільства помітну політичну, культурну та економічну роль. При багатьох монастирях діяли колегіуми, школи, друкарні. Монастирі володіли цінними бібліотеками та архівами. Нові відомості про монастирські бібліотеки поглиблюють знанння про

їхню історію, шляхи комплектування, склад і зміст фондів, а відтак рельєфніше окреслюють роль та функції цих інституцій в історичному процесі. Вагома роль бібліотек в історії культури людського суспільства, і монастирських книгозбірень зокрема, надає актуальності дослідженням з історії бібліотеки будь-якого монастиря. Єзуїтські колегіуми становлять важливу сторінку в історії розвитку європейської освіти і науки. Їхня діяльність помітно впливала на політичне життя суспільства. В певні періоди історії України діяльність отців єзуїтів відігравала вагому роль у суспільно-політичному житті українського народу, помітний слід залишили вони в історії української культури та освіти.

Неможливе існування і продуктивна діяльність навчального закладу без бібліотеки. Остання віддзеркалює своїми фондами перебіг навчального процесу, рівень його організації, зв'язки з культурними і науковими осередками. Бібліотечні примірники несуть інформацію про людей, які користувалися книжками, піклувалися про них. Фонди промовисто розповідають про долю наукових і літературних творів, їх значущість, побутування та мінливу славу.

Мета даної публікації — на основі документальних матеріалів висвітлити основні етапи в історії бібліотеки Берестейського єзуїтського колегіуму, шляхи її комплектування, дати книгознавчу характеристику бібліотечному фонду та джерелознавчий аналіз провенієнцій, що зберігаються на бібліотечних примірниках.

Ця бібліотека не стала до сіоб'єктом самостійних історико-книгознавчих досліджень. У другій половині XIX ст. Ф. Радзішевський в своїй відомій праці «Wiadomość historyczno-statystyczna o znakomitszych…» писав про те, що монастирські бібліотеки єзуїтів, домініканців, василіян, августинців і тринітаріїв із Берестя після касації цих орденів було вивезено[1]. Місця передислокації книгозбірень автор не вказує.

Інформація фрагментарного характеру про склад бібліотечного фонду книгозбірні Берестейського єзуїтського колегіуму в контексті освітянської діяльності єзуїтів міститься в публікації білоруського дослідника Ю. Лаврика[2], присвяченій бібліотекам єзуїтських навчальних закладів. У монографії білоруського історика Т.Б. Блинової «Иезу-

1 Radziszewski F. Wiadomość historyczno-statystyczna o znakomitszych bibliotekach i archiwach publicznych i prywatnych… — Kraków, 1875. S. 5.

2 Лаўрык Ю. М. Скарбніцы мудрасці: бібліятэкі езуіцкіх навучальных устаноў (канец XVI— пачатак XIX ст.) // Адукацыя і выхаванне. 1994. № 8. С. 87—92.

Візітацыя, праведзеная і складзеная ў 1798 г., дае падставы зрабіць цікавыя назіранні. Па-першае, колькасць асяродкаў уніяцкага рэлігійнага культу на тэрыторыі сучаснага Баранавіцкага раёна павялічылася на 50% і дасягнула ў складзе Навагрудскага і Цырынскага дэканатаў 17, у той самы час колькасць рэлігійнай літаратуры павялічылася

толькі на 40% і дасягнула 75 адзінак[19]. За стагоддзе, што мінула пасля візітацыі канца XVII ст., амаль знікаюць рукапісныя кнігі, за выключэннем рукапіснага Евангелля з мястэчка Палонка, «якое не мела пачатку», на якое звярнуў увагу і Я. Калубовіч. Пра рукапіснае Евангелле з Палонкі памятаюць і старажылы: яно захоўвалася ў 30-я гг. не ў самой царкве, а ў царкоўных актывістаў, па палях мела шмат допісаў, у тым ліку і тых, якія тычыліся гісторыі самога мястэчка. Сляды Евангелля губляюцца з канца 30-х гадоў мінулага стагоддзя.

Па-другое, з'яўляецца значны пласт польскамоўнай літаратуры, пераважна Евангелляў агульнай колькасцю 18 адзінак. У царкве ў Паручыне візітатары зафіксавалі адзін лацінамоўны Імшал (Службоўнік). Такім чынам, і на прыкладзе цэркваў сучаснага Баранавіцкага раёна пацвярджаецца заняпад кірылічнага кнігадрукавання, што адбілася на кніжных зборах. Візітатары ў многіх выпадках адзначаюць адносны ўзрост кніг, напрыклад, «Служэбнік стары», «Актоіх друкаваны стары», «Актоіх зусім стары», «Трэбнік стары» і інш. Безумоўна, гэта паказвае, што друкаваная літаратура паходзіць з тых кніжных збораў, што вядомыя нам з візітацыі канца 17 ст.

Аднак лёс гэтых бібліятэк склаўся трагічна. У 1879 г., калі была выдадзена друкам кніга «Описание церквей и приходов Минской епархии. IX Новогрудский уезд», у цэрквах амаль не ўпамінаюцца старадрукі[20]. Старабеларуская кніжная прадукцыя пачала мэтанакіравана канфіскоўвацца і вынішчацца з 1834 г. Так, на працягу 1834—1835 гг., у Жыровічы былі пакліканы да дачы тлумачэнняў за адмову выкарыстоўваць у набажэнствах Службоўнікі маскоўскага друку святары Гедэон Савіч з Каўпеніцы, Ігнат Марціноўскі са Сталовічаў, Фама Гарбацэвіч з Гарадзішча, Іван Шыманскі з Жалезніцы, Іван Пятровіч з Ясянца, Антон Трыкоўскі з Ястрабля і Станіслаў Яноўскі з Пачапава. Уніяцкіх святароў прымушалі даваць распіскі аб благанадзейнасці да Рускай Праваслаўнай Царквы, а тых , хто адмаўляўся гэта рабіць, пазбаўлялі пасадаў і званняў, як тое было зроблена ў адносінах да Фамы Савіча з Каўпеніцы[21]. У сувязі з гэтым фактам, патрэбна паставіцца з даверам да інфармацыі айца Льва Гарошкі, які прывёў прыклад масавага непадпарадкавання святароў

19 АСД СЗР. Вильна, 1903. Т. 13. С. 158—220; Тамсама, Вильна, 1904. Т. 14. С. 116—125.

20 Описание церквей и приходов Минской епархии, составленное по официально затребованным от причтовь сведений. IX Новогрудский уезд. Мн., 1879. С. 26—159.

21 Записки Иосифа Митрополита Литовского. Спб. 1893. С. 153, 188.

Навагрудчыны выконваць загад Сямашкі аб прымусовай здачы богаслужбовых кніг, за што многа святароў былі пакараны годам манастырскай турмы[22]. Безумоўна, рэлігійная літаратура пачала больш актыўна адбірацца з ужытку пасля ліквідавання Уніяцкай царквы. Сямашка не таіў інфармацыі пра сістэматычнае вынішчэнне, у тым ліку пра публічнае паленне старых кніг. Няма сумнення ў тым, што ў Жыровічах былі знішчаны многія кнігі, што паходзяць з кніжных царкоўных бібліятэчак сучаснага Баранавіцкага раёна. У час напісання хроніка-дакументальнай кнігі «Памяць Баранавіцкага раёна і г. Баранавічы» намі была зроблена спроба ўліку старадрукаў, але такіх у цэрквах Баранавіцкага раёна не знайшлося, акрамя Вялікалуцкай царквы, дзе нам пашчасціла сфатаграфаваць выданне пачаеўскага друку. Здзіўляе ў гэтым аспекце адно: беднасць рэлігійнай літаратуры ў цэрквах у сярэдзіне XIX ст., нягледзячы на масавы яе завоз з тэрыторыі Расіі, дзе кнігадрукаванне знаходзілася на высокім узроўні.

Не менш трагічна склаўся лёс і бібліятэк касцёлаў Баранавіцкага раёна. Вядомы факт гвалтоўнага захопу маёмасці касцёла ў Ішкалдзі, пасля яго закрыцця ў 1867 г. Святар А. Стэцко спрабаваў у судовым парадку вярнуць маёмасць, у тым ліку і кнігі, якія захапіў праваслаўны поп І. Ражановіч. На пачатку XIX ст. у бібліятэках каталіцкіх касцёлаў налічвалася кніг: у Гарадзішчы — 9, Задзвеі — 6, Крошыне — 11, Новай Мышы — 16 [23].

Падсумоўваючы сказанае, можам канстатаваць наяўнасць багатай рэгіянальнай храмавай кніжнай культуры, якая развівалася ў рэчышчы тых працэсаў, якія разгортваліся на Беларусі на працягу XVI—XIX стст. Гэты артыкул, спадзяемся, пакладзе пачатак больш дэталёваму вывучэнню стану кніжных фондаў у Баранавіцкім раёне, як духоўных устаноў, так і тых, што належалі свецкім асобам.

---

22 Калубовіч Я. Крокі гісторыі. Беласток-Вільня-Менск, 1993. С. 191.

23 Дубейка В.М. Як нашы продкі адукаванымі людзьмі станавіліся // Памяць: гіст.-дакум. хроніка г. Баранавічы і Баранавіцкага р-на. Мн., 2000. С. 132.

Праневіч Г. М.

Берасце і Літоўскі Статут 1588 г.: нараджэнне маніфеста свабоды

Патрэбы духоўна-гістарычнай самаідэнтыфікацыі, аднаўлення ў поўным аб'ёме гістарычнай памяці, спазнання ўласнай нацыянальнай ментальнасці прымушаюць сёння больш пільна і ўважліва ставіцца да падзей і фактаў нашай даўнейшай гісторыі — асабліва да тых яе культурна-цывілізацыйных чыннікаў, якія выходзяць за рамкі звужанай, прыстасаванай да патрэб сацыялістычнай ідэалогіі канцэпцыі сацыяльнага этнагенезу беларусаў як выключна сялянскай нацыі.

Сярод іх важнае месца належыць асэнсаванню ідэалагічных, юрыдычна-прававых, маральна-этычных аспектаў грамадзянска-палітычнага і духоўна-культурнага ўкладу жыцця вышэйшых шляхецка-арыстакратычных колаў і ўрбанізаваных слаёў насельніцтва ВКЛ, адлюстраваных у юрыдычна-прававых дакументах ВКЛ XV—XVII стст. кшталту палажэнняў артыкулаў Магдэбургскага права, Літоўскіх Статутаў ВКЛ рэдакцый 1529, 1566 і 1588 гг. і інш.

Змест, абставіны з'яўлення на свет і барацьба за легітымізацыю і ўвядзенне ў дзеянне трэцяй рэдакцыі Літоўскага Статута (1588 г.), заключным акордам да якога стала напісанне ў Берасці падканцлерам ВКЛ Львом Сапегам дзвюх выдатных публіцыстычных прадмоў, якраз і з'яўляецца адной з такіх ключавых тэм, якая, апроч іншага, самым

непасрэдным чынам звязвае гэты дакумент найвялікшай гістарычнай і духоўна-мастацкай вартасці з Берасцем.

Пры больш дэталёвым разглядзе факт гэты зусім не здаецца выпадковым. Больш за тое, — успрымаецца як заканамерны ў святле цэлага шэрагу агульнаеўрапейскіх працэсаў геапалітычнага, грамадска-палітычнага характару і прыватных акалічнасцяў, звязаных з Сапегамі і іхняй роляй у грамадска-палітычнай гісторыі горада і ВКЛ на працягу XV—XVII стст.

Па-першае, Берасце і Берасцейшчына — ключавы для будучага канцлера біяграфічны і духоўна-гістарычны топас, які непасрэдна спрычыніўся да яго палітычнай і творчай біяграфіі, а таксама імклівага ўзлёту і ўзвышэння як палітыка і выдатнага дзяржаўнага дзеяча ВКЛ.

Пачнем з таго, што свой легендарны радавод Сапегі, як вядома, выводзілі ад Гедымінавічаў, лічылі сябе нашчадкамі пінскага князя Нарымонта Гедымінавіча[1]. Кодань, каля Берасця, і Ружаны — у суседнім, Наваградскім ваяводстве, на мяжы з Берасцейскім — сталі апорнымі для Багдана і Івана Сямёнавічаў — пачынальнікаў дзвюх галоўных ліній сапежанскага роду — чарэйска-ружанскай і коданьскай. Іван Сямёнавіч у 1513—1517 гг. займаў пасаду ваяводы падляшска-берасцейскага і меў у Берасці свой ваяводскі двор. Іван, сын Багдана Сямёнавіча, знаходзіўся на гэтай жа пасадзе ажно 12 гадоў — з 1529 па 1541 г. Традыцыю прадоўжыў і сын Івана Сямёнавіча — Павел, які займаў двор ваяводы падляшскага ў Берасці на працягу 1556—58 гг. Паводле звестак, якія прыводзіць М. Шкялёнак, старастам дарагічынскім і ваяводам падляшскім некаторы час быў таксама бацька Льва Сапегі, прадаўжальнік старэйшай чарэйска-ружанскай лініі роду Іван Іванавіч Сапега[2]. Калі зыходзіць з таго, што бацька Л. Сапегі памёр у 1580 годзе, а апошнім ваяводам падляшскім да захопу і далучэння Падляшша да польскай Кароны быў В. Тышкевіч (1558—1569 гг.), дык выходзіць на тое, што пасаду ваяводы падляшскага бацька Л. Сапегі мог займаць толькі ў перыяд з 1541 па 1556 г., хутчэй за ўсё, пасля смерці свайго бацькі Івана Багданавіча Сапегі (1546 г.). Трэба адзначыць, што доўгія гады шматлікія дзяржаўныя і земскія пасады ў Берасці і Падляшска-Берасцейскім ваяводстве займалі таксама

1 Грыцкевіч А. Сапегі // Энцыклапедыя гіст. Беларусі : у 6 т. — Мн., 2001. Т. 6. Кн. 1. С. 223.

2 Шкялёнак М. Леў Сапега // Спадчына. 1991. № 1. С. 59.

некаторыя іншыя, менш вядомыя, прадстаўнікі роду Сапегаў. Так, з «Апісання стараства Берасцейскага 1566 года» вядома, што каралеўскім рэвізорам на Падляшшы, адказным за ўлік земляў і маёмасці, плацяжы і падаткі, доўгі час быў нехта Іван Сапега, а «потомъ за недоконченемъ через него по смерты его <…> тое постановене и ревизея во всем том старостве докончоно и постановено естъ черезъ <…> Дмытрея Сопеги, ревизора его кр. мл. на Подляшу (відаць, сына ранейшага рэвізора Івана Сапегі — Г.П.)»[3].

Такім чынам, эканамічныя і палітычныя інтарэсы роду Сапегаў на працягу доўгага часу былі цесна звязаны з Падляшска-Берасцейскім ваяводствам і яго абодвума цэнтрамі — Берасцем і Дарагічынам. Таму зусім не дзівіць, што, займаючы высокія службовыя пасады ў дзяржаве (вялікага пісара (1584), падканцлера (1585), а з 1589 г. канцлера ВКЛ), якія патрабавалі, апроч іншага, шчыльных і частых палітычных кантактаў з каралём і польскай дзяржаўна-палітычнай элітай, сын колішняга дарагічынскага старасты Івана Сапегі і Багданы Друцкай-Сакалінскай глыбока пусціў свае карані менавіта ў Берасцейскую зямлю, якая на доўгія гады стане новым сямейным прытулкам і ўдзячным месцам жыцця, працы і адпачынку для актыўнай і дзейнай натуры выдатнага палітыка, дзяржаўнага дзеяча і дыпламата, шчодра адоранага яшчэ і бліскучым літаратурным талентам.

Ружанскі маёнтак, які Леў Сапега ў 1598 годзе, на піку сваёй палітычнай кар'еры, выкупіў у Барташа Брухальскага, стане галоўнай рэзідэнцыяй канцлера. Тут, у пачатку XVII стагоддзя, ён збудуе для сябе і сваёй сям'і новы двухпавярховы палац з шыкоўнай банкетнай гасцявой залай, вялікай бібліятэкай і архівам, у якім будзе прымаць самых высокіх гасцей і нават асобаў каралеўскай крыві.

Месца для рэзідэнцыі было выбрана выключна ўдала і рацыянальна: праз Ружану пралягаў найбольш зручны і кароткі шлях да абедзвюх сталіц Рэчы Паспалітай — Вільні і Варшавы, — паміж якімі найчасцей даводзілася курсіраваць канцлеру. Адсюль таксама было зручна дабірацца да Нясвіжскай рэзідэнцыі Радзівілаў, на двары якіх з сямігадовага ўзросту выхоўваўся будучы канцлер, трывалы палітычны саюз з якімі забяспечыў пасля маладому арыстакрату ўзыходжанне да вяршынь

3 Описаніе староства Берестейскаго1566 года // Документы Московского архива министерства Юстиции / под ред. М. Довнара-Запольского. М., 1897. Т. 1. С. 205.

палітычнай улады ў ВКЛ. І ўжо зусім рукой падаць было да Берасця — найбольш значнага пасля Вільні эканамічнага і дзяржаўна-палітычнага цэнтра дзяржавы, дзе часта адбываліся соймы і канфедэрацыі, царкоўныя сіноды і дыпламатычныя сустрэчы.

Другое важнейшае значэнне Берасця як нефармальнай сталіцы ВКЛ заключалася ў тым, што менавіта адсюль вёўся наўпроставы дыялог з польскай Каронай і Захадам наогул. Тут выпрабоўвалася мадэль новага тыпу еўрапейскай культуры, заснаваная на сінтэзе гуманістычных здабыткаў Захаду і Усходу, Поўдня і Поўначы. Адначасна з гэтым патрыятычнымі сіламі краіны вёўся пошук дзейсных спосабаў умацавання незалежнасці і суверэннасці дзяржавы, якая пад уплывам магутных цэнтрабежных тэндэнцый з Захаду і Усходу, з боку Польшчы і Масковіі, каталіцызму і праваслаўя паступова страчвала сваю ранейшую ваенна-палітычную моц, рэлігійна-культурную тоеснасць і нацыянальна-этнічную кансалідаванасць, што пагражала самому існаванню Княства. Процістаяць гэтым тэндэнцыям, прыдаць ім «зваротны ход», прымусіць працаваць на ўмацаванне дзяржавы імкнулася частка магнатэрскай эліты ВКЛ, у прыватнасці, Радзівілы і іх паслядоўнікі магнаты Хадкевічы, Сапегі, Глебавічы, Валовічы і інш., імкнуліся разгарнуць краіну на паўночны Захад Еўропы, абраўшы ў якасці ідэалагічнай асновы новага палітычнага курсу пратэстантызм у форме папулярнага ў Швейцарыі і балта-скандынаўскіх краінах кальвінізму.

Канкрэтным вынікам гэтай палітыкі стала заснаванне Мікалаем Радзівілам Чорным і ягоным стрыечным братам Мікалаем Радзівілам Рудым шматлікіх кальвінскіх Збораў і школ, дзе прапагандавалася новае веравучэнне, а таксама заснаванне ў Берасці і Нясвіжы друкарняў лацінскага і кірылічнага шрыфту.

У задачу першай з іх, заснаванай у 1553 г. у Берасці Бернардам Ваявудкам, а таксама пазнейшых друкарняў Станіслава Мурмеліуса (1558—1560-я гг.) і асабліва Кіпрыяна Базыліка (Cyprian Bazylik, 1566—1570) уваходзіла выданне разнастайнай рэлігійнай (кальвінскага напрамку) і свецкай літаратуры гуманістычна-рэфармацыйнага характару на польскай і лацінскай мовах, адрасаванай пераважна магнатэрска-шляхецкай эліце і каталіцкаму насельніцтву Княства.

Тады важнейшай задачай Нясвіжскай друкарні С. Буднага, М. Кавячынскага і Л. Крышкоўскага было: трансліраваць здабыткі гуманістычна-рэфармацыйнай культуры Захаду і новага веравучэння на вернікаў

праваслаўнага абраду, звязаных з старажытнарускай культурнай традыцыяй, арыентаваных на кірылічнае пісьменства і родную мову.

У гэтым праекце Берасцю, зыходзячы з яго памежнага становішча на мяжы Кароны і ВКЛ, адводзілася роля своеасаблівага маста паміж Усходам і Захадам. Як адзначаў М.В. Доўнар-Запольскі, «Берасце было тымі варотамі, праз якія Беларусь уступала ў дачыненні з Польшчай і паўднёвай Германіяй. На гэтым шляху Кракаў, Познань, і асабліва Люблін у XVI ст. набылі вялікае значэнне»[4]. Адпаведна сваёй новай ролі ў другой палове XVI ст. істотна вырасла не толькі палітыка-эканамічнае, але і культурна-цывілізацыйнае значэнне Берасця як своеасаблівага рэцыпіента і рэтранслятара заходніх уплываў. Падобна да таго, як Кракаў у канцы XV— пачатку XVI стст. стаў перадавым фарпостам і асноўным рэтранслятарам беларускай рэнесансавай культуры на еўрапейскім Захадзе, што выявілася ў закладцы ў Кракаве Ш. Фіёлем і ягонымі славянскімі памочнікамі Гаўрылам, Богушам і Янам на сродкі магнатаў Гаштольдаў, Солтанаў і Сапегаў друкарні кірылаўскага друку, у з'яўленні выдавецкага праекта «Бібліі рускай» Ф. Скарыны, узнікненні ў сталіцы польскага каралеўства магутнага ўсходнеславянскага вогнішча новалацінскай паэзіі і інш., Берасце стала першым такім рэпрэзентантам і папулярызатарам у ВКЛ і на еўрапейскім Усходзе польскай і ўвогуле заходняй гуманістычна-рэфармацыйнай культуры.

Тут, у 1553 г., з ініцыятывы і на сродкі М. Радзівіла Чорнага, выхадцам з Кракава Бернардам Ваяводкам была закладзена першая на землях Беларусі і ВКЛ друкарня лацінскага шрыфту. Прыгадаем, што росквіт друкарскай справы ў Берасці прыпаў на гады навучання Л. Сапегі на нясвіжскім двары М. Радзівіла Чорнага, а пасля ў Ляйпцыгскім універсітэце ў Германіі, калі з друкарні Цыпрыяна Базыліка выйшлі польскамоўная пратэстанцкая Радзівілаўская Біблія (1563 г.), а таксама каля 40 іншых выданняў на польскай і лацінскай мовах. Абсальвент Кракаўскай Акадэміі, кальвініст паводле веравызнання, заангажаваны да працы на нясвіжскім двары Радзівілаў спачатку як арганізатар музычнай капэлы, а пасля ў якасці кіраўніка Берасцейскай друкарні, Кіпрыян Базылік праявіў сябе не толькі як таленавіты музыка і выдатны друкар, але як арыгінальны паэт і перакладчык, погляды якога вызначаліся дэмакратызмам і свабодамыснасцю. Яму прыпісваецца аўтарства такіх

4 Довнар-Запольский М.В. История Белоруссии. Мн., 2003. С. 229.

антыкаталіцкіх твораў, як сатырычная паэма «Пратэй, або Пярэварацень» (1564 г.), алегорыя «Працэс чарцей супраць людскога роду» (1570 г.). Пра гэта сведчаць і ягонае творчае супрацоўніцтва з вядомым філосафам А. Валанам, з якім яны разам пераклалі з лаціны на польскую мову «Гісторыю жорсткіх ганенняў царквы боскай» (1567 г.). Акрамя гэтага, К. Базыліку належаць пераклады на польскую мову выдатнага палітычнага трактата Андрэя Фрыча Маджэўскага «Аб выпраўленні Рэчы Паспалітай» (Лоск, 1577), М. Олаха «Пра Атылу, караля вугорскага» (Кракаў, 1574), а таксама твора М. Барлетыуса пра героя вайны супраць туркаў Г. Скандэрбега «Гісторыя аб жыцці і выдатных справах Ежы Кастрыёта, якога па-простаму Скандэрбегам празываюць» (Берасце, 1569).

Каб ацаніць маштаб асобы і характар грамадскіх ідэалаў і памкненняў К. Базыліка, дастаткова працытаваць словы з напісанага ім да апошняга твора прысвячэння серадзкаму ваяводзе Альбрэхту Ласкаму і прадмовы да перакладу, у якіх К. Базылік, ставячы подзвіг Скандэрбега, героя вызваленчай барацьбой балканскіх народаў супраць турэцкай няволі, у прыклад рыцарскай шляхце Рэчы Паспалітай, уздымаецца да сапраўднага хваласпеву ў гонар свабоды як вышэйшай Боскай і чалавечай цноты: «Калі Бог пажадаў адарыць сваё стварэнне чалавека найвялікшай з усіх каштоўнасцей свету, ён абраў для гэтага свабоду». І яшчэ адна цытата з прадмовы К. Базыліка: «Няхай пахваляюцца вучоныя італьянцы навукамі, якія даўно там квітнеюць, багатымі зборамі пладоў, якія тут не растуць; няхай пахваляецца ганарлівы немец і ўмелы фландр рознымі тонкімі рамёствамі, няхай пахваляецца багаты француз багаццем і незлічонымі даходамі, няхай пахваляецца доблесны венгр і імклівы мужны іспанец усім тым, што ўзвышае іх над іншымі народамі. Не могуць яны пахваліцца тымі вольнасцямі, якімі ганарыцца Польшча»[5].

Такім чынам, Леў Сапега з «маладых пазногцяў» аказаўся ў самым эпіцэнтры, на вастрыі новых палітычных і культурных тэндэнцый, новай палітыкі дзяржавы, асновы якой заклаў ягоны апякун, тагачасны канцлер ВКЛ і віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Чорны. Ідэалы свабоды і гуманістычнай павагі да чалавечай асобы, рэлігійна-культурнай

5 Цыт. паводле артыкула Івановай Л.С. Роля Берасцейскай друкарні ў распаўсюджванні Рэфармацыі ў Вялікім княстве Літоўскім, змешчаным у гэтым выданні (с. 181).

талерантнасці, нацыянальна-дзяржаўнага патрыятызму і палітычнай незалежнасці ВКЛ сталі асноўным зместам адукацыі, выхавання і духоўных памкненняў будучага канцлера.

Значны ўплыў на фарміраванне асобы Л. Сапегі, яго філасофскіх, грамадска-палітычных і юрыдычна-прававых поглядаў аказалі таксама такія выданні берасцейскіх друкарняў, як «Артыкулы права магдэбургскага» і «Судовы працэс» (1560) Б. Граіцкага, перакладзены К. Базылікам знакаміты трактат Андрэя Фрыча Маджэўскага «Аб выпраўленні Рэчы Паспалітай» (Кракаў, 1577 г.), а таксама патрыятычны палітычны трактат віленскага войта і вядомага ў Еўропе доктара права Аўгустына Ротундуса «Размова Паляка з Літвінам» (каля 1564 г.), аўтар якога ў вострай палеміцы з С. Ажахоўскім, прыхільнікам ідэі інкарпарацыі ВКЛ у склад Польскага Каралеўства, адстойваў суверэнітэт і годнасць ВКЛ як вольнай, незалежнай і дэмакратычнай дзяржавы[6].

Гэта былі кнігі, якія фарміравалі духоўнае аблічча юнага Сапегі, які ў гэты час падрастаў і набіраўся сіл на Нясвіжскім двары Радзівілаў, спасцігаў навукі ў сценах Ляйпцыгскага універсітэта ў Нямеччыне, выбіраў свой шлях і жыццёвую дарогу, каб з найбольшай карысцю паслужыць сваёй Айчыне, якая адстойвала сваю свабоду і незалежнасць у крывавых бітвах Лівонскай вайны з самадзяржаўна-дэспатычнай Масковіяй Івана IV Грознага.

Мяркуем, што да зместу гэтых і іншых выданняў берасцейскіх друкарняў, а таксама прац і арыгінальных твораў берасцейскіх друкароў Л. Сапега неаднойчы звяртаўся і пазней, на працягу ўсёй сваёй палітычнай кар'еры. Багаж набытых ідэй і ведаў шырока выкарыстоўваў падканцлер і ў сваёй практычнай палітычнай дзейнасці, звязанай з публічнай юрыдычна-прававой абаронай патрыятычнымі сіламі краіны дзяржаўна-палітычнага суверэнітэту ВКЛ, істотна падарванага несправядлівымі ўмовамі Люблінскай уніі 1569 года; у прыватнасці, пры рэдагаванні ім Літоўскага Статута 1588 г. і падрыхтоўцы яго да друку.

Вядома, што ўзначаліўшы соймавую камісію па падрыхтоўцы новай рэдакцыі Статута, якая павінна была прывесці ўсё заканадаўства ВКЛ у адпаведнасць з палажэннямі Люблінскай уніі, ён фактычна праігнараваў рашэнні Люблінскага сойма 1569 г., стварыўшы на аснове і ў пра-

6 Саверчанка І. Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока. Мн., 1998. С. 71—79.

цяг традыцый Статута 1566 г. новы Звод законаў, якім замацоўваліся нацыянальна-дзяржаўны суверэнітэт і ствараліся юрыдычна-прававыя гарантыі існавання і развіцця Вялікага княства Літоўскага як незалежнай прававой дзяржавы.

Паны-рада і Канцылярыя ВКЛ шукалі дзейсныя спосабы абароны сваёй дзяржавы ад інкарпарыцыі і паглынання яе Польшчай, умацоўваючы самадзельныя, аўтаномныя формы гаспадарання і грамадска-палітычнага жыцця краіны. Гэтым мэтам як найлепш адпавядала стварэнне новай рэдакцыі Статута, якім дзяржава цалкам аднаўляла б свой палітычны суверэнітэт. Гэтак жа было і з выбарамі новага караля: Літва меркавала аддаць свой голас таму з кандыдатаў на трон Рэчы Паспалітай, хто згодзіцца з ліцвінскімі ўмовамі і зацвердзіць новы Статут.

Умела выкарыстоўваючы палітычныя цяжкасці Жыгімонта III Вазы, які змагаўся з аўстрыйскім эрцгерцагам Максімільянам Габсбургам за трон караля Рэчы Паспалітай, Л. Сапега з сваімі аднадумцамі і прыхільнікамі дабіліся ад манарха падпісання, а затым увядзення ў дзеянне новага Статута, артыкулы якога аднаўлялі працу вышэйшага заканадаўчага органа краіны — Сойму, забаранялі замежнікам набываць землі, займаць дзяржаўныя, духоўныя і свецкія пасады, выбірацца ў суды і органы мясцовага самакіравання, а ў дадатак істотна абмяжоўвалі правы самога манарха.

«И то есть наша вольность, — пісаў Л. Сапега ў «Звароце да ўсіх станаў Вялікага княства Літоўскага», надрукаваным у якасці прадмовы да выдадзенага ім на ўласныя сродкі Статута 1588 г., — которою се мы межи иншыми народами хрестиянскими хвалим же пана, ижбы водле воли своее, а не водле прав наших пановал, над собою не маем, а яко славы учстивое, так живота и маетности волно уживаем. <…> А если которому народу встыд своих прав не умети, поготовю нам, которые не обчым яким языком, але своим власным права списаные маем и кождого часу, чого нам потреба ку отпору всякое кривды, ведати можем»[7].

Пад бліскучымі публіцыстычнымі прадмовамі-зваротамі Л. Сапегі да новаабранага караля Рэчы Паспалітай Жыгімонта III Вазы і ўсіх станаў Вялікага княства Літоўскага, прасякнутымі ідэямі свабоды чалаве-

7 Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мн. : БелСЭ, 1989. С. 47—48.

чай асобы і вяршэнства закона ў жыцці грамадства, пафасам барацьбы супраць рабства і тыраніі ўладароў, якімі канцлер завяршаў у Берасці сваю працу над трэцяй рэдакцыяй Літоўскага Статута 1588 г., стаіць уласнаручны подпіс Л. Сапегі з дакладна абазначанымі месцам і датай з'яўлення дакумента: «Писан у Берестью лета от нароженья сына Божьего 1588 месяца декабря, 1 дня.»[8]

Вучоных цікавіць, дзе канкрэтна ў Старым Берасці (паводле яго колішняй тапаграфіі) маглі быць напісаны знакамітыя радкі Сапегавых прадмоў да Літоўскага Статута 1588 г., для стварэння якіх, безумоўна, патрэбен быў і час, і бібліятэка, і сталы прытулак у горадзе, неабходныя для плённай творчай працы.

Тое, што Л. Сапега, па прыкладзе некаторых іншых высокапастаўленых магнатаў ВКЛ кшталту князя К. Астрожскага, меў у горадзе нейкую нерухомую маёмасць — уласны заезджы двор, дом ці палацык — практычна не выклікае сумнення: даўнія і сталыя сувязі Сапегаў з Берасцейшчынай і Падляшшам, дзе яны мелі шматлікія ўладанні, а таксама дзяржаўныя абавязкі Л. Сапегі як вялікага пісара, а пасля і падканцлера ВКЛ, адказнага за дыпламатыю і знешнюю палітыку дзяржавы, выключаюць нейкі іншы адказ.

Некаторымі даследчыкамі выказваліся меркаванні, што палацык Л. Сапегі месціўся ў Старым горадзе, на рагу вуліц Пясецкая і Кракаўская[9]. Аднак пры бліжэйшым разглядзе высветлілася, што ў якасці рэзідэнцыі Л. Сапегі разглядалася пазначаная ў «Апісанні Берастейскага староства 1566 года» колішняя сціплая сядзіба ў Берасці каралеўскага рэвізора Дзмітрыя Сапегі плошчай 1½ прута (прыкладна 35 м кв — Г.П.), якая, па-першае, належала зусім іншай асобе, а, па-другое, (нават калі б Л. Сапега пазней стаў яе ўладальнікам) наўрад ці магла выкарыстоўвацца ім у якасці рэзідэнцыі, улічваючы амбіцыі магната і высокі дзяржаўны статус падканцлера ВКЛ.

Значна большую цікавасць уяўляе апублікаваны І. Лаўроўскай рэестр земляў, ахвяраваных канвенту св. Брыгіты на працягу 1632—1691 гг., у якім пад 1584 годам значыцца дом у Берасці, уласнікам якога называ-

---

8 Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мн. : БелСЭ, 1989. С. 45.

9 Гл. рэдакцыйныя ўключэнні І. Лаўроўскай ў артыкуле: Праневіч Г. Вялікі Канцлер Вялікага Княства // Брестский курьер. 2003. 20 — 26 ноября. С. 9.

ецца «пісар ВКЛ»[10]. Паколькі ж сам канвент св. Брыгіты быў заснаваны пазней, у пачатку XVII ст., і, адпаведна, само ахвяраванне магло быць зроблена не раней гэтага часу, дык можна меркаваць, што пазначаны ў рэестры 1584 г. — гэта, хутчэй за ўсё, год набыцця дома ва ўласнасць самім ахвярадаўцам, у якім не без падстаў можна падазраваць менавіта Льва Сапегу, які з 1581—га па 1585 г. займаў пасаду вялікага пісара ВКЛ, і, безумоўна, меў патрэбу ва ўласным доме ў Берасці.

Такім чынам, Л. Сапегу на працягу доўгіх гадоў трывала лучыла з Берасцем не толькі даўняя сямейна-родавая традыцыя, але найперш службовыя абавязкі вялікага пісара і падканцлера ВКЛ, якія вымагалі частых і доўгіх падарожжаў за межы дзяржавы. Бо вялікім пісарам ВКЛ, як людзям добра абазнаным у дзяржаўных справах, адукаваным юрыстам і знаўцам моў, часта даручаліся пасольствы да замежных двароў. У той час як канцлеры і падканцлеры традыцыйна займаліся знешнімі сувязямі дзяржавы з Масковіяй і Польшчай. У абавязкі апошніх уваходзіла таксама пастаянная (па паўгода на кожнага) прысутнасць пры каралеўскім двары[11]. Гораду, такім чынам, выпала місія перадавога фарпосту Вялікага княства Літоўскага на галоўным накірунку яго знешняй палітыкі і дачыненняў з асноўным сваім партнёрам-супернікам — Польскай Каронай. Як правіла, з Берасця, дзе канцэнтраваўся ток высокага палітычнага напружання, што ішоў з Вільні і Нясвіжа, і распачынаў падканцлер свой няпросты дыялог-палеміку з саюзнікам. Удзел Літвы і літвінскіх паслоў у элекцыйным сейме, які праходзіў 30 чэрвеня 1587 г. паблізу Варшавы, барацьба за тое, каб новы манарх вярнуў незаконна адабраныя ад дзяржавы землі Падляшша, Падолля і Кіеўшчыны, прызнаў новы Статут, якім адмяняліся ўсе артыкулы Люблінскай уніі, скіраваныя на скасаванне незалежнасці ВКЛ, патрабавалі ад падканцлера пастаяннай прысутнасці паблізу асноўнага тэатра палітычных дзеяў. Тым больш, што Леў Сапега, як старшыня соймавай камісіі, непасрэдна ўдзельнічаў у завяршэнні працы над новым Статутам і ў палітычных перамовах з Жыгімонтам III Вазам аб яго зацвярджэнні і ўвядзенні ў дзеянне. Берасце, як найлепш, падыходзіла для выканання гэтай задачы. Тут ён спыняўся перад сваімі пастаяннымі раз'ездамі і ваяжамі ў Польшчу, да каралеўскіх рэзідэнцый

10 Лаўроўская І. Ахвярадаўцы і ахвяраваньні ў Берасьці Літоўскім // ARCHE Пачатак. 2008. № 7—8. С. 693.

11 Góralski Z. Urzędy i godności w dawnnej Polsce. Warszawa, 1998. S. 83, 86, 88, 116.

у Кракаве і Варшаве, на сеймы і дыпламатычныя сустрэчы. Тут праводзіў апошнія сустрэчы і палітычныя кансультацыі, атрымоўваў неабходную інфармацыю, абдумваў свае выступленні і заявы, рыхтаваў дакументы, вёў дыпламатычную перапіску і г.д.

У гэтай барацьбе-супрацьстаянні Л. Сапега несумненна абапіраўся не толькі на матэрыяльныя і палітычныя рэсурсы, але і на духоўна-культурны патэнцыял Берасця як буйнога ваяводскага цэнтра і аднаго з галоўных гарадоў Вялікага княства Літоўскага, падпітваўся вольналюбівым духам горада і яго жыхароў, выхаваных у Магдэбургскім праве, прывілей на якое горад атрымаў у 1390 годзе, адразу ўслед за Вільняй. Галоўнае ж, што рабіла гараджан аднадумцамі і прыхільнікамі Вялікага Канцлера, заключалася ў тым, што іх светапогляд, грамадска-палітычныя настроі і ідэалы, як і яго ўласныя, таксама фарміраваліся пад уплывам свабодалюбівых ідэй К. Базыліка і А. Волана, А. Ротундуса і А.Ф. Маджэўскага, Паўла з Бжэзіна і М. Барлетыуса, кнігі якіх выходзілі з-пад варштатаў брэсцкіх друкарняў і, безумоўна, уплывалі на духоўную атмасферу Берасця і яго жыхароў.

Не выклікае сумнення, што ў асабістым кнігазборы Л. Сапегі былі выданні берасцейскіх друкарняў. Неабходныя канцлеру для працы над прадмовамі кнігі можна было знайсці таксама ў багатых бібліятэках берасцейскіх манастыроў і пратэстанцкіх Збораў і прыватных кнігазборах заможных гараджан.

Такім чынам, у Сапегавым «Звароце да ўсіх станаў Вялікага княства Літоўскага», дзе свабода і незалежнасць абвешчаны вышэйшай каштоўнасцю і цнотай чалавечага жыцця, можна выразна адчуць не толькі водгук ідэй К. Базыліка, А. Волана ці А. Ротундуса, але і салідарны голас грамадзян Берасця: «Обачывали то усих веков люди мудрые, же в каждой речы посполитой чоловеку почстивому ничого не маеть быти дорожшого над вольность. А неволею так се маеть гыдити, же не только скарбами, але и смертью ее од себе отганяти есть повинен. А прото люди почстивые не только маетности, але и горл своих против кождому неприятелю выносити не жалують, абы под их окрутное опанованье не приходили, а з волности своее будучи злуплени, водлуг воли и мысли их яко невольники не мусели жити»[12].

12 Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 : Тэксты. Давед. Камент. / Беларус. Сав. Энцыкл. ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ, 1989. С. 47.

Статут 1588 г. засведчыў найвышэйшы духоўна-творчы ўзлёт Л. Сапегі як палітыка і творцы. За свабодалюбным зместам напісаных падканцлерам у Берасці публіцыстычных прадмоў і гуманізмам юрыдычна-прававых артыкулаў Літоўскага Статута 1588 г. стаяць не толькі шматгадовая руплівая праца выдатных тагачасных палітыкаў, прававедаў і філосафаў, такіх як канцлеры ВКЛ Крыштаф Радзівіл і Астафей Валовіч, віленскі войт і доктар права Ротундус і інш., але глыбокія веды, асабісты духоўны вопыт і ідэйныя перакананні самога Л. Сапегі, узбагачаныя патрыятычнымі ідэямі такіх айчынных філосафаў і рэфарматараў, як Ф. Скарына, С. Будны, В. Цяпінскі, А. Волан і інш.

Назіранні за прадмовамі Л. Сапегі і зместам артыкулаў Літоўскага Статута 1588 г. сведчаць, што Леў Сапега схіляўся ў сваёй творчасці да мастацкага сінтэзу розных традыцый, імкнучыся да творчага абагульнення перадавых грамадска-палітычных і філасофскіх ідэй свайго часу, выпрацаваных еўрапейскімі гуманістамі і айчыннымі мысліцелямі, а ў сваім шляхецкім лібералізме, сантыментах і спагадзе да селяніна і людзей простых аказаўся найбольш блізкі да таго грамадзянскага і чалавечага тыпажу, які прадстаўлялі ў літаратуры эпохі Рэнесансу і Рэфармацыі Францыск Скарына, Андрэй Волан, а ў польскай — выдатны публіцыст і палітычны дзеяч Андрэй Фрыч Маджэўскі.

Навукова-публіцыстычная спадчына апошняга надзвычай імпанавала Л.Сапегу сваёй тэорыяй арыстакратычна-шляхецкага патэрналізму, бацькоўскай апекі і дапамогі сялянам з боку феадалаў, таксама ідэямі гуманізацыі адносін і прымірэння паміж станамі ў імя грамадзянскага міру і ўнутранага спакою ў дзяржаве, якія А.Ф. Маджэўскі выклаў у сваёй славутай кнізе «Аб выпраўленні Рэчы Паспалітай».

Як піша Казімір Лепшы, «А.Ф. Маджэўскі асцерагаўся грамадскага перавароту, які б узбунтаваў і вызваліў масы сялян і гарадскога плебсу, і хацеў унікнуць у яго праз зняцце напружанага супрацьстаяння на вёсцы. А для гэтага нагадваў феадалам, каб змянілі свае адносіны да селяніна, даводзячы ім, што «не павінна быць ніякага адрознення паміж бацькам і добрым панам», спадзеючыся, што маральна-этычныя аргументы ў выніку пераканаюць феадалаў адмовіцца ад іх палітыкі ўціску і эксплуатацыі»[13].

13 Lepszy K. Andrzej Frycz Modrzewski. Warszawa, 1954. S. 60.

Ліберальныя ідэі А.Ф. Маджэўскага мелі вялікі розгалас у Рэчы Паспалітай, але найбольш — у Літве, дзе іх падтрымлівалі такія высокапастаўленыя магнаты як канцлер А. Валовіч і падканцлер Л. Сапега. Пра гэты ўплыў, прынамсі, могуць сведчыць некаторыя гуманістычныя юрыдычныя навацыі, унесеныя ў тэкст Літоўскага Статута 1588 г. соймавай камісіяй пад кіраўніцтвам Льва Сапегі, якіх не было ў ранейшых рэдакцыях. Складальнікі, напрыклад, увялі ў Статут 1588 г. беспрэцэдэнтна смелы для таго часу артыкул, які прадугледжваў смяротнае пакаранне шляхціца за наўмыснае забойства простага чалавека. Гэты факт дазволіў даследчыкам гаварыць аб больш гуманістычным характары літоўскага заканадаўства ў адносінах да сялян у параўнанні з Каронай, дзе падобны артыкул быў уведзены толькі ў 1768 г.[14]

Статут 1588 г. як выдатны помнік прававой культуры беларускага народа стаў выключнай з'явай еўрапейскага заканадаўства, дзякуючы найперш творчаму ўкладу Л. Сапегі, які ўзбагаціў яго глыбокімі ведамі і здабыткамі перадавой юрыдычна-прававой навукі, а ў сваіх прадмовах «выказаў шмат гэткіх высокіх думак, якія адпавядалі толькі XVIII і XIX стагодзьдзям»[15]. Так, у Статуце дэкларавуся прынцып усеагульнага прамога выбарчага права для ўсіх станаў і саслоўяў, які ўвойдзе ў практыку еўрапейскага заканадаўства толькі ў канцы XVIII ст.

Прадугледжвалася больш суровае пакаранне (амаль удвая) за злачынствы супраць жанчын.

Статут устанаўліваў прэзумпцыю невінаватасці асобы, вызваляў ад крымінальнай адказнасці непаўналетніх (да 16 гадоў) і псіхічна хворых.

У ім замацоўвалася права падсуднага на абарону з удзелам пракуратараў (адвакатаў).

Пацвярджалася магчымасць свабоднага выезду за межы дзяржавы (акрамя непрыяцельскіх земляў) з мэтай лячэння, атрымання адукацыі і здзяйснення рыцарскіх учынкаў.

Нязменным і абавязковым для ўсіх службовых асобаў, пісараў і канцылярыстаў заставаўся дзяржаўны статус старабеларускай мовы.

---

14 Stroynowski A. Pozycja społeczna drobnej szlachty WKL w końcu XVIII w. // Zeszyty naukowe uniwersytetu Łódzkiego. Nauki humanistyczno-społeczny. Łódź, 1976. Seria I, zeszyt 4. S. 106.

15 Шкялёнак М. Леў Сапега // Спадчына. 1991. № 1. С. 64.

Зыходзячы з акта Варшаўскай канфедэрацыі 1573 года «Аб міры паміж іншаверцамі», зацвярджаўся прынцып верацярпімасці і роўнасці ўсіх хрысціянскіх веравызнанняў.

Адносна апошняга належыць сказаць, што сам Л. Сапегаў сваёй шчырай прыхільнасці і адданасці ідэі рэлігійнай талерантнасці адштурхоўваўся не толькі ад засвоенай ім у маленстве пратэстанцкай этыкі, але відочна ішоў наўпрост ад Скарынавай традыцыі, у прыватнасці, ад яго фенаменальнай «Бібліі рускай» (1517—1519 гг.), адрасаванай не адной якой-небудзь канфесіі (праваслаўным, каталікам ці пратэстантам), але ўсім «людем посполитым рускаго языка».

Паслядоўны дзяржаўнік і патрыёт, чалавек і палітык, які пад уплывам розных ідэйных перакананняў і палітычных меркаванняў сам двойчы пераходзіў з адной хрысціянскай канфесіі ў другую, ён адным з першых усвядоміў, што ва ўмовах эпохі Рэнесансу і Рэфармацыі хрысціянская ідэя на Беларусі і ў ВКЛ пачала набываць экуменічны, надканфесійны характар, пераўтвараючыся ў *ідэю нацыянальную*, сэнсам якой стала аб'яднанне народа на глебе гуманістычных каштоўнасцяў свабоды асобы і захоўвання закону, а таксама абароны дзяржаўнага суверэнітэту, роднай мовы і культуры, спалучаных з гуманістычнай этыкай самых розных хрысціянскіх веравызнанняў.

Такім чынам, можна гаварыць аб тым, што Літоўскі Статут 1588 г., ачолены Л. Сапегам у сваім берасцейскім палацыку дзвюма выключна глыбокімі паводле грамадска-палітычнага і філасофскага зместу прадмовамі, назаўсёды звязаў імя іх аўтара з Берасцем як месцам першага вялікага палітычнага трыумфу беларускай нацыянальнай ідэі.

Ва ўзнікненні гэтага феномена Берасцю поруч з Нясвіжам і Вільняй належыць адна з ключавых роляў, звязаных з перадачай, трансляцыяй і сінтэзам здабыткаў гуманістычнай культуры Захаду і Усходу, што ў значнай ступені паўплывала на ідэйны змест і характар выдатнейшага грамадска-палітычнага і прававога дакумента эпохі — Літоўскага Статута 1588 года, які стаў для беларусаў маніфестам і тэстаментам свабоды, на стагоддзі наперад вызначыўшы арыенціры і шляхі барацьбы за адраджэнне Айчыны.

Аўтары зборніка

Бразюнене Альма — доктар гуманітарных навук, лектар Інстытута кнігазнаўства і дакументалістыкі Віленскага універсітэта

Бярозкіна Наталля Юр'еўна — кандыдат гістарычных навук, дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі

Валецкі Вацлаў — прафесар Ягелонскага універсітэта, кіраўнік Цэнтра даследаванняў Польскай бібліяграфіі Эстрэйхераў Ягелонскага універсітэта

Верас Нэлі Яўгенаўна — магістр гуманітарных навук, загадчык сектара навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі

Галубовіч Ала Купрыянаўна — дырэктар Нацыянальнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Рэспублікі Беларусь

Гвёздзік Яланта — доктар, ад'юнкт Сілезскага універсітэта (Катавіцы)

Герасімаў Валерый Мікалаевіч — загадчык сектара старадрукаў і рэдкіх выданняў Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь

Гладышчук Анатоль Антонавіч — доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта

Гусева Вольга Валер'еўна — кандыдат філалагічных навук, дацэнт Санкт—Пецярбургскага універсітэта

Доўнар Ларыса Іосіфаўна — кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў

Долгадрова Таццяна Аляксееўна — доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага аддзела рэдкіх кніг Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі (Масква)

Дубейка Васіль Міхайлавіч — дырэктар Цешаўлянскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці

Жылко Вадзім Вітальевіч — краязнаўца (Лунінец, Брэсцкая вобласць)

Зверава Ірына Сяргееўна — кандыдат філалагічных навук, загадчык Аддзела архіўных дакументаў Расійскай Нацыянальнай бібліятэкі (Санкт-Пецярбург)

Есіпава Валерыя Анатольеўна — доктар гістарычных навук, загадчык сектара аддзела рукапісаў і кніжных помнікаў Навуковай бібліятэкі Томскага дзяржаўнага універсітэта

Іванова Алена Вітальеўна — дырэктар Нацыянальнай кніжнай палаты Рэспублікі Беларусь

Іванова Людміла Сяргееўна — вядучы палеограф Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (Мінск)

Ігнацюк Алена Іванаўна — кандыдат філалагічных навук, выкладчык Палескага дзяржаўнага універсітэта (Пінск, Брэсцкая вобласць)

Ільін Аляксандр Львовіч — кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Палескага дзяржаўнага універсітэта (Пінск, Брэсцкая вобласць)

Караў Дзмітрый Уладзіміравіч — доктар гістарычных навук, прафесар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы

Камісарава Алена Віктараўна — кандыдат педагагічных навук, супрацоўнік Генеральнага консульства Чэшскай Рэспублікі ў Санкт-Пецярбургу

Кірухіна Людміла Генадзьеўна — намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі РБ

Кірэева Галіна Уладзіміраўна — загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Нацыянальнай бібліятэкі РБ

Кнырэвіч Сяргей Міхайлавіч — краязнаўца (Мінск)
Коўкель Лілія Іванаўна — доктар, ад'юнкт Педагагічнай акадэміі (Кракаў)
Лаўрык Юрый Мікалаевіч — магістр тэалогіі, вядучы навуковы супрацоўнік навукова-фондавага аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі (Мінск)
Мамантаў Марк Аляксандравіч — кандыдат педагагічных навук, старшы навуковы супрацоўнік Расійскай нацыянальнай бібліятэкі (Санкт-Пецярбург)
Мароз Валерый Вячаслававіч — краязнаўца (Брэст)
Нарбуцене Дайва — доктар гуманітарных навук, загадчык аддзела рэдкай кнігі бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Літвы
Несцярчук Леанід Міхайлавіч — галоўны спецыяліст упраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама
Нікалаеў Мікалай Віктаравіч — доктар філалагічных навук, загадчык аддзела рэдкіх кніг Расійскай нацыянальнай бібліятэкі (Санкт-Пецярбург)
Пазіхоўская Святлана Уладзіміраўна — загадчык Музея кнігі і друку (Астрог)
Пазіхоўскі Аляксандр Лявонцьевіч — загадчык аддзела нумізматыкі Дзяржаўнага гісторыка-культурнага запаведніка г. Астрога
Папко Вольга Мікалаеўна — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры філасофіі і культуралогіі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага універсітэта
Петшкевіч Івона — доктар, ад'юнкт Педагагічнай акадэміі (Кракаў)
Підлыпчак-Маеровіч Марыя — доктар габілітаваны, прафесар Педагагічнай акадэміі (Кракаў)
Праневіч Генадзь Мікалаевіч — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна
Саітава Валянціна Іванаўна — кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
Саўчук Алеся Іванаўна — галоўны захавальнік Гродзенскага дзяржаўнага гістарычна-археалагічнага музея
Сацута Іван Уладзіміравіч — кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы і дыялекталогіі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна
Семашка Святлана Мікалаеўна — дырэктар Брэсцкай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы
Сінкевіч Мікалай Мікалаевіч — краязнаўца, журналіст (Бяроза, Брэсцкая вобласць)
Сіесс-Кшышкоўскі Станіслаў — прафесар, спецыяліст Центра даследаванняў польскай бібліяграфіі Эстрэйхераў Ягелонскага універсітэта (Кракаў)
Сцефановіч Аляксандр Віктаравіч — загадчык аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі
Туміловіч Васіль Мікалаевіч — краязнавец, святар (Камянец, Брэсцкая вобласць)
Турмасава Любоў Іванаўна — загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага
Цібароўская-Рымаровіч Ірына Алегаўна — кандыдат гістарычных навук, супрацоўнік аддзела старадрукаў і рэдкіх выданняў Нацыянальнай бібліятэкі Украіны імя В.І. Вярнадскага (Кіеў)
Цітоў Анатоль Канстанцінавіч — гісторык (Мінск)